**Аляксандр Гужалоўскі**

# МУЗЕІ БЕЛАРУСІ

*(1941-1991 гг.)*

Мінск 2004

УДК 069(476) (091)
ББК 79.1 Г 93

Навуковы рэдактар: доктар гістарычных навук, прафесар У. М. Міхнюк

Рэцэнзенты:

доктар мастацтвазнаўства, прафесар Н. Ф. Высоцкая
старшыня Беларускага фонду культуры У. А. Гілеп

**А. А. Гужалоўскі.**

Музеі Беларусі (1941-1991 гг.) — Мн.: НАРБ, 2004,-218 с.

ISBN 985-6372-34-8

Прапануемая кніга прысвечана лёсу беларускіх музейных калекцый у гады вайны, узнаўленню музейнай сеткі БССР у пасляваенны чгс, а таксама развіццю музейнай справы ў рэспубліцы да распаду СССР у 1991 г. Прыведзена 50 ілюстрацый, большасць з якіх публікуюцца ўпершыню. Гэта выданне зацікавіць як спецыялістаў-музеёлагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, калекцыянераў, мастакоў, студэнтаў, так і аматараў айчыннай гісторыі.

УДК 069(476) (091)

ISBN 985-6372-34-8

© А. А. Гужалоўскі, 2004

# УВОДЗІНЫ

Кожны музей непаўторны, ён уяўляе ўнікальную з'яву грамадскага жыцця, мае ўласную гісторыю, уласных заснавальнікаў, уласныя калекцыі, уласную экспазіцыю, уласны будынак, уласную аўдыторыю. Як няма на свеце двух аднолькавых людзей, так няма і не павінна быць двух аднолькавых музеяў. Прынцып індывідуальнасці, унікальнасці палягае ў самой аснове музейнай справы.

У прапануемай чытачу кнізе разглядаецца музейная справа Беларусі за даволі вялікі адрэзак часу. Гэта перыяд складаных і неадназначных працэсаў у савецкім грамадстве, і музеі, з'яўляючыся адным з элементаў духоўнага жыцця, адлюстроўвалі змены ў грамадска-палітычным жыцці. Вызначыць дакладныя храналагічныя рамкі гэтых змен даволі цяжка, і наўрад ці патрэбна. Развіццё музейнай справы ў разглядаемы час цалкам вызначала дзяржаўная ідэалогія. Зыходзячы з агульных ідэалагічных установак, з пастаноўкі і рэалізацыі дзяржаўных задач у галіне музейнага будаўніцтва, можна выдзеліць тры перыяды:

1941 г. — сярэдзіна 1950-х гг.,
сярэдзіна 1950-х гг. — канец 1960-х гг.,
канец 1960-х гг. — 1991 г.

У сваю чаргу першы перыяд можна падзяліць на дзве часткі, першая з якіх вызначана храналагічнымі рамкамі і падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, а другая — працэсам аднаўлення музейнай сеткі ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Другі перыяд адлюстроўваў кароткае дзесяцігоддзе дэмакратызацыі жыцця ў СССР пасля XX з'езда КПСС, што не магло не адбіцца на музейнай дзейнасці. На працягу трэцяга перыяду, які храналагічна ахоплівае апошнія дваццаць гадоў існавання БССР, музейная справа рэспублікі развівалася пад сцягам прапаганды «развітога сацыялізму» музейнымі сродкамі. Стан музейнай справы пасля ўтварэння 19 верасня 1991 г. Рэспублікі Беларусь не разглядаецца — музеі краіны знаходзяцца ў працэсе пошуку і патрабуюць спецыяльнага даследавання.

Унутры кожнага з гэтых перыядаў фактычны матэрыял разглядаецца на абранай аўтарам схеме. Усе музеі адпаведна іх ведамаснай прыналежнасці падзелены на тры групы. Першая з іх, пасля непрацяглага знаходжання ў складзе Наркамасветы, а потым Камітэта па справах культасветустаноў, падпарадкоўвалася Міністэрству культуры. Другая аб'яднала музеі іншых міністэрстваў, ведамстваў і ўстаноў. У трэцюю групу ўвайшлі шматлікія грамадскія музеі, большасць з якіх была створана ў школах. Спачатку гаворка ідзе аб

музеях Наркамасветы — Камітэта па справах культасветустаноў — Міністэрства культуры. Потым аналізуецца другая па колькасці і значнасці група музеяў, якія падпарадкоўваліся розным ведамствам. І, нарэшце, кожная глава (за выключэннем першай) завяршаецца разглядам работы грамадскіх музеяў.

Трэба агаварыцца, што групаванне матэрыялу пра музеі Наркамасветы — Камітэта па справах культасветустаноў — Міністэрства культуры мае свае асаблівасці. У першай главе яно вызначана працэсам узнаўлення музейнай сеткі: спачатку разглядаецца ўзнаўленне даваенных музеяў, потым — стварэнне новых музейных устаноў. Аднаўленне на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя сеткі дзяржаўных музеяў у БССР дазволіла выкарыстаць у другой главе найбольш распаўсюджаны прынцып класіфікацыі музейных устаноў, зыходзячы з іх прыналежнасці да пэўных профільных груп. Адпаведна класіфікацыі, якая выкарыстоўвалася Міністэрствам культуры пачынаючы з сярэдзіны 1950-х гг., усе дзяржаўныя музеі БССР падзяляліся на: 1) краязнаўчыя (комплексныя); 2) ваенна-гістарычныя; 3) гісторыка-рэвалюцыйныя; 4) мастацкія; 5) літаратурныя. Падобная профільная класіфікацыя азначанай групы музеяў пакладзена ў аснову трэцяй главы.

У дадзенай рабоце меркавалася разглядаць музейную справу як арганічную частку культуры Беларусі ў цэлым. Аднак рашэнне гэтай задачы ўскладнілася цяжкасцямі, абумоўленымі наяўнасцю абагульняючых гісторыка-культурных даследаванняў. Працы па гісторыі культуры Беларусі разглядаемага перыяду, напісаныя да 1991 г., характарызуюцца апалагетыкай кожнай новай пастановы вышэйшага партыйнага кіраўніцтва, адсутнасцю крытычнага погляду, імкненнем знайсці прычыну хібаў толькі ў практычнай дзейнасці асобных ведамстваў і ўстаноў культуры. Сёння ж вучоныя, якія займаюцца праблемамі культуры, накіравалі свае намаганні пераважна на больш далёкія ў храналагічных адносінах перыяды.

Усе работы, прысвечаныя гісторыі музеяў Беларусі, якія існавалі ў перыяд з 1941 па 1991 г., можна ўмоўна аб'яднаць у два блокі.

Першы блок складаецца з работ, якія асвятляюць гісторыю музейнага будаўніцтва, асобныя напрамкі дзейнасці музеяў Беларусі за пэўны прамежак часу, а таксама фарміраванне дзяржаўнага музейнага фонду, рух музейных калекцый. Так, фрагменты, прысвечаныя музейнаму будаўніцтву ў БССР у другой палове 1940-х — пачатку 1970-х гг., мы знаходзім у аб'ёмнай манаграфіі С. В.

Марцэлева, прысвечанай гісторыі беларускай савецкай культуры[I]. Першая спроба разгляду асветніцкага напрамку музейнай дзейнасці ў рэспубліцы ў пасляваенны час у якасці самастойнай праблемы была зроблена ў дысертацыйным даследаванні К. А. Біруковіч[II]. Тэма, сфармуляваная гэтым аўтарам, атрымала далейшую распрацоўку ў дысертацыі А. М. Калбаска[III]. Яскравым прыкладам крыніцазнаўчага напрамку ў гісторыка-музейных даследаваннях з'яўляецца апублікаваны ў 1996 г. нарыс вядомага гісторыка культуры А. І. Мальдзіса, прысвечаны лёсу беларускіх музейных калекцый падчас Вялікай Айчыннай вайны[IV].

Другі блок работ — гэта артыкулы ў навуковых зборніках, перыядычным друку, а таксама тэзісы выступленняў на канферэнцыях, прысвечаныя гісторыі музейнай справы Беларусі. У другой палове 1980-х — пачатку 2000-х гг. даследчыкамі (пераважна супрацоўнікамі музеяў) была зроблена вялікая праца ў галіне вывучэння стварэння і развіцця асобных музейных устаноў, у тым ліку разглядаемага перыяду. На аснове разнастайных першакрыніц, пераважна архіўных, напісаны невялікія па аб'ёме, але важныя па змесце гісторыка-музейныя даследаванні[V].

Важную інфармацыю абагульняючага характару, якая дапамагае асэнсаваць дзяржаўную палітыку ў галіне музейнага будаўніцтва ў другой палове XX ст. у маштабах СССР, мы знаходзім у нарысе расійскага музеёлага В. І. Златауставай[VI].

---

[I] Марцелев С. В. К духовному расцвету. Мн., 1974.

[II] Бирюкович К. О. Роль музеев Белоруссии в коммунистическом воспитании трудящихся (1945-1970). Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук. Мн., 1977.

[III] Колбаско А. Н. Деятельность музеев Белорусской ССР по воспитанию трудящихся на патриотических и трудовых традициях белорусского народа. 1971-1985. Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук. Мн., 1990.

[IV] Мальдзіс А. Трагічныя лёсы беларускіх музейных, бібліятэчных і архіўных збораў у час Другой сусветнай вайны // Вяртанне 3. Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мн, 1996. С. 6-13.

[V] Герасімовіч П. Адноўлены на руінах // Мастацтва Беларусі. 1985. № 4. С. 12; Мамаева Д. Падзвіжнікі. Гісторыя стварэння аднаго музея //Літаратура і мастацтва. 1990. 6 крас.; Сухорукое А., Шишанов В. К истории создания музея-усадьбы И. Е. Репина «Здравнёво» // Беларуска-рускае культурнае ўзаемадзеянне канца XIX - пачатку XX ст. Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння І. Я. Рэпіна і 100-годдзю знаходжання мастака на Беларусі. Віцебск, 1995. С. 116; Писаненко А. Д., Шкляров Л. П. История зоологического музея Белорусского университета // Фауна и систематика: Тр. Зоол. Музея Бел. Ун-та. Мн., 1995. С. 6-22; Кондратьева Л. Ф. Из истории Могилевского областного краеведческого музея. Послевоенный период. 1944 -1967 гг. // Магілёўшчына. Вып. VII. Магілёў, 1998. С. 104; Артемчик Н. П. Из истории Бобруйского музея // Старажытнасці Бабруйшчыны. Вып. 2. Мінск Бабруйск, 1998. С. 7; Курчицкий А. В. Страницы истории Гомельского областного краеведческого музея // Краеведческие записки (к 80-летию Гомельского областного краеведческого музея). Гомель, 2000. С. 17-33. Джумантаева Т. А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. XX ст. 70-я гг. XX ст.) // Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведпік. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1999 г.). Полацк, 2000. С. 15, Воронкова И.Ю. Создание и становление Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны. Мн., 2001 плакетка А. І. Беларускі дзяржаўны музей-запаведнік «Менка» (вытокі і шляхі станаўлення) // Зборнік навуковых прац, прысвечаны дваццаціпяцігоддзю стварэння музея і пятнаццацігоддзю экспазіцыі беларускага скансэна. Міг, 2001. С. 18 34; Падалян Г. Старонкі гісторыі музейнага аб'яднання // Зборнік прац навуковых супрацоўнікаў аб'яднання за 2001 г. Браслаў, 2002. С 3 і інш.

[VI] Златоустова В. И. Государственная политика в области музейного дела (1945 1985 гг.) // Музей и власть. Государственная политика в области музейного дела (XVIII-XX вв.). М, 1991. Ч. 1. С. 226 298.

Такім чынам, нягледзячы на з'яўленне значнай колькасці артыкулаў, нарысаў, а таксама двух спецыяльных дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных розным аспектам музейнай справы Беларусі ў пасляваенны перыяд, яны не ствараюць цэласнай карціны гэтай важнай галіны гісторыі культуры.

Крыніцазнаўчай базай для напісання манаграфіі з'явіліся апублікаваныя партыйна-ўрадавыя дакументы, якія рэгулявалі музейнае будаўніцтва, кіраванне музейнай сеткай, вызначалі задачы і функцыі музеяў у разглядаемы перыяд. Гэта перш за ўсё нешматлікія пастановы ЦК КПСС (1964 і 1982 гг.), якія непасрэдна тычыліся дзейнасці музеяў; рэспубліканскія заканадаўчыя акты, такія, як Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978 г ); пастановы Савета Міністраў СССР і БССР розных гадоў па пытаннях арганізацыі аховы помнікаў гісторыі і культуры, а таксама пастанова Савета Міністраў СССР «Аб музейным фондзе Саюза ССР» (1965 г.).

У даследаванні былі выкарыстаны таксама нарматыўныя акты Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў і Міністэрства культуры БССР: загады, пастановы калегій, інструкцыі і г. д. Значны масіў гэтых дакументаў дае магчымасць, з аднаго боку, выявіць метады і формы ажыццяўлення пастаўленых дырэктыўнымі органамі задач, а з другога — атрымаць некаторае уяўленне аб выніках іх укаранення ў музейную практыку. Дыяпазон даследавання пашырае перапіска органаў кіравання культурай з Саветам Міністраў БССР, з Міністэрствам культуры СССР, Міністэрствам фінансаў БССР і іншымі міністэрствамі і ведамствамі. Усе гэтыя дакументы знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ).

Важнай крыніцай для ацэнкі музейнай практыкі з'яўляюцца стэнаграмы нарад музейных работнікаў, якія адбываліся па ініцыятыве Міністэрства культуры БССР, пасяджэнняў Праблемнай навуковай рады па пытаннях захавання, рэстаўрацыі і экспанавання музейных калекцый, гадавыя справаздачы аб рабоце музеяў, матэрыялы аглядаў работы музеяў да юбілейных дат, якія знаходзяцца ў Архіве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (Архіў МКРБ).

Акрамя таго, выкарыстоўваліся матэрыялы архіваў буйнейшых музейных устаноў краіны — Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (Архіў БДМГВАВ), Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (Архіў НММ РБ), Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (Архіў НМГіКБ), а таксама Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (Архіў НПГКМЗ), Лідскага краязнаўчага музея (Архіў ЛКМ) і некаторых іншых.

# Глава І
# МУЗЕІ Ў ГАДЫ ВАЙНЫ І ПЕРШАЕ ПАСЛЯВАЕННАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

Напярэдадні нападу нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз у БССР праводзілася рэарганізацыя і ўпарадкаванне музейнай сеткі, што было выклікана новым абласным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам. У рэспубліцы налічвалася 26 музеяў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Народнага камісарыята асветы[1]. Нягледзячы на замацаванне ў 1930-я гг. афіцыйных адносін да музея як да палітыка-прапагандысцкай установы і ў выніку гэтага страты часткі гісторыка-культурных каштоўнасцей, у фондасховішчах музеяў БССР захоўваліся дзясяткі тысяч першакласных твораў беларускага і замежнага мастацтва, рухомых помнікаў нацыянальнай гісторыі і прыроды.

Да ліку буйнейшых музейных устаноў рэспублікі ў той час адносіліся Мінскі абласны сацыяльна-гістарычны музей, Дзяржаўная мастацкая галерэя БССР, Віцебскі абласны сацыяльна-гістарычны музей, Гомельскі абласны гістарычны музей, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Баранавіцкі абласны мастацкі музей, Слонімскі музей і некаторыя іншыя.

У перадваенныя гады Наркамасветы БССР не меў планаў выратавання музейных каштоўнасцей у выпадку пагрозы іх знішчэння. У музеяў не было ні планаў пагрузкі, ні спісаў прадметаў, якія падлягалі першачарговай эвакуацыі, ні ўпаковачных матэрыялаў. Задачу захавання калекцый ва ўмовах пачаўшайся вайны супрацоўнікі кожнага музея выконвалі ў адпаведнасці са сваімі матэрыяльнымі магчымасцямі і маральна-этычнымі перакананнямі.

Па рашэнні ЦК УКП(б) і СНК СССР ад 24 чэрвеня 1941 г. пры СНК быў створаны Савет па эвакуацыі, які ў агульнадзяржаўным маштабе вызначаў тэрміны, парадак і чарговасць эвакуацыі прамысловых прадпрыемстваў, матэрыяльных, культурных каштоўнасцей і насельніцтва, а таксама пункты іх размяшчэння. На месцах функцыі яго ўпаўнаважаных выконвалі сакратары абкомаў і райкомаў партыі. Вываз музейнай маёмасці з раёнаў, да якіх набліжаўся фронт, праводзіўся адначасова з агульнай эвакуацыяй прамысловасці, матэрыяльных каштоўнасцей і насельніцтва. Эвакуацыя музеяў праводзілася галоўным чынам сіламі музейных работнікаў у адпаведнасці з распараджэннямі ўпаўнаважаных Савета па эвакуацыі. Гэта рабілася ў вялікай спешцы, што тлумачылася хуткім набліжэннем фронту.

У ліпені — жніўні 1941 г. з вялікімі цяжкасцямі, а ў асобных выпадках і з рызыкай для жыцця, пад нямецкай бамбёжкай была эвакуіравана частка калекцый двух абласных музеяў з усходу БССР. Першымі былі вывезены калекцыі Лідскага краязнаўчага музея, які напярэдадні вайны знаходзіўся яшчэ ў стадыі арганізацыі. Эвакуацыю здолеў арганізаваць дырэктар гэтага музея П. М. Свірыдаў, які загінуў разам з калекцыямі пад бамбёжкай у наваколлі Смаленска[2].

У цяжкім стане апынуўся Віцебскі абласны музей, дзе падрыхтоўка фондаў да эвакуацыі адбывалася ў вельмі сціслыя тэрміны — горад быў узяты немцамі ўжо 11 ліпеня 1941 г. Пад кіраўніцтвам дырэктара В. К. Зэйлерта частка калекцый абласнога музея была нагружана ў вагон разам з фондамі Мастацкай галерэі Ю. М. Пэна і адпраўлена ў Куйбышаў, а потым — у Саратаў. Музейныя каштоўнасці суправаждала навуковы супрацоўнік музея А. Х. Саламонік. Часу на пламбіроўку скрыняў з музейнымі прадметамі і складанне эвакуацыйнага вопісу з указаннем дакладнай колькасці адзінак не хапіла. Недахопам часу тлумачыцца і тое, што у Віцебску было пакінута каля 15 тыс. прадметаў калекцый абласнога музея, абсалютная большасць з якіх бяследна знікла. Гэта складала прыкладна палову ад агульнай колькасці яго фондавых збораў, у тым ліку багацейшую калекцыю фарфору, нумізматычную калекцыю, карціны. Засталіся ў Віцебску таксама зборы Антырэлігійнага музея, дзе захоўваліся бібліятэкі закрытых каталіцкіх кляштараў[3].

Больш падрабязна хацелася б спаніцца на эвакуацыі Гомельскага абласнога гістарычнага музея. З пачаткам вайны у памяшканні палаца Паскевіча размясціўся штаб Цэнтральнага фронту. Дэмантаж экспазіцыі, а таксама упакоўка прадметаў у скрыні адбывалася ў планавым парадку, без панікі, бо часу на гэту работу было дастаткова. Фондавыя калекцыі (4299 адз.) у саправаджэнні навуковай супрацоўніцы музея Э. Р. Чэчык былі вывезены спачатку ў Сталінград, а потым у г. Камышын Сталінградскай вобласці. Разам з калекцыямі ад'ехаў дырэктар музея С. Т. Антонаў[4]. Нягледзячы на добра арганізаваную работу па эвакуацыі, значная колькасць пераважна аб'ёмных прадметаў (3241 адз.) засталася ў палацы. Сярод таго, што не было вывезена, трэба ўзгадаць мэблю эпохі Рэнесансу, Людовіка XV і Людовіка XVI, скульптуры работы А. Кановы, К. Рауха, Дж. Дэль Норо, фарфоравыя вырабы расійскіх, нямецкіх, французскіх заводаў, калекцыю крышталю, мастацкую разьбу, больш ста партрэтаў на слановай косці работы Дж. Белоні і С. Маршалкевіча, дываны, мундзіры і калекцыю зброі Паскевічаў[5]. Дакументальных сведчанняў аб лёсе пакінутых у гомельскім палацы каштоўнасцей

няма, але з вялікай доляй верагоднасці можна казаць аб іх вывазе ў Германію.

Амаль цалкам загінулі ацалеўшыя пасля шматлікіх «перакідак» 1930-х гг. калекцыі Магілёўскага абласнога гістарычнага музея, будынак якога згарэў у першыя дні вайны. Трэба адзначыць, што ў згарэўшым будынку былі матэрыялы, прысвечаныя пераважна савецкаму перыяду. Найбольш важныя ў гісторыка-мастацкіх адносінах помнікі матэрыяльнай культуры засталіся ў старым будынку музея (былога земскага банка), у браніраваным пакоі-сейфе. Там змяшчаліся залаты і сярэбраны ключы Магілёва, дзве сярэбраныя пячаткі горада, залатыя ўпрыгажэнні і пліткі з выявамі, знойдзеныя пры раскопках Пампеі, сярэбраная булава караля Жыгімонта III, залатыя і сярэбраныя кубкі, крыжы, дараносіцы, кадзільніцы, іконы Бялыніцкай (XV ст.), Спаскай (1670 г.), Казанскай, Іверскай Божай Маці, святых Мікалая, Пятра і Паўла, аздобленыя каштоўнымі камянямі, карціны І. Айвазоўскага, В. Баравікоўскага, А. Вато, І. Рэпіна і іншых мастакоў. У ліпені 1941 г. разам з гэтымі каштоўнасцямі адсюль бясследна знікла нацыянальная каштоўнасць беларускага народа — крыж Ефрасінні Полацкай[6]. Агульная колькасць вывезеных і загінуўшых у Магілёве музейных прадметаў склала каля 5 тыс., у тым ліку калекцыі нумізматыкі, зброі (X-XIV стст.), беларускай драўлянай разьбы (XVI-XVIII стст.), мастацкага фарфору (XVIII-XIX стст.), а таксама вялікія прыродазнаўчыя калекцыі і гістарычная бібліятэка[7].

Музеі, якія знаходзіліся ў заходняй і цэнтральнай частках БССР, за невялікімі выключэннямі эвакуіраваць на паспелі. Значная частка іх фондавых калекцый загінула, былі разбураны будынкі, з'ехала на вёску альбо эвакуіравалася большасць музейных супрацоўнікаў. Выяўленнем і адпраўкай у Германію гэтых калекцый займалася Міністэрства па справах ўсходніх абласцей пад кіраўніцтвам А. Розенберга. «Айнзатцштаб» міністэрства раскінуў сетку сваіх аддзяленняў па ўсёй акупіраванай тэрыторыі СССР. Адно з іх знаходзілася ў Мінску. Загады «айнзатцштаба» выконвалі «айнзатцкаманды», якія рухаліся ўслед за вермахтам[8].

Найбольш цяжкі лёс напаткаў Дзяржаўную мастацкую галерэю БССР у Мінску. У першыя дні вайны кіраўніцтва галерэі на чале з дырэктарам М. П. Міхалапам з'ехала на ўсход. Беларускі пісьменнік Р. Д. Мурашка ўзгадвае: «Хутка пасля акупацыі Мінска спачатку другі паверх, а потым і ўвесь будынак галерэі быў заняты пад пастой для нямецкіх афіцэраў. У выніку гэтага тыдні праз два з яе сцен зніклі амаль усе карціны. Карціны, якія ўлазілі ў афіцэрскія чамаданы з рамкамі, здымаліся са сцен разам з імі. Калі ж памеры рамак не

дазвалялі гэтага зрабіць, лязом альбо нажом карціны выразаліся і адпраўляліся ў афіцэрскія чамаданы без рамак, рамкі ж заставаліся вісець на сцяне. Гэткі ж лёс напаткаў і скульптуру, творы народных майстроў. Усё, што можна было змясціць у афіцэрскіх чамаданах, аднойчы ў жніўні 1941 г. было нагружана ў вялічэзныя вайсковыя грузавыя машыны і ўвезена ў Германію»[9].

Толькі арганізавана ва Ўсходнюю Прусію з галерэі было вывезена каля 170 твораў рускага і заходнееўрапейскага мастацтва, сярод іх палотны І. Айвазоўскага, К. Брулова, В. Бялыніцкага-Бірулі, В. Васняцова, С. Канёнкава, П. Клодта, І. Крамскога, А. Куінджы, І. Левітана, Ф. Рушчыца, І. Рэпіна, В. Пярова, М. Урубеля, І. Шышкіна, М. Ярашэнкі і інш. Але найвялікшай стратай мастацкай галерэі першых тыдняў акупацыі быў вываз калекцыі слуцкіх паясоў, якая налічвала 48 адзінак[10]. Спробы мінскіх мастакоў А. Тычыны і В. Ціхановіча выратаваць гэтую калекцыю ад немцаў не далі плёну. З Дзяржаўнай мастацкай галерэі знікла каля 2 тыс. адзінак жывапісу, 1,5 тыс. адзінак графікі, 250 адзінак скульптуры і 2,5 тыс. твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва[11].

Вялікай стратай для беларускай культуры быў вываз у Германію усіх работ старэйшага тэатральнага мастака Беларусі О. Марыкса, экспанаваўшыхся ў чэрвені 1941 г. на яго персанальнай выставе ў памяшканні Саюза мастакоў БССР у Мінску[12].

Калекцыі Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея не ўратавала ад рабавання нават тое, што яны знаходзіліся ў складскім памяшканні (экспазіцыя музея, размешчаная ў былым Архірэйскім доме, распавядала аб дасягненнях сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР і змяшчала пераважна калійныя матэрыялы). Падчас хаосу першых тыдняў акупацыі музей рабаваў хто хацеў — большасць яго супрацоўнікаў эвакуіравалася. Затым ў Германію вывезлі 19 старажытных гармат, у тым ліку 16 — з нясвіжскага збору. Загадалі вывезці ў Венскі інстытут гебраістыкі карціны, кнігі, рукапісы, прадметы рэлігійнага культу, звязаныя з яўрэйскай культурай Беларусі, у тым ліку «Гадзіннікавага майстра» Ю. Пэна, партрэт Скарыны работы Я. Кругера, гравюры С. Юдовіна і інш. Адноўленым у Мінску праваслаўным цэрквам перадаваліся абразы і начынне былога царкоўна-археалагічнага музея[13].

Ужо летам 1941 г. пагроза поўнага знішчэння навісла над Заалагічным музеем БДУ. Яго памяшканне ў галоўным корпусе універсітэта было занята пад лазарэт. Загадчык музея дэкан біялагічнага факультэта БДУ Я. М. Зубковіч, дацэнт А. В. Вязовіч і прэпаратар-таксідэрміст А. К. Ціток рабілі ўсё магчымае, каб зберагчы унікальныя

калекцыі. Напрыканцы 1941 г. яны здолелі атрымаць ад нямецкіх улад дазвол на перавоз калекцый і абсталявання музея ў будынак былога яўрэйскага педтэхнікума. Акрамя Заалагічнага музея, вучоныя вывезлі туды частку універсітэцкай бібліятэкі і абсталяванне з некаторых факультэтаў. Пасля таго, як былі арыштаваны і пакараны смерцю ўдзельнікі мінскага падполля Я. М. Зубковіч і А. В. Вязовіч, адказнасць за захаванне музея лягла на плечы А. К. Цітка. Дзякуючы яго самаахвярнай працы захавалася каля трэцяй часткі фондавых калекцый Заалагічнага музея. Астатняе, у тым ліку багацейшая калекцыя паляўнічых трафеяў Радзівілаў з Нясвіжскага замка, было вывезена ў Германію або знішчана[14]. Такі ж лёс напаткаў геолагамінералагічны і гісторыка-археалагічны кабінеты БДУ[15].

Падчас акупацыі былі таксама знішчаны каштоўныя калекцыі, існаваўшыя пры кафедрах біялогіі, судовай медыцыны і нармальнай анатоміі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута[16].

Паводле паведамлення прэзідэнта Акадэміі навук БССР К. В. Горава, немецкія войскі знішчылі заалагічны музей Акадэміі, фонды якога да вайны змяшчалі «3 тыс. шт. млекакормячых, 4 тыс. шт. рэптылій і амфібій, рыб каля 1500 шт., малюскаў, лускакрылых звыш 200 тыс. шт., чучалы (зубра, мядзведзяў, кабаноў, касуль, рачных баброў і ішн.)»[17]. Часткова былі знішчаны, а часткова вывезены ў Германію таксама фонды геалагічнага музея Акадэміі навук.

З Баранавіцкага абласнога мастацкага музея акупанты вывезлі «Партрэт старога» Рэмбранта, работы Я. Матэйкі, каля 60 мініяцюр заходнееўрапейскіх мастакоў, беларускія абразы і драўляную скульптуру XVII-XVIII стст., французскі габелен XIV ст., японскія вазы, каля 160 статуэтак заводаў Заходняй Еўропы, больш 200 карцін савецкіх мастакоў, а таксама вялікую бібліятэку на гісторыі мастацтва.

З Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея ў Беласток, а потым у Германію было вывезена каля 200 прадметаў дэкаратыўнаприкладнога мастацтва, 4370 старажытных манет і медалёў, 626 кніг і 45 карцін. Акрамя таго, з Гродна забралі каля 20 асабістых рэчаў Э. Ажэшкі. Прыродазнаўчыя зборы С. П. Жыўны з рызыкай для жыцця здолеў схаваць ад немцаў су працоўнік музея А. К. Звяржэвіч.

З Пінскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея былі цалкам забраны аддзел нумізматыкі (каля 1100 адзінак), калекцыя шкла (123 адзінкі), дываны, мэбля, старажытная зброя, карціны (каля 150 адзінак), каля 140 тамоў рукапісных летапісаў Пінскага і Тураўскага княстваў, якія датаваліся XV-XVII стст.

Полацкі музей пазбавіўся партрэтнай галерэі дзеячаў дамініканскага ордэна (47 адзінак), пяці слуцкіх паясоў, дзвух рукапісных кніг XV і XVI стст., некалькіх дрэварытаў і абразоў.

Са Слонімскага музея вывезлі жывапіс XVI-XIX стст., мэблю, фарфор, дываны, зброю, сцягі, царкоўнае начынне, медалі, крыжы, пячаткі, старадрукі, этнаграфічную калекцыю.

З Беластоцкага абласнога мастацкага музея — творы жывапісу і скульптуры[18].

З Ваўкавыскага музея — старажытныя абразы, рукапісы, кнігі, карты[19].

Ад пападання нямецкай авіябомбы ў Дом-музей А. Міцкевіча загінулі ўсе яго экспанаты, у тым ліку насценны гадзіннік бацькі паэта, хустка яго нявесты Марылі, яе куфэрак, карціны XIX ст., а таксама невялікая нумізматычная калекцыя[20].

Увайшоўшы ў Бабруйскі музей, «...немцы разбілі скульптуры Леніна і Сталіна, чучала пеўня ўсталявалі на варотах бойні, бібліятэка выкарыстоўвалася ў гаспадарчых мэтах, а чучалы звяроў шэф па пушніне вывез у Германію»[21].

Гвалтоўны вываз і бессэнсоўнае знішчэнне калекцый беларускіх музеяў супярэчыла палітыцы заваёвы сімпатый мясцовага насельніцтва шляхам пэўных саступак у галіне культуры, якія праводзіліся генеральным камісарам Генеральнай акругі Беларусь В. Кубэ. 29 верасня 1941 г. у сваім лісце да А. Розенберга ён паведамляў аб сваім рашэнні высветліць нумары воінскіх часцей, афіцэры якіх вывезлі «каштоўнейшыя карціны і мэблю XVIII і XIX стагоддзяў, вазы, вырабы з мармуру, гадзіннікі і г. д.» і накласці на іх пакаранне. В. Кубэ прасіў Міністэрства па справах усходніх абласцей «зрабіць захады перад адказнымі вайсковымі ўстановамі з тым, каб у будучым падобнае знішчэнне было спынена, а вінаватыя падвяргаліся цяжкім пакараннем»[22]. Ён планаваў запрасіць з Берліна ў Мінск мастака для правядзення рэстаўрацыйных работ. У Генеральным камісарыяце была ўведзена пасада шэфа культурных устаноў (спачатку яе займаў нейкі Куртц, потым — ІПольц). Паралельна ў мінскай гарадской управе, якой кіраваў прафесар В. Л. Іваноўскі, былі створаны аддзел культуры і адукацыі, які па чарзе ўзначальвалі паэт У. Гуцька (Дудзіцкі) і дацэнт І. Жарскі. Тое, што засталося ад Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР, было падпарадкавана аддзелу мастацтва мінскай гарадской управы, якую ўзначальваў пісьменнік М. Ільінскі. Гэтыя асобы і вырашалі лёс беларускіх музеяў у гады акупацыі.

У акупіраваным Мінску адзіным цэнтрам захавання беларускай гісторыка-культурнай спадчыны быў гістарычны музей. Яго стан змя-

ніўся да лепшага напрыканцы жніўня 1941 г. пасля прызначэння «кіраўніком» музея настаўніка А. А. Шукелойця, а мастаком-рэстаўратарам — Г. С. Віера (апошні займаў гэтую пасаду і да вайны). Штатным супрацоўнікам дапамагала мінская вучнёўская моладзь. На працягу 1941-1944 гг. пры дапамозе вядомага скульптара і педагога М. А. Керзіна яны праводзілі элементарныя кансервацыйныя, рэстаўрацыйныя і ўліковыя работы. Сярод іншага, Г. С. Віер адрэстаўраваў абраз Мінскай Божай Маці. Сталай экспазіцыі ў Мінскім гістарычным музеі створана не было, але ладзіліся часовыя выставы, прысвечаныя беларускаму іканапісу, народнаму мастацтву, прыгожаму пісьменству[23].

У кастрычніку 1942 г. пад кіраўніцтвам вядомага паэта і краязнаўцы С. М. Новіка-Пяюна (займаў пасаду дырэктара з 1940 г.) ўзнавіў сваю работу Слонімскі музей, дзе асноўны акцэнт рабіўся на адукацыйна-асветніцкай дзейнасці. У сціслыя тэрміны па аснове захаваўшыхся калекцый і новых паступленняў была праведзена рээкспазіцыя. Цяпер яна структурна складалася з чатырох раздзелаў. Першыя два дэманстравалі матэрыялы археалагічных раскопак на Слонімшчыне, трэці раздзел быў прысвечаны беларускай этнаграфіі і гісторыі кнігадрукавання, чацвёрты — нацыянальнаму адраджэнню. У экспазіцыі меліся два тэматычныя комплексы, прысвечаныя Ф. Скарыце і М. К. Агінскаму. Музей карыстаўся папулярнасцю сярод мясцовага насельніцтва. За першыя 9 месяцаў яго работы экспазіцыю аглядзела больш 3 тыс. чалавек, якія мелі магчымасць пакідаць свае ўражанні ў кнізе водгукаў[24].

З лета 1942 г. зноў адкрыў сваю экспазіцыю Баранавіцкі мастацкі музей. Там можна было ўбачыць вялікую калекцыю касцельнай драўлянай скульптуры XVI-XVII стст., а таксама работы сучасных беларускіх мастакоў[25]. 20 красавіка 1942 г., у дзень параджэння Гітлера, адкрыў свае дзверы для наведвальнікаў Палескі музей у Пінску[26].

У лютым 1944 г. у складзе Беларускага культурнага згуртавання пры Беларускай Цэнтральнай Радзе ў Мінску быў створаны аддзел краязнаўства і музеяў, які ўзначаліў А. А. Шукелойць[27]. Загадам генеральнага камісара Мінскі гістарычны музей перадаваўся ў падпарадкаванне Рады. Але з наступленнем Савецкай Арміі ўжо ў чэрвені 1944 г. дзейнасць Беларускай Цэнтральнай Рады была спынена, таму аддзел краязнаўства і музеяў не паспеў разгарнуць сваю дзейнасць.

Па-свойму склаўся лёс Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні, які паводле новага акупацыйнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу апынуўся на тэрыторыі

Генеральнай акругі Літва. Музей, фондавыя калекцыі якога напярэдадні акупацыі налічвалі 13,5 тыс. адзінак захоўвання, быў выведзены з сістэмы Акадэміі навук і падпарадкаваны дэпартаменту навукі і мастацтва пры ўпраўленні асветы. У гэтых умовах новы дырэктар музея — вядомы беларускі грамадскі і культурны дзеяч І. І. Шутовіч пераважна праводзіў работы па сістэматызацыі і вывучэнню калекцый. У пачатку 1944 г. нямецкія акупацыйныя ўлады загадалі І. І. Шутовічу вызваліць Базыліянскія муры, дзе знаходзіўся музей, і перавезці яго калекцыі ў Мастацкі інстытут. Каб ўратаваць найбольш каштоўныя прадметы ад вывазу, было вырашана схаваць іх у скляпеннях касцёла св. Міхала пад наглядам беларускага рэлігійнага дзеяча і вучонага ксяндза А. В. Станкевіча. Але гэтая мера перасцярогі была лішняй — адступленне нямецкіх войск з Вільні было настолькі паспешлівым, што нават думаць пра вываз культурных каштоўнасцей немцам не выпадала. Такім чынам, перыяд нямецкай акупацыі гэты музей перажыў амаль без страт[28].

Пасля ўсталявання ў Вільні ў ліпені 1944 г. савецкай улады СНК Літоўскай ССР ухваліў рашэнне аб ліквідацыі музея і падзеле яго калекцый паміж Літоўскай ССР і Беларускай ССР. Спецыяльна створаная ліквідацыйная камісія, якая працавала да сярэдзіны чэрвеня 1945 г., перадала лепшыя калекцыі, у тым ліку відавочна беларускія матэрыялы, у Гісторыка-этнаграфічны музей АН Літоўскай ССР і яго філіялы, Літоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут, а таксама ў бібліятэкі Віленскага універсітэта і АН Літоўскай ССР. У апошняй быў нават створаны спецыяльны беларускі фонд, які складаўся з перададзеных матэрыялаў. Невялікая колькасць гісторыка-мастацкіх помнікаў меншай вартасці была падзелена паміж Дзяржаўным мастацкім музеем БССР і Дзяржаўным музеем БССР. Нешматлікія дакументы, малюнкі і кнігі мы сёння знаходзім у Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Дзяржаўным архіве кінафотадакументаў, а таксама Фундаментальнай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі[29].

У чэрвені 1944 г. з міністэрства па справах усходніх абласцей паступіў загад аб эвакуацыя фондаў Мінскага гістарычнага музея. Спачатку іх прывезлі ў г. Істэнбург (Прусія), а затым у замак Хёхштэдт (Баварыя), дзе знаходзіліся культурныя каштоўнасці, нарабаваныя ў Расіі, Украіне, Польшчы. Вываз Мінскага музея ажыццяўляўся пад наглядам немкі Э. Гаўпт. Адчуваючы ўласную адказнасць за лёс калекцый, іх суправаджаў А. А. Шукелойць. Нямецкія ўлады адмовілі яму ў праве назіраць за іх захаваннем. Тады, каб быць бліжэй да

калекцый, ён уладкаваўся працаваць конюхам у фальварак паблізу замка. Пакінуў А. А. Шукелойць калекцыі Мінскага гістарычнага музея толькі пасля таго, як прадстаўнік амерыканскай акупацыйнай адміністрацыі паведаміў яму пра заключэнне пагаднення з савецкім бокам аб вяртанні хёхштэдтскіх скарбаў у краіны Ўсходняй Еўропы.

У 1945 г. Хёхштэдт быў акупіраваны амерыканскай арміяй. Калі амерыканцы знайшлі ў замку склады нарабаваных немцамі ўсходнееўрапейскіх каштоўнасцей, то шмат з іх было значка пашкоджана. З карцін і абразоў асыпалася фарба, дрэва і мармур скульптур атрымалі драпіны, зломы. Да таго ж помнікі з розных музеяў захоўваліся разам, што ўскладняла высвятленне іх дзяржаўнай прыналежнасці. Хутка пасля амерыканцаў у Хёхштэдтскі замак прыбыла спецыяльная савецкая місія з мэтай дастаўкі ў СССР нарабаванага.

У кастрычніку 1947 г. забраныя з Хёхштэдта беларускія музейныя калекцыі, пагружаныя ў 182 скрыні, прыняў ва Ўсходнім порце Берліна ад прадстаўніка савецкай вайсковай адміністрацыі ўпаўнаважаны Савета Міністраў БССР. У скрынях змяшчалася частка мастацкіх твораў з Дзяржаўнай мастацкай галерэі (у тым ліку звыш 50 радзівілаўскіх партрэтаў, значная колькасць работ беларускіх мастакоў 1920 1930-х гг., калекцыя абразоў), царкоўнае начынне XVII-XVIII стст., калекцыя старажытнай зброі, археалагічная калекцыя (з Мінскага гістарычнага музея і Акадэміі навук), вялікая калекцыя этнаграфічнага матэрыялу, калекцыя беларускага культавага разбярства XVII XVIII стст., прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з фарфору і бронзы, старажытная мэбля, цэхавыя сцягі і вырабы, каля 30 рукапісных кніг XVII-XVIII стст., больш 100 старадрукаў, у тым ліку супрасльскія і куцеінскія выданні[30].

Савецкая ваенная адміністрацыя ў Германіі вярнула БССР каля 15 тыс. музейных прадметаў, якія былі размеркаваны па захаванне ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай айчыннай вайны, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей і Акадэмію навук БССР[31]. Акрамя таго, вясной 1945 г. савецкія войскі знайшлі ў Кёнігсбергу і перадалі ў Мінск частку вывезенай з Мастацкай галерэі нясвіжскай калекцыі карцін.

Паводле акта Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, якая выяўляла памеры страт СССР у перыяд з 1941 па 1944 г., у БССР было разрабавана 11 музеяў. У Музеі рэвалюцыі, Доме-музеі I з'езда РСДРП і Мемарыяльным музеі А. Міцкевіча акупанты знішчылі будынкі. Шкода, панесеная ад страты будынкаў і калекцый, была вызначана камісіяй ў 317 млн. рублёў[32]. Аднак гэтыя лічбы, безумоўна, не поўныя. Як

вядома, перад пачаткам вайны ў БССР існавала 26 музеяў, і падчас акупацыі ў большай ці меншай ступені пацярпеў кожны з іх.

Яшчэ ў 1944 г. урадам БССР і абласным кіраўніцтвам рэспублікі былі выдадзены пастановы аб ўзнаўленні работы абласных музеяў у Гомелі і Віцебску. Асновай іх павінны былі стаць калекцыі, рээвакуіраваныя з РСФСР. У жніўні 1945 г. намеснік дырэктара Віцебскага абласнога музея М. І. Папова даставіла з Саратава 27 889 музейных прадметаў. Прыкладна ў той жа час былі знойдзены фрагменты калекцый музея ў Рызе (1099 адз.) і ў Віцебску (1559 адз.)[33]. Летам 1946 г. Сталінградам абласным музеем былі вернуты БССР гомельскія калекцыі ў складзе 3800 адзінак. На жаль, 96 з іх (прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, побытавыя рэчы, фалерыстыка) з эвакуацыі не вярнулася[34].

У выніку вайны і акупацыі Беларусь панесла вялікія культурныя страты. Вермахт і нямецкая цывільная адміністрацыя свядома парушалі прынцыпы і патрабаванні, выкладзеныя ў артыкуле № 56 Гаагскай канвенцыі 1907 г., аб законах і звычаях сухапутнай вайны, нягледзячы на тое, што Германія была адной з падпісаўшых яе краін. У гэтым артыкуле сцвярджалася: «Уласнасць грамады, установ царкоўных, дабрачынных, мастацкіх і навуковых, нават належаных дзяржаве, мае статус прыватнай уласнасці. Любы свядомы захоп, знішчэнне або пашкоджанне падобных установ, гістарычных помнікаў, твораў мастацтва і навукі забараняюцца і павінны падлягаць пераследу»[35]. Між тым, рабаўніцтва гістарычных і мастацкіх каштоўнасцей на акупіраваных усходніх тэрыторыях праводзілася нацыстамі ў вялікіх маштабах і па спецыяльна распрацаванаму плану. Толькі пералік нарабаваных падчас другой сусветнай вайны культурных каштоўнасцей, прадстаўлены на Нюрнбергскім працэсе ў выглядзе каталога, склаў 39 тамоў.

Вынікі намаганняў цывільнай адміністрацыі па абароне беларускай гісторыка-культурнай спадчыны і наладжванні музейнай справы былі вельмі сціплыя, бо яны супярэчылі агульнай культурнай палітыцы нацысцкага кіраўніцтва. Частка даваеннага музейнага фонду БССР ацалела ў віхуры вайны дзякуючы самаахвярнай працы музейных работнікаў — тых, хто ў цяжкіх умовах і нават з рызыкай для жыцця эвакуіравалі калекцыі сваіх музеяў на ўсход, захоўвалі іх на акупіраванай тэрыторыі, расшуквалі і вярталі на радзіму.

Неабходнасць аднаўлення і вяртання да жыцця музеяў БССР ва ўмовах пасляваенных цяжкасцей перш за ўсё патрабавала правядзення шэрагу мерапрыемстваў адміністрацыйна-кіраўнічага і мета-

дычнага характару. Перш за ўсё гэта тычылася аднаўлення органаў кіраўніцтва музейнай справай ў маштабах рэспублікі.

Як вядома, з 1918 па люты 1945 г. кіраўніцтва музеямі БССР ажыццяўляў Народны камісарыят асветы. Згодна з пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 15 мая 1945 г. для ўзмацнення кіраўніцтва культурна-асветніцкай работай у рэспубліцы быў створаны Камітэт па справах культурна-асветніцкіх устаноў пры СНК (з сакавіка 1946 г. — Савеце Міністраў) БССР. Пры выканкомах абласных і гарадскіх Саветаў народных дэпутатаў таксама існавалі аддзелы культурна-асветніцкай работы, а пры райвыканкомах уводзіўся штат інструктараў. У складзе Камітэта з'явілася ўпраўленне музеяў і паркаў. У 1948 г. яно было пашырана за кошт увядзення ў яго склад аддзела ўліку, аховы і рэстаўрацыі археалагічных і гістарычных помнікаў і адпаведна атрымала назву ўпраўлення музеяў, уліку, аховы і рэстаўрацыі археалагічных і гістарычных помнікаў. У падпарадкаванні гэтага ўпраўлення цяпер знаходзіліся музеі, якія раней падпарадкоўваліся Народнаму камісарыяту асветы. Гэтым актам быў канчаткова аформлены перавод асноўнай масы музеяў рэспублікі ў сістэму культурна-асветніцкіх устаноў, якімі яны па сутнасці з'яўляліся з 1930-х гг. Дзяржаўная карцінная галерэя БССР адносілася да кампетэнцыі Упраўлення (з 1949 г. Камітэта) па справах мастацтваў пры Савеце міністраў БССР. Апарат упраўлення музеяў быў нешматлікі. Акрамя начальнікаў упраўлення і аддзела помнікаў у штатным раскладзе значыліся 4 інспектары. На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя упраўленне музеяў узначальваў У. Л. Вяшокоў[I] — спецыяліст з вялікім арганізацыйна-кіраўнічым музейным вопытам.

У 1953 г. у працэсе рэарганізацыі і ўзбуйнення кіраўніцкага апарату былі зроблены змены і ў кіраўніцтве ўстановамі культуры. Пасля аб'яднання Міністэрства кінематаграфіі, Упраўлення па справах паліграфіі і выдавецтваў, Камітэтаў па справах культурна-асветніцкіх устаноў і па справах мастацтва было створана Міністэрства культуры БССР з асобным аддзелам музеяў і помнікаў у складзе ўпраўлення культурна-асветніцкай работы, у падпарадкаванне якога перайшлі ўсе музеі былога Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў. У 1959 г. падчас чарговай рэарганізацыі апарату Міністэрства культуры мастацкія музеі былі зноў выдзелены ў самастойную

[I] Вяшокоў Уладзімір Леанідавіч (1903-1962) музейны дзеяч, адзін з арганізатараў краязнаўчага руху на Магілёўшчыне. Нарадзіўся ў Іркуцку ў сям'і афіцэра, у 15-гадовым узросце ўступіў у ВКП(б), удзельнік грамадзянскай вайны, у 1921 1924 гг. удзельнічаў у работах па электрыфікацыі БССР. З 1924 па 1932 г. узначальваў Магілёўскае аддзяленне БДМ, у 1932 1941гг. Дом тэхнікі ў Мінску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 па 1954 г. працаваў начальнікам упраўлення музеяў, уліку, аховы і рэстаўрацыі археалагічных і гістарычных помнікаў Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў. З 1955 г, па стапу здароўя на пенсіі.

групу і перададзены ў падпарадкаванне упраўлення па справах мастацтва. На месцах яны знаходзіліся ў падпарадкаванні органаў культуры выканаўчых камітэтаў Саветаў абласных і раённых народных дэпутатаў. У выніку склалася арганізацыя кіравання музеямі сістэмы Міністэрства культуры, якая дзейнічала да канца разглядаемага перыяду.

У музейнай дзейнасці Міністэрства культуры вырашала наступныя задачы:

1) распрацоўка і ажыццяўленне мерапрыемстваў для паляпшэння дзейнасці музеяў;

2) павышэнне іх ролі ў камуністычным выхаванні працоўных, забеспячэнне высокаідэйнай навукова-даследчыцкай і навукова-асветніцкай работы;

3) вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне вопыту музейнай работы.

Арганізацыя планавання, кантроль за дзейнасцю музеяў, падбор кадраў, арганізацыя іх вучобы, падрыхтоўка канферэнцый, семінараў, распрацоўка нарматываў, давядзенне да мясцовых органаў культуры і музеяў рашэнняў вышэйстаячых арганізацый — вось няпоўны пералік кола музейнай дзейнасці міністэрства.

У сакавіку 1945 г. у Мінску адбыўся семінар музейных работнікаў, на якім абмяркоўваўся стан беларускіх музеяў падчас вайны і асноўныя задачы музейнага будаўніцтва. Па выніках работы семінара ў тым жа, 1945 г., Наркамасветы БССР распрацаваў першы ў пасляваенны час нарматыўны дакумент у галіне музейнай справы — «Тыпавое палажэнне аб музеях Беларускай ССР, якія знаходзяцца на мясцовым бюджэце»[36] (абласнога і раённага падпарадкавання). У названым палажэнні музей вызначаўся як «палітыка-асветніцкая і навукова-даследчая ўстанова», у задачу якой уваходзіць ахова ўсіх помнікаў у межах тэрыторыі яе дзеяння. Акрамя бюджэтных асігнаванняў музеям дазвалялася мець уласныя спецсродкі, якія фарміраваліся за кошт арэнднай платы, ліквідацыі немузейнай маёмасці, уваходнай платы, продажу кніжнай, сувенірнай прадукцыі і г. д. Апошні пункт палажэння дазваляў «згортванне або часовае перамяшчэнне музеяў» толькі з дазволу СНК БССР.

Ва ўмовах адсутнасці ў БССР спецыяльнага музейнага заканадаўства палажэнне закладала юрыдычна-прававыя асновы практычнай дзейнасці па аднаўленні музейнай сеткі рэспублікі. Важным было замацаванне за музеем статуса не толькі прапагандысцкай, але і навукова-даследчай установы, у абавязкі якой уваходзіла ахова і збіранне ўсяго комплексу рухомай і нерухомай спадчыны ў

вызначаным рэгіёне. Палажэнне вызначала фінансава-эканамічныя асновы работы музеяў, у прыватнасці, дазваляла мець уласныя спецсродкі. Ва ўмовах, калі большая частка музеяў атрымлівала ад дзяржавы толькі мізэрныя сумы на заробак для супрацоўнікаў і бягучыя гаспадарчыя патрэбы, дадатковая крыніца фінансавання дазваляла разгортваць іншыя напрамкі дзейнасці. Цяжка перааацаніць важнасць апошняга пункту для забеспячэння матэрыяльна-тэхнічнай базы музейнай дзейнасці, прымаючы пад увагу няпростыя адносіны паміж краязнаўчымі музеямі і мясцовымі ўладамі, якія склаліся на працягу 1930-х гг.

У ліпені 1947 г. Камітэтам па справах культурна-асветніцкіх устаноў быў праведзены семінар дырэктараў музеяў БССР, прысвечаны праблемам перыядызацыі і экспазіцыйнага паказу савецкага перыяду гісторыі Беларусі ў краязнаўчых музеях. У выступленнях удзельнікаў семінара прагучала шмат крытычных выказванняў не толькі ў адрас музеяў, але і адносна стану краязнаўчай работы ў цэлым. Шмат з іх было выкарыстана супрацоўнікамі Упраўлення музеяў пры падрыхтоўцы праекта пастановы ЦК КП(б)Б «Аб паляпшэнні работы музеяў і разгортванні краязнаўства ў Беларусі» у 1947 г[37]. У праекце, у прыватнасці, канстатавалася: «Шырокая краязнаўчая работа ў рэспубліцы фактычна адсутнічае. Абласныя і раённыя планавыя камісіі нічога не робяць для арганізацыі краязнаўчых даследаванняў па вывучэнню абласцей і раёнаў. Навуковыя установы не маюць ніякай краязнаўчай карэспандэнцкай сеткі. У сістэме Міністэрства асветы на краязнаўства забыліся ўвогуле, у сувязі з чым большасць настаўнікаў не ў стане правесці элементарных краязнаўчых даследаванняў»[38].

Акрамя складанасцей з разгортваннем краязнаўчага руху, у праекце пастановы пералічваліся з'явы, якія, на думку яе аўтараў, у найбольшай ступені перашкаджалі аднаўленню музейнай сеткі рэспублікі. Да іх адносіліся:

1) адсутнасць у большасці музеяў адпаведных памяшканняў (шмат будынкаў, якія належалі музеям да вайны, было захоплена іншымі арганізацыямі, а ва ўжо адноўленых Віцебскага, Бабруйскага і Пінскага музеяў мясцовыя ўлады забралі пад свае патрэбы частку плошчаў);

2) кадравая праблема (аб'ектыўныя цяжкасці, выкліканыя чалавечымі стратамі падчас вайны, ўскладняліся практыкай партыйных і савецкіх органаў улады, якія накіроўвалі на работу ў музеі «праваліўшыхся» на адказных пасадах людзей);

3) нізкая якасць музейных экспазіцый (перш за ўсё крытыка тычылася гісторыі савецкага грамадства, якое «паказана ўбога і

сумна, на плоскасным матэрыяле, у сувязі з чым значна прайграе ў параўнанні з папярэднімі грамадска-эканамічнымі фармацыямі»)[39].

У заключэнні праекта пастановы прапаноўвалася ўзнавіць існаваўшыя да вайны абласныя краязнаўчыя арганізацыі, Цэнтральны Дом тэхнікі як Рэспубліканскі політэхнічны музей, Беларускі дзяржаўны музей, стварыць на гістарычным і біялагічным факультэтах БДУ кафедры музеязнаўства па падрыхтоўцы прафесійных кадраў. Трэба адзначыць, што калі «музейныя» прапановы ў праекце пастановы былі цалкам рэалістычныя і ў выніку рэалізацыі паспрыялі б хутчэйшаму развіццю музейнай справы Беларусі, то прапанова адраджэння даваеннай краязнаўчай сеткі ва ўмовах жорсткага ідэалагічнага дыктату і ўспрымання краязнаўства выключна як сродку паскарэння гаспадарчага развіцця была ў прынцыпе нерэалістычнай.

У адрозненне ад пастановы ЦК КП(б)Б «Аб паляпшэнні работы музеяў і разгортванні краязнаўчага руху ў Беларусі», якая ўзнімала комплекс праблем матэрыяльнага і арганізацыйнага-метадычнага характару, вышэйшая выканаўчая ўлада БССР звярнула ўвагу толькі на неабходнасць паляпшэння экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі падзей савецкай гісторыі. У тым жа 1947 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб мерапрыемствах па паляпшэнні паказу сацыялістычнага будаўніцтва ў музеях БССР»[40], якая перад краязнаўчымі музеямі ставіла задачу арганізаваць мэтанакіраванае, комплекснае камплектаванне фондаў матэрыяламі па сацыялістычнаму будаўніцтву, пераважна рэчавага характару. Дзеля гэтага ўсе міністэрствы, ведамствы і выканкомы абавязваліся бясплатна перадаваць у музеі «якасна выкананыя экспанаты, якія характарызуюць гісторыю прадпрыемстваў, узнаўленне народнай гаспадаркі, культуры, асноўныя і новыя віды прадукцыі, мадэліраваныя схемы тэхналагічных працэсаў, мадэлі і макеты станкоў, рацыяналізатарскіх прапаноў, вынаходніцтваў, прыстасаванняў, фотаздымкі, дакументы, дыяграмы»[41]. Для папаўнення калекцый творамі мастацтва, якія адлюстроўвалі дадзеную тэматыку, у Камітэце па справах культурна-асветніцкіх устаноў засноўваўся цэнтральны закупачны фонд. Акрамя таго, з мэтай накаплення матэрыялаў, якія адлюстроўвалі сацыялістычнае будаўніцтва, на буйных прадпрыемствах і ў калгасах ствараліся музеі і музейныя куткі.

Такім чынам, была абвешчана дзяржаўная рэспубліканская праграма камплектавання фондавых калекцый беларускіх музеяў

матэрыяламі па сучаснасці[I]. Калі ўзяць пад увагу, што раней фонды краязнаўчых музеяў папаўняліся падобнымі матэрыяламі пераважна ў выглядзе юбілейных падарункаў, фотаздымкаў і плакатаў, то ініцыятыву Савета Міністраў трэба ацаніць як значны крок наперад у справе стварэння дзяржаўнага музейнага фонду. Галоўным недахопам гэтай праграмы была яе ідэалагічная афарбоўка, якая выключала з поля зроку супрацоўнікаў музеяў розныя аспекты развіцця тагачаснага беларускага грамадства, перш за ўсё паўсядзённага жыцця людзей.

Пастановай Савета Міністраў СССР «Аб мерах паляпшэння аховы помнікаў культуры»[42], прынятай у 1948 г., функцыі аддзела музеяў былі пашыраны за кошт уключэння ў сферу яго дзейнасці нерухомых помнікаў. З гэтага часу аддзел музеяў адказваў за ўлік, рэстаўрацыю і іншыя ахоўныя мерапрыемствы ўсяго комплексу нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. У адным з раздзелаў пастановы сцвярджалася, што дзяржаўныя музеі з'яўляюцца асноўнымі сховішчамі калекцый помнікаў культуры. Такая ацэнка была надзвычай важнай ва ўмовах, калі музей разглядаўся як палітыка-асветніцкая ўстанова. Яна нагадвала, што першы абавязак музея — захаванне гісторыка-культурных рэліквій і прыродных аб'ектаў, а таксама давала надзею, што помнікі, выціснутыя з экспазіцый у 1930-я гг., зноў зоймуць у іх належнае месца.

Вынікам пастановы 1948 г. была распрацоўка метадычнага забеспячэння і стандартызацыі фондавай работы. Гэтым пытанням быў прысвечаны семінар супрацоўнікаў музеяў БССР, які адбыўся ў 1952 г.[43] На ім была распрацавана і ўхвалена інструкцыя, якая прадугледжвала тры этапы дзяржаўнага ўліку музейных каштоўнасцей: 1) дзяржаўная рэгістрацыя; 2) дзяржаўная інвентарызацыя (улік); 3) навуковая каталагізацыя. У асобную групу вылучаліся прадметы з каштоўных металаў, удакладняліся паняцці асноўнага і абменнага фондаў, што павышала пачуццё адказнасці супрацоўнікаў музеяў за захаванне помнікаў. Уводзіліся інвентарныя кнігі адзінага ўзору, якія з'яўляліся дзяржаўным дакументам, і пашпарты на прадметы калекцый.

Паралельна з пытаннямі фондавай работы на мяжы 1940-1950-х гг. пачынаецца абмеркаванне методыкі пабудовы гістарычных экспазіцый. У 1954 г. Міністэрства культуры БССР ужо ў выглядзе загада патрабавала праводзіць гэту работу, абапіраючыся на аўтэнтычныя

---

[I] Сёння падобная праграма рэалізавана і дзейнічае ў дзяржаўным маштабе пад назвай «SAMDOC» толькі ў адінай краіне — Швецыі.

помнікі, з улікам рэгіянальнай спецыфікі і па загадзя складзеных таматыка-экспазіцыйных планах. Аднак асноўныя намаганні ў арганізацыі і кіраванні музейнай справай былі нацэлены на хутчэйшую пабудову экспазіцыйных раздзелаў, прысвечаных гісторыі савецкага грамадства. Уяўленне аб іх змесце можа даць пералік тэм, абавязковых для экспазіцыйнага адлюстравання ў музеях рэспублікі ў 1950-1951 гг.: «Прапаганда барацьбы за мір», «Дасягненні ў фізкультуры і спорце», «Жанчыны — вялікая сіла», «Павышэнне вытворчасці рыбных прудоў», «Перадавы вопыт трактарных брыгад», «Выкарыстанне прамысловых адходаў для ўгнаенняў у падшэфных калгасах».

Другім прыярытэтным напрамкам работы было павелічэнне аб'ёмаў асветніцкай (чытай прапагандыскай) дзейнасці музеяў.

Хуткі колькасны рост краязнаўчых музеяў вымагаў забеспячэння арганізацыйных і юрыдычных асноў іх дзейнасці. Гэту задачу павінна было вырашыць «Палажэнне аб раённым краязнаўчым музеі», прынятае Міністэрствам культуры БССР ў маі 1954 г.[44] Дадзенае палажэнне замацавала за раённымі краязнаўчымі музеямі статус культурна-асветніцкіх устаноў. Разам з тым яно патрабавала ад раённых музеяў «усебаковага вывучэння раёна, збірання і паказу музейных матэрыялаў» — гэта значыць тых работ, правядзенне якіх патрабавала ад супрацоўнікаў навуковай кваліфікацыі[I].

Важным было вызначэнне структуры краязнаўчых музеяў, якая складалася з трох экспазіцыйных аддзелаў: прыроды, дарэвалюцыйнага мінулага, савецкага перыяду. У апошнім, найбольш важным аддзеле, прадугледжвалася дэманстрацыя матэрыялаў ад падрыхтоўкі Кастрычніцкай рэвалюцыі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, а таксама паказ дасягненняў апошніх гадоў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, культуры і г. д. Акрамя вышэйназваных краязнаўчы музей павінен быў мець аддзел фондаў, бібліятэку, навуковы архіў, фоталабараторыю, дапаможныя кабінеты, майстэрні, у тым ліку рэстаўрацыйныя. Пры наяўнасці калекцый музеі атрымалі права ствараць самастойныя экспазіцыйныя аддзелы — мастацкія, літаратурныя і інш.

Акрамя структуры, палажэнне вызначала сістэму кіраўніцтва краязнаўчым музеем. На чале яго стаяў дырэктар, якога прызначаў раённы аддзел культуры. Па прадстаўленню дырэктара раённы аддзел зацвярджаў кандыдата на другую па значнасці пасаду ў музеі — загадчыка фондамі. Пры дырэктары музея дзейнічаў дарадчы орган у

---

[I] Характэрна, што «Палажэнне аб абласным, краявым, рэспубліканскім краязнаўчым музеі», распрацаванае і прынятае Міністэрствам культуры РСФСР у 1948 г. і выкарыстанае ў якасці ўзору ў Мінску, вызначала музей перш за ўсё як «навукова-даследчую» і толькі ў другую чаргу як «культурна-асветніцкую» ўстанову.

выглядзе музейна-краязнаўчага савета, у склад якога акрамя навуковых супрацоўнікаў музея ўваходзілі прадстаўнікі мясцовых партыйных, савецкіх і гаспадарчых устаноў. Знешне стварэнне музейна-краязнаўчых саветаў выглядала як дэмакратызацыя кіраўніцтва работай краязнаўчых музеяў. Аднак, улічваючы іх склад і непрацяглую практыку дзейнасці, саветы з'яўляліся ў большай ступені органамі цэнзуры і рэгламентацыі музейнай работы.

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе было адзначана шэрагам выпадкаў пагардлівых, фармальных адносін партыйных і савецкіх органаў улады да краязнаўчых музеяў. Рэакцыяй Міністэрства культуры БССР на гэта былі пункты палажэння, якія забаранялі ліквідацыю музеяў, іх перамяшчэнне з займаемых памяшканняў, а таксама перадачу ў іншыя рукі прадметаў фондавых калекцый без спецыяльнага дазволу Савета Міністраў БССР.

«Палажэнне аб раённым краязнаўчым музеі» аказала дваісты ўплыў на развіццё музейна-краязнаўчага руху. З аднаго боку, важна адзначыць у ім яскрава акрэслены ахоўны аспект, што павышала статус музея як сацыяльнага інстытута і забяспечвала захаванне калекцый. З другога боку, палажэнне абумовіла з'яўленне аднабаковых, стандартных экспазіцый, якія адразу яе узгадваюцца і сёння, калі гутарка ідзе аб краязнаўчых музеях. Стандартная структура была вельмі зручнай для кіраўнічага апарату пры правядзенні разнастайных праверак і інспекцый. Акрамя таго, разглядаючы мясцовыя краязнаўчыя музеі як ідэалагічныя установы, аўтары палажэння асобным пунктам увялі цэнзураванне ўсіх новых экспазіцый — практыку, якая захоўвалася да канца разглядаемага перыяду.

Асноўным дакументам, якім кіраваліся адміністрацыйна-кіраўнічыя структуры ўлады, вырашаючы практычную задачу ўзнаўлення і развіцця музеяў у першыя пасляваенныя гады, стаў Закон «Аб пяцігадовым плане ўзнаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР», прыняты Вярхоўным Саветам СССР ў сакавіку 1946 г., аднолькава абавязковы як для вытворчай, так і для невытворчай сферы народнай гаспадаркі. Вызначаная ў ім задача дасягнення і павелічэння па ўсіх паказчыках даваеннага ўзроўню патрабавала перш за ўсё ўзнаўлення музейнай сеткі з тым, каб забяспечыць асноўную для таго часу сацыяльную функцыю музея — правядзенне культурна-асветніцкай работы.

Яшчэ да прыняцця пяцігадовага плана Народны камісарыят асветы распрацаваў план практычных мерапрыемстваў на бліжэйшы год па узнаўленню музейнай сеткі, адпаведна якому гэтыя работы трэба было праводзіць па наступнаму графіку: III квартал 1944 г. —

Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі абласныя музеі, IV квартал 1944 г. — Гродзенскі, Пінскі, Брэсцкі абласныя музеі, I квартал 1945 г. — Музей рэвалюцыі БССР, Мемарыяльны музей А. Міцкевіча, Бабруйскі абласны музей, II квартал 1945 г. — Баранавіцкі, Полацкі, Палескі абласныя музеі, III квартал 1945 г. — Барысаўскі, Тураўскі, Слонімскі, Ваўкавыскі раённыя краязнаўчыя музеі.

Такім чынам, паводле плана Наркамасветы на працягу года трэба было ўзнавіць дзейнасць гісторыка-краязнаўчых музеяў ва ўсіх абласных цэнтрах[I] за выключэннем Маладзечна (адсутнасць у плане Мінска цалкам зразумела, калі ўлічыць тое, што падчас яго складання ў сталіцы працавала ўжо тры музеі), а таксама шэраг музеяў рэспубліканскага і раённага падпарадкавання. Рэальнае жыццё ўнесла пэўныя карэктывы ў гэты план, але ў цэлым ён вызначыў агульны працэс узнаўлення дзяржаўнай музейнай сеткі БССР.

У плане гаварылася аб неабходнасці хуткага аднаўлення абласных музеяў з прадстаўленнем для іх адпаведных памяшканняў. Супрацоўнікі музеяў засяродзілі асноўную ўвагу на зборы матэрыялаў, якія адлюстроўвалі падзеі другой сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, а таксама на іх папулярызацыі праз стацыянарныя і перасоўныя выстаўкі.

Рашэннем Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта ад 28 сакавіка 1944 г. у горадзе аднаўляўся Гомельскі абласны краязнаўчы музей[45]. Уладамі горада музею была выдзелена частка яго даваеннага будынку — некалькі пакояў у палацы Паскевіча. Быў сфарміраваны штат супрацоўнікаў на чале з дырэктарам Т. Х. Малкіным. На працягу двух першых гадоў ішло камплектаванне фондавых калекцый, пераважна матэрыяламі па гісторыі партызанскага руху на Гомельшчыне.

У чэрвені 1946 г. фондавыя калекцыі Гомельскага музея ўзбагаціліся каштоўнасцямі, рээвакуіраванымі з Урупінска. Сярод прывезенага былі карціны мастакоў І. Крамскога, Я. Сухадольскага, А. Залескага, С. Маршалкевіча і інш., бронзавая і мармуровая скульптура, пабытавыя рэчы з палаца, а таксама рукапіс славутай камедыі А. С. Грыбаедава «Гора ад розуму». Рээвакуацыяй калекцый займалася намеснік дырэктара музея Э. Р. Чэчык, якая суправаджала іх у 1941 г. у Сталінград. Каб вярнуць гомельскія калекцыі, яна вымушана была двойчы ездзіць ва Ўрупінск. Падчас першага прыезду Камітэт па справах культурна-асветніцкіх устаноў РСФСР патрабаваў

---

[I] Згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, які існаваў у перыяд з 20 верасня 1944 па 8 студзеня 1954 г., тэрыторыя БССР падзялялася на 12 абласцей: Баб руйскую, Баранавіцкую, Брэсцкую, Віцебскую, Гомельскую, Гродзенскую, Магілёўскую, Маладзечанскую, Мінскую, Палескую, Пінскую, Полацкую.

ад яе платы за ўвесь час знаходжання гомельскіх збораў ва Ўрупінску. Другі прыезд Э. Р. Чэчык быў больш плённым — яна вярталася з палацавымі каштоўнасцямі. Але аддадзена Гомельскаму музею было не ўсё. Зніклі каштоўныя калекцыі нумізматыкі і фалерыстыкі, посуду, выробленага з каштоўных металаў, бронзавая статуя А. Кановы «Веснік свету», помнік графу М. П. Румянцаву з Петрапаўлаўскага сабора і інш.[46]

Афіцыйнае адкрыццё Гомельскага краязнаўчага музея адбылося 1 сакавіка 1946 г. на аснове сабраных першых 700 экспанатаў, яшчэ да прыбыцця даваенных збораў. Яго экспазіцыя, якая змяшчала пераважна дакументы і фотаздымкі, пасля ўзгаднення з ідэалагічным аддзелам абласнога камітэта КП(б)Б набыла наступную структуру:

1) Сацыялістычны Гомель да Вялікай Айчыннай вайны;
2) Зверствы нямецка-фашысцкіх акупантаў на Гомельшчыне;
3) Партызанская барацьба на Гомельшчыне;
4) Вызваленне Гомеля і аднаўленчы перыяд.

За першы дзень Гомельскі музей наведала 30 адзіночных наведвальнікаў і 15 экскурсантаў. Усяго ж за першыя тры месяцы работы яго агледзела каля 6 тыс. чалавек, пераважна школьнікі. Інтэлектуальны клімат, які панаваў у той час у экспазіцыі Гомельскага музея, перадае наступны запіс, зроблены ў кнізе водгукаў: «Агледзеўшы музей, у нас з'яўляецца яшчэ больш нянавісці да нашых ворагаў і гарачая любоў да нашай Савецкай Радзімы, якая вызваліла нас ад смерці і стварыла нам шчаслівае і радаснае жыццё»[47].

У першае дзесяцігоддзе структура экспазіцыі музея ў цэлым захоўвалася, храналагічна ахопліваючы савецкі перыяд гісторыі. Аб змесце дзейнасці музея ў гэты час дапамагае скласці ўражанне тэматыка перасоўных выставак, стварэнню якіх мясцовым партыйным кіраўніцтвам надавалася асаблівая ўвага: «Сталінская канстытуцыя — самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце», «800-годдзе Масквы», «Угнаенні і іх выкарыстанне, парады акадэміка Лысенкі», «Вялікія будоўлі камунізму» і інш. Зразумела, што ў такой экспазіцыі каштоўныя дарэвалюцыйныя калекцыі, з такой цяжкасцю вернутыя з эвакуацыі, былі непатрэбны. Яны захоўваліся ў жудасных умовах[I].

Пэўныя змены ў дзейнасці музея пачаліся ў 1954 г., калі па выніках сумесных археалагічных раскопак на тэрыторыі Гомельскай

---

[I] Аб гэтым сведчыць зварот Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў БССР ад 1946 г. да старшыні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта з пагрозаю, што рээвакуіраваныя гомельскія калекцыі будуць перададзены іншаму музею, калі ў Гомелі для іх не знойдзецца належнага месца. Пасля правядзення рэстаўрацыйных работ у палацы памяшканне для калекцый, нарэшце, знайшлося. Але і яно было далёка не ідэальным — напрыклад, у 1952 г., калі папёк дах, карціны літаральна плавалі ў вадзе.

вобласці, якія праводзіліся Інстытутам гісторыі матэрыяльнай культуры і Гомельскім гісторыка-краязнаўчым музеем, быў адкрыты новы экспазіцыйны раздзел «Археалогія краю». У наступным годзе ўзнік «аддзел старажытнага перыяду» і раздзел «З мінулага»[48].

У ліпені 1944 г. Магілёўскі абласны камітэт КП(б)Б прыняў пастанову аб стварэнні ў Магілёве музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэтую ідэю падтрымаў СНК БССР, які прапанаваў, каб першым крокам на шляху стварэння музея стала арганізацыя аддзела гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Магілёўскім абласным музеі[49]. Меркавалася перадаць музею асобны будынак, сфарміраваць штат супрацоўнікаў на чале з былым дырэктарам абласнога музея І. С. Мігуліным, наладзіць збор матэрыялаў праз аддзелы прапаганды раённых камітэтаў партыі. Пастанова магілёўскага партыйнага кіраўніцтва так і засталася на паперы. Абласны музей не меў ні калекцый, ні будынка, які згарэў у 1941 г. Яе адзіным вынікам была невялікая колькасць матэрыялаў па гісторыі Магілёўшчыны перыяду нямецкай акупацыі, сабраных І. С. Мігуліным[I] падчас паездак па вобласці у якасці лектараў 1943-1944 гг., якія захоўваліся ў яго кватэры.

У ліпені 1946 г. была зроблена другая спроба адрадзіць музей, калі Магілёўскі абласны савет дэпутатаў прыняў рашэнне «Аб узнаўленні дзейнасці гісторыка-краязнаўчага музея»[50]. Як і ў 1944 г., планавалася прадставіць музею памяшканне, сфарміраваць штат супрацоўнікаў на чале з І. С. Мігуліным, правесці шэраг іншых арганізацыйных мерапрыемстваў. Але і гэта рашэнне ў сувязі з недахопам сродкаў засталося на паперы. Мігулін па-ранейшаму адзін, у вольны ад чытання лекцый час, збіраў прадметы музейнага значэння.

Нарэшце у 1949 г. трэцяя спроба ўзнавіць дзейнасць Магілёўскага абласнога музея скончылася паспяхова. Пад экспазіцыю было выдзелена памяшканне ў толькі што адрамантаваным Доме Саветаў, набраны штат супрацоўнікаў у складзе 6 чалавек, адкрыта фінансаванне. Пасляваенная дзейнасць музея пачалася са стварэння двух вялікіх фотавыставак «70-годдзе з дня нараджэння Сталіна» і «Дзесяцігоддзе ўз'яднання беларускага народа ў адзінай БССР», а таксама выставкі работ магілёўскіх мастакоў. Адначасова І. С. Мігулін з дапамогай Н. Ф. Мясніковай і іншых навуковых супрацоўнікаў

---

[I] Мігулін Іван Сяргеевіч (1902-1994) — музейны дзеяч, краязнавец, нарадзіўся ў Клімавічах, пасля заканчэння двух класаў гарадскога вучылішча быў вымушаны працаваць парабкам, рабочым на чыгунцы. У 1920 г. добраахвотнікам уступае ў Чырвоную Армію, з 1927 г. пасля страты рукі - на пасадзе загадчыка Дома працаўнікоў асветы ў Магілёве, з 1929 па 1932 г. працуе архіварыусам у архіве ЦК КП(б)Б. З 1932 г., пасля пераводу партархіваў Мінск навуковы супрацоўнік Магілёўскага гістарычнага музея. Пасля заканчэння Магілёўскага камвуза прызначаны на пасаду дырэктара музея (1934 -1941, 1954 1969).

распачаў работы па камплектаванню калекцый, неабходных для стварэння будучай сталай экспазіцыі.

Першыя гады пасля заснавання музея былі часам шматлікіх экспедыцый і камандзіровак навуковых супрацоўнікоў, у выніку якіх з'явілася магчымасць адлюстраваць музейнымі сродкамі гісторыю Магілёўшчыны савецкага перыяду. Для будучага аддзела дасавецкага перыяду зброю і рыштунак, узнагароды і муляжы сцягоў перадалі Дзяржаўны гістарычны музей з Масквы, а таксама Артылерыйскі музей і Ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава з Ленінграда. Кіраўнікам усіх прадпрыемстваў горада былі адпраўлены лісты з просьбай даслаць у музей узоры ўласнай вытворчасці, дадзеныя статыстычнага і гістарычнага характару. Аб інтэнсіўнасці збіральніцкай дзейнасці, што праводзілася супрацоўнікамі музея, сведчыць наступная лічба: толькі за 1950 г. у фондасховішча трапіла больш 5 тыс. адзінак захоўвання[51].

1 студзеня 1951 г. адбылося адкрыццё экспазіцыі Магілёўскага абласнога музея, якая складалася з двух аддзелаў: «Вялікая Айчынная вайна» і «Пасляваеннае сацыялістычнае будаўніцтва». Яна размясцілася ў трох пакоях і на лесвіцы будынка Дома Саветаў і была вынікам сумеснай дзейнасці навуковых супрацоўнікаў музея і мясцовых мастакоў (В. Панамарова, З. Шкляра, А. Белазёрава і А. Выдры). Выконваючы патрабаванні ідэалагічнага характару, аўтары першай пасляваеннай экспазіцыі Магілёўскага музея імкнуліся адлюстраваць у ёй падзеі агульнасаюзнага маштабу. Так, у першым аддзеле былі заяўлены такія тэмы, як абарона Масквы, Ленінграда, Адэсы, Севастопаля, Сталінградская і Курская бітвы, вызваленне ад нацызму цэнтральнаеўрапейскіх краін, Берлінская аперацыя. Зразумела, што раскрыць усе гэтыя тэмы музейнымі сродкамі (з дапамогаю аўтэнтычных рэчаў) было немагчыма. Завяршаўся агляд экспазіцыі яе эмацыянальнай дамінантай — вялікай карцінай пад назвай «Раніца Радзімы нашай». Вось як перадае сучаснік свае пачуцці падчас яе агляду: «Велічны воблік дарагога правадыра на фоне краявіду, на якім бачны лесаахоўныя палосы, высакавольтныя лініі электраперадач, трубы фабрык і заводаў, калоны трактароў пакідае незабыўнае ўражанне, што наша краіна няспынна ідзе да сонечных вяршынь камунізму»[52].

У наступныя гады экспазіцыя Магілёўскага музея ў адпаведнасці з ідэалагічнымі і цэнзурнымі патрабаваннямі некалькі разоў (1952, 1954 і 1955 гг.) перабудоўвалася. У 1954 г. адкрылася сталая выстаўка «Збудаванне Сусвету». Пашырылася тэматыка камплектавання за кошт з'яўлення першых прыродазнаўчых калекцый.

4 верасня 1944 г. СНК БССР зацвердзіў пастанову Віцебскага абласнога савета дэпутатаў аб узнаўленні дзейнасці Віцебскага дзяржаўнага гістарычнага музея[53]. Згодна з планам, структурна ён павінен быў складацца з трох раздзелаў: 1) Віцебск і вобласць да рэвалюцыі 1917 г.; 2) Віцебск савецкі — росквіт горада і вобласці пасля Кастрычніка; 3) Віцебск у гады Айчыннай вайны.

Як бачна з гэтай структуры, у адрозненне ад Гомеля і Магілёва, у Віцебску планавалася стварыць экспазіцыю па дарэвалюцыйнай гісторыі краю, што тлумачылася гістарычным профілем Віцебскага музея. Першыя вынікі работы па збіранню экспанатаў былі прадстаўлены ў ліпені 1945 г. на выстаўцы «Віцебская вобласць у гады Вялікай Айчыннай вайны», якая адкрылася яшчэ да вяртання з эвакуацыі даваенных калекцый у будынку гарадской ратушы — помніку барока XVIII ст. Мастацкае вырашэнне выстаўкі было вельмі простым, тым не менш, яна карысталася поспехам у наведвальнікаў.

Праца па ўзнаўленню Віцебскага гістарычнага музея ішла з вялікімі цяжкасцямі. Слабай была яго матэрыяльная база, музей дзяліў будынак ратушы са шматлікімі жыхарамі. Вельмі востра ў першыя пасляваенныя гады адчуваўся недахоп прафесійных кадраў. Так, першы пасляваенны дырэктар быў зняты з работы менш чым праз год пасля яго прызначэння на гэтую пасаду. Чалавек, які змяніў яго, не мог пісаць без памылак і планаваў аблегчыць сабе працу, пазбавіўшыся ад рээвакуіраваных з Саратава калекцый праз іх размеркаванне па іншых музеях. Сітуацыя змянілася да лепшага пасля прыходу ў 1945 г. на пасаду галоўнага захавальніка фондаў Г. Ф. Паўленка, якая ўзначальвала гэты важнейшы накірунак на працягу наступных 35 гадоў[54].

У верасні 1944 г. пачаліся работы па аднаўленню Абласнога гістарычнага музея ў Гродна. Пастановай СНК БССР ад 2 жніўня 1945 г. ён быў перайменаваны ў Дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, што ўзнімала яго афіцыйны статус да рэспубліканскага. Тлумачылася гэта тым, што гродзенскі музей валодаў у той час буйнейшым у БССР зборам гісторыка-археалагічнага характару, які быў створаны яшчэ ў даваенны перыяд у выніку дзейнасці захавальніка музея Ю. Ядкоўскага[I]. Агульная колькасць прадметаў у яго фондах у 1945 г.

---

[I] Ядкоўскі Юзаф (Іосіф Іосіфавіч), (1890-1950) археолаг, нумізмат, музейны дзеяч. Нарадзіўся ў Гродне. Пасля заканчэння гімназіі паступіў у Вышэйшую школу мастацтваў у Маскве. Пасля адкрыцця Маскоўскага археалагічнага інстытута пераходзіць на вучобу туды, але працягвае наведваць лекцыі ў школе мастацтваў. Падчас вучобы друкаваўся ў гістарычных часопісах і газетах Вільні, Варшавы, Кракава. З 1912 г. пасля заканчэння інстытута працаваў у Румянцаўскім музеі ў Маскве. Напярэдадні Першай сусветнай вайны вяртаецца ў Гродна, дзе па даручэнню Маскоўскага археалагічнага таварыства выконвае абавязкі кансерватара ў Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губернях. У 1919 г. пасля аднаўлення незалежнасці Польшчы працаваў у Цывільным упраўленні ўсходніх земляў у Гродне, прымаў удзел у савецка-польскім узброеным канфлікце па польскім баку ў якасці добраахвотніка. З

складала каля 45 тыс. адзінак, у тым ліку 14 тыс. гісторыка-археалагічных, 12 тыс. прыродазнаўчых помнікаў, а таксама 18 тыс. прадметаў, якія знаходзіліся ў доме Э. Ажэшкі (асабістыя рэчы пісьменніцы, творы выяўленчага мастацтва, кнігі). Структурна музей складаўся са: 1) Старога замка; 2) падземнага музея на месцы археалагічных раскопак; 3) Каложскай царквы; 4) прыродазнаўчага музея; 5) дома пісьменніцы Э. Ажэшкі[55].

Да 1950 г. скончылася фарміраванне штатаў навуковых аддзелаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея за кошт выпускнікоў пераважна гістарычных факультэтаў. На працягу трох пасляваенных дзесяцігоддзяў музей узначальваў М. І. Собаль[I], з імем якога звязана другое нараджэнне музея. Абавязкі галоўнага захавальніка выконваў вядомы гісторык і археолаг Л. В. Аляксееў. Прыродазнаўчы музей узначальвала В. А. Юркевіч. Разам з адміністрацыяй і гаспадарчымі службамі ў той час у музеі працавала 58 чалавек.

Высокі адукацыйны ўзровень супрацоўнікаў музея дазволіў распачаць даследчыцкую работу, перш за ўсё ў галіне археалогіі. У 1949 г. пад кіраўніцтвам вядомага расійскага археолага і гісторыка мастацтва М. М. Вароніна былі праведзены раскопкі на Замкавай Гары, выяўлены рэшткі муроў XII ст., храм з маёлікавай падлогай, жылыя будынкі. Вынікі гэтых даследаванняў былі абагульнены ў спецыяльнай манаграфіі[56]. У 1952-1954 гг. супрацоўнікі гісторыка-археалагічнага аддзела праводзілі археалагічныя разведкі на тэрыторыі вобласці, па выніках якіх была складзена археалагічная карта. Станоўчы водгук на сесіі Інстытута археалогіі АН СССР атрымала паведамленне аб раскопках у Індуры і Турыйску, якія праводзіліся сіламі музея[57].

Трэба агаварыцца, што ўсе гэтыя работы праводзіліся ва ўмовах вялікіх побытавых цяжкасцей. Навуковы супрацоўнік музея тых гадоў К. Т. Кавальская ўзгадвае: «Зімою ва ўсім музеі было холадна, таму што печы недастатковa ацяплялі памяшканні. Усе былі ў паліто, у тым ліку наведвальнікі ў залах... Летам мы ладзілі комплексныя экспе-

---

1920 г. кіраўнік Гродзенскай камісіі па ахове помнікаў мастацтва і культуры, у 1922 1936 гг. захавальнік Гісторыка-археалагічнага музея ў Гродна. Пасля пераезду ў Варшаву працаваў у Музеі нарадовым, падчас нямецкай акупацыі знаходзіўся ў канцэнтрацыйным лагеры. У 1945 г. зноў вяртаецца па працу ў Музей парадовы, дзе аднаўляе нумізматычны кабінет, быў ініцыятарам узнаўлення работы Варшаўскага нумізматычнага таварыства. Памёр у Варшаве. Аўтар больш 100 навуковых прац.

[I] Собаль Мікалай Ісакавіч (1913 1990) — музейны дзеяч, нарадзіўся ў в. Брадзец Бярэзінскага раёна, пасля заканчэння Рагачоўскай СІП у 1929 1930гг. працаваў дзесятнікам на будаўніцтве. З 1932 па 1935 г. настаўнічаў, у 1935 1940 гг. студэнт БДУ. У 1940 г. прызваны па службу ў Чырвоную Армію, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Парада Перамогі 1945 г. у Маскве. З 1945 па 1947 г. працаваў навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела ў Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 па 1976 г. - дырэктар Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея.

дыцыі аддзелаў у раёны Гродзенскай вобласці. Месяцамі жылі ў вёсках, ішлі пешшу ад вёскі да вёскі, з хаты ў хату. Аўтобусы ў той час хадзілі нерэгулярна, а з глыбінкай транспартнай сувязі ўвогуле не было. Нягледзячы на гэта, не было ў Гродзенскай вобласці кутка, дзе б не набывалі музейныя супрацоўнікі»[58].

Фонды музея папаўняліся не толькі за кошт правядзення этнаграфічных экспедыцый і археалагічнага вывучэння Гродзеншчыны. У 1953 г. шэраг ленінградскіх музеяў перадаў у Гродна старажытную зброю і абмундзіраванне, у тым ліку мундзір Гродзенскага гусарскага палка.

Адначасова з пашырэннем складу калекцый ішлі работы па рэстаўрацыі Старога замка, што дало магчымасць разгарнуць экспазіцыйную дзейнасць, якая пачалася з правядзення выставак. У 1947 г. прайшла выстаўка «Партызанскі рух на Гродзеншчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны», у 1948 г. — «Беларуская ССР за 30 год», у 1950 г. — выстаўка прамысловых вырабаў вобласці. Падчас правядзення выставак вялася напружаная праца па распрацоўцы стацыянарнай экспазіцыі, якая была адкрыта для агляду ў два этапы. У 1956 г. былі завершаны залы гісторыі савецкага грамадства (1917-1941), а ў наступным годзе для наведвальнікаў адкрылася ўся экспазіцыя, разам з заламі гісторыі дасавецкага перыяду і гісторыі Гродзенінчыны ў пасляваенны час[59].

Драматычна ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе складваўся лёс Слонімскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, які валодаў надзвычай цікавымі фондавымі калекцыямі, сабранымі вядомым беларускім краязнаўцам І. І. Стаброўскім. З'яўляючыся стваральнікам і першым дырэктарам музея, ён прыкладваў шмат намаганняў, каб уратаваць сабранае падчас нямецкай акупацыі. Але, нягледзячы на гэтыя намаганні, акупацыйнымі ўладамі было шмат што вывезена ў Германію. Вялікая шкода была зроблена музею падчас савецкіх бамбардзіровак 10-12 ліпеня 1944 г., калі музей рабаваў хто хацеў. Але нягледзячы на тое, што пасля ваенных страт у фондавым зборы заставалася каля 5,5 тыс. адзінак захоўвання, музей працягваў работу. Пачынаючы з лета 1944 г. яго адзіны супрацоўнік І. І. Стаброўскі праводзіў экскурсіі для ваеннаслужачых і школьнікаў, чытаў лекцыі для настаўнікаў. У сярэднім экспазіцыю Слонімскага музея, якая ў той час складалася з агульнаадукацыйнага, гісторыка-краязнаўчага і ваеннага раздзелаў, аглядала да 250 чалавек у дзень[60].

У 1946 г. Слонімскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей быў перайменаваны ў Баранавіцкі абласны гісторыка-краязнаўчы музей. Гэта рашэнне ўлад тлумачылася тым, што ў Слоніме знаходзіўся

буйнейшы музейны збор Баранавіцкай вобласці, а Баранавіцкі абласны музей выяўленчага мастацтва быў цалкам знішчаны падчас нямецкай акупацыі.

У 1946 г. да кіраўніцтва Слонімскім музеем прыйшлі новыя людзі, якія кампенсавалі недахоп ведаў і прафесіяналізму дзеяннямі адміністрацыйнага і прадпрымальніцкага характару. Напрыканцы 1947 г. паніжаны ў пасадзе навуковы супрацоўнік І. І. Стаброўскі выступіў з рэзкім пратэстам супраць набыцця для аддзела Вялікай Айчыннай вайны карцін вельмі нізкай якасці, выкананых сучаснымі беларускімі мастакамі за свядома завышаны кошт. Прынцыповасць яму дорага абышлася. У 1948 г. загадам упраўлення музеяў Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў І. І. Стаброўскі быў звольнены з працы. З гэтага моманту і да сярэдзіны 1950-х гг. у музеі змянілася 6 дырэктараў і 22 навуковыя супрацоўнікі. Вынікам гэтай кадравай «чахарды» быў заняпад усіх напрамкаў дзейнасці музея: адсутнічаў падзел на прадметы асноўнага і навукова-дапаможнага фонду, у экспазіцыі меліся грубыя памылкі ў выкладанні хрэстаматыйных гістарычных падзей.

З цяжкасцю ўладкаваўшыся ў музей касірам, амаль без сродкаў да існавання, І. І. Стаброўскі не мог абыякава назіраць за тым, як прыходзіць у заняпад справа яго жыцця. Ён адправіў 38 скаргаў у вышэйшыя савецкія і партыйныя ўстановы, адстойваючы сваё дзецішча. Але адзіным адказам было абвінавачванне яго ў «фальсіфікацыі гістарычных падзей, споведзі песімізму, адсутнасці веры ў жыццё»[61].

У кастрычніку 1952 г., калі Слонімскі раён увайшоў у склад Гродзенскай вобласці, музей быў перайменаваны ў Слонімскі раённы краязнаўчы. Частка яго калекцый пры гэтым была перададзена Баранавіцкаму абласному і Гродзенскаму гісторыка-археалагічнаму музеям.

Вось як апісвае стан музея ў гэты час сталічны карэспандэнт:

«На пытанне, дзе знаходзіцца музей, хлопчык паказаў рукой на процілеглы бок вуліцы.

— Бачыце белы дом? Уваход са двара...

Брамка была адчынена, але моцныя масіўныя дзверы музея аказаліся на замку. Скрозь шырокія вокны было відаць пустыя пакоі: унутры сумна, няўтульна. Што ж гэта значыць? Хлопчык, відаць, пажартаваў... Ніякага музея тут няма.

— Дзядзечка, музей пераехаў! — пачуўся голас таго ж хлопчыка. — Я па старой звычцы... — І хлопчык павёў у суседні стары домік.

— Вам каго?— аглядаючы нас з ног да галавы, запытаў вартаўнік. Музей не працуе...

— Выхадны?

— Не... Другі год не працуе...

Вартаўнік ужо гатовы быў зачыніць дзверы, але калі ўбачыў, што мы не адыходзім, паблажліва сказаў:

— Забаронена... Але так і быць, паглядзіце...

Мы ўбычылі невялікія пакоі, заваленыя амаль да столі карцінамі, кнігамі, чучаламі звяроў і птушак, кавалкамі жалеза, дрэва, нейкімі каменнямі, відаць, астаткамі таго самага «каменнага веку». Усё грувасцілася адно на другім, вісела, ляжала, валялася на падлозе. У адным з пакояў столь абвалілася, скрозь велізарную шчыліну відаць быў дах, з якога капала вада.

— Скажыце, калі ласка, Стаброўскага можна бачыць?

— Стаброўскага?... Гэта той, хто каменныя сякеры збіраў?

— Так... Старшага навуковага супрацоўніка.

— Э-э, даўно не відаць... Гаварылі, быццам-бы выехаў»[62].

Пінскі абласны краязнаўчы музей узнавіў сваю працу ў ліпелі 1945 г. на аснове археалагічнай, этнаграфічнай і прыродазнаўчай калекцый, якія захаваліся пасля адступлення нямецкіх войск. Адпаведна калекцыям была структурыравана экспазіцыя музея. 23 лютага 1946 г. яна пашырылася за кошт новага аддзела — Вялікай Айчыннай вайны. Праводзіўся збор матэрыялаў для аддзела пасляваеннага сацыялістычнага будаўніцтва[63].

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе было часам актыўнага назапашвання калекцый: за першы пасляваенны год іх агульная колькасць узрасла з 2 да 8 тыс. адзінак; у наступны, 1947 г., — да 19 тыс. адзінак; і кожны наступны год павялічвалася ў сярэднім на 1-2 тыс. адзінак. Хуткае павелічэнне фондавых калекцый вымагала наладжвання сістэмы ўліку, распрацоўкі структуры каталогаў, прынцыпаў навуковай класіфікацыі помнікаў матэрыяльнай культуры. Уся гэта работа праводзілася пад кіраўніцтвам Л. А. Студэнт — галоўнага захавальніка фондаў Пінскага музея на працягу чвэрці стагоддзя. Новы імпульс развіцця музей атрымаў у 1952 г., калі абласныя ўлады перадалі ў яго распараджэнне двухпавярховы будынак у цэнтры горада[64].

Бабруйскі абласны музей ў пасляваенны час таксама пачынаў работу з пошукаў памяшкання. Перад адступленнем будынак даваеннага музея быў узарваны немцамі, таму знаходжанне новага памяшкання было першай умовай яго адраджэння. Ва ўмовах вострага недахопу жылля ў першыя пасляваенныя гады выйсце было знойдзена

з дапамогай Савета па справах рэлігіі пры СНК БССР, які перадаў для музейных патрэб закрыты каталіцкі касцёл. Неўзабаве абласныя ўлады перадалі Бабруйскаму музею яшчэ адзін будынак — былы прыватны жылы дом, які супрацоўнікі музея доўгі час дзялілі з яго жыхарамі. У чэрвені 1945 г. адкрылася экспазіцыя па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая карысталася вялікай папулярнасцю. Толькі за першыя тры дні работы яе агледзела звыш 500 чалавек. У наступныя гады дзейнасць супрацоўнікаў Бабруйскага музея была сканцэнтравана пераважна на камплектаванні і паслядоўнай экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі дасягненняў сацыялістычнага будаўніцтва ў вобласці, у выніку чаго з'явіліся аддзелы «Мічурынская аграбіялагічная навука» і «Жывёлагадоўля»[65].

У адпаведнасці з пастановай СНК БССР Абласны краязнаўчы музей у Полацку павінен быў узнавіць сваю дзейнасць 6 лістапада 1948 г. у будынку Сафійскага сабора[66].

Рашэнне аб адкрыцці Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея было прынята СНК БССР у чэрвені 1945 г., але на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя ён не быў адкрыты для агляду.

У сувязі са скасаваннем Бабруйскай, Баранавіцкай, Палескай, Пінскай і Полацкай абласцей Міністэрства культуры загадам ад 9 красавіка 1954 г. зняло з назваў музеяў былых абласцей слова «абласны». За гэтымі музеямі былі замацаваны групы раёнаў (зоны), у межах якіх і будавалася ўся работа. У зону Бабруйскага музея ўваходзілі г. Бабруйск, Бабруйскі, Кіраўскі, Клічаўскі, Асіповіцкі раёны; у зону Баранавіцкага — г. Баранавічы, Нова-Мышскі, Ляхавіцкі, Быценскі, Гарадзішчанскі раёны; у зону Мазырскага — г. Мазыр, Мазырскі, Калінкавіцкі, Васілевіцкі раёны; у зону Пінскага — г. Пінск, Пінскі, Давыд-Гарадоцкі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Жабчыцкі, Іванаўскі, Ленінскі, Лагішынскі, Лунінецкі, Столінскі, Целеханскі раёны; у зону Полацкага — г. Полацк, Полацкі, Ветрынскі, Дрысенскі, Асвейскі, Ушацкі, Расонскі раёны. Брэсцкі, Віцебскі, Гомельскі і Магілёўскі абласныя краязнаўчыя музеі павінны былі будаваць дзейнасць у межах сваіх абласцей. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей меў статус рэспубліканскага, але ў сваёй збіральніцкай, навуковай і асветніцкай дзейнасці асаблівую ўвагу надаваў рэгіянальным аспектам. Мінская і Маладзечанская (скасавана ў 1960 г.) вобласці сваіх краязнаўчых музеяў увогуле не мелі[67].

У надзвычай складанай сітуацыі ў пасляваенны перыяд апынуліся раённыя краязнаўчыя музеі. На першы план выступалі тры праблемы: адсутнасць памяшканняў, мізэрныя асігнаванні, недахоп кадраў. Большасць створаных у першыя пасляваенныя гады экспазіцый

не мелі папярэдняй навуковай падрыхтоўкі і адпавядалі часовым выстаўкам. Калі для аддзелаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, былі сабраны баявыя рэліквіі, трафеі і іншыя арыгінальныя матэрыялы, то аддзелы прыроды, дасавецкай гісторыі і савецкага перыяду вызначаліся бессістэмнасцю і дылетантызмам. У шэрагу выпадкаў раённыя краязнаўчыя музеі спрабавалі адлюстраваць у сваіх экспазіцыях гісторыю ўсёй краіны. У выніку яны ўяўлялі набор шматтыражных ілюстрацый па гісторыі СССР, якія можна было знайсці ў падручніку або альбоме наглядных дапаможнікаў.

Першым з раённых краязнаўчых музеяў разгарнуў працу па збору, вывучэнню і папулярызацыі мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны Ваўкавыскі раённы краязнаўчы музей. Рашэнне аб аднаўленні яго дзейнасці было прынята мясцовымі ўладамі на пачатку 1946 г. Для музея было знойдзена памяшканне ў доме, дзе летам 1812 г. знаходзіўся штаб генерала П. І. Баграціёна. Быў прызначаны дырэктар — Г. І. Пех[I]. Аднак далей гэтага справа не пайшла. Дом Баграціёна быў па-ранейшаму заняты жыхарамі і аб існаванні музея нагадвала толькі работа яго дырэктара па ўзнаўленню даваенных калекцый.

Сітуацыя змянілася ў 1948 г., пасля прыняцця пастановы Савета Міністраў БССР «Аб узнаўленні дзейнасці Ваўкавыскага раённага краязнаўчага музея ў доме Баграціёна»[68]. Была праведзена рэстаўрацыя будынку, перад уваходам устаноўлены бюст П. І. Баграціёна, сістэматызаваны калекцыі, распрацавана структура экспазіцыі. Першыя наведвальнікі маглі азнаёміцца з наступнымі раздзеламі: «Вайна рускага народа 1812 г.», «Ваўкавыск — старадаўні рускі горад», «Нашы вялікія продкі». Падзеі мясцовай гісторыі інтэрпрэтаваліся як частка агульнарасійскай гісторыі, цэнтральнае месца ў залах займалі партрэты Аляксандра Неўскага, Дзмітрыя Данскога, Кузьмы Мініна, Дзмітрыя Пажарскага, Пятра I, А. В. Суворава. Нягледзячы на падобную інтэрпрэтацыю, у экспазіцыі дэманстраваўся каштоўны рэчавы матэрыял па беларускай гісторыі. У ёй можна было ўбачыць археалагічныя знаходкі (кераміка, упрыгожанні, узбраенне XI-XIII стст.), узбраенне і даспехі Рэчы Паспалітай XVII ст., ўзоры зброі і абмундзіравання эпохі напалеонаўскіх войнаў.

---

[I] Пех Георгій Іосіфавіч (1897 1969) музейны дзеяч, парадзіўся ў г. Луга Пецярбургскай губ., скончыў 6 класаў гімназіі, у 1921-1923 гг. служыў у польскай арміі, у 1939-1940 гг. - дырэктар, у 1940-1941 гг. — загадчык гістарычнага аддзела Ваўкавыскага краязнаўчага музея, у гады нямецкай акупацыі працаваў рабочым мясцовага дэпо. Пачынаючы з 1944 г. на аматарскіх пачатках збіраў матэрыялы для адраджэння Ваўкавыскага музея, у 1946 1967 гг. яго дырэктар.

Матэрыялы па сацыялістычнаму будаўніцтву, у адрозненне ад астатніх краязнаўчых музеяў БССР, тут адсутнічалі. Гэта выклікала рэзкую крытыку музея ў рэспубліканскім партыйным друку. У кастрычніку 1952 г. яго дзейнасць абмяркоўвалася на пасяджэнні бюро Ваўкавыскага райкома КП(б)Б. Па выніках абмеркавання было вырашана актуалізаваць работу музея шляхам накіравання на пасаду навуковага супрацоўніка «заатэхніка Міхальчук»[69]. У 1953 г. загадам Камітэта па справах культурна-асветніцкіх установаў Ваўкавыскі раённы краязнаўчы музей быў перапрафіліраваны і стаў ваенна-гістарычным музеем імя П. І. Баграціёна, што зняло вастрыню сітуацыі.

У разглядаемы перыяд раённыя краязнаўчыя музеі былі адкрыты ў Барысаве (1950), Тураве (1950), Рэчыцы (1954), Століне (1955), Ашмянах (1955). Праводзіліся работы па аднаўленню раённых музеяў у Слуцку і Лепелі.

16 мая 1944 г. старшыня СНК БССР П. К. Панамарэнка падпісаў пастанову аб узнаўленні дзейнасці Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР з часовай базай у Гомелі «у мэтах узнаўлення фонду мастацкіх твораў, іх рэстаўрацыі, захавання ад псавання, а таксама папулярызацыі мастацкіх твораў сярод насельніцтва Беларусі, выкарыстання жывапісу для творчага росту мастакоў, развіцця маладых талентаў»[70]. Галерэя падпарадкоўвалася Упраўленню па справах мастацтваў, якое ў той час ўзначальваў пісьменнік П. С. Пестрак. Дырэктарам Дзяржаўнай карціннай галерэі была прызначана А. В. Аладава[I], якая загадвала аддзелам рускага і беларускага мастацтва галерэі ў даваенны час. Фарміраванне пасляваеннага фондавага збору галерэі адбылося ў значнай ступені дзякуючы яе 33-гадовай самаахвярнай падзвіжніцкай працы на гэтай пасадзе.

Аснову новай калекцыі Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР склалі карціны, якія былі створаны беларускімі мастакамі падчас вайны і дэманстраваліся на выставах 1944 г. у Маскве і 1945 г. у Мінску. На выдзеленыя ўрадам грошы ўжо ў жніўні 1945 г. былі набыты палотны Б. Кустодзіева, В. Паленава, К. Брулова, І. Левітана. Дзяржаўны музей выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна і Рускі музей перадалі тры краявіды А. Куінджы, краявід А. Багалюбава і

[I] Аладава Алена Васільеўна (1907-1986) беларускі музейны дзеяч і мастацтвазнаўца, нарадзілася ў Пружанах у сям'і настаўніка. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта з 1937 г. працавала навуковым супрацоўнікам арганізацыйнай групы па стварэнні (з 1939 г. — загадчыцай аддзела) Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. З 1941 г. знаходзілася ў эвакуацыі ў г. Саратаве, дзе працавала намеснікам дырэктара і адначасова галоўным захавальнікам Дзяржаўнага мастацкага музея імя А. М. Радзішчава. З 1944 г. працавала ў Камісіі па стратах, панесеных фашысцкімі захопнікамі музеям БССР, і адначасова з'ўлялася дырэктарам Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. Стваральнік фондавых калекцый галерэі, шматлікіх экспазіцый, рэспубліканскіх і замежных выставак, аўтар кніг па беларускаму мастацтву. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. З 1977 г, ст. навуковы супрацоўнік-кансультант Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

парадны партрэт імператрыцы Кацярыны II. На былым Архірэйскім падвор'і ў Мінску, дзе да вайны знаходзіўся Беларускі дзяржаўны музей, былі знойдзены іконы, у тым ліку такія шэдэўры беларускага іканапісу, як «Нараджэнне Маці Божай» Пятра Яўсеевіча з Галынца 1649 г. і «Узнясенне» XVI ст.

Канцэпцыя збіральніцкай дзейнасці галерэі, распрацаваная А. В. Аладавай, у асноўным была арыентавана на збор айчыннай класікі. З дапамогай старэйшага беларускага мастацтвазнаўцы С. Д. Падвеса, а таксама галоўнага захавальніка галерэі П. М. Герасімовіча і навуковага супрацоўніка А. В. Васілеўскай А. В. Аладава праводзіла вялікую работу з калекцыянерамі, у якіх набывала палотны выдатных беларускіх мастакоў — І. Аляшкевіча, А. Гараўскага, І. Хруцкага, С. Заранкі, Н. Сілівановіча. У гэтым ёй дапамагалі творчыя сувязі з выдатнымі расійскімі мастакамі, рэстаўратарамі, мастацтвазнаўцамі, у тым ліку І. Грабарам, А. Фёдаравым-Давыдавым, братамі Корынамі, У. Фаворскім, П. Канчалоўскім. Асабліва моцным было яе сяброўства з В. К. Бялыніцкім-Бірулем. Дзякуючы іх парадам і кансультацыям у галерэі былі закладзены асновы калекцыі беларускага і рускага класічнага мастацтва.

На канец 1940-х — 1950-я гг. прыпадае асабліва актыўная работа па ўзбагачэнню фондаў лепшымі ўзорамі айчыннага мастацтва. Актыўная экспедыцыйная дзейнасць, якая пачалася ўжо ў 1946 г. і спалучалася з разгортваннем навукова-даследчых і рэстаўрацыйных работ, дазволіла сфарміраваць выдатную калекцыю беларускага мастацтва XII-XVIII стст. У гэтыя гады ў галерэю трапляюць каменныя абразы, шахматы з Ваўкавыска, драўляныя грэбні і іншыя творы XII-XIII стст., а таксама творы так званай «беларускай рэзі скразной», у тым ліку царскія вароты з Нікольскай царквы Магілёва[71].

У лістападзе 1947 г. адкрылася невялікая сталая экспазіцыя галерэі. Яна размясцілася ў пяці залах другога паверха Дома прафсаюзаў, дзе ў той час ужо знаходзіліся Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Літаратурны музей Я. Купалы. У экспазіцыі дэманстраваліся творы рускай класікі і сучаснае савецкае мастацтва. Далейшаму разгортванню сталай экспазіцыі перашкаджала адсутнасць памяшкання, таму асноўны акцэнт у экспазіцыйнай дзейнасці галерэі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе рабіўся на правядзенне выставак. Напрыклад, у 1955 г. супрацоўнікамі галерэі былі праведзены наступныя выстаўкі: «Заходнееўрапейскае мастацтва са збораў Дзяржаўнага Эрмітажа» (Мінск); «Польскае выяўленчае мастацтва канца XVIII-XX стст. з музеяў і прыватных збораў Польшчы» (Мінск); «Творы народнага мастака БССР А. А. Бембеля. Да 50-годдзя са дня

нараджэння» (Мінск); «Выяўленчае мастацтва і народная творчасць Беларускай ССР» (Масква); «Творы беларускіх мастакоў і народных майстроў» (Каўнас)[72].

Работы па аднаўленню калекцый Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР ішлі поўным ходам, калі нечакана ў жніўні 1950 г. па рашэнню Савета Міністраў БССР Польскай рэспубліцы былі перададзены 89 партрэтаў з Нясвіжскага замка[73]. У гэтым акце «добрай волі», які нанёс вялікую страту беларускай мастацкай спадчыне, праявіўся, з аднаго боку, нігілізм да нацыянальнай культуры беларускага савецкага кіраўніцтва, а з другога — маштабы рэстытуцыйнай дзейнасці, якая праводзілася Польшчай пасля заканчэння другой сусветнай вайны не толькі на Захадзе, але і на Усходзе. Перадача радзівілаўскіх партрэтаў была вынікам работы польскага ўрада, якая мэтанакіравана праводзілася з беларускім бокам пачынаючы з 1946 г., па перадачы «усіх польскіх культурных каштоўнасцей»[74].

У верасні 1945 г. ЦК КП(б)Б і СНК БССР прыняў спецыяльную пастанову аб узнаўленні ў Мінску Дома-музея І з'езда РСДРП.[75] Сам дом згарэў у 1941 г., але захаваўся яго фундамент, что дазволіла высветліць дакладныя габарыты, а таксама зрабіць тэрытарыяльную прывязку. Рэканструкцыі Дома-музея дапамаглі супрацоўнікі Музея рэвалюцыі ў Маскве, дзе захаваўся яго маштабны макет, а таксама жывыя сведкі — былы дырэктар Музея рэвалюцыі БССР М. Я. Гракаў, аўтар мастацкага вырашэння даваеннай экспазіцыі Дома-музея РСДРП А. І. Кроль і інш.

Дом-музей І з'езда РСДРП планавалі адкрыць у дзень 50-годдзя з'езда — 1 сакавіка 1948 г., але першая экскурсія ўвайшла ў яго залы толькі 1 студзеня 1949 г. Экскурсантам прапанавалася азнаёміцца з двума аддзеламі. Першы з іх быў прысвечаны палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Расійскай імперыі канца XIX ст. і пачатку рэвалюцыйнай дзейнасці Леніна-Сталіна. Другі — рэвалюцыйнаму пад'ёму пачатку XX ст., II з'езду РСДРП, дзейнасці газеты «Іскра», барацьбе з меншавікамі. Зразумела, што падобная экспазіцыя была пабудавана выключна на калійным матэрыяле. У 1953 г., у сувязі з узвядзеннем манумента Перамогі, музей быў перанесены бліжэй да р. Свіслач, а ў 1954 г. была адкрыта для наведвання мемарыяльная частка музея, у якой быў узноўлены інтэр'ер кватэры П. В. Румянцава, дзе праходзілі пасяджэнні з'езда.

Дом-музей І з'езда РСДРП быў адным з найбольш наведваемых і ў той жа час ідэалагізаваных музеяў БССР. Штогод туды прыходзіла больш 20 тыс. чалавек. Гэта былі пераважна «арганізаваныя» наведвальнікі — слухачы рэспубліканскай партыйнай школы, студэнты,

навучэнцы, ваеннаслужачыя. У адрозненне ад большасці музеяў рэспублікі, асноўнай формай навукова-асветніцкай дзейнасці Дома-музея былі аглядныя і тэматычныя лекцыі, якія складаліся паводле першай і другой глаў Кароткага курсу ВКП(б)[76].

У рэспубліцы не толькі ўзнаўляліся існаваўшыя да вайны музеі, але і ствараліся новыя. Адным з іх быў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, кропкай адліку гісторыі якога з'яўляецца пастанова ЦК КП(б)Б ад 2 чэрвеня 1942 г. аб стварэнні ў Маскве рэспубліканскай Камісіі па збору дакументаў і матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны. Старшынёй Камісіі быў прызначаны сакратар ЦК КП(б)Б па прапагандзе Ц. С. Гарбуноў, адказным сакратаром — В. Д. Стальноў, які пазней стаў першым дырэктарам музея.

Галоўнымі крыніцамі паступленняў матэрыялаў у Камісію былі камандзіроўкі яе супрацоўнікаў у воінскія часці, партызанскія фарміраванні, на эвакуіраваныя беларускія прадпрыемствы. Яны прывозілі лісты з франтоў, інфармацыю аб баявых дзеяннях партызан, падпольныя газеты і часопісы, улёткі, фотаздымкі і інш. Вялікую ролю ва ўзбагачэнні калекцый адыгралі Віцебскія (Суражскія) вароты[I]. Праз іх супрацоўнікі накіроўваліся ў нямецкі тыл для збору матэрыялаў. Пазней гэта работа праводзілася з дапамогай ваенна-транспартнай авіяцыі. Паводле успамінаў удзельнікаў тых падзей, пасля вяртання самалётаў з нямецкага тылу на лётнае поле выходзілі супрацоўнікі Камісіі і стэнаграфісткі, каб не губляючы часу запісаць аповяды пілотаў і партызан[77].

Вынікі першых шасці месяцаў дзейнасці Камісіі былі прадстаўлены на выстаўцы «Беларусь жыве, Беларусь змагаецца, Беларусь была і будзе Савецкай», якая адкрылася ў пачатку лістапада 1942 г. у Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве. Яе дырэктарам была прызначана былая супрацоўніца Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР А. В. Аладава. Выстаўка складалася з пяці раздзелаў, на ёй было прадстаўлена 313 экспанатаў, якія адлюстроўвалі жыццё ў акупіраванай Беларусі, удзел беларусаў у баях на франтах і ў тылавой працы[78].

Пасля вызвалення Беларусі летам 1944 г. Камісія была пераведзена ў Мінск, дзе працавала да 1946 г. У верасні 1944 г. з Масквы ў Мінск перавезлі таксама выстаўку «Беларусь жыве...», якая стала асновай першай экспазіцыі Белдзяржмузея Вялікай Айчыннай вайны. Падчас прыбыцця ў Мінск экспанатаў гэтай выстаўкі ЦК КП(б)Б у верасні 1943 г. ужо было прынята рашэнне аб стварэнні ў сталіцы

---

[I] Так называлі 40-кіламетровы разрыў лініі фронту паміж гарадамі Вяліж і Ўсвяты, які ўзнік ў выніку паспяховых баявых дзеянняў Чырвонай Арміі зімой 1941 1942 гг. і вызвалення беларускімі партызанамі навакольных населеных пунктаў. Вароты дзейнічалі з 10 лютага па 28 верасня 1942 г.

БССР «музея па гісторыі барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну»[79]. Работы па падрыхтоўцы да адкрыцця музея курыраваў асабіста старшыня СНК БССР П. К. Панамарэнка. Музею перадалі адзін з лепшых ацалеўшых у Мінску будынкаў - Дом прафсаюзаў на плошчы Свободы, надалі 1-ю катэгорыю, зацвердзілі штатную структуру ў памеры 167 чалавек[I]. У адміністрыцыйных і гаспадарчых адносінах ён падпарадкоўваўся Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР, у ідэалагічных — ЦК КП(б)Б.

Дырэктарам музея быў прызначаны В. Д. Стальноў (ужо ў 1946 г. яго змяніў былы дырэктар Музея рэвалюцыі БССР М. Я. Гракаў), яго намеснікам па навуковай рабоце — У. У. Саблін. У першы навукова-творчы калектыў увахoдзілі навуковыя супрацоўнікі П. М. Ганчароў, М. С. Абрамаў, П. С. Лавецкі, В. С. Раманоўская, мастакі С. Г. Раманаў, А. С. Бархаткоў, Г. Ф. Бржазоўскі і інш. У гэты перыяд у музеі пэўны час працавалі будучыя вядомыя беларускія гісторыкі члены-карэспандэнты АН БССР К. І. Шабуня і У. М. Сікорскі. Ніхто з іх не меў вопыту музейнай работы. Гэта былі пераважна настаўнікі, журналісты, жывапісцы, якія актыўна ўдзельнічалі ў партызанскім руху ў гады нямецкай акупацыі. Але недахоп ведаў і вопыту кампенсаваўся энтузіязмам і падтрымкай з боку партыйнага і ваеннага кіраўніцтва. Восенню 1944 — вясной 1945 г. было праведзена чатыры камандзіроўкі на фронт па збору экспанатаў (дзве ў Польшчу, дзве ў Берлін), якія далі тысячы каштоўных прадметаў. Адначасова актыўныя пошукі вяліся на тэрыторыі БССР.

Атмасферу, якая панавала ў калектыве музея ў тыя дні, перадаюць успаміны П. М. Ганчарова: «Дамовіліся напачатку арганізаваць выстаўку «Узбраенне беларускіх партызан». Але дзе ўзяць экспанаты? Партызанскія атрады раззброіліся пад Мінскам, у Лошыцы. Я, прызначаны начальнікам партызанскага аддзела музея, накіраваўся да прадстаўніка штаба партызанскага руху... Дазвол атрымаў. Але як даставіць усю гэту зброю ў Мінск? Стаў шукаць ў горадзе грузавыя машыны. Каюся: угаворваў вадзіцеля зрабіць незаконны рэйс. А што было рабіць? Разлічваўся са свайго рэчавага мяшка. Так, так! Перад тым якраз атрымаў заробак — амаль за палову сорак першага года, за сорак другі, сорак трэці і за паўгода сорак чацвёртага. Амаль цэлы

[I] Маштабы гэтага праекта асабліва ўражваюць на фоне галечы і разрухі першых пасляваенных гадоў. На думку аўтараў праекта, акрамя навуковага і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала музей павінен быў мець уласныя камендатуру, сакрэтную часць, ваенізаваную ахову, уласную гаспадарку. Нерэалістычнасць гэтага праекта стала відавочнай адразу ж пасля адкрыцця музея з 1948 г. пачаліся скарачэнні штатаў, прычым першымі ахвярамі станавіліся супрацоўнікі, якія знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі, або рэпрэсаваныя органамі дзяржбяспекі. (ПАРБ. Ф. 799. Воп. І. Спр. 9. Арк. 60.)

мяшок грошай. Дык вось, першыя буйныя сумы выдаткаваў на аплату транспарта, які даставіў з Лошыцы ў музей вінтоўкі, кулямёты, самаробныя міны, гарматы, адрамантаваныя ў лясных майстэрнях, трафейныя аўтаматы...»[80].

22 кастрычніка 1944 г. апоўдні адбылося ўрачыстае адкрыццё Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя ў выглядзе двух выставак «Узбраенне беларускіх партызан» і «Бальшавіцкі друк Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны» была размешчана ў 15 залах, адрамантаваных сіламі былых партызан.

Адначасова з адкрыццём музея у раёне Дома Чырвонай Арміі была разгорнута Рэспубліканская выстаўка ўзораў трафейнага ўзбраення, якая складалася з чатырох раздзелаў: артылерыйскага, танкавага, авіяцыйнага і інжынернага. Большая частка ўзбраення, якое мела нямецкае, французскае, галандскае, бельгійскае, чэхаславацкае, югаслаўскае, польскае і нарвежскае паходжанне, была дастаўлена з месцаў баёў у Мінскім і Бабруйскім «катлах». Экскурсіі праводзілі афіцэры — удзельнікі аперыцыі «Баграціён». У 1948 г. гэта выстаўка была дэманціравана[81].

Пасля адкрыцця музея працягвалася інтэнсіўнае павелічэнне яго калекцый. Ішлі актыўныя паступленні ад Камісіі па збору дакументаў і матэрыялаў Вялікай Айчыннай вайны, Беларускага штаба партызанскага руху, прыватных асоб, устаноў і арганізацый. На аснове гэтых паступленняў 1 мая 1947 г. была адкрыта першая стацыянарная экспазіцыя, якая складалася з наступных раздзелаў: гістарычнае развіццё беларускага народа; Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза; партызанскі рух у Беларусі; вызваленне Савецкай Беларусі; узнаўленне народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі.

З гэтай структуры няцяжка заўважыць, што пры адсутнасці Дзяржаўнага гістарычнага музея на Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны кіруючыя органы імкнуліся ўскласці яго функцыі. Аднак, улічваючы змест калекцый апошняга і тэрміны, ў якія трэба было скончыць работы, спраектаваць разгорнутую экспазіцыю па гісторыі Беларусі было немагчыма. Адразу ж пасля адкрыцця новая экспазіцыя стала аб'ектам крытыкі Упраўлення агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б. Ад кіраўніцтва музея патрабавалі зняць тэму «Другі фронт», скараціць паказ матэрыялаў аб масавым знішчэнні яўрэяў у мінскім гета. Адначасова экспазіцыя крытыкавалася за схематычны паказ падзей на франтах вайны, даваеннай гісторыі Беларусі, а таксама першых пасляваенных гадоў[82].

У 1948-1949 гг. амаль ва ўсе залы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны былі ўнесены больш ці менш значныя па-

праўкі. Найбольш сур'ёзнай метадычнай распрацоўцы падлягалі цяжкія для музейнага паказу тэмы: «Савецкая Армія — вызваліцельніца народаў Еўропы ад гітлераўскага рабства», «Народная гаспадарка і культура Савецкай Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны» і інш. Адначасова прыводзілася ў парадак фондавая «гаспадарка» музея падчас адкрыцця першай стацыянарнай экспазіцыі палова прадметаў калекцый не была інвентарызавана, у тым ліку каля тысячы экспанатаў, якія знаходзіліся ў экспазіцыйных залах. Наладжваліся сувязі з прадпрыемствамі і навучальнымі ўстановамі горада з мэтай арганізацыі наведвання музея на сталым грунце. Новы імпульс далейшаму развіццю павінен быў надаць створаны ў 1950 г. Савет музея, куды ўвайшло 26 прадстаўнікоў навуковых і грамадскіх установ, а таксама музеяў горада.

Першае дзесяцігоддзе работы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўяўляе вялікую цікавасць для гістарыяграфіі Беларусі перыяду вайны і беларускага музеязнаўства як перыяд інтэнсіўнага збірання фондавых калекцый, творчых пошукаў у экспазіцыйнай рабоце, разнастайных, не заўсёда ўдалых, спроб зрабіць экспазіцыю найбольш «зразумелай» масаваму наведвальніку. За першыя 10 год музеям былі сабраны каштоўныя калекцыі, агульная колькасць якіх склала каля 60 тыс. адзінак захоўвання. За той жа час яго экспазіцыі агледзела звыш 600 тыс. чалавек[83].

Другі музей ваенна-гістарычнага профілю паўстаў у Кобрыне, калі ў 1946 г. урад рэспублікі прыняў пастанову аб неадкладным аднаўленні сядзібы А. В. Суворава. Гэта сядзіба разам з сямю тысячамі душ была ў 1795 г. падаравана генералісімусу Кацярынай II за падаўленне нацыянальна-вызваленчага паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. У першы пасляваенны год сядзіба ўяўляла змрочнае відовішча — абрушаны гонтавы дах, перакошаныя старыя драўляныя сцены, пустыя аконныя і дзвярныя праёмы, густа пераплеценыя калючым дротам. Такім яе убачыў А. М. Мартынаў[I], прызначаны на пасаду дырэктара пакуль што не існуючага Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава ў жніўні 1946 г.

З гэтага часу музей стаў галоўным аб'ектам прыкладання яго сіл і здольнасцей. Адначасова з аднаўленнем сядзібы А. М. Мартынаў распачаў збор матэрыялаў адпаведна профілю музея. Не абмяжоў-

---

[I] Мартынаў Аляксей Міхайлавіч (1904 1999) — музейны дзеяч. Нарадзіўся ў Кобрыне ў сям'і настаўніка, пасля заканчэння Рагачоўскага рэальнага вучылішча прадаваў настаўнікам. У 1922 г. вярнуўся ў Кобрын, дзе на працягу 1920 1930 х гг. працаваў на ўласнай гаспадарцы. У 1939 г. быў прызначаны мясцовымі савецкімі ўладамі на пасаду дырэктара гарадской бібліятэкі. Падчас нямецай акупацыі працаваў кладаўшчыком, аграномам, у 1944 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. З 194G па 1978 г. з'яўляўся дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. Б. Суворава.

ваючыся межамі БССР, ён вёў пошук помнікаў ваеннай гісторыі ў буйнейшых музеях краіны. На заклік аб аказанні дапамогі першым адазваўся Ваенна-гістарычны музей артылерыі, інжынерных войск і войск сувязі ў Ленінградзе, перадаўшы ў Кобрын значную колькасць прадметаў са свайго дублетнага фонду, пераважна зброю і абмундзіраванне. Неўзабаве пачалі прыходзіць каштоўныя прадметы з Міністэрства Узброеных Сіл, Эрмітажа, Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве, Дзяржаўнага ваенна-гістарычнага музея А. В. Суворава ў Ленінградзе і іншых установаў[84].

Гэтыя здабыткі дазволілі А. М. Мартынаву ў 1948 г. адкрыць для публічнага агляду першую экспазіцыю музея, якая складалася з трох аддзелаў: нашы вялікія продкі; А. В. Суવораў; Айчынная вайна 1812 г. Не ўсе вызначаныя тэмы былі ў ёй раскрыты з дапамогай рэчавых першакрыніц, вельмі нізкі быў узровень яе тэхнічнага абсталявання, амаль цалкам ігнаравалася беларуская ваенная гісторыя. Тым не менш, экспазіцыя адразу ж выклікала вялікую цікавасць сярод мясцовага насельніцтва. У канцы 1940-х — пачатку 1950-х гг. фондавыя калекцыі і экспазіцыя Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея значна ўзбагаціліся дзякуючы энтузіязму яго дырэктара. У пошуках матэрыялаў, звязаных з расійскай ваеннай гісторыяй, перш за ўсё эпохай Кацярыны II, ён наведаў каля 150 гарадоў СССР, адкуль прывёз тысячы рэчавых помнікаў і дакументаў, якія склалі аснову фондавага збору музея[85].

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе вяліся работы па арганізацыі мемарыяльных музеяў. У жніўні 1948 г. у Оршы распачаў сваю дзейнасць першы з іх — Музей К. С. Заслонава, прысвечаны вядомаму арганізатару і кіраўніку падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці[86].

У 1950 г. ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб рэканструкцыі сядзібы Дзяржынава ў Налібоцкай пушчы, дзе прайшлі дзіцячыя гады вядомага дзеяча РСДРП(б), старшыні Усерасійскай надзвычайнай камісіі Ф. Э. Дзяржынскага, і стварэнні ў ёй мемарыяльнага музея. Адкрыццё Музея Ф. Э. Дзяржынскага было прымеркавана да 25-годдзя з дня яго смерці ў ліпені 1951 г. Але, нягледзячы на тое, што падрадчыкам была будаўнічая арганізацыя Міністэрства дзяржаўнай бяспекі, а сама рэканструкцыя адбывалася за кошт сродкаў, выдаткаваных на школьнае будаўніцтва, адкрыццё музея ў Дзяржынава затрымалася на чвэрць стагоддзя[87].

Да стагоддзя з дня смерці славутага паэта ў 1955 г. было прымеркавана аднаўленне Дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагра-

дку, згарэўшага падчас вайны. Будынак рэканструіраваўся на месцы, дзе стаяў дом бацькоў паэта.

Фондавая база першых мемарыяльных музеяў БССР была вельмі вузкай, навуковая работа амаль не вялася. Усе намаганні іх супрацоўнікаў накіроўваліся на асветніцкую дзейнасць. Напрыклад, штат мемарыяльнага музея К. С. Заслонава складаўся з двух чалавек — дырэктара і прыбіральшчыцы. Пасаду навуковага супрацоўніка кіраўнік справамі Савета Міністраў БССР уласнаручна выкрасліў са штатнага раскладу музея.

Як і ў даваеннай БССР, у разглядаемы перыяд пэўная колькасць музеяў не падпарадкоўвалася аддзелу музеяў Наркамасветы і яго спадкаемцам у выглядзе адпаведных аддзелаў Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў і Міністэрства культуры. Яны ствараліся і з'яўляліся структурнымі падраздзяленнямі розных міністэрстваў, навуковых, навучальных устаноў, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, фінансаваліся імі і мелі назву ведамасных музеяў. Парадак стварэння, фінансавання і кіравання ведамаснымі музеямі нікім не быў рэгламентаваны, паняцце «ведамасны музей» распаўсюджвалася практычна на ўсе музеі, якія не ўваходзілі ў сістэму Міністэрства культуры, незалежна ад іх прававога статуса і заснавальніка. Сувязь з органамі кіравання музейнай справай яны ажыццяўлялі толькі па метадычных пытаннях. Прафесійны ўзровень і маштабы дзейнасці гэтых музеяў залежалі ад характару тых устаноў, дзе яны нарадзіліся. Першы такі музей, арганізацыя якога пачалася яшчэ падчас вайны, меў літаратурны профіль і падпарадкоўваўся Акадэміі навук БССР.

У ліпені 1942 г. была прынята пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Аб літаратурнай спадчыне народнага паэта БССР Янкі Купалы», згодна з якой пры АН БССР утваралася камісія для збору ўсіх матэрыялаў, што тычыліся жыцця і дзейнасці паэта[88]. Работа камісіі праводзілася па плану, распрацаваным удавой Я. Купалы — У. Ф. Луцэвіч[I]. Значная колькасць матэрыялаў, сабраных камісіяй, дазволіла ў 1943 г. узняць пытанне аб стварэнні музея, прысвечанага паэту. А у жніўні 1945 г. СНК БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Я, Купалы». У пастанове ішла гаворка аб будаўніцтве Дома-музея Я. Купалы ў Мінску і арганізацыі філіялаў: аднаго ў Вязынцы Радашковіцкага раёна — на радзіме паэта, другога у Ляўках

---

[I] Луцэвіч Уладзіслава Францаўна (1891-1960) музейны дзеяч, літаратуразнаўца. Нарадзілася ў в. Вішнева Валожынскага раёна, скончыла 2-гадовыя педагагічныя курсы ў Варшаве, на працягу 1908 1941 гг. на педагагічнай рабоце, у 1944 1960 гг. — дырэктар Літаратурнага музея Я. Купалы. Аўтар артыкулаў пра творчасць Я, Купалы, успамінаў пра яго, З. Бядулю, Цётку, укладальнік шэрагу зборнікаў для дзяцей. Заслужаны дзеяч культуры БССР.

Аршанскага раёна, дзе да вайны было лецішча Купалы. Першапачаткова музей знаходзіўся ў падпарадкаванні АН БССР. Яму былі перададзены некалькі пакояў у будынку Дома прафсаюзаў, дзе ў той час ужо знаходзіліся два музеі — гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Мастацкі.

У першыя гады існавання музея Я. Купалы пад кіраўніцтвам яго дырэктара У. Ф. Луцэвіч была разгорнута актыўная збіральніцкая работа. Фарміраваць фондавыя калекцыі ёй дапамагалі навуковыя супрацоўнікі музея — паэт і грамадскі дзеяч В. П. Таўлай, літаратуразнаўцы А. І. Александровіч і І. К. Жыдовіч. Паралельна вялася распрацоўка асобных пытанняў біяграфіі і творчасці паэта. Гэта работа ўскладнялася тым, што мінскі дом Я. Купалы ў гады нямецкай акупацыі згарэў разам з бібліятэкай і архівам. Тым не менш, у выніку пошукаў у архівах і дапамогі з боку прыватных асоб былі сабраны амаль усе выданні кніг Я. Купалы, яго рукапісы, асабістыя рэчы, фотаздымкі, успаміны сяброў. На аснове гэтых матэрыялаў у верасні 1945 г. адкрылася першая невялікая экспазіцыя музея ў Мінску, а ў чэрвені 1948 г. — яго філіяла на радзіме песняра ў Вязынцы.

У 1950 г. музей пераехаў у новы будынак па вуліцы Энгельса, 27, дзе ў наступным годзе адбылося яго ўрачыстае адкрыццё. У пяці экспазіцыйных залах музея дэманстравалася каля тысячы экспанатаў, з дапамогай якіх былі адлюстраваны дзве тэмы: «Я. Купала — паэт і драматург» і «Адлюстраванне асобы паэта ў творах мастацтва». Трэба адзначыць, што ў абедзьвюх экспазіцыях асноўны акцэнт рабіўся на творчасць Я. Купалы пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, у цэлым яны давалі спрошчаную, ідэалагізаваную інтэрпрэтацыю яго жыцця.

З'яўляючыся адной з устаноў АН БССР, Музей Я. Купалы ўжо ў першыя пасляваенныя гады распачаў актыўную навуковую работу. Пачынаючы з 1946 г. у ім штогод праводзіліся купалаўская чытанні, у якіх прымалі ўдзел навукоўцы і пісьменнікі з розных рэспублік СССР. Праводзілася сістэматызацыя і падрыхтоўка да друку рукапісаў, складаліся жыццёвы летапіс і бібліяграфічны даведнік твораў, да 70-годдзя з дня нараджэння паэта быў выдадзены юбілейны зборнік.

Акрамя Музея Я. Купалы, Акадэмія навук мела яшчэ адзін музей у Інстытуце геалогіі. Гэты музей складаўся з трох аддзелаў: сістэматычнага, геалогіі і стратыграфіі, карысных выкапняў БССР. Для шырокай публікі ён быў закрыты[89].

Першым музеем ВНУ, які ўзнавіў сваю работу ў пасляваенны перыяд, быў Заалагічны музей Белдзяржуніверсітэта. Яго ўзнаўленню надавалася асаблівае значэнне — гэта быў другі (пасля Гродзенскага

прыродазнаўчага музея) музей прыродазнаўчага профілю ў БССР. Заалагічны музей распачаў сваю дзейнасць у 1944 г. на аснове фрагментаў калекцый, захаваных прэпаратарам-таксідэрмістам А. К. Цітком. Канец 1940-х — пачатак 1950-х гг. былі часам хуткага павялічэння калекцый: біяматэрыялы збіраліся падчас палявых выездаў, дублеты перадалі заалагічныя музеі некаторых ВНУ СССР, а таксама прыватныя асобы. Планамерныя паступленні ішлі з заснаванай у 1946 г. біялагічнай станцыі на возеры Нарач. Значную колькасць арніталагічнага матэрыялу, а таксама ўзораў амфібій і рэптылій дала экспедыцыя 1953 г. пад кіраўніцтвам А. К. Цітка. Вывучэнне і сістэматызацыя сабраных калекцый дазволілі ў хуткім часе распачаць іх выкарыстанне ў выкладанні шэрагу вучэбных дысцыплін на біялагічным факультэце БДУ[90].

Аналагічныя работы па ўзнаўленню геолага-мінералагічных калекцый пачаліся ў 1948 г. на геаграфічным факультэце Белдзяржуніверсітэта пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры геалогіі прафесара А. В. Фурсенкі і выкладчыка С. Д. Калусоўскага. У аснову Геалагічнага музея былі пакладзены рэшткі даваенных калекцый, захаваных Н. Е. Кавалёвым[I]. Неўзабаве фонды музея ўзбагаціліся палеанталагічнай і мінералагічнай калекцыямі, перададзенымі адпаведна АН БССР і АН СССР, каштоўнае музейнае і лабараторнае абсталяванне падараваў Маскоўскі дзяржаўны універсітэт, вялікая колькасць геалагічных узораў была дастаўлена студэнтамі-геолагамі БДУ пасля летняй практыкі 1954 г. на Паўднёвым Урале[91].

Важны ў навуковых адносінах музей прыродазнаўчага профілю ў 1951 г. быў створаны ў дзяржаўнай запаведна-паляўнічай гаспадарцы «Белавежская пушча». Камплектаванне яго калекцый на працягу другой паловы 1940-х гг. праводзілі вядомыя вучоныя-натуралісты з Мінска і Масквы. Экспанаты Музея прыроды ў Белавежскай пушчы — больш за 50 відаў млекакормячых і 200 відаў птушак - былі арганізаваны ў жывапісныя біягрупы. Яны адрозніваліся высокай якасцю і прафесіяналізмам выроблівання (некаторыя экспанаты музея дэманстраваліся ў беларускім павільёне на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве). Больш сціплыя былі дасягненні Музея прыроды ў галіне навукова-асветніцкай працы. За першы год яго экспазіцыю агледзела каля 5 тыс. чалавек[92].

---

[I] На базе гэтых калекцый, паўстаўшых на аснове прыватнага збору акадэміка М. Ф. Блядухі, у чэрвені 1941 г. рыхтаваўся да адкрыцця Музей мінералогіі і петраграфіі БДУ.

* * *

Такім чынам, на пачатак 1951 г. у рэспубліцы працавала 22 музеі. Аб маштабах іх фондавай і асветніцкай дзейнасці сведчаць дадзеныя, прыведзеныя ў Табліцы 1 (Брэсцкі і Магілёўскі музеі працавалі над стварэннем сваіх сталых экспазіцый, Полацкі музей быў закрыты на рамонт, звестак аб дзейнасці некаторых ведамасных музеяў няма)[93].

Табліца 1

| **Назва музея** | **Ведамасная падпарадкаванасць** | **Колькасць адзінак захоўвання** | **Колькасць наведвальнікаў** | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Сталыя экспазіцыі | Выстаўкі |
| Баранавіцкі абласны краязнаўчы музей у г. Слоніме | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 4571 | 6 537 | 7 800 |
| Бабруйскі абласны краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асетніцкай работы | 6 800 | 68 000 | 17 000 |
| Брэсцкі абласны краязнаўчы музей | Абласны аддзел кул ьтур на-светны цкай работы | 22 320 | - | 18 400 |
| Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава | Абласны аддзел культурна-асветні цкай работы | 4 588 | 30 321 | 12 000 |
| Віцебскі абласны гісторыка-краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 363 240 | 38 023 | 20 310 |
| Аршанскі музей імя К. С. Заслонава | Гарадскі аддзел культурна-асветніцкай работы | 786 | 105 239 | |
| Гомельскі абласны гісторыка-краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 11 253 | | 146 200 |
| Ваўкавыскі краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 6 130 | 22 103 | |
| Дзяржаўная карцінная галерэя БССР | Упраўленне па справах Мастацтва пры СМ БССР | 1 500 | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | Камітэт па справах культурна-асветніцкіх установ пры СМ БССР | 62 962 | 46 596 | 200 000 |
| Дом-музей I з'езда РСДРП | Камітэт на справах культурна-асветніцкіх установ пры СМ БССР | 315 | 19 831 | - |
| Гродзенскі гісторыка-краязнаўчы музей | Камітэт па справах культурна-асветніцкіх установ пры СМ БССР | 57 317 | 23 373 | 20 000 |
| Геолага-мінералагічны музей БДУ | Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР | 2 000 | - | - |
| Заалагічны музей БДУ | Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР | 5 093 | - | - |
| Літаратурны музей Я. Купалы | Акадэмія навук БССР | 2 000 | 17 000 | - |
| Геалагічны музей Інстытута геалогіі | Акадэмія навук БССР | _ | - | - |
| Барысаўскі краязнаўчы музей | Гарадскі аддзел культурна-асветніцкай работы | 919 | - | - |
| Магілёўскі абласны краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніццкай работы | 5 403 | - | - |
| Пінскі абласны гісторыка-краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 22 320 | 9 875 | 8 645 |
| Палескі абласны краязнаўчы музей у Мазыры | Абласны аддзел культурна-асветніцкай работы | 917 | 1 708 | |
| Тураўскі раённы краязнаўчы музей | Раённы аддзел культурна-асветніцкай работы | 306 | - | - |
| Полацкі абласны краязнаўчы музей | Абласны аддзел культурна-асветніцкіх установ | 2 000 | | |

У 1950 г. у музеях БССР працаваў 81 павуковы супрацоўнік, з якіх толькі 47 мелі вышэйшую адукацыю.

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе прадэманстравала відавочныя поспехі БССР у галіне музейнага будаўніцтва. Была адноўлена значная частка даваенных музеяў. На жаль, не ўдалося аднавіць

Беларускі дзяржаўны музей, Беларускі музей імя І. Луцкевіча, Музей рэвалюцыі, Прыродазнаўчы музей Інбелкульта, Цэнтральны педагагічны музей, Музей працы, Мастацкую галерэю Ю. М. Пэна, мемарыяльныя музеі Т. Касцюшкі, Э. Ажэшкі, С. Арджанікідзе, антырэлігійныя музеі ў Віцебску, Гомелі, Магілёве, а таксама шэраг краязнаўчых, сельскагаспадарчых і прамысловых музеяў. Але за кошт стварэння шэрагу новых у колькасных паказчык даваенная сетка музеяў была адноўлена.

Было арганізавана кіраўніцтва музейнай справай, закладзены асновы музейнага заканадаўства, створана сістэма ўліку і захавання фондавых калекцый, зроблены першыя крокі ў накірунку «рэабілітацыі» аўтэнтычнага помніка ў экспазіцыі, нарэшце, шэраг музеяў сталі сапраўднымі навукова-асветніцкімі цэнтрамі.

Трэба адзначыць, што у гэты складаны час дасягненнямі ў галіне музейнага будаўніцтва мы абавязаны лепшым прадстаўнікам прафесіі, якія, не абмяжоўваючыся практычнай работай, звярталіся да кіраўніцтва з праектамі і прапановамі, выкананне якіх узнімала музейную справу Беларусі на новую, якасна вышэйшую прыступку[I].

Разам з тым, гэтыя гады прадэманстравалі адносіны кіраўніцтва рэспублікі да музеяў як да аднаго са сваіх ідэалагічных падраздзяленняў, што адмоўна адбілася перш за ўсё на іх навукова-даследчай і фондавай рабоце. Па-ранейшаму слабай была матэрыяльная база музеяў, недастатковы ўзровень падрыхтоўкі кадраў.

Цяжкае становішча музеяў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе тлумачылася, з аднаго боку, аб'ектыўнымі эканамічнымі цяжкасцямі ва ўсіх сферах сацыяльнага і эканамічнага жыцця. З другога, яно з'яўлялася вынікам непавагі і пагарды, якія склаліся яшчэ ў даваенны час у большасці прадстаўнікоў партыйна-дзяржаўнага апарату ў адносінах да музеяў, у аснове якіх было неразуменне або нежаданне разумець важнасць захавання нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. Нізкі культурны ўзровень большасці апаратных работнікаў таксама быў адной з прычын шматлікіх музейных пакут.

[1] НАР Б. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 482. Арк. 41.
[2] Архіў ЛКМ. Ф. 154. Спр. 2.
[3] Там жа, Ф. 790. Воп. І. Спр. 5. Арк. 6, 19, 24.
[4] Курчицкий А. В. Страницы истории... С. 17-33.

---

[I] Напрыклад, у 1946 г. дырэктар Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны М. Я. Гракаў звярнуўся з лістом да старшыні Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў М. А. Мінковіча, у якім прапаноўваў стварыць у Мінску музейны гарадок, адкрыць факультэт музеязнаўства ў БДУ, пачаць выданне беларускага музейнага часопіса.

[5] НАРБ. Ф. 790. Воп. І. Спр. 40. Арк. 23, 93 ЮЗ.

[6] Эпізод знікнення крыжа атрымаў досыць шырокае асвятленне ў артыкулах беларускіх гісторыкаў і журналістаў, надрукаваных на працягу 1990-х гадоў. Гл.: Тоўсцік А. Куды быў вывезены крыж святой Ефрасінні? (агляд друку) // Вяртанне — 3. Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мн., 1996. С. 230-232.

[7] Вяртанне. Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Мн, 1992. С. 111-121.

[8] Максакова Л. В. Спасение культурных ценностей в годы Великой Отечественной войны. М., 1990. С. 12.

[9] Платонов Р. П. Белоруссия, 1941-й: известное и неизвестное. Мн, 2001. С. 85.

[10] Мальдзіс А. Трагічныя лёсы беларускіх музейных, бібліятэчных і архіўных збораў у час Другой сусветнай вайны // Вяртанне-3. Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мн., 1996. С. 8.

[11] Вяртанне. Дакументы і архіўныя матэрыялы... С. 70-107.

[12] Каталог работ мастака-дэкаратара Оскара Пятровіча Марыкса. Мн., 1941.

[13] НАРБ. Ф. 790. Воп. І. Спр. 68. Арк. 22, 23.

[и] Писаненко А. Д., ПІкляров Л. П. История зоологического музея... С. 12.

[15] Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Документы и материалы. Мн., 1965. С. 188.

[16] Шишко Е. И., Ключарев А. А., Курарко А. Н. Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный медицинский институт. Мн., 1991. С. 11, 15, 16.

[17] Там жа. С. 215.

[18] НАРБ Ф. 790. Воп. 1. Спр. 68. Арк, 13-21.

[19] Чарныш А. П. Ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна... С. 209.

[20] НАРБ. Ф. 790. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 1.

[21] Там жа. Спр. 4. Арк. 5.

[22] Преступления немецко-фашистских оккупантов... С. 30.

[23] Мы гэтак шмат страцілі // Літаратура і мастацтва. 1991. 26 ліпеня. С. 14 15.

[24] І.М. Слонімскі музей // Новы шлях. 1943. № 19. С. 12.

[25] Новы шлях. 1943. № І. С. 9.

[26] Пінська газета. 1942, 15 ліп.

[27] Новы шлях. 1944. № 8. С. 7.

[28] З успамінаў Я. Шутовіча // Спадчына. 1995. № І. С. 38.

[29] Там жа. С. 40.

[30] НАРБ. Ф. 790. Воп. І. Спр. 68. Арк. 10.

[31] Там жа. Ф. 974. Воп. І. Спр. 15. Арк. 340,

[32] Там жа. Ф. 790. Воп. І. Спр. З. Арк. 32.

[33] Там жа. Спр. 5. Арк. 24.

[34] Там жа. Спр. 40. Арк. 12.

[35] Нюрнбергский процесс. М., 1958. Т, З. С. 519.
[36] НАРБ. Ф 790. Воп. I. Спр, 3. Арк. 49.
[37] Там жа. Арк. З.
[38] Там жа.
[39] Там жа.
[40] Там жа. Ф. 7. Воп. З. Спр. 205. Арк. 110.
[41] Там жа.
[42] Там жа. Ф. 790. Воп. I. Спр. 112. Арк. 28.
[43] Там жа. Спр. 347. Арк. 30.
[44] Там жа. Ф. 974. Воп. I. Спр. 46. Арк. 283.
[45] Там жа. Ф. 790. Воп. I. Спр. 40. Арк. 10.
[46] Там жа. Арк. 23.
[47] Там жа. Арк. 4.
[48] Курчицкий А. В. Страницы истории ... С. 29.
[49] НАРБ. Ф. 7. Воп. 3. Спр. 695. Арк. 370.
[50] Там жа. Спр. 1529. Арк. 38.
[51] Кондратьева Л. Ф. Из истории Могилёвского областного краеведческого музея... С. 104.
[52] Матэвушаў В. Абласны краязнаўчы музей //За Радзіму. 1950. 26 снежня.
[53] НАРБ. Ф. 7. Воп. 3. Спр. 22. Арк. 6.
[51] Там жа. Ф. 790. Воп. I. Спр. 5. Арк. 12, 34.
[55] Там жа. Ф. 7. Воп. З. Спр. 1479. Арк. 30.
[56] Воронин Н. Н. Древнее Гродно: (По материалам археологических раскопок 1932 1949 гг.). М, 1954.
[57] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 246.
[58] Из воспоминаний сотрудницы музея К. Т. Ковальской // Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Краязнаўчыя запіскі. Вып. 4 Гродна, 1997. С. 176.
[59] Салаўёва А. А., Царук В. М. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей... С. 5.
[60] НАРБ. Ф. 790. Воп. I. Спр. 39. Арк. 19.
[61] Там жа. Ф. 7. Воп. 4. Спр. 3014. Арк. 456.
[62] Лазнявой А. Сумная гісторыя // Звязда. 1956. 12 кастр.
[63] Шавров П. Музей в Мінске // Сталинская молодёжь. 1946. 18 сентября.
[64] Марголіна Р. Палеская скарбніца// Беларуская мінуўшчына. 1997. № З. С. 63.
[65] Хурсан I. Музей, які адстае ад жыцця // Звязда. 1951. 5 кас ір.
[66] НАРБ. Ф. 7. Воп. З. Спр. 290. Арк. 269.
[67] Там жа. Ф. 974. Воп. I. Спр. 25. Арк. 283.
[68] Там жа. Ф. 790. Воп. I. Спр. 37. Арк. 11.
[69] Басак Ул. У крывым люстэрку // Звязда. 1953. 6 студз.
[70] НАРБ. Ф. 7. Воп. З. Спр. 18. Арк. 99.

[71] Карачун Ю. А. Государственному художественному музею 50 лет // Сообщения государственного художественного музея БССР. Вып. I. Мн., 1994. С. 8.

[72] Китанина С. И. Хроника музея за 50 лет (24.01.1939 24.01.1089) // Сообщения государственного художественного музея... С. 191.

[73] Спіс каштоўнасцей, якія перададзены Польскай рэспубліцы ў жніўні 1950 г. (Складальнік А. Зайцаў) // Вяртанне. Дакументы і архіўныя матэрыялы ... С. 194 201.

[74] НАРБ. Ф. 790. Воп. I. Спр. З. Арк. 69.

[75] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Мн., 1986. Т. 4. С. 46.



[76] НАРБ. Ф. 790. Воп. і. Спр. 182. Арк. 1.

[77] Воронкова И. Ю. Создание и становление... С. 5.

[78] Савецкая Беларусь. 1942. 28 кастр.

[75] НАРБ. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1251. Арк. 57.

[80] Щербаков А. Обманчивая тишина музея // Огонёк. 1981. № 20. С. 8.

[81] Звязда. 1944. 5 жніўня.

[82] НАРБ. Ф. 790. Воп. 1. Спр. 154. Арк. 39.

[83] Там жа. Ф. 974. Воп. I. Спр. 45. Арк. 93.

[84] Мартынаў А. Тут жыў палкаводзец // Літаратура і мастацтва. 1976. 17жн. С. 16.

[85] Кукса М. А в Лувре вы бывали? // Заря. 1989. 30 Сент.

[86] НАРБ. Ф. 7. Воп. З. Спр. 282. Арк. 21.

[87] Там жа. Ф. 790. Воп. I. Спр. 244. Арк. З.

[88] Пуцявінамі Янкі Купалы: дакументы і матэрыялы. Ми., 1981. С. 274.

[89] НАРБ. Ф. 790. Воп. I. Спр. 346. Арк. 12.

[90] Писаненко А. Д., Шкляров Л. П. История зоологического музея... С. 14.

[91] Таинственный мир камня. Путеводитель по музею землеведения. Мн., 2000. С. 9.

[92] НАРБ. Ф. 7. Воп. 4. Спр. 3334. Арк. 189.

[93] Там жа. Ф. 790. Воп. 1. Спр. 346. Арк. 7-13.

## Глава II.

## МУЗЕІ З СЯРЭДЗІНЫ 1950-х ДА КАНЦА 1960-х ГАДОЎ

Новы маральна-палітычны клімат у СССР, які ўзнік пасля смерці Сталіна і асабліва пасля XX з'езда КПСС, грамадскі ўздым пасля асуджэння культу асобы, працэс дэмакратызацыі жыцця ў краіне не маглі не адбіцца на музейнай дзейнасці. Новыя ідэалагічныя задачы вызначалі новыя патрабаванні да музеяў, перш за ўсё да зместу іх экспазіцый і навукова-асветніцкай дзейнасці.

Ідэалогія «адлігі» знайшла сваё адлюстраванне ў матэрыялах XX, XXI, XXII з'ездаў КПСС і шэрагу пастаноў ЦК КПСС другой паловы 1950-х гг. Пастановы ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы папулярнага навучальнага дапаможніка «Асновы марксізму-ленінізму», «Аб 100-годдзі з дня нараджэння Г. В. Пляханава», «Аб 40-й гадавіне лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі» і інш. прапаноўвалі больш аб'ектыўны погляд на вузлавыя пытанні савецкай гісторыі і спрыялі пачатку работ па перабудове экспазіцый і стварэнню новых музеяў. Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб некаторых зменах у выкладанні гісторыі ў школах» абумовіла раскрыццё ў экспазіцыях гістарычных музеяў новых тэм, а менавіта ролі народных мас і значэння асобы ў гісторыі.

Працэс рэабілітацыі рэпрэсіраваных палітычных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры даў магчымасць пачаць камплектаванне і экспанаванне матэрыялаў аб шматлікіх удзельніках гістарычных падзей, памяць аб якіх імкнуліся закрэсліць у гады культа. На жаль, гэты працэс не быў рашучым і насіў палавінчаты характар, што, у прыватнасці, адбілася на дзейнасці савецкіх гісторыкаў, якія, не паспеўшы выкарыстаць магчымасць гаварыць праўду аб удзельніках кастрычніцкай рэвалюцыі, былі ў 1957 г. рэзка асуджаны пастановай ЦК КПСС «Аб часопісе «Пытанні гісторыі» за спробы рэабілітаваць апартуністаў, адыход ад прынцыпаў партыйнасці і г. д.

Працэс аздараўлення, распачаты XX з'ездам КПСС, даў работнікам музеяў надзеі на вырашэнне шматлікіх застарэлых праблем, адкрыццё новых перспектыў у рабоце. Да разглядаемага перыяду адносіцца пашырэнне культурных сувязяў СССР з замежнымі краінамі. У 1957 г. было афармлена ўступленне савецкіх музейных арганізацый у Міжнародны савет музеяў. Першы савецкі камітэт Міжнароднага савета музеяў узначаліў член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў, дырэктар Дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна А. І. Замошкін. Пачалі ўсталёўвацца і непасрэдныя кантакты буй-

нейшых музеяў СССР з музеямі замежных (пераважна сацыялістычных) краін. Гэта былі, безумоўна, пазітыўныя змены. Аднак за ўвесь перыяд «хрушчоўскай адлігі» змянілася няшмат. Па-ранейшаму асноўная ўвага партыйна-дзяржаўных органаў была сканцэнтравана на выкананні музеямі выключна ідэалагічных задач пры мінімальных выдатках і захаванні дырэктыўных метадаў кіраўніцтва.

Асабліва паўплывала на дзейнасць музеяў у гэты перыяд пастанова ЦК КПСС «Аб задачах партыйнай прапаганды ў сучасных умовах», прынятая ў 1960 г. У ёй былі вызначаны асноўныя напрамкі ідэалагічнай работы ў СССР, формы і метады яе ажыццяўлення. Згодна з гэтай пастановай, усе сродкі прапаганды павінны былі раскрываць перавагі сацыялізму, выдатныя дасягненні ва ўсіх галінах грамадскага жыцця ў мэтах выхавання савецкіх людзей у духу савецкага патрыятызму і нацыянальнай годнасці. Натуральна, што ўся ўвага музеяў павінна была сканцэнтравацца на вывучэнні пытанняў сучаснага этапу камуністычнага будаўніцтва, раскрыцці ролі КПСС як вядучай і кіруючай сілы.

На адлюстраванне ў экспазіцыях сучасных працэсаў у савецкім грамадстве, на барацьбу за далейшы пад'ём народнай гаспадаркі і культуры ў сваёй мясцовасці, на збліжэнне з практычнымі задачамі сённяшняга дня арыентавалі музеі літаральна ўсе дырэктыўныя матэрыялы Міністэрства культуры БССР. Адным з практычных крокаў па забеспячэнню музеяў матэрыяламі па сучаснасці было распараджэнне Савета Міністраў БССР ад 4 ліпеня 1958 г. аб перадачы музеям узораў, мадэляў і макетаў вырабаў прамысловасці[1]. Дадзенае распараджэнне паспрыяла таму, што многія музеі атрымалі ў фонды ўзоры прадукцыі, а таксама ўзнагароды прадпрыемстваў.

Напрыканцы 1950-х гг. значна ўзрастаюць цікавасць і ўвага да пытанняў аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры. Гэтаму паспрыяў агульны працэс дэмакратызацыі жыцця краіны, турыстычны рух, цікавасць да айчыннай культуры, гісторыі, прыроды. Усё гэта вымагала ўлады звярнуць увагу на каштоўныя помнікі, многія з якіх былі занятыя самымі рознымі арганізацыямі. У 1958 г. у ЦК КПСС з удзелам прадстаўнікоў Акадэміі навук СССР і дзеячаў культуры абмяркоўваўся законапраект аб паляпшэнні аховы помнікаў і дзейнасці музеяў. Практычным вынікам гэтага абмеркавання была арганізацыя ў тым жа годзе на базе шэрагу расійскіх музеяў (Наўгародскага, Уладзімірскага, Кастрамскога, Горкаўскага) музеяў-запаведнікаў, а таксама падрыхтоўка да турыстычнага агляду архітэктурных помнікаў. У 1961 г. былі адкрыты для наведвальнікаў музеі Маскоўскага Крамля.

У БССР рух за ахову архітэктурных і археалагічных помнікаў атрымаў больш сціплы водгук. У 1959 г. спецыяльным загадам міністра культуры БССР была распачата работа па пашпартызацыі помнікаў гісторыі, археалогіі і мастацтва ў маштабах рэспублікі. Адказнасць за правядзенне гэтых работ тым жа загадам міністэрства ўсклала на абласныя гісторыка-краязнаўчыя музеі. Паралельна з правядзеннем пашпартызацыі супрацоўнікі гэтых музеяў павінны былі «сістэматычна весці назіранні за захаванасцю помнікаў, паведамляць аб спробах зносу або вядзення раскопак без адкрытага ліста»[2]. Іншымі словамі, на музеі БССР дзяржавай была ускладзена адказнасць за ўлік і захаванне не толькі рухомай, але і нерухомай нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. Нагадаем, што тыя ж абавязкі ўскладала на музеі «Тыповае палажэнне аб музеях Беларускай ССР» 1945 г. Жыццё паказала, што ва ўмовах супрацьдзеяння ахоўным мерапрыемтвам гаспадарнікаў розных узроўняў, страшэннага занядбання саміх помнікаў, а таксама абмежаванай колькасці і невысокай кваліфікацыі навуковага персаналу абласных музеяў гэта патрабаванне яны выканаць не маглі. І ўсё ж, нягледзячы на відавочную безвыніковасць папярэдняй спробы, міністэрства паранейшаму трымалася погляду на музеі як на найлепшы орган захавання нерухомай спадчыны. Акрамя таго, у 1959 г. Міністэрства культуры БССР выдала інструкцыю па ўліку і захаванню музейных фондаў, паводле якой была ўведзена сучасная стандартная ўліковая дакументацыя.

Наступны важны крок у гэтым накірунку быў зроблены ў 1967 г., калі ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі пастанову «Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў БССР»[3]. Падчас прыняцця пастановы ў рэспубліцы ўжо дзейнічала Беларускае дабраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, створанае ў 1966 г. і меўшае каля тысячы пярвічных арганізацый, якія аб'ядноўвалі больш 80 тыс. членаў[4]. Аднак задачы рэстаўрацыі і кансервацыі вымагалі дзяржаўнага, прафесійнага падыходу. Непасрэднымі вынікамі пастановы было стварэнне ў складзе Міністэрства культуры Дзяржаўнай інспекцыі па ахове помнікаў і навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў. У штаты Дзяржаўнага музея БССР і абласных музеяў уводзілася пасада навуковага супрацоўніка па ахове помнікаў. Актывізаваліся работы па выяўленню і ўліку помнікаў, пачалося стварэнне вакол іх ахоўных зон і зон рэгулявання забудовы. Нарэшце чатыры помнікі — Верхні і Ніжні замкі разам з Сафійскім саборам у Полацку, Замкавая гара з усімі архітэктурнымі і гістарычнымі помнікамі ў Гродна, Замкавая гара і

могільнік у Пінску і гарадзішча з Прэабражэнскай царквой у Заслаўі былі абвешчаны архітэктурна-археалагічнымі запаведнікамі.

У 1962 г. ЦК КПСС прыняў рашэнне аб неабходнасці больш эканомнага выдаткавання сродкаў на сацыяльна-культурныя патрэбы. Выконваючы гэта рашэнне, адначасова са скарачэннем фінансавання выдавецтваў, тэатраў, канцэртных арганізацый, Савет Міністраў БССР падрыхтаваў план скарачэння выдаткаў на ўтрыманне сеткі краязнаўчых музеяў. Паступілі адпаведныя прапановы і з Міністэрства культуры. У выніку ў 1962 г. Ашмянскі, Бярозаўскі, Крычаўскі, Лепельскі, Рэчыцкі, Слуцкі, Столінскі і Тураўскі дзяржаўныя раённыя краязнаўчыя музеі былі пераўтвораны ў народныя са скарачэннем усіх штатных адзінак[5]. Гэта ва ўмовах адсутнасці альтэрнатывы дзяржаўнаму фінансаванню культуры ў БССР азначала іх фактычнае знішчэнне.

Да разглядаемага перыяду адносіцца пачатак дыскусіі ў беларускім друку аб ролі мастака ў стварэнні музейнай экспазіцыі і аб экспазіцыйным дызайне ў цэлым. Дагэтуль задачы экспазіцыйнай работы вырашаліся згодна з распрацаванымі ў кіраўнічых органах методыкамі, якія замацоўвалі не толькі догмы ў галіне зместу экспазіцый, але і стэрэатыпы іх прасторава-пластычнага вырашэння і, як вынік, спрыялі уніфікацыі музеяў. Да сярэдзіны 1950-х гг. у СССР склалася асаблівая вузкадыдактычная версія экспазіцыі гісторыка-краязнаўчага музея, у аснову якой быў пакладзены тэматыка-экспазіцыйны комплекс. Працэс дэмакратызацыі культурнага жыцця падчас «адлігі» адразу ж закрануў «візітную картку» музея — яго экспазіцыю. Першапачаткова музейныя экспазіцыі «новай хвалі» з'явілся ў Маскве — спачатку часовыя, а потым стацыянарныя. Першым агульнапрызнаным поспехам быў Музей А. С. Пушкіна ў Маскве, які адкрыўся ў 1961 г. Адмовіўшыся ад трафарэтнай, хрэстаматыйнай інтэрпрэтацыі жыцця паэта, ён прапанаваў узор аўтарскага прачытання тэмы. Пошукі новай экспазіцыйнай мовы, што адбываліся ў сталічных музеях, былі заўважаны беларускімі мастакамі.

Пачатак дыскусіі на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» быў пакладзены артыкулам вядомага беларускага мастацтвазнаўцы і мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аўтара шэрагу экспазіцыйных праектаў у музеях Масквы і Ленінграда А. А. Сурскага. У прыватнасці, ён пісаў: «На самай справе, колькі яшчэ суму, шэрасці, аднастайнасці ў нашых музеях. Як часта з-за неўмелай падачы матэрыялаў тут застаюцца незаўважанымі каштоўныя рэліквіі, і наведвальнікі праходзяць абыякава міма іх. Прычына — невыразнасць музейных экспазіцый. Стэрэатыпнае сіметрычнае размяшчэнне на

сценах і стэндах у некалькі радоў ад падлогі да столі шматлікіх дакументаў і фатаграфій у аднолькавых рамках, непрыгожыя і нязручныя вітрыны і шафы, забітыя экспанатамі, казённыя этыкеткі з надпісамі, выпадковыя карціны і скульптуры ператвараюць музеі ў бясстрасных захавальнікаў гісторыі. Ва ўсім гэтым шмат непрафесіянальнага, несур'ёзнага стаўлення да сур'ёзнай і адказнай справы.»[6]

Іншыя ўдзельнікі дыскусіі таксама дэманстравалі на канкрэтных прыкладах недахопы ў мастацкім вырашэнні музеяў, адзначалі значэнне работы мастака для ўзмацнення камунікацыйных магчымасцей музея, прапаноўвалі мадэрнізіраваць выкарыстоўваемыя ў ім пластычныя сродкі. Было прапанавана нямала экспазіцыйных рашэнняў, якія дазвалялі індывідуалізаваць збор, адысці ад стэрэатыпаў. Ініцыятарамі спроб пераадолець існуючую сітуацыю былі пераважна мастакі, якія імкнуліся рэалізаваць у музеях свой вопыт работы ў дызайне і стварэнні немузейных выставак. Прапановы пераадолець у музеі практыку стылізатарства і ілюстравання, выкарыстоўваць сродкі прасторава-вобразнага сінтэзу, які развіваўся перадавым мастацтвам таго часу, гучалі таксама з боку музейных кіраўнікоў[7].

Трэба адзначыць, што вынікі дыскусіі амаль не паўплывалі на існаваўшую ў беларускіх музеях экспазіцыйную практыку. Тое, што было магчыма пры стварэнні немузейных выставак, у музеях сутыкалася з непераадольнай руціннай практыкай, якая адводзіла мастаку толькі ролю «афарміцеля» стэрэатыпных экспазіцыйных рашэнняў. Нягледзячы на некалькі удалых праектаў, рэалізаваных у 1960-я гг., у цэлым праблемы музейнага дызайна ў БССР абмяркоўваліся толькі на старонках спецыяльнага друку і ў кулуарах.

12 мая 1964 г. ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных»[8]. Задачы, якія былі пастаўлены ў пастанове, можна аб'яднаць у некалькі асноўных блокаў: 1) абавязковая арганізацыя ва ўсіх музеях, акрамя мемарыяльных, аддзелаў савецкай гісторыі; 2) умацаванне сувязі музеяў з прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, іншымі ўстановамі, пашырэнне краязнаўчага руху; 3) пашырэнне ўсіх форм масава-палітычнай работы, асабліва ў сельскай мясцовасці; 4) упарадкаванне сеткі музеяў рэспубліканскага і мясцовага значэння, удакладненне іх профіляў, стварэнне новых музеяў толькі з дазволу ЦК кампартый саюзных рэспублік па прадстаўленню органаў культуры і толькі калі маюцца сапраўдныя каштоўныя матэрыялы і памяшканні для экспазіцый. Акрамя таго, у пастанове Міністэрству культуры СССР сумесна з Прэзідыумам Акадэміі навук СССР было

прапанавана распрацаваць «Палажэнне аб музейным фондзе СССР», а таксама «Прынцыпы развіцця музейнай справы ў краіне».

Як бычым, у дадзенай пастанове былі замацаваны ўжо існуючыя к таму часу асноўныя погляды ўлады на сутнасць музейнай дзейнасці: дэманстрацыя поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва, пашырэнне масава-асветніцкай работы, упарадкаванне сеткі музеяў. Разам з тым, даручэнне распрацаваць «Палажэнне аб музейным фондзе СССР» і «Прынцыпы развіцця музейнай справы ў краіне» давалі надзею на выпрацоўку навукова абгрунтаванай праграмы музейнага будаўніцтва, якая, на жаль, цалкам не была рэалізавана.

2 ліпеня 1965 г. саюзным урадам была прынята пастанова «Аб музейным фондзе Саюза ССР»[9]. На аснове дадзенай пастановы Міністэрства культуры СССР у тым жа годзе зацвердзіла «Палажэнне аб музейным фондзе Саюза ССР». Гэты дакумент вызначаў агульныя ўяўленні аб музейным фондзе, склад, арганізацыю і парадак яго выкарыстання, змест фондавай работы, а таксама ўзаемаадносіны музеяў з іншымі ўстановамі, якія захоўваюць гісторыка-культурную спадчыну. «Палажэнне» спрыяла ўзмацненню ўвагі да ўсяго комплексу фондавай работы, перш за ўсё да камплектавання калекцый. Разуменне камплектавання як формы дзейнасці музея, якая абумоўлівае ўсе іншыя формы, у тым ліку навукова-даследчую, экспазіцыйную і навукова-асветніцкую, пачало фарміравацца пасля зацвярджэння гэтага дакумента. Разам з тым, у ім недвухсэнсоўна вылучалася задача камплектавання матэрыялаў, якія дазвалялі адлюстроўваць поспехі камуністычнага будаўніцтва, перамогу ленінскага курса, павышэнне дабрабыту народа. Пры гэтым, натуральна, адпадала неабходнасць ў камплектаванні матэрыялаў, якія адлюстроўвалі складанасці, супрацьлегласці працэсу пабудовы сацыялізму ў СССР.

Прыняцце «Палажэння аб музейным фондзе Саюза ССР» вымагала ад аддзела музеяў і помнікаў Міністэрства культуры БССР правядзення шэрагу мерапрыемстваў па паляпшэнню захавання нацыянальнай рухомай гісторыка-культурнай спадчыны. У 1965 г. з мэтай упарадкавання музейнага фонду была створана рэспубліканская экспертная камісія, абласныя экспертныя камісіі, а таксама фондавыя камісіі пры буйнейшых музеях. Міністэрства культуры БССР распачало пераразмеркаванне абменных фондаў паміж музеямі рэспублікі адпаведна іх профілям. Дзяржаўныя музеі абавязваліся браць на ўлік прадметы музейнага значэння, якія знаходзіліся на той час у грамадскіх музеях, а таксама ва ўласнасці ўстаноў, арганізацый і прыватных асаб. Пачаліся работы па складанню зводнага навуковага каталога рухомай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

У выніку гэтых работ да музейнай грамадскасці паступова прыходзіла разуменне катастрафічных страт, якія зведала беларуская культура на працягу папярэдніх дзесяцігоддзяў. Сітуацыя абвастралася неабходнасцю шырокага асвятлення падзей беларускай гісторыі дакастрычніцкага перыяду ў музейных экспазіцыях, чаго вымагала сама атмасфера грамадскага пад'ёму канца 1950-х — 1960-х гг. Аднак атрымаўшы магчымасць распавесці пра тысячагадовую гісторыю свайго народа, музейныя супрацоўнікі БССР апынуліся ў складаным становішчы. Зрабіць гэта з дапамогай першакрыніц — рэчавых, візуальных, дакументальных, што патрабавала спецыфіка экспазіцыйнай работы, было амаль немагчыма. Неўзабаве кулуарная канстатацыя гэтай праблемы вылілася ў публічную дыскусію, якую распачаў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» вядомы пісьменнік і літаратуразнавец А. І. Мальдзіс.

Наведаўшы шэраг музеяў рэспублікі, ён сутыкнуўся з тым, што цэлыя пласты беларускай гісторыі, дзясяткі імён славутых землякоў ніяк не прадстаўлены ў іх экспазіцыях. Так, накіроўваючыся ў Слуцк, ён спадзяваўся на ўласныя вочы пабачыць славутыя слуцкія паясы, старажытныя шкляныя вырабы мясцовай вытворчасці, абразы і творы царкоўнага дэкаратыўнага мастацтва, старадрукі, творы слуцкіх мастакоў і інш. Спадзяванні А. І. Мальдзіса пры аглядзе экспазіцыі слуцкага музея не спраўдзіліся — падчас з размовы з дырэктарам высветлілася, што фондавыя калекцыі не дазваляюць паказаць і дзясятую частку багатай гісторыі Случчыны. Тое ж расчараванне напаткала аўтара пры аглядзе Дома-музея А. Міцкевіча ў Навагрудку, Слонімскага краязнаўчага музея і некаторых іншых. Узняўшы пытанне аб каштоўнасным аспекце фарміравання дзяржаўнага музейнага фонду, А. І. Мальдзіс прапанаваў наступныя шляхі яго павелічэння за кошт рэчаў дасавецкага паходжання: актывізацыя пошукавай работы музеяў, рэстытуцыя вывезеных каштоўнасцей, абмен імі з музеямі іншых краін[10].

Намеснік дырэктара Мінскага абласнога краязнаўчага музея Г. А. Каханоўскі, працягваючы тэму, распачатую А. І. Мальдзісам, паказаў яе балючыя аспекты знутры, як музейны практык. У прыватнасці, ён узняў пытанні каардынацыі збіральніцкай дзейнасці музеяў у рэспубліканскім маштабе, масавага рабавання калекцыянерамі закрытых культавых устаноў, захавання калекцый школьных музеяў, і, нарэшце, нізкай прафесійнай кваліфікацыі супрацоўнікаў дзяржаўных раённых музеяў[11]. На жаль, прапановы ўдзельнікаў дыскусіі не былі пачуты кіраўніцтвам і пералічаныя пытанні заставаліся «балючымі» у музейнай практыцы БССР і надалей.

Другім важным накірункам работ па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных» была распрацоўка «Прынцыпаў развіцця музейнай справы». Для распрацоўкі гэтага дакумента ў Маскве была створана аб'яднаная камісія, куды ўвайшлі вядучыя вучоныя-грамадазнаўцы Акадэміі навук СССР, кіруючыя работнікі Міністэрства культуры СССР, дырэктары буйнейшых музеяў. Асноўная ўвага камісіі была сканцэнтравана на спецыфіцы музеяў, іх арганічнай сувязі з навукай, камплектаванні фондавых калекцый, іх экспаніраванні, і, нарэшце, на каардынацыі музейнай дзейнасці ў маштабах краіны. У якасці асноўнага прынцыпу развіцця сеткі вылучалася ідэя дзяржаўнай падтрымкі грамадскай ініцыятывы ў стварэнні музеяў. Быў сфармуляваны тэзіс: «Наяўнасць тых ці іншых музеяў у краі сведчыць аб развіцці яго культурнага жыцця, аб ступені вывучанасці яго гісторыі і прыроды, аб грамадскай зацікаўленасці навукай, культурай і мастацтвам»[12]. Для падрыхтоўкі спецыялістаў-музеязнаўцаў рэкамендавалася наладзіць навучанне музейных работнікаў на базе ВНУ, сістэматычнае павышэнне іх кваліфікацыі праз курсы, стажыроўкі, аспірантуру, прадставіць права абароны дысертацый па спецыяльнасці «музеязнаўства».

Такім чынам, нават пры канспектыўным выкладанні «Прынцыпаў» бачна, што гэта быў значны крок наперад. Аднак, яны так і не атрымалі дырэктыўнага замацавання і засталіся толькі варыянтам праекта пастановы Савета Міністраў СССР. Але ўсё ж яны станоўча паўплывалі на стан музейнай справы ў краіне праз абмеркаванні ў кабінетах міністэрстваў культуры саюзных рэспублік, на музейных канферэнцыях, семінарах, нарадах. Адна з ідэй дакумента знайшла сваё практычнае ўвасабленне ў загадзе міністэрства культуры БССР аб вызначэнні галаўных музеяў (Дзяржаўны музей БССР, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Літаратурны музей Я. Купалы, Дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей у Гродна), на якія былі ўскладзены абавязкі каардынацыі і дапамогі музеям іх профілю ў маштабах рэспублікі[13].

Ідэя выкарыстання патэнцыялу буйнейшых рэспубліканскіх музеяў для ўзняцця ўзроўню абласных і раённых краязнаўчых музеяў была плённай, але дзеля яе рэалізацыі патрабавалася распрацаваць спецыяльныя механізмы — стварыць навукова-метадычныя саветы, спецыяльныя каардынуючыя органы з штатамі і фінансавым забеспячэннем. Усяго гэтага зроблена не было. Адзінай асновай для навукова-метадычнай работы з'яўлялася «Палажэнне аб галаўным музеі», згодна з якім цэнтральныя музеі распачалі гэтую работу, арганізуючы

кансультацыі, стажыроўкі і выезды на месцы. Найбольш актыўнымі ў гэтай дзейнасці былі Дзяржаўны музей БССР і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Яшчэ адным станоўчым вынікам выканання пастановы ЦК КПСС «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных» было стварэнне ў маі 1964 г. пры Міністэрстве культуры СССР Навукова-метадычнага савета па рабоце музеяў. Да работы ў ім былі прыцягнуты буйнейшыя вучоныя краіны, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, у падпарадкаванні якіх знаходзіліся музеі, вядучыя навуковыя супрацоўнікі буйнейшых музеяў сістэмы Міністэрства культуры усіх саюзных рэспублік[I]. Старшынёй прэзідыума савета быў абраны вядомы гісторык, акадэмік Б. А. Рыбакоў. У складзе савета дзейнічалі секцыі, сфарміраваныя па асноўных профілях музеяў краіны, якія разглядалі найбольш актуальныя пытанні музейнага будаўніцтва, распрацоўвалі прапановы па паляпшэнню ўсіх напрамкаў работы музеяў. Так, секцыя гістарычных музеяў займалася агульнагістарычнымі, гісторыка-рэвалюцыйнымі, ваеннагістарычнымі, этнаграфічнымі, археалагічнымі музеямі, музеямі гісторыі рэлігіі, а таксама аддзеламі гісторыі краязнаўчых музеяў. У БССР падобны навукова-метадычны савет існаваў пад кіраўніцтвам акадэміка К. К. Атраховіча (К. Крапівы) пры Прэзідыуме АН БССР, але яго дзейнасць абмяжоўвалася нерухомай гісторыка-культурнай спадчынай[14].

У цэлым пастанова ЦК КПСС «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных» паспрыяла паляпшэнню стану музейнай справы ў БССР. У 1964 г. была ўпарадкавана музейная сетка, у прыватнасці, Ашмянскаму, Бярозаўскаму, Крычаўскаму, Лепельскаму, Рэчыцкаму, Слуцкаму, Столінскаму і Тураўскаму народным музеям быў вернуты статус дзяржаўных раённых краязнаўчых музеяў з усімі штатнымі адзінкамі, што фактычна выратавала іх ад знікнення. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база музеяў рэспублікі — было завершана ўзвядзенне будынку для Дзяржаўнага музея БССР, пачалася рэканструкцыя будынку Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, шэраг абласных і раённых музеяў атрымалі новыя памяшканні. Абласным музеям былі перададзены машыны-аўтаклубы для правядзення перасоўных выставак. У 1964 і 1965 гг. Міністэрства культуры БССР арганізавала два рэспубліканскія семінары музейных работнікаў. З мэтай павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў музеяў

---

[I] БССР у Навукова-метадычным савеце па рабоце музеяў прадстаўляў дырэктар Дзяржаўнага музея БССР С. З. Сапешка.

было запланавана праводзіць штогод падобныя семінары ў абласцях, а таксама арганізоўваць для іх стажыроўкі[15].

Як і ў папярэдні перыяд, у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. найбольш шматлікая і важная ў навуковым і асветніцкім значэнні група беларускіх музеяў знаходзілася ў падпарадкаванні Міністэрства культуры. Згодна распрацаванай у той час міністэрствам класіфікацыі, усе яны падзяляліся па профілях на краязнаўчыя, ваенна-гістарычныя, мастацкія, гісторыка-рэвалюцыйныя і літаратурныя. На 1 студзеня 1962 г. сетка музеяў сістэмы Міністэрства культуры выглядала наступным чынам (Табліца 2):

У 1962 г. агульная колькасць прадметаў калекцый асноўнага фонду пералічаных вышэй музеяў пераўзышла 500 тыс. Іх экспазіцыі на працягу года агледзела каля мільёна чалавек, трэцяй частцы якіх было прапанавана экскурсійнае абслугоўванне. Ва ўсёй «музейнай гаспадарцы» Міністэрства культуры БССР у той час працавала крыху больш 300 чалавек, з якіх толькі палову складалі навуковыя супрацоўнікі[16].

Важнай падзеяй у навуковым і культурным жыцці рэспублікі было адкрыццё ў Мінску Дзяржаўнага музея БССР, які аб'ектыўна выконваў функцыі цэнтра па вывучэнню і папулярызацыі нацыянальнай рухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Камітэт па справах культурна-асветніцкіх устаноў шмат разоў, пачынаючы з сярэдзіны 1940-х гг., звяртаўся ў Савет Міністраў БССР з прапановай адкрыць у Мінску Беларускі дзяржаўны музей (мелася на ўвазе адраджэнне даваеннага БДМ). Ідэю стварэння музея, «які б адлюстраваў гістарычныя шляхі развіцця беларускага народа, яго барацьбу за савецкую дзяржаўнасць, паказаў бы сённяшні дзень Беларусі, яе народную гаспадарку» падтрымлівала Акадэмія навук БССР у асобе яе прэзідэнта М. І. Грашчанкова[17].

Табліца 2

| **Профіль музея** | **Назва музея** |
|---|---|
| Краязнаўчы | Арганізацыйная група па стварэнню Дзяржаўнага музея БССР |
| Краязнаўчы | Брэсцкі абласны |
| Краязнаўчы | Пінскі раённы |
| Краязнаўчы | Баранавіцкі раённы |
| Краязнаўчы | Столінскі раённы |

| | |
|---|---|
| Краязнаўчы | Бярозаўскі раённы |
| Краязнаўчы | Віцебскі абласны |
| Краязнаўчы | Полацкі раённы |
| Краязнаўчы | Лепельскі раённы |
| Краязнаўчы | Гомельскі абласны |
| Краязнаўчы | Мазырскі раённы |
| Краязнаўчы | Тураўскі раённы |
| Краязнаўчы | Рэчыцкі раённы |
| Краязнаўчы | Гродзенскі гі торыка-археалагічны |
| Краязнаўчы | Слонімскі раённы |
| Краязнаўчы | Лідскі раённы |
| Краязнаўчы | Ашмянскі раённы |
| Краязнаўчы | Мінскі абласны ў г. Маладзечна |
| Краязнаўчы | Барысаўскі раённы |
| Краязнаўчы | Слуцкі раённы |
| Краязнаўчы | Магілёўскі абласны |
| Краязнаўчы | Бабруйскі раённы |
| Краязнаўчы | Крычаўскі раённы |
| Ваенна-гістарычны | Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны |
| Ваенна-гістарычны | Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна |
| Ваенна-гістарычны | Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава |
| Ваенна-гістарычны | Музей К. С. Заслонава |
| Гісторыка-рэвалюцыйны | Музей Ф. Э. Дзяржынскага |
| Літаратурны | Дом-музей А. Міцкевіча |
| Мастацкі | Дзяржаўны мастацкі музей БССР |

Але кожны раз гэтыя прапановы адхіляліся з-за недахопу сродкаў на ўзвядзенне будынка ў цэнтры Мінска.

Між тым, збор фондавых калекцый для будучага Дзяржаўнага музея БССР быў распачаты супрацоўнікамі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны згодна з загадам Камітэта па справах культурна-асветніцкіх ўстаноў ужо ў ліпені 1949 г. У аснову калекцый былі пакладзены прадметы, якія засталіся ад даваеннага Беларускага дзяржаўнага музея і Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. Збіральніцкая дзейнасць актывізавалася пасля распараджэння Савета Міністраў БССР ад 15 снежня 1956 г. «Аб Арганізацыйнай групе па стварэнню Дзяржаўнага музея-БССР». Узначаліў Арггрупу Л. А. Міхайлоўскі: У 1959 г. яго змяніў намеснік дырэктара Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны С. З. Сапешка[I]. Абавязкі галоўнага захавальніка фондаў выконвала Г. І. Чарнова, аддзелам першабытна-абшчыннага ладу загадвала В. В. Рыжкоўская, аддзелам феадалізму — Р. Н. Самсонаў, аддзелам капіталізму — А. М. Заклінская, аддзеламі савецкага перыяду (даваеннага і пасляваеннага часу) — В. П. Марутка і І. П. Загрышаў, аддзелам прыроды — Г. І. Лукашэвіч. Акрамя названых аддзелаў у структуры Арггрупы меліся фоталабараторыя, біялабараторыя і рэстаўрацыйная майстэрня. У складзе Арггрупы працаваў спецыяліст па нерухомых помніках, які займаўся іх рэгістрацыяй у межах БССР[18].

На працягу першага пяцігоддзя ўся дзейнасць Арггрупы была скіравана на камплектаванне калекцый. Ужо ў 1957 г. яе супрацоўнікамі было праведзена 7 экспедыцый, а таксама 20 выездаў на месцы правядзення археалагічных раскопак, у выніку чаго было сабрана каля 3 тыс. прадметаў, якія адлюстроўвалі гістарычнае мінулае і прыроду Беларусі.

У другой палове 1950-х гг. супрацоўнікі аддзела першабытна-абшчыннага ладу сумесна з сектарам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР правялі раскопкі палеалітычных стаянак «Елісеевічы», «Юровічы», неалітычных стаянак «Трафімавіч кусты», «Белая града» Навагрудскага раёна, а таксама курганных могільнікаў каля в. Хадасовічы Гомельскай вобласці. У зімовы перыяд у музеі вывучалі і апрацоўвалі помнікі зарубінецкай культуры з раскопак селішчаў «Адаменка»

---

[I] Сапешка Станіслаў Захаравіч (1908-1969) музейны дзеяч, нарадзіўся ў в. Шастакі Капыльскага раёна. Пасля заканчэння рабфака БДУ (1934) і гістарычнага факультэта Ленінградскага педінстытута імя Герцэна (1939) працаваў настаўнікам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, у 1945-1948 гг. служыў у Войску Польскім. З 1948 г. працаваў навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела, намеснікам дырэктара Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У 1959-1967 гг. загадчык Арггрупы па стварэнню Дзяржмузея БССР, у 1967-1969 гг. яго дырэктар. Выкладаў музеязнаўчыя дысцыпліны на гістарычных факультэтах БДУ і Мінскага педінстытута імя Горкага. Заслужаны работнік культуры БССР.

Быхаўскага раёна, матэрыялы гарадзішча «Таўкач» Полацкага раёна, палеалітычных стаянак «Бердыж», «Журавель», «Падлужжа» Чачэрскага раёна, «Каромка» Рагачоўскага раёна, «Добры бор» Баранавіцкага раёна[19].

Супрацоўнікі аддзела феадалізму былі пераважна заняты пошукамі ў архівах Масквы, Ленінграда, Львова, Гродна, музеях БССР, сталічных антыкварных крамах. Рабіліся захады па вяртанню матэрыялаў беларускага паходжання з музеяў ПНР. Выраблялiся копіі і муляжы. У 1959 г. аддзел сумесна з Інстытутам гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР пад кіраўніцтвам Л. В. Аляксеева правёў раскопкі старажытнага Друцка, сумесна з Інстытутам гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам А. Р. Мітрафанава — раскопкі Полацка[20].

Супрацоўнікі аддзела капіталізму наведвалі кватэры старых мінчан, у выніку чаго музей атрымаў сярод іншых рэчаў пячатку мінскай гарадской думы, шынель чыгуначніка пачатку XX ст., касцюм гараджанкі канца XIX ст., гімназічныя падручнікі і камплекты дарэвалюцыйнай перыёдыкі. Праводзіліся комплексныя гісторыка-побытавыя экспедыцыі ў розныя рэгіёны БССР[21].

Найбольш шматлікімі былі аддзелы савецкага перыяду. Адначасова з работай ў архівах супрацоўнікі музея збіралі матэрыялы на беларускіх прадпрыемствах, у сем'ях дзяржаўных дзеячаў, выдатных военачальнікаў, вучоных, пісьменнікаў. У выніку гэтай работы калекцыі ўзбагаціліся асабістымі рэчамі і паперамі П. Броўкі, М Танка, П. Пестрака. Летам 1961 г. аддзел правёў гісторыка-побытавую экспедыцыю ў Казахстан, былі сабраны матэрыялы аб беларусах, якія ўдзельнічалі ў асваенні цаліны[22].

Вялікую навуковую каштоўнасць мелі вынікі экспедыцыі аддзела прыроды ў Белавежскую пушчу, а таксама выезды па збору матэрыялаў у розныя прыродныя рэгіёны БССР.

Акрамя таго, супрацоўнікі ўсіх аддзелаў з мэтай набыцця прадметаў музейнага значэння вялі перапіску з абласнымі і раённымі музеямі, краязнаўцамі рэспублікі. У фонды будучага музея передаваліся знойдзеныя ў рэспубліцы клады, начынне з закрытых цэркваў, экспанаты выставак. У рэстаўрацыйнай майстэрні і біялабараторыі выраблялiся макеты і муляжы.

Вялікую дапамогу ў стварэнні Дзяржмузея БССР аказалі ўстановы культуры Ленінграда. Цэнтральны гістарычны ваенна-марскі музей перадаў халодную і агнястрэльную зброю сярэдзіны XIX ст., Ваенна-гістарычны музей артылерыі, інжынерных войск і войск сувязі — рускую і французскую зброю перыяду напалеонаўскіх войнаў, шмат плакатаў і лубкоў перыяду першай і другой сусветных

войнаў, Музей гісторыі Ленінграда — матэрыялы аб паўстанні дзекабрыстаў, Дзяржаўны рускі музей — этнаграфічныя матэрыялы сярэдзіны XIX ст., сабраныя ў Мінскай губерні. У аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М Я. Салтыкова-Шчадрына былі зроблены копіі граматы ад 25 красавіка 1389 г. мсціслаўскага князя Сімяона Лугвеня Альгердавіча каралю Польшчы Ягайлу і яго жонцы Ядвізе, грамат рускага цара Аляксея Міхайлавіча мінскаму, магілёўскаму, полацкаму, барысаўскаму і шклоўскаму ваяводам, гербаў беларускіх гарадоў, карт XVIII ст., малюнкаў і гравюр па гісторыі Лівонскай і Паўночнай войнаў, асобных нумароў газет XIX ст. У мастацка-афарміцельскім камбінаце Ленінграда былі зроблены муляжы рускай зброі XI-XIII стст., а таксама наўгародскіх і літоўскіх манет[23]. Міністэрства культуры УССР таксама перадало Дзяржмузею шэраг прадметаў, у тым ліку слуцкі пояс XVIII ст.[24]

У выніку першага пяцігоддзя работы Арггрупы было сфарміравана ядро фондавага збору будучага музея. На 1 студзеня 1961 г. агульная колькасць прадметаў склала 38 тыс. адзінак, прычым палова з іх паступіла ў 1960 годзе[25].

Пачынаючы з 1962 г. галоўная ўвага Арггрупы была звернута на падрыхтоўку экспазіцыі: складаліся тэматыка-экспазіцыйныя планы, ствараліся карты, схемы, табліцы, дыяграмы, пісаліся навуковыя даведкі. Рыхтуючыся да яе адкрыцця, супрацоўнікі Арггрупы наведалі больш 20 лепшых музеяў СССР для пераймання лепшага вопыту. Адначасова мастацкая група, у якую ўваходзілі вядомыя жывапісец У. Стальмашонак і архітэктар Г. Бенядзіктаў, працавала над эскізамі будучай экспазіцыі. Распрацоўка тэматыка-экспазіцыйнага плана выявіла лакуны ў калекцыях, што вымушала актывізаваць збіральніцкую работу. Толькі ў 1963 г. было праведзена 10 навуковых экспедыцый і 78 камандзіровак, якія павялічылі фондавы збор на 14 тыс. адзінак. Павышэнню агульнага ўзроўню работы Арггрупы паспрыяла стварэнне ў 1963 г. у яе складзе Вучонага савета, куды ўвайшлі вядомыя беларускія навукоўцы Л. С. Абэцэдарскі, А. І. Залескі, В. С. Тарасенка, А. І. Азараў, А. В. Аладава, І. М. Сяржанін і інш. У Арггрупе ў розныя часы працавалі вядомыя нумізмат В. Н. Рабцэвіч, арганізатар музейнай справы У. А. Гілеп і інш.

7 лістапада 1964 г. ЦК КПБ прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску Дзяржаўнага музея БССР. На гэты час ў яго фондах ужо налічвалася 120 тыс. адзінак захоўвання. 12 лістапада таго ж года кіраўнік Арггрупы С. З. Сапешка ва ўрачыстай абстаноўцы атрымаў ад будаўнікоў ключы ад новага будынка на праспекце Леніна, 25А (архітэктары Г. Бенядзіктаў, Г. Заборскі), пасля чаго ў ім пачаўся

мантаж экспазіцыі. У сціслыя тэрміны ў новым будынку была разгорнута юбілейная выстава «900 год Мінску», прыходзілі да завяршэння мантажныя работы ў аддзеле прыроды, калі ў лістападзе 1965 г. пастановай ЦК КПБ яны былі спынены, усе экспанаты перавезены ў дарэвалюцыйны будынак былога банка па вул. К. Маркса, 12, які займаў Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а апошні заняў новы будынак на праспекце Леніна, 25А. У выніку новую гістарычную экспазіцыю Дзяржмузея БССР давялося манціраваць на плошчы ў тры разы меншай, чым папярэдняя, а аддзел прыроды знайшоў прытулак у падвальным памяшканні[26]. Афіцыйнае адкрыццё музея адбылося 2 лістапада 1967 г. Яго экспазіцыя была размешчана ў 18 залах і знаёміла наведвальнікаў з прыродай і гісторыяй беларускага народа са старажытных часоў да нашых дзён. Каля 70% ад агульнай плошчы Дзяржмузея БССР было аддадзена асвятленню падзей гісторыі Беларусі ў савецкі час[27].

Пасля працяглага падрыхтоўчага перыяду ў 1957 г. адкрыўся Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. У яго фондасховішчы ўжо знаходзілася каля 20 тыс. адзінак захоўвання. Паслядоўнае камплектаванне прадметаў музейнага значэння і дакументаў праводзілася па трох аддзелах. Асаблівую ўвагу заслугоўваў аддзел гісторыі дакастрычніцкага перыяду, дзе захоўваліся археалагічная (матэрыялы з раскопак на тэрыторыі вобласці), этнаграфічная (музычныя інструменты XVIII ст, прылады працы, хатняе начынне XIX ст.) і нумізматычная (куфэрак з манетамі, закладзены пры заснаванні Брэсцкай крэпасці) калекцыі, рукапісныя і друкаваныя кнігі (трэбнік 1646 г., рукапісны «Апостал» XVII ст.), зброя і даспехі XIII-XIX стст., дакументы пра сацыял-дэмакратычны руху на Берасцейшчыне. Аддзел савецкага перыяду камплектаваўся дакументамі, баявымі рэліквіямі, узнагародамі, фотаздымкамі, якія адлюстроўвалі падзеі рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннае сацыялістычнае будаўніцтва. У аддзеле прыроды былі сабраны ўзоры жывёльнага і расліннага свету вобласці[28]. Высокі навуковы ўзровень апрацоўкі і вывучэння гэтых матэрыялаў забяспечвалі не толькі навуковыя супрацоўнікі музея, але і мясцовыя аматары-краязнаўцы, сярод якіх асаблівы ўклад у станаўленне музея зрабіў М. І. Алексяюк[I].

---

[I] Алексяюк Міхаіл Іванавіч (1907 1983) краязнаўца, археолаг, нарадзіўся ў г. Лодзь, пасля заканчэння ў 1928 г. Брэсцкага чыгуначнага тэхнікума працаваў у розных арганізацыях па меліярацыі Палесся. Адначасова праводзіў археалагічныя і краязнаўчыя даследаванні, адкрыў шэраг палеалітычных стаянак, свайныя пабудовы эпохі неалітана воз. Ула Вілейскага раёна. З 1954 г. член Вучонага савета Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, з 1967 г. яго навуковы супрацоўнік, у 1981 1982 гг. загадчык археалагічнага музея «Бярэсце» Аўтар больш 150 работ па гісторыка-краязнаўчай тэматыцы.

Першая экспазіцыя Брэсцкага краязнаўчага музея была разгорнута ў адным з закрытых культавых будынкаў горада. Яна мела традыцыйную структуру і невысокі нават для свайго часу навуковы і мастацкі ўзровень. У хуткім часе такія яе галоўныя недахопы, як «кніжнасць», «ілюстратыўнасць» зрабіліся аб'ектам крытыкі не толькі з боку кіраўніцтва музейнай справы рэспублікі, але і наведвальнікаў. Таму ў 1963 г. было прынята рашэнне аб правядзенні рээкспазіцыі, у якой прымалі ўдзел маскоўскія мастакі. Вось як апісвае сучаснік атмасферу, якая панавала ў той час у музеі: «Вядзецца вялікая сумесная работа навуковых супрацоўнікаў і мастакоў па пабудове ўсёй экспазіцыі. Ідуць пошукі, а часам і спрэчкі аб тым, якімі сродкамі дамагчыся, каб кожны экспанат загаварыў, лепш чытаўся, больш вобразна раскрываў слаўныя старонкі гісторыі і апавядаў пра цяжкія часы, перажытыя нашым народам, і пра наша сённяшняе жыццё»[29]. Змены закранулі пераважна мастацкі і тэхнічны аспекты. Да найбольш атракцыйных фрагментаў мастацкага праекта адносіліся дзве агучаныя дыярамы: «Абарона Брэсцкай крэпасці» і «Белавежская пушча». Падчас адкрыцця ў 1965 г. новай экспазіцыі музея ў ім была праведзена рэспубліканская нарада музейных работнікаў, дзе навуковы экспазіцыйны змест і мастацкае вырашэнне атрымалі станоўчую ацэнку[30].

Структурнай часткай Брэсцкага краязнаўчага музея з'яўляўся помнік архітэктуры XIII ст. Камянецкая вежа, які атрымаў статус філіяла. У 1968 г. пачалася рэстаўрацыя гэтага помніка і падрыхтоўка да стварэння ў ім экспазіцыі[31].

Геаграфічнае становішча Брэсцкага музея абумовіла значны прыток наведвальнікаў, пераважна турыстаў, адразу ж пасля яго адкрыцця. На працягу 1960-х гг. экспазіцыі штогод аглядала каля 10 тыс. чалавек. Праводзіліся іншыя формы асветніцкай работы — музейныя вечарыны, лекцыі, перасоўныя выстаўкі. Павелічэнню папулярнасці музея павінна было паспрыяць рашэнне Брэсцкага аблвыканкома аб яго пераводзе з 1962 г. на бясплатнае наведванне[32].

На працягу другой паловы 1950-х гг. стацыянарная экспазіцыя Віцебскага абласнога краязнаўчага музея набыла наступную структуру: 1) раздзел прыроды; 2) раздзел дасавецкага перыяду; 3) раздзел савецкага перыяду (1917-1945); 4) раздзел пасляваеннага сацыялістычнага будаўніцтва. У 1960 г. быў адкрыты асобны мастацкі раздзел. За той жа час паўсталі тры філіялы Віцебскага музея — былая турма гестапа ў Віцебску, а таксама экспазіцыі, прысвечаныя падпольнай групе «Юныя мсціўцы» (Обаль) і генералу Л. М. Даватару

(Ула). У 1960г. экспазіцыю ў Віцебскай ратушы разам з філіяламі аглядзела больш 50 тыс. чалавек[33].

Вельмі каштоўную частку дзяржаўнага музейнага фонду ўтваралі калекцыі археалогіі, нумізматыкі, сфрагістыкі, фарфору, зброі, этнаграфіі, мастацтва, дакументаў і рукапісаў, што захоўваліся ў Віцебскім абласным музеі. У іх складзе мы знаходзім берасцяную грамату XIII ст., «Евангелле з мініяцюрамі», выдадзенае ў Маскве ў 1628 г., «Канонік» з гравюрамі XVIII ст., творы гісторыка А. П. Сапунова, у тым ліку рукапіс «Гісторыя горада Віцебска», карціны беларускіх і рускіх мастакоў XIX — пачатку XX ст.

У 1961 г. Віцебскі абласны музей правёў 4 комплексныя гісторыка-побытавыя экспедыцыі. На працягу трох палявых сезонаў яго супрацоўнікі ўдзельнічалі ў рабоце экспедыцыі Інстытута археалогіі АН СССР у Талачынскім раёне. Вынікі экспедыцыйных здабыткаў былі прадстаўлены на абласным семінары музейных работнікаў у 1961 г.[34] На жаль, забяспечыць належныя ўмовы захавання знойдзеных прадметаў і іх дэманстрацыі на працягу 1960-х гг. не было магчымасці. Памяшканні гарадской ратушы ў гэта дзесяцігоддзе Віцебскі музей дзяліў разам з 22-мя сем'ямі.

Асноўныя намаганні супрацоўнікаў Гомельскага абласнога краязнаўчага музеяў «пасляз'ездаўскае» дзесяцігоддзе былі накіраваны на правядзенне змястоўных і мастацка-тэхнічных змен у экспазіцыі. Так, у 1956 г. у раздзеле «Пасляваеннае сацыялістычнае будаўніцтва» з'явіліся фрагменты выступленняў М. С. Хрушчова. У наступным годзе, у сувязі з 40-гадовым юбілеем кастрычніцкай рэвалюцыі, былі праведзены змены ва ўсёй экспазіцыі, пасля чаго яна набыла наступную структуру: «Археалогія краю», «З мінулага краю», «Рэвалюцыйны рух 1905 г. на Гомельшчыне», «Край у перыяд пабудовы сацыялізму (1917-1941), «Вялікая Айчынная вайна на Гомельшчыне», «Пасляваеннае сацыялістычнае будаўніцтва», «Прырода краю». Увядзенне новых тэм было вынікам навукова-пошукавай работы, якая праводзілася супрацоўнікамі музея на працягу некалькіх гадоў у архіўных і музейных установах БССР, а таксама Масквы і Ленінграда. Дзякуючы ёй колькасць фондавых калекцый значна павялічылася і дасягнула ў 1959 г. 30,5 тыс. адзінак. Другім вынікам гэтай работы было з'яўленне некалькіх выданняў краязнаўчага і археаграфічнага характару[I] і шэрагу артыкулаў у мясцовым перыядычным друку. Наступныя змены, «...што адлюстроўвалі вялікія пераўтварэнні балотных зямель

---

[I] Гл.: Революционное движение в Гомельской области в 1905-1907 гг. Гомель, 1955; Белорусские пословицы и поговорки. Гомель, 1956; Трудящиеся Гомельщины в борьбе за власть Советов (1917-1920). Хроника событий. Гомель, 1958 і інш.

Гомельскай вобласці ў квітнеючыя палі і сады», ў экспазіцыю музея былі ўнесены ў 1959 г.[35] Далейшаму развіццю музея паспрыяла рашэнне мясцовых улад аб передача яму у 1962 г. ўсяго левага крыла палаца, дзякуючы чаму экспазіцыйная плошча павялічылася амаль утрая.

З'яўленне вялікай колькасці новых матэрыялаў у экспазіцыі Гомельскага музея напачатку 1960-х гг. паставіла пытанне аб яе мастацкім і тэхнічным узроўні. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця паспрыяла таму, што гэтыя пытанні сталі прадметам галоснага абмеркавання на старонках перыядычнага друку. Адзін з карэспандэнтаў газеты «Літаратура і мастацтва» наступным чынам характарызаваў сітуацыю, якая склалася ў музеі ў той час: «Наогул на мастака ў Гомельскім музеі глядзяць, як на рамесніка-афарміцеля, усяляк стрымліваючы яго творчы запал, яго спробы ўнесці нешта новае, незвычайнае ў раскрыццё зместу асобных тэм і раздзелаў. Напісаць этыкетку да шматлікіх экспанатаў, назвы тэм, памагчы супрацоўніку храналагічна-паслядоўна і сіметрычна размясціць арыгіналы дакументаў і фотакопіі ў стандартных вітрынах або на спецыяльных шчытах і стэндах, якія зоймуць усе сцены ў пакоях — вось да чаго зводзяцца абавязкі мастака. А шкада! Ён жа можа знайсці адзіна правільнае кампазіцыйна-прасторавае вырашэнне экспазіцыі, надаць ёй глыбокую вобразнасць і комплекснае адзінства. Адным словам, зрабіць яе больш яркай, выразнай, запамінальнай»[36]. Гэтая крытыка была пачута. У сярэдзіне 1960-х гг. група маладых мастакоў па замове кіраўніцтва распачала распрацоўку эскізаў новай экспазіцыі з улікам выкарыстання новага лёгкага экспазіцыйнага абсталявання, каляровага вырашэння памяшкання, асвятлення і г. д.

Напачатку 1965 г. аб'ём фондавых калекцый Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея дасягнуў 110 тыс. адзінак захоўвання. Калекцыі ўзбагаціліся каштоўнымі матэрыяламі гісторыка-побытавых экспедыцый, раскопак старажытнага Турэйска, экспедыцый у Белавежскую пушчу.

Дзесяцігоддзе пасля XX з'езда КПСС было часам не толькі актыўнага камплектавання калекцый гэтага музея, але і напружанай работы па перабудове экспазіцый. У 1956 г. яго супрацоўнікамі ствараецца першая стацыянарная экспазіцыя па гісторыі савецкага грамадства (1917-1941 гг.). Адначасова адкрываецца мастацкі аддзел, дзе экспанаваліся творы сучасных беларускіх мастакоў і скульптараў. У наступным годзе ў пяці залах ствараецца экспазіцыя па гісторыі феадалізму і капіталізму, завяршаюцца работы ў раздзеле гісторыі

савецкага грамадства, дзе былі прадстаўлены матэрыялы пра гісторыю края ў пасляваенны перыяд.

У 1960-я гг., адпаведна патрабаванням партыйнага кіраўніцтва, асноўная ўвага надавалася паляпшэнню паказа сацыялістычнага будаўніцтва на Гродзеншчыне. Пасля сур'ёзнай прапрацоўкі экспазіцыйных тэм была праведзена рээкспазіцыя раздзелаў «Вялікая Айчынная вайна», «Гродзеншчына пад уладай буржуазна-памешчыцкай Польшчы», «Край у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізму» (аўтар мастацкага рашэння — С. Сілуянаў). У выніку праведзеных экспазіцыйных работ каля 70% плошчаў залаў у Старым замку занялі матэрыялы па гісторыі савецкага грамадства. Мастацкі аддзел быў ліквідаваны. У сярэдзіне 1950-х гг. змяніўся статус прыродазнаўчага філіяла Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, які стаў аддзелам, а яго экспазіцыя была пераведзена ў Стары замак. Акрамя тэматычных комплексаў, яна змяшчала асобны зал, дзе паказваліся калекцыі са збору Ст. Жыўны[37].

У сярэдзіне 1960-х гг. зрабілася відавочнай неадпаведнасць каштоўнасці сабранага матэрыялу эстэтычнай якасці яго падачы ў экспазіцыі. А. А. Сурскі так апісвае свае ўражанні пасля знаёмства з экспазіцыяй Гродзенскага музея: «Тры дні блукаў я тут, адчуваючы глыбокую павагу да ўсяго, што мяне акружала, пранікаючыся ўсё большай пашанай да карпатлівай працы работнікаў музея, але разам з тым і адчуваючы незадавальненне. Пераходзячы ў залах ад адной да другой шафы, гледзячы на шчыты, стэнды ў традыцыйных багетных рамах, абцягненых сумным, шэрым палатном і скрозь утыканых экспанатамі, проста патанаеш у гэтай аднастайнасці. І як да выратавальнага круга кідаешся да надпісаў і тлумачэнняў. Але стандартныя этыкеткі з датамі і цытатамі, якія нагадваюць сумныя вытрымкі з падручнікаў гісторыі, толькі падкрэсліваюць «наукообразие» падобнай сістэмы. Тут ужо паволі пачынаеш сумнявацца ў «акадэмічных» музейных запаведзях: «строгасць», «нічога лішняга», «экспанат гаворыць сам за сябе». Даруйце, што ён гаворыць, калі, напрыклад, у адну шафу плошчаю 2 кв. метры — толькі адну! — уціснена 339 экспанатаў»[38].

На базе створаных экспазіцый будавалася масавая адукацыйна-асветніцкая работа музея. На працягу 1964 г. каля 90 тыс. чалавек агледзела стацыянарныя экспазіцыі, яшчэ 75 тыс. чалавек наведала перасоўныя выстаўкі, падрыхтаваныя ў музеі. Акрамя традыцыйных музейных выставак экскурсантам прапаноўвалася азнаёміцца з Каложскай і Ніжняй цэрквамі, а таксама помнікам этнаграфіі XIX ст. — сялянскай хатай, якія ўтваралі са Старым замкам адзіны

гісторыка-архітэктурны комплекс. З'яўляючыся метадычным музейным цэнтрам рэспубліканскага значэння, Гродзенскі музей аказваў дапамогу абласным і раённым музеям рэспублікі[39].

У другой палове 1950-х гг. стала відавочна, што далейшае развіццё Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея ў некалькіх пакоях Дома Саветаў немагчыма. З-за недахопу і нязручнасці экспазіцыйных плошчаў большасць тэм была раскрыта сціпла і схематычна, а сярэдняя колькасць наведвальнікаў была ў 4-5 разоў меншай, чым у іншых абласных музеях рэспублікі. Экспазіцыя была адкрыта для агляду толькі ў гадзіны работы Дома Саветаў, а па суботах і нядзелях зачынена ўвогуле. Нарэшце, не было належных умоў захавання фондавых калекцый. Выйсце з гэтай сітуацыі знайшлі ў 1961 г., калі Магілёўскаму абласному музею быў перададзены помнік архітэктуры канца XVIII ст. на Савецкай плошчы, у гістарычным цэнтры горада. Нягледзячы на тое, што раней гэты будынак выкарыстоўваўся пад казармы, ў цэлым ён адпавядаў музейным патрабаванням[40]. І хоць рашэнне аб перадачы музею гэтага будынка было прынята абласным выканаўчым камітэтам, наступныя чатыры гады былі часам бесперапыннай барацьбы дырэктара І. С. Мігуліна з новымі прэтэндэнтамі на музейныя плошчы — машынабудаўнічым інстытутам, бібліятэчным тэхнікумам, дзіцячай турыстычнай станцыяй і інш. Дзякуючы цвёрдай пазіцыі І. С. Мігуліна, які звяртаўся да сакратароў ЦК КПБ, у рэдакцыю газеты «Праўда» і ў іншыя высокія інстанцыі, музей застаўся ў гэтым будынку. Не абмяжоўваючыся адстойваннем сваіх правоў у высокіх кабінетах, супрацоўнікі Магілёўскага музея імкнуліся даказаць свае правы на будынак, праводзячы шматлікія выстаўкі, якія карысталіся значным поспехам у жыхароў горада. У сярэднім іх аглядала да 34 тыс. чалавек у год. Пастулова абласным і гарадскім уладам стала зразумела, што размяшчэнне музея на Савецкай плошчы — гэта найбольш разумнае рашэнне.

У 1965 г. Магілёўскі музей закрыўся на капітальны рамонт, а яго супрацоўнікі ўшчыльную прыступілі да стварэння сталай экспазіцыі поўнага краязнаўчага профілю, якая б адлюстроўвала гістарычнае мінулае і прыроду краю. Падчас падрыхтоўчага перыяду супрацоўнікі вялі напружаны пошук матэрыялаў у архіўных, бібліятэчных і музейных сховішчах Мінска, Вільнюса, Масквы, Ленінграда. Адначасова ў мясцовым аддзяленні мастацкага фонду распрацоўвалася мастацкае рашэнне музея. 5 лістапада 1967 г. адбылося адкрыццё новай экспазіцыі, якая адразу ж атрымала шматлікія станоўчыя водгукі ў прэсе. Яе першым наведвальнікам быў першы сакратар ЦК

КПБ П. М. Машэраў, які аглядаў музейныя залы ў суправаджэнні мясцовага партыйнага кіраўніцтва.

Агляд экспазіцыі, якая займала дваццаць залаў, пачынаўся з жывёльнага і расліннага свету краю, паказанага ў шматлікіх чучалах і дыярамах. Наступны раздзел знаёміў з дарэвалюцыйнай гісторыяй. Асаблівую увагу наведвальнікаў прыцягвалі археалагічныя знаходкі, макет гарадзішча, даспехі сярэдневяковых рыцараў, зброя, клады, інтэр'еры шляхецкага маёнтка і сялянскай хаты. У якасці галоўных экспазіцыйных ідэй аўтарамі раздзела былі абраны барацьба беларускага народа супраць прыгоннага ўціску, барацьба з захопнікамі і імкненне да аб'яднання з рускім народам. Раздзел савецкага перыяду пачынаўся дыярамай «Штурм Зімняга» і заканчваўся паказам сацыяльна-эканамічных і культурных дасягненняў вобласці ў пасляваенны перыяд. Новая экспазіцыя Магілёўскага краязнаўчага музея мела ўсе хібы, абумоўленыя часам яе стварэння: перагружанасць плоскасным капійным матэрыялам, перабольшаная ўвага да савецкага перыяду, спрошчанае мастацкае афармленне. Разам з тым, падчас яе падрыхтоўкі ўпершыню былі вывучаны і сістэматызаваны цэлыя пласты гісторыі краю, сабраны вялікі рэчавы і дакументальны матэрыял аб яго ўраджэнцах. Нарэшце, упершыню быў дадзены сістэматызаваны паказ прыроды Магілёўшчыны. Аб поспеху экспазіцыі 1967 г. ускосна сведчылі лічбы наведвання: у 1968 г. у музей прыйшло ў два разы больш людзей, чым у папярэднія гады, калі ў ім праводзіліся часовыя выставы[41].

Падчас святкавання ў 1958 г. 250-годдзя бітвы пад Лясной адбылося адкрыццё філіяла Магілёўскага абласнога музея, прысвечанага гісторыі гэтай бітвы. Экспазіцыя філіяла адкрылася ў мемарыяльнай капліцы, пабудаванай у 1912 г. па праекту архітэктара А. Гагена. Капліца з'яўлялася кампазіцыйным цэнтрам Ляснянскага мемарыяльнага комплексу, куды таксама ўваходзілі манумент у гонар перамогі рускіх войск над шведскім корпусам А. Левенгаўпта 28 верасня 1708 г. і мармуровы абеліск на брацкіх могілках рускіх воінаў[42].

Апошні па часе музей абласнога падпарадкавання быў заснаваны ў Маладзечна. Рашэнне аб утварэнні Мінскага абласнога краязнаўчага музея было прынята ў ліпені 1959 г. Гэтаму рашэнню папярэднічала краязнаўчая дзейнасць студэнтаў Маладзечанскага настаўніцкага інстытута пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры беларускай літаратуры, будучага славутага гісторыка М. І. Ермаловіча. Назапашаны імі этнаграфічны матэрыял дазволіў узняць пытанне аб музеі ў перыядычным друку, а таксама ў кабінетах кіраўнікоў органаў кіравання культурай. Пасля прыняцця рашэння аб

фарміраванні арганізацыйнай групы па ўтварэнню музея распачаўся збор матэрыялаў. Шэраг каштоўных помнікаў матэрыяльнай культуры ў фондавы збор было перададзена з раскопак, якія праводзіліся археолагамі Л. Д. Побалем, М. М. Чарняўскім, Г. В. Штыхавым, А. Р. Мітрафанавым, М. М. Ткачовым і інш. Сярод іх — залатое скроневае кальцо XII ст. са Старабарысава, посуд з неалітычнага паселішча Лысая Гара Стаўбцоўскага раёна, кафля з Маладзечанскага замчышча, гліняная галоўка чалавека з гарадзішча Багушэвічы Бярэзінскага раёна, унікальная разьба па косці. З г. Калініна была перададзена грамата, выдадзеная З. Даленгу-Хадакоўскаму ў 1818 г. і дазваляўшая праводзіць археалагічныя раскопкі, а таксама працаваць ў архівах і бібліятэках. Дзяржаўны гістарычны музей у Маскве перадаў у Маладзечна залататканы слуцкі пояс. Дачка беларускага пісьменніка Альберта Паўловіча прыслала з Львова асабістыя рэчы бацькі і падарункі вядомага беларускага асветніка Б. І. Эпімах-Шыпілы. Дачка краязнаўцы А. К. Сніткі таксама перадала асабістыя рэчы бацькі і ліст акадэміка Б. А. Тарашкевіча. Свае работы падарылі музею мастакі К. Харашэвіч, Я. Радзялоўская, А. Пупко, Ю. Герасіменка, М. Купава, А. Марачкін і інш.

Значная колькасць матэрыялаў была выяўлена супрацоўнікамі арганізацыйнай групы падчас экспедыцый. У іх выніку паўстала значная этнаграфічная калекцыя, а таксама калекцыі, якія адлюстроўвалі падзеі эпохі напалеонаўскіх войн, паўстанне 1863-1964 гг., рэвалюцыю 1905-1907 гг., першую сусветную вайну, кастрычніцкую рэвалюцыю, вызваленчы рух у Заходняй Беларусі, партызанскі рух падчас нямецкай акупацыі 1941-1944 гг., удзел беларусаў у бітвах Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнае будаўніцтва. Асобную групу складалі матэрыялы аб жыцці і творчасці В. І. Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Кузьмы Чорнага, Максіма Танка, Паўліны Мядзёлкі, Сцяпана Александровіча, Максіма Лужаніна і іншых пісьменнікаў, а таксама кампазітараў Ю. Семянякі, К. Цесакова, І. Лучанка[43].

Вынікам трохгадовай работы арганізацыйнай групы было фарміраванне першаснага фонду, які складаўся з 2 тыс. прадметаў і дакументаў. У далейшым фонды Маладзечанскага музея павялічваліся на 1 тыс. адзінак захоўвання штогод. Сярод найкаштоўнейшых паступленняў пазнейшага часу была скрыпка вядомага кампазітара М. К. Агінскага.

26 красавіка 1964 г. адбылося адкрыццё Мінскага абласнога краязнаўчага музея (пасля скасавання ў 1960 г. Маладзечанскай вобласці музей перайшоў у падпарадкаванне мінскіх абласных

органаў культуры). У музеі была разгорнута шырокая навукова-асветніцкая дзейнасць. На працягу толькі першага няпоўнага года яго экспазіцыю агледзела 17 тыс. чалавек. У наступныя гады колькасць наведвальнікаў штогод павялічвалася. Акрамя традыцыйных экскурсій, для жыхароў вобласці праводзіліся выязныя лекцыі, сустрэчы і інш[44].

Камплектаванне і апрацоўку калекцый, а таксама іх папулярызацыю праводзіў невялікі па колькасці штат супрацоўнікаў, які доўгі час узначальваў глыбокі знаўца і энтузіяст музейнай справы Г. А. Каханоўскі[1]. Акрамя захавання музейных калекцый, яны рупіліся аб выяўленні і ахове нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны. Так, у 1979 г. супрацоўнікамі музея быў устаноўлены нетыповы для таго часу мемарыяльны знак у в. Мясата Маладзечанскага раёна, прысвечаны выдатным людзям, якія ішлі і ехалі ў розныя часы па дарозе Мінск - Вільня. Такім незвычайным спосабам была ўшанавана памяць славутых падарожнікаў С. Буднага, М. Агінскага, Ф. Багушэвіча, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, Б. Тарашкевіча і інш.

Развіццё Ашмянскага, Бярозаўскага, Крычаўскага, Лепельскага, Рэчыцкага, Слуцкага, Столінскага і Тураўскага раённых краязнаўчых музеяў было перапынена рашэннем Міністэрства культуры БССР 1962 г. аб пазбаўленні іх статуса дзяржаўных і пераўтварэнні ў народныя са скасаваннем усіх штатных адзінак[45]. Рашэнне міністэрства паставіла гэтыя невялікія маладыя ўстановы на мяжу знікнення. Дырэктар Столінскага (ўжо народнага) музея наступным чынам апісвае яго работу ў 1964 г.: «...7 пенсіянераў, якія дапамагаюць мне, працуюць нерэгулярна, часта хварэюць... і я адна літаральна разрываюся на два паверхі: не паспееш адкрыць адзін, трэба бегчы па прыступках адкрываць другі, і так цэлы дзень»[46]. І ўсё ж у тым жа годзе ў музеі прайшло 6 выставак, якія наведала каля 45 тыс. чалавек. У 1964 г. гэтым музеям быў вернуты статус дзяржаўных, але іх развіццё было замаруджана трохгадовым перапынкам дзейнасці.

Сярод раённых краязнаўчых музеяў актыўнай навуковай дзейнасцю вылучаўся краязнаўчы музей у Пінску. У 1955 г. яго кіраўніцтва арганізавала першыя раскопкі на гарадзішчы старажытнага Пінска, у выніку якіх археалагічная калекцыя музея ўзбагацілася на 4

---

[1] Каханоўскі Генадзь Аляксандравіч (1936-1994) — музейны дзеяч, археолаг, краязнавец, літаратуразнавец, доктар гістарычных навук. Пасля заканчэння Маскоўскага педагагічнага інстытута з 1964 г. працаваў навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара, дырэктарам Мінскага абласнога краязнаўчага музея. З 1981 г. старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, з 1991 г. старшы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела Навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны. У 1989 г. быў ініцыятарам адраджэння і старшынёй Беларускага краязнаўчага таварыства.

тыс. адзінак. Даследаванні археалагічнай спадчыны Піншчыны працягваліся далей: гарадзішча ў в. Гароднае Столінскага раёна, курганныя могільнікі ў в. Ясінец Ганцавіцкага раёна і в. Крыўчыцы Іванаўскага раёна. У выніку ў экспазіцыі музея з'явіліся помнікі, якія сёння з'яўляюцца яго гонарам — унікальная па разнастайнасці форм паліваная керамічная плітка XII ст., абломак амфары XII ст. з надпісам «... рополче віно», віслая пячатка князя Ізяслава Яраславіча, тураўскі саркафаг XII ст. Агульная колькасць фондавых калекцый напачатку 1961 г. дасягнула 31 398[47].

У маі 1965 г. у жыцці Пінскага музея адбылася важная падзея. Яго мастацкі аддзел, атрымаўшы экспазіцыйнае памяшканне ў велічных залах былога езуіцкага калегіума, адкрыўся для агляду пад назвай Пінскай карціннай галерэі. Яе з'яўленню папярэднічаў калектыўны ліст пінчукоў міністру культуры СССР К. А. Фурцавай з просьбай стварыць у іх горадзе «малую Траццякоўку». Гэта ідэя была адобрана ў Маскве і хутка залы калегіума ужо ўпрыгожвалі карціны У. Айвазоўскага, В. Пярова, І. Шышкіна, В. Васняцова, В. Паленава, К. Макоўскага, В. Бялыніцкага-Бірулі, П. Канчалоўскага, Ю. Пэна, У. Цвірко і інш. Яны былі перададзены Мастацкім фондам СССР, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэяй, Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, мясцовымі мастакамі. Прымаў каштоўныя творы мастацтва і ствараў на іх аснове першую экспазіцыю загадчык галерэі палымяны энтузіяст-мастацтвазнаўца У. У. Баравікоў[48].

Слонімскі раённы краязнаўчы музей у 1957 г. атрымаў двухпавярховы будынак, у якім была разгорнута новая стацыянарная экспазіцыя. Праз два гады музеем упершыню былі праведзены археалагічныя раскопкі на старажытным Слонімскім замчышчы. Лепшае са знойдзенага ўвайшло ў самастойны экспазіцыйны комплекс, які распавядаў аб узнікненні горада і яго сацыяльна-эканамічным развіцці ў XI-XVIII стст. Пазней па замове музея былі праведзены гісторыка-археалагічныя даследаванні гістарычнага цэнтра Слоніма, якія таксама далі каштоўныя экспанаты. Сістэматычна праводзіўся збор матэрыялаў па сацыяльна-эканамічнаму развіццю краю ў бягучы час. Гэтыя і іншыя матэрыялы, прадстаўленыя ў дзевяці экспазіцыйных залах, у 1960-я гг. у сярэднім аглядала каля 20 тыс. чалавек у год[49].

Полацкі раённы краязнаўчы музей, які знаходзіўся ў невялікім будынку лютаранскай кірхі, да 1968 г. меў экспазіцыю толькі па савецкай гісторыі. Аднак яго фондавая калекцыя ў гэты перыяд ўзбагацілася каштоўнымі полацкімі знаходкамі археолагаў Л. В. Аляксеева (1955), а таксама М. К. Каргера і Г. В. Штыхава (1963)[50]. У

1967 г. напярэдадні святкавання 50-годдзя кастрычніцкай рэвалюцыі новыя экспазіцыі наведвальнікам прапанавалі Бабруйскі, Мазырскі, Барысаўскі і некаторыя іншыя раённыя краязнаўчыя музеі. Экспазіцыі мелі традыцыйную структуру, у іх аснову былі пакладзены матэрыялы, сабраныя супрацоўнікамі музеяў на працягу пасляваеннага перыяду.

Значны ўклад ў справу вывучэння і папулярызацыі прыроды і гісторыі мясцовага краю рабіў Лідскі раённы краязнаўчы музей, заснаваны пастановай Савета Міністраў БССР у лютым 1959 г.[51] Музею быў перададзены будынак закрытага касцёла піяраў, дзе пад кіраўніцтвам прызначанага на пасаду дырэктара былога партызана Я. К. Шуцілы пачаўся збор матэрыялаў. Першым паступленнем сталі некалькі нумароў мясцовай газеты «Уперад» за 1944 г., а таксама антыфашысцкія ўлёткі. З цягам часу фондавы збор музея набыў наступную структуру: зброя (найбольш каштоўныя ўзоры XIX ст. былі перададзены з Гродзенскага гісторыка-археалагічнага і Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музеяў), нумізматыка (у тым ліку клад солідаў перыяду праўлення Жыгімонта ПІ Вазы, знойдзены ў час раскопак у Лідскім замку), археалогія (матэрыяльная культуры краю ад першабытнаабшчыннага ладу да XVIII ст., у тым ліку значны комплекс матэрыялаў, выяўленых падчас раскопак у Лідскім замку), этнаграфія (творы майстроў разьбы па дрэву, саломапляцення, ткацтва), мастацтва (пераважна абразы XIX — пачатку XX стст.), дакументальны і кніжны фонд, фотатэка[52].

Першая экспазіцыя Лідскага краязнаўчага музея адкрылася для агляду ў красавіку 1959 г. і складалася з двух аддзелаў: Вялікая Айчынная вайна 1941-45 гг.; гісторыя горада. Абедзьве тэмы раскрываліся з дапамогай дакументаў, фотаздымкаў, карт, а таксама партызанскай зброі.

У 1963 г., пасля выпадковай рэплікі аглядаўшага музей першага сакратара ЦК КПБ К. Т. Мазурава пра пажаданасць адкрыцця ў горадзе планетарыя, экспазіцыя ў касцёле была тэрмінова згорнута, а на яе месцы пачалося абсталяванне лекцыйнай залы і пляцоўкі для тэлескопа. Перасяленне музея супала са скарачэннем яго штатаў, у выніку чаго засталося 3 штатныя адзінкі: дырэктар, тэхнічка і дворнік. У гэтай складанай сітуацыі дзейнасць музея працягвалася дзякуючы створанаму пры ім школьнаму гуртку краязнаўства. Пасля ўзнаўлення штатаў адкрылася новая экспазіцыя Лідскага музея. Яна была разгорнута ў цеснай касцельнай прыбудове, плошчы якой не дазвалялі поўна прадставіць значна пашыраныя фондавыя калекцыі. У 1967 г. камісіяй гарадскога камітэта КПБ быў прыняты раздзел

экспазіцыі, прысвечаны савецкаму перыяду, праз тры гады — раздзелы дасавецкага перыяду і прыродазнаўства. У наступныя гады аддзел савецкага перыяду перабудоўваўся двойчы — у 1973-1976 і 1985-1989 гг. Напрыканцы 1979 г. у музеі была створана экспазіцыя «Лідзе — 600 год», якая распавядала аб сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці горада. Значнай падзеяй у культурным жыцці горада сталі некалькі выставак твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва майстроў Лідчыны, якія праводзіліся на працягу 1980-х гг. Іх лепшыя экспанаты дэманстраваліся на рэспубліканскай і агульна-саюзнай выстаўках народнай творчасці ў Мінску і Маскве.

Узнікненне Крычаўскага раённага краязнаўчага музея звязана з імем аднаго чалавека — М. Ф. Мельнікава[I]. Вывучаць родны край, збіраць помнікі мінуўшчыны ён пачаў яшчэ юнаком у 1930-я гг., калі разам з бацькам, тэхнікам па сельскаму будаўніцтву, ездзіў па Магілёўшчыне. Усё сабранае юным калекцыянерам загінула разам з бацькоўскім домам, спаленым падчас вайны. Па вяртанні на радзіму М. Ф. Мельнікаў прыняў рашэнне аднавіць і пашырыць сваю калекцыю дзеля стварання на яе падмурку мясцовага музея. На працягу 1950-х гг. наведваў бібліятэкі, архівы, музеі Магілёва, Мінска, Масквы, знаёміўся з вучонымі, журналістамі, пісьменнікамі, дзяржаўнымі дзеячамі, якім даводзілася працаваць ці ваяваць на Крычаўшчыне. Яны дапамагалі даследаваць падзеі і факты, звязаныя з гісторыяй краю, высвятляць іх узаемасувязі з агульнай гісторыяй краіны. Павелічэнню калекцыі спрыялі мясцовыя краязнаўцы, якія згуртаваліся вакол будучага музея. З іх дапамогай паступаўшыя прадметы праходзілі першасны ўлік — рэгістраваліся і сістэматызаваліся, некаторыя з іх зрабіліся аб'ектам вывучэння. Усе матэрыялы для будучага музея Мельнікаў набываў за ўласныя сродкі, часта адмаўляючы сабе ў неабходным. «Старэнькі пінжак, паношаныя чаравікі, выцвілая сарочка... Многім менавіта такім запомніўся Міхаіл Фёдаравіч у тую пару»[53].

Напачатку 1960-х гг. колькасць сабраных прадметаў і дакумен-таў дазволіла ўзняць пытанне аб адкрыцці на іх аснове мясцовага музея. Але ўжо пасля першых хадайніцтваў М. Ф. Мельнікаў сутыкнуўся з абыякавасцю і непаразуменнем улад. Многія лічылі яго дзіваком. А адзін з кіраўнікоў раёна ў адказ на чарговую просьбу

---

[I] Мельнікаў Міхаіл Фёдаравіч (1921-1993) - беларускі музейны дзеяч, краязнавец, нарадзіўся ў Крычаве, вучыўся ў БДУ. У 1939 г. быў беспадстаўна рэпрэсіраваны, асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ГУЛАГу. У 1950 г. вярнуўся на радзіму, дзе працаваў у бібліятэцы, доме культуры. Адначасова збіраў матэрыялы па гісторыі Крычаўшчыны і яе ўраджэнцаў з мэтай стварэння мясцовага музея, дырэктарам якога быў у 1961 1982 гг. З 1982 г. — навуковы супрацоўнік. Заслужаны работнік культуры БССР, аўтар шэрагу кніг, нарысаў, сцэнарыяў дакументальных фільмаў.

краязнаўцы прама адказаў: «Жылі без музея і яшчэ сто гадоў пражывём». Таму першую экспазіцыю Мельнікаў адкрыў у прыбудове да ўласнага дома[54].

Тым не менш, энтузіязм і ўпартасць краязнаўцы дазволілі дасягнуць поспеху. Крычаўскі дзяржаўны раённы краязнаўчы музей быў адкрыты 15 кастрычніка 1961 г. у невялікім аднапавярховым драўляным будынку паблізу ад Сожа. Праз год пасля адкрыцця музей нечакана быў пераўтвораны ў грамадскі. Канец 1962, 1963 і 1964 гг. М. Ф. Мельнікаў працаваў адзін, не атрымліваючы ніякага заробку. За гэты час яму прыходзілася не толькі папулярызаваць фондавыя калекцыі (напрыклад, у 1964 г. музей агледзела больш 40 тыс. чалавек), але і ажыццяўляць іх ахову, ў тым ліку ад сваіх мінскіх калег, якія планавалі далучэнне крычаўскіх калекцый да фондавага збору Аргргрупы па стварэнню Дзяржмузея БССР[I]. Летам 1964 г. Мельнікаў, даведзены да адчаю, звярнуўся з лістом да М. С. Хрушчова, у якім пісаў аб агульным заняпадзе беларускай культуры, пагардлівых адносінах ўлад да музеяў, скарачэнні іх

*

79

колькасці і пераводзе на грамадскія пачаткі. У прыватнасці, ён адзначаў: «Культасветустановы з іх малымі заробкамі для некаторых праваліўшыхся работнікаў сталі месцам пакарання, месцам атрымання пенсіі»[55]. З падобнымі лістамі М. Ф. Мельнікаў звяртаўся ў Міністэрства культуры БССР, а яго справаздачы, якія ён рэгулярна дасылаў у Мінск, больш нагадвалі планы разгортвання музейна-краязнаўчай работы ў рэспубліцы.

Пасля вяртання дзяржаўнага статуса ў 1965 г. развіццё Крычаўскага музея працягнулася. Яго экспазіцыя дазваляла наведвальнікам скласці ўражанне аб мінуўшчыне і прыродзе Крычаўшчыны. Экспазіцыйны аповяд пачынаўся з дэманстрацыі матэрыялаў археалагічных раскопак, у тым ліку Крычаўскага замка. З этнаграфічнай калекцыі было прадстаўлена народнае адзенне, прылады працы і побыту канца XIX — пачатку XX стст., узоры прыкладнога мастацтва. Асобныя комплексы распавядалі пра ўдзел беларусаў у Грунвальдскай бітве 1410 г., казацкія войны сярэдзіны XVII ст., падзеі Паўночнай вайны 1700-1721 гг., Крычаўскае паўстанне першай паловы XVIII ст., дзейнасць Крычаўскай суднаверфі ў XVIII ст., пра

---

[I] Гэта была вымушаная мера з боку кіраўніцтва Аргргрупы і, напэўна, адзіны спосаб выратаваць калекцыі страціўшых дзяржаўны статус музеяў. Напрыклад, пасля пераводу на грамадскія пачаткі Слуцкага музея яго фондавы збор быў звалены ў невялікім пакоі ў мясцовым доме культуры, калекцыі Рэчыцкага музея перадалі ў гарадскую школу-інтэрнат, адкуль яны былі перавезены ў фондасховішча Аргргрупы.

ўдзельнікаў народніцкага (А. В. Бонч-Асмалоўскага, М. К. Судзілоўскага, С. П. Каваліка) і сацыял-дэмакратычнага (П. М. Лепяшынскага, У. Д. Бонч-Бруевіча, В. А. Радус-Зяньковіча) рухаў. Дэманстраваліся асабістыя рэчы, фотаздымкі, кнігі з аўтографамі беларускіх і рускіх пісьменнікаў І. Шамякіна, М. Ткачова, А. Пысіна, К. Сіманава, Я Вараб'ёва, С. Ларыёнава, творы жывапісу М. Аўчыннікава, А. Бархаткова, Я. Зайцава, П. Крохалева, М. Назарчука, скульптуры С. Адашкевіча і інш.

Да ўнікальных помнікаў музея адносіліся Крычаўскі звон, адліты мясцовымі ліцейшчыкамі з бронзы ў 1748 г., крычаўская кераміка XV-XX стст. — выраблены з чырвонай гліны паліваны сталовы посуд, кафля, дэкаратыўныя архітэктурныя ўпрыгожанні, вазы, цацкі, якія вылучаліся высокім узроўнем тэхналогіі вытворчасці, і ішп.

Праводзячы экскурсіі па свайму музею, М. Ф. Мельнікаў добра разумеў, што ніякі падручнік па гісторыі не ў стане спаборнічаць з арыгінальнымі помнікамі ні па ўзроўню эмацыянальнага ўздзеяння, ні па трываласці захоўвання ў памяці гістарычных фактаў. Яго бліскучыя экскурсіі былі вынікам паглыбленага вывучэння першакрыніц і вучылі разумець «мову» рэчаў. Кожная яго музейная экскурсія, вечарына на прадпрыемстве або ў школе, лекцыя ў вёсцы мела індывідуальны характар і нязменны поспех.

У перыяд «адлігі», як і ў папярэдняе дзесяцігоддзе, асноўную ўвагу кіраўніцтва музейнай галіной рэспублікі надавала ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Гэта задача ўскладалася перш за ўсё на музеі ваенна-гістарычнага профілю, буйнейшым з якіх бы ў Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У кастрычніку 1962 г. музей быў закрыты для агляду ў сувязі з аварыйным станам будынку. У чэрвені 1964 г. музею быў прадастаўлены новы будынак па вул К. Маркса, 12. У ім у вельмі сціслыя тэрміны супрацоўнікі зманціравалі экспазіцыю, адкрыццё якой было прымеркавана да святкавання 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі. Экспазіцыя мела часовы характар, бо меркавалася правесці рэканструкцыю будынка. У ёй ужо адсутнічалі агульныя матэрыялы па гісторыі Беларусі, якія адышлі ў фонды Дзяржмузея БССР. У той жа час з'явіліся матэрыялы аб падзеях на іншых тэатрах баявых дзеянняў другой сусветнай вайны[56].

Нечакана пасля заканчэння пабудовы новай экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны па вул. К. Маркса, 12 партыйным кіраўніцтвам рэспублікі было прынята рашэнне аб перадачы яму новага будынка Дзяржаўнага музея БССР па праспекту Леніна 25А. 20 лютага 1966 г. там адкрылася для агляду экспазіцыя

на першым паверсе (мастак — М. Кірылаў). А ў лістападзе 1967 г. у дні святкавання 50-годдзя кастрычніцкай рэвалюцыі была адкрыта ўся экспазіцыя музея. Гэтыя работы праводзіліся ў вялікай спешцы, таму ўжо ў наступным годзе згодна з рашэннем бюро ЦК КПБ пачалася перабудова экспазіцыі.

Працэс стварэння філіялаў Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў распачаты пастановай Савета Міністраў БССР «Аб уладкаванні месцаў пахавання воінаў Савецкай Арміі, партызан і мірнага насельніцтва, загінуўшых у 1941-1945 гг., і аб увекавечанні знамянальных месц і падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайною на тэрыторыі БССР», прынятай у красавіку 1959 г.[57] Пасля прыняцця пастановы дырэктар музея С. Р. Шчуцкі спецыяльным загадам абавязваўся адкрыць у 1960 г. філіялы на месцах лагераў смерці ў вёсках Малы Трасцянец, Масюкоўшчына і Уручча. Акрамя таго, планавалася стварыць самастойныя музеі-запаведнікі на былым аэрадроме мінскага партызанскага аб'яднання на востраве Зыслаў Любанскага раёна і месцы дыслакацыі партызанскай брыгады «Буравеснік» у в. Каладзіно Уздзенскага раёна. У ліпені таго ж 1960 г. у Савет Міністраў БССР звярнуўся дырэктар Бярэзінскага запаведніка І. А. Пяхота з прапановай стварыць у пас. Кранцы, дзе ўжо знаходзіўся Музей флоры і фаўны, яшчэ адзін філіял музея Вялікай Айчыннай вайны. Сваю прапанову І. А. Пяхота матываваў тым, што на тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка пражывае шмат былых партызан, у вёсках захаваліся прадметы партызанскага побыту, а на месцах баёў — зброя і баявая тэхніка[58]. Але ніводны з гэтых праектаў у першапачатковым выглядзе ў той час рэалізаваны не быў.

Адкрыццё першага філіяла Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — Музея камсамольскага падполляў пас. Обаль Віцебскай вобласці — адбылося праз пяць гадоў, 29 кастрычніка 1965 г. Экспазіцыя, якая распавядала аб дзейнасці ў 1942-1943 гг. обальскага камсамольска-маладзёжнага падполля «Юныя мсціўцы», была зманціравана супрацоўнікамі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на чале з яго дырэктарам С. Р. Шчуцкім. Першапачаткова ў ёй налічвалася толькі 500 экспанатаў. Адкрывала музей былы сакратар обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі Е. С. Зянькова. У снежні 1989 г. обальскі філіял набыў статус самастойнага музея[59].

На аснове новых паступленняў у сярэдзіне 1960-х гг. адкрылася новая экспазіцыя Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, якая займала ўжо два будынкі. У сувораўскай сядзібе раскрывалася тэма «Вялікі рускі палкаводзец А. В. Сувораў». У экспазіцыі пяці залаў другога будынка пераважна на капійных матэрыялах

схематычна даваўся агляд расійскай ваеннай гісторыі, пачынаючы з Айчыннай вайны 1812 г. і заканчваючы Вялікай Айчыннай вайною 1941-1945 гг. Як і ў першыя гады пасля адкрыцця, Кобрынскі ваенна-гістарычны музей быў адным з найбольш папулярных у БССР сярод наведвальнікаў. Напрыклад, у 19651, яго агледзела каля 70 тыс. чалавек, большасць з якіх складалі турысты[60].

Найбольш паспяховым ў разглядаемы перыяд у дзейнасці Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П. І. Баграціёна быў 1962 г., калі ў СССР праходзіў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 150-годдзю Айчыннай вайны 1812 г. Галоўная ўвага супрацоўнікаў музея была накіравана на экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў, колькасць якіх у юбілейным годзе склала 38,5 тыс. чалавек. Асветніцкія мерапрыемствы дапаўняліся работамі па папаўненню і сістэматызацыі фондавых калекцый музея (перш за ўсё археалагічнай і помнікаў ваеннай гісторыі), якія вылучаліся высокай якасцю і дасягнулі ў 1962 г. 66 620[61].

Пашырылася поле адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці Музея К. С. Заслонава ў Оршы. Яго супрацоўнікі арганізоўвалі вялікую колькасць перасоўных выставак, выезды былых партызан і моладзі ў в. Кукавацъ Сенненскага раёна на месца гібелі легендарнага «дзядзькі Косці», турыстычныя паходы моладзі па месцах баявых дзеянняў пад кіраўніцтвам былых партызан-заслонаўцаў.

У жніўні 1966 г. паводле распараджэння Савета Міністраў БССР пачаліся падрыхтоўчыя работы па арганізацыі новага музея ваенна-гістарычнага профілю — Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза М. Л. Шмырова[62].

Яшчэ адзін новы ваенна-гістарычны музей адкрыўся 15 кастрычніка 1968 г. ў в. Леніна Горацкага раёна на месцы першага сумеснага бою часцей Чырвонай Арміі і сфарміраванай у СССР 1-й Польскай пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі супраць нямецкіх войск і з'яўляўся часткай Мемарыяльнага комплексу савецка-польскай баявой садружнасці. Яго адкрыццё было прымеркавана да 25-й гадавіны бою і адбылося ва ўрачыстай абстаноўцы з удзелам ветэранаў вайны з дзвюх краін. Музей савецка-польскай баявой садружнасці з'яўляўся цэнтральнай кампазіцыяй комплексу і вылучаўся нетрадыцыйным, яскравым будынкам (архітэктары Я. Белапольскі, В. Хавін, скульптар У. Цыгаль). Ён уяўляў купал дыяметрам 34 м і вышынёй 11 м з жалезабетону, шкла і алюмінію, зроблены ў форме салдацкай каскі і накрыты невялікімі шчытамі з чорнай бляхі, пакладзенымі на каркас. Лесвічныя вузлы былі вылучаны блокамі і ўпрыгожаны звонку барэльефнымі выявамі пяціканцовай зоркі і арла — сімваламі дзвюх

краін. Перад шырокім арачным уваходам у музей змяшчалася стэла, увянчаная выявай сцяга, дрэўка якога трымаюць дзве рукі. Непадалёк ад музея, на ўзгорку знаходзіліся дзве брацкія магілы загінуўшых савецкіх і польскіх воінаў з усталяваным на іх помнікам прабітым снарадамі, пакарэжаным лістом брані.

Экспазіцыя Музея савецка-польскай баявой садружнасці была прысвечана гісторыі ўтварэння і фарміравання Войска Польскага баявыя сцягі, зброя, дакументы, фотаздымкі, схемы баявых апера-цый, урны з зямлёй з усіх ваяводстваў Польшчы. У яе цэнтральнай частцы знаходзілася дыярама «Бітва пад Леніна», якая паказвала кульмінацыйны момант бою. Атмасферу ўрачыстасці ў экспазіцыі стварала мармуровая дошка, на якой былі высечаны прозвішчы польскіх і савецкіх салдат, загінуўшых у баі пад Леніна. Музей саве-цка-польскай баявой садружнасці быў аб'ектам пераважна турыстыч-нага агляду. Штогод яго ў сярэднім наведвала каля 40 тыс. чалавек[63].

11 верасня 1957 г. у дзень 80-годдзя з дня нараджэння Ф. Э. Дзяржынскага на яго радзіме ў г. п. Івянец Маладзечанскай вобласці адкрыўся гісторыка-рэвалюцыйны музей, прысвечаны яго памяці. Першая экспазіцыя, створаная за шэсць месяцаў, змяшчала пераважна калійныя матэрыялы. З цягам часу ў выніку збіральніцкай работы экспазіцыя ўзбагацілася «Кнігай Дзераўнянскай рымска-каталіцкай прыходскай царквы пра нованароджаных у 1876-1883 гг.» з запісам у ёй пра нараджэнне Ф. Э. Дзяржынскага, а таксама яго асабістымі рэчамі, сямейным альбомам з фотаздымкамі, макетамі маёнтка Дзяржынава і рабочага кабінета ў Маскве. Акрамя таго, у фондавы збор трапілі творы, лісты, копіі распараджэнняў і загадаў, фатаздымкі, фанатэка з запісамі ўспамінаў, дакументальныя фільмы, кнігі, творы мастацтва, прысвечаныя Дзяржынскаму[64].

Партыйнае кіраўніцтва БССР надавала музею Ф. Э. Дзяржынскага вялікае значэнне ў справе ідэалагічнага выхавання насельніцтва. Ён быў уключаны ў маршруты, якія прапаноўваліся турыстычнымі арганізацыямі савецкім і замежным групам. Толькі праз Маладзечанскае бюро падарожжаў і экскурсій музей Ф. Э. Дзяржынскага наведалі турыстычныя групы з Тбілісі, Кіева, Арэнбурга, Петрапаўлаўска, Казані, Запарожжа, Крывога Рога і соцень іншых гарадоў, аб чым сведчылі запісы ў кнізе водгукаў. Важным накірункам дзейнасці музея ў Івянцы была метадычная і практычная дапамога ў стварэнні школьных музеяў, прысвечаных Дзяржынскаму[65].

У 1964 г. раённы краязнаўчы музей у Бярозе — горадзе, дзе з 1934 г. па 1939 г. існаваў канцэнтрацыйны лагер для палітзняво-

леных, быў перапрафіляваны ў гісторыка-рэвалюцыйны. У наступныя гады ў яго залах была разгорнута экспазіцыя, якая ахоплівала перыяд з канца XIX ст. і адлюстроўвала галоўныя этапы рэвалюцыйнага руху на Беларусі. Складалася картатэка вязняў канцлагера[66].

Хуткае павелічэнне калекцый Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР (па-ранейшаму адзінага ў рэспубліцы музея мастацкага профілю) паставіла пытанне пра ўзвядзенне для яе ўласнага будынка. Вырашыць яго дапамагла Дэкада беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. У 1954 г. у рэспубліцы ішла актыўная падрыхтоўка да Дэкады, прычым многія падрыхтоўчыя мерапрыемствы праходзілі ў непрыстасаваным памяшканні галерэі. Для ўдзелу ў адным з іх — папярэднім праглядзе твораў беларускага мастацтва ў Мінск прыехалі вядомыя савецкія мастакі А. Бубнаў, А. Грыцай, Д. Шмарынаў, скульптар М. Манізер, мастацтвазнаўца П. Сысоеў. Госці з Масквы наведалі ЦК КПБ, потым у галерэі адбыўся канчатковы адбор работ для выстаўкі ў дні Дэкады. На праглядзе таксама прысутнічалі першы сакратар ЦК КПБ М. С. Патолічаў і старшыня Савета Міністраў БССР А. Я. Кляшчоў. Падчас абмеркавання было закранута пытанне аб неабходнасці ўзвядзення належнага будынка карціннай галерэі і неўзабаве яно было ўнесена ў план капітальнага будаўніцтва Мінска. У канцы таго ж года архітэктар М. Бакланаў начарціў першыя абрысы будынка па вул. Леніна.

Пакуль ішло будаўніцтва, галерэя працягвала збіранне твораў мастацтва. Былі набыты «Смерць Аданіса» А. Ласенкі, «Партрэт Т. Разнатоўскай» Д. Лявіцкага, «Партрэт К. Радзянкі» У. Баравікоўскага, «Старая сялянка» А. Венецыянава, «Партрэт А. Легран» П. Фядотава, «Царэўна» В. Сурыкава, «З прашэннем» В. Васняцова, «Паводка» І. Левітана, «Дзяўчына ў вянку» С. Канёнкава. Як і раней, асаблівая ўвага надавалася збіранню творчасці мастакоў, жыццё і дзейнасць якіх былі звязаны з беларускай зямлёй. Сярод іх «Групавы партрэт» І. Аляшкевіча, «Партрэт Ф. Талстога» С. Заранкі, «Ружы і плады», «Партрэт сына» І. Хруцкага, «Каля кузні», «Жаночы партрэт», «Вечар у Мінскай губерні» А. Гараўскага, «Летні дзень» Ф. Яноўскага, «Жаночы партрэт», «Партрэт мужчыны» К. Карсаліна, «Імерэцінская арба з буйваламі» Ф. Хадаровіча, «Месячная ноч. Здраўнёва» І. Рэпіна, «Пахмурны дзень», «Рэчка. Вечар», «Ціхая светлая ноч. Вясковая вуліца» В. Бялыніцкага-Бірулі, «Возера Сенеж», «Інтэр'ер», «Вясковая ноч» С. Жукоўскага[67].

Працягвалася правядзенне навуковых экспедыцый па вывучэнню і збіранню помнікаў даўніны. Асабліва плённай была 3-я экпедыцыя 1958 г., падчас якой былі абследаваны і фотафіксаваны

помнікі ў Мінскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях. 3-я экспедыцыя выявіла такія шэдэўры, як «Маці Боская Адзігітрыя Смаленская» у Лубянцы, «Царскія Вароты» у Баранавічах, шматярусныя іканастасы ў Давыд-Гарадку, скульптуру XVI ст. і інш.[68]

У 1957 г. Дзяржаўная карцінная галерэя БССР была перайменаваная ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР, які пераехаў у новы будынак[69]. Падчас пераезду агульная колькасць твораў мастацтва ў фондавых калекцыях дасягнула 3 370. Цікавасць публікі да гэтага збору была вялікай. Толькі за першыя шэсць месяцаў 1958 г. музей агледзела 40 460 чалавек. Наведвальнікі ўбачылі ў залах класічную мастацкую спадчыну беларускага і рускага народаў. Моцнае ўражанне пакідалі старажытны беларускі жывапіс і драўляная «рэзь», якія ўпершыню занялі належнае месца ў экспазіцыі музея. Шырока была паказана творчасць сучасных беларускіх мастакоў — І. Ахрэмчыка, В. Волкава, Я. Зайцава, К. Касмачова, А. Шыбнёва, В. Цвіркі, М. Філіповіча, З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава і інш.[70]

Адкрыццё Дзяржаўнага мастацкага музея азначала ўзнікненне новага асяродка мастацкай культуры. Не абмяжоўваючыся традыцыйнай дзейнасцю ў сценах музея, яго супрацоўнікі праводзілі шматлікія перасоўныя выстаўкі, геаграфія якіх сягала далёка за межы рэспублікі. Так, на працягу 1959 г. было праведзена 28 выставак, якія агледзела 58 тыс. чалавек[71]. Акрамя актыўнай экспазіцыйнай і асветніцкай дзейнасці, музей вылучаўся высокім узроўнем навукова-даследчай работы. За першыя дваццаць пасляваенных гадоў з-пад пяра яго супрацоўнікаў выйшла 8 кніг і 54 артыкулы па пытаннях выяўленчага мастацтва[72].

У 1955 г. да 100-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча быў адноўлены даваенны Дом-музей паэта, якому быў нададзены літаратурны профіль. У тым жа годзе для агляду была адкрыта яго экспазіцыя, створаная пераважна на калійным матэрыяле. З цягам часу экспазіцыя набыла літаратурна-мемарыяльны характар. Яна ўзбагацілася асабістымі рэчамі А. Міцкевіча (гадзіннік, акуляры і інш.), макетам помніка паэту ў Парыжы (скульптар А. Бурдэль), помнікам-гарэльефам, заказаным да 100-годдзя з дня нараджэння паэта яго старэйшай дачкой у Варшаве (у 1903 г. устаноўлены ў касцёле св. Міхаіла ў Навагрудку), карцінамі В. Ваньковіча, Р. Мясаедава, творамі сучасных беларускіх мастакоў і пісьменнікаў, прысвечанымі Міцкевічу, фрагментамі прадметаў побыту з археалагічных раскопак на радзіме Міцкевіча — на хутары Завоссе, вырабамі са шкла, фарфору, фаянсу XIX ст. У кніжны фонд паступілі рукапісы, прыжыццёвыя выданні, пераклады твораў паэта, старадрукі і інш.[73]

Экспазіцыя Дома-музея была падмуркам яго навукова-асветніцкай дзейнасці. Музей карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод турыстаў, асабліва з Польшчы. Штогод музей аглядала да тысячы груп экскурсантаў. Акрамя таго, праводзілася вялікая колькасць выстаў, лекцый, іншых нетрадыцыйных форм работы з наведвальнікамі, такіх, як літаратурна-музычныя салоны.

Разглядаемы перыяд характарызаваўся развіццём існаваўшых і стварэннем новых ведамасных музеяў. Статыстыка музеяў дадзенай групы, як і раней, нікім у рэспубліцы не вялася, адсутнічаў які-небудзь каардынацыйны орган. Таму існуюць толькі фрагментарныя дадзеныя аб іх дзейнасці. Між тым, нават яны сведчаць аб важнай ролі, якую адыгрывалі ведамасныя музеі ў дакументаванні асобных галін навукі, тэхнікі, вытворчасці. Большасць з іх была даступна з пэўнымі абмежаваннямі. Павелічэнне колькасці, а таксама пашырэнне дыяпазону дзейнасці ведамасных музеяў, створаных у разглядаемы перыяд, дазваляе падзяліць іх на две вялікія групы: гісторыка-біяграфічныя і галіновыя. Музеі, якія адносіліся да першай групы, раскрывалі ў сваіх экспазіцыях гісторыю нейкага ведамства, установы або прадпрыемства праз біяграфіі яго стваральнікаў, кіраўнікоў, ветэранаў, асноўныя этапы яго развіцця, а таксама прафесійныя дасягненні. Музеі другой групы былі прысвечаны пэўнай галіне гаспадаркі, сферы грамадскага жыцця або навуковай дысцыпліне, напрыклад, медыцынскія, педагагічныя, сельскагаспадарчыя, навукова-тэхнічныя, сувязі, транспарту і інш. Большасць гэтых музеяў мела таксама рэтраспектыўны характар, але ў адрозненне ад гісторыка-біяграфічных, зарыентаваных на збіранне і экспанаванне перш за ўсё дакументальных і фотаматэрыялаў, фондавыя зборы галіновых музеяў узбагачаліся пераважна рэчавымі першакрыніцамі.

Пэўныя змены адбыліся ў музеях, створаных у складзе АН БССР. У 1957 г. у Мінску было распачата ўзвядзенне будынка для Літаратурнага музея Я. Купалы, што было прадугледжана пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Беларусі Я. Купалы», прынятай у 1945 г. Гарадскі савет выдзеліў для будоўлі месца па вул. Я. Купалы на былым папялішчы дома, у якім паэт жыў да вайны. У лістападзе 1959 г. музей пераехаў у новы будынак, дзе адразу ж пачалася праца па стварэнню новай экспазіцыі. У ёй, акрамя супрацоўнікаў, прынялі ўдзел вядомыя пісьменнікі К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Глебка, П. Броўка. Падрыхтаваны імі тэматыка-экспазіцыйны план прайшоў экспертызу і быў ухвалены не толькі ў Акадэміі навук БССР, але і ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя М. Горкага. Падчас мантажу экспазіцыі ў новым купалаўскім доме

нечакана памерла яго нязменная гаспадыня У. Ф. Луцэвіч. Адкрыццё музея 17 мая 1960 г. адбылося ўжо без яе.

Новая экспазіцыя была значна пашырана і змяніла характар за кошт прынцыпу прадметнага паказу. Тры першыя залы былі прысвечаны дарэвалюцыйнаму перыяду жыцця паэта, пяць наступных — савецкаму, у апошняй зале размяшчалася выстава «Янка Купала ў народнай творчасці» (мастацкае афармленне — А. Кроль). У цокальным паверсе змяшчалася лекцыйная зала. Яшчэ адзін пункт пастановы 1945 г. «Аб увекавечанні памяці народнага паэта Беларусі Я. Купалы» быў выкананы ў 1962 г., калі падчас святкавання 80-годдзя песняра ў будынку былой канторы Капыскага лясніцтва адкрыўся філіял музея «Ляўкі»[74].

У 1963 г., нягледзячы на супраціўленне навуковых супрацоўнікаў на чале з дырэктарам літаратуразнаўцам І. З. Шарахоўскім, Літаратурны музей Я. Купалы быў выведзены са складу Акадэміі навук і падпарадкаваны Міністэрству культуры. Гэта рашэнне абумовіла змену прыярытэтаў — галоўным паказчыкам якасці работы музея цяпер стала адукацыйна-асветніцкая, а не навукова-даследчыцкая дзейнасць.

16 жніўня 1956 г., праз тры дні пасля смерці Якуба Коласа, ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі пастанову «Аб увекавечанні памяці народнага паэта БССР Якуба Коласа», дзе адным з пунктаў было распараджэнне аб стварэнні прысвечанага яму літаратурнага музея ў Мінску і філіяла гэтага музея ў Стаўбцоўскім раёне. Першым дырэктарам музея стаў старэйшы сын паэта Д. К. Міцкевіч, які прысвяціў жыццё справе ўшанавання памяці свайго славутага бацькі, папулярызацыі яго творчай спадчыны. Экспазіцыя музея адкрылася ў снежні 1959 г. у невялікай сядзібе, якую паэт займаў апошнія 11 гадоў свайго жыцця і якая мела мемарыяльны характар. Першапачаткова Літаратурнаму музею Я. Коласа быў нададзены статус навукова-даследчай установы ў складзе Акадэміі навук БССР.

За першае дзесяцігоддзе дзейнасці ў музеі былі сфарміраваны калекцыі агульнай колькасцю ў 10 тыс. адзінак. Найдаражэйшыя з іх — рукапісы вершаў, паэм «Сымон-музыка», «Рыбакова хата», «Суд у лесе», «Адплата», кнігі «На ростанях», апавяданняў, публіцыстычных артыкулаў, лісты і дзённікі. Вялікую каштоўнасць мелі фатаграфічны фонд (каля тысячы выяў паэта), кніжны фонд (амаль ўсе выданні кніг Я. Коласа на розных мовах), выяўленчы фонд (працы амаль усіх беларускіх жывапісцаў, графікаў, скульптараў), фонд фотадакументаў (успаміны дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, мастакоў). Навукова-даследчая дзейнасць праводзілася супрацоўнікамі па двух

напрамках: складанне бібліяграфіі твораў Я. Коласа і летапіс яго жыцця і творчасці. Здабыткі збіральніцкай і навукова-даследчай дзейнасці знайшлі сваю рэалізацыю ў бібліяграфічных даведніках, зборніках артыкулаў і ўспамінаў пра песняра, альбомах пра яго жыццё і творчасць, тэлеперадачах[75]. Штогод «Коласаў дом» наведвала да 20 тыс. чалавек[76].

Далейшае развіццё музея стрымлівалі умовы працы — у адным пакоі плошчай ў 16 кв. м знаходзіліся рабочыя месцы супрацоўнікаў, фондасховішча, бібліятэка і канцылярыя. Надзеі на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы Літаратурнага музея Я. Коласа яго супрацоўнікі звязвалі з передачай сваёй установы ў падпарадкаванне Міністэрству культуры БССР, што адбылося ў 1963 г.

Лепш зразумець і адчуць творы Я. Коласа, у якіх знайшлі адлюстраванне навакольная прырода, жыццё і побыт землякоў, сям'і Міцкевічаў дапамагаў філіял музея ў Смольні. Літаратурна-манаграфічная экспазіцыя філіяла была ў 1967 г. размешчана у хаце сям'і Міцкевічаў і змяшчала шэраг рэчаў, якімі карыстаўся паэт[77].

1960-я гг. былі часам актыўнага папаўнення фондавых калекцый галіновых музеяў вышэйшых навучальных устаноў.

Пасля экспедыцыі на Баранцава і Белае моры пад кіраўніцтвам тагачаснага загадчыка музея Л. П. Шклярава фонды Заалагічнага музея Белдзяржуніверсітэта ўзбагаціліся каланіяльнымі відамі «птушыных базараў» і некаторымі прадстаўнікамі ластаногіх. Выпускнікамі біяфака БДУ з марскіх экспедыцый на Ціхі і Атлантычны акіяны і на ўзбярэжжа Антарктыды былі дастаўлены рэдкія віды марскіх жывёл. Больш 70 калекцыйных чучал птушак перадаў Заалагічны музей Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта. Адначасова супрацоўнікі музея праводзілі рэстаўрацыю і кансервацыю «старых» калекцый, а таксама адукацыйна-асветніцкую работу[78].

Новы імпульс развіцця Музей мінералогіі і петраграфіі Белдзяржуніверсітэта атрымаў пасля прызначэння ў 1955 г. на пасаду яго загадчыка былога дырэктара Ільменскага запаведніка на Урале У. Г. Спірыдонава. У другой палове 1950-х — пачатку 60-х гг. музей узбагаціўся багатымі калекцыямі мінералаў і горных парод, сабраных студэнтамі падчас летніх практык у Сібіры, Сярэдняй Азіі і Украіне. Намаганнямі У. Г. Спірыдонава была праведзена іх дыягностыка і класіфікацыя, складзены каштоўныя ў навуковых адносінах каталогі. Назапашаны матэрыял дазволіў стварыць новыя экспазіцыйныя раздзелы: «Марфалогія і фізічныя ўласцівасці мінералаў», «Класы мінералаў» і інш.[79]

У выніку правядзення штогадовых археалагічных і этнаграфічных экспедыцый у 1960 г. на гістарычным факультэце Белдзяржуніверсітэта аднавіў сваю дзейнасць гісторыка-археалагічны кабінет. Яшчэ праз чатыры гады быў створаны нумізматычны кабінет, высокі навуковы ўзровень работы якога забяспечваў дацэнт В. Н. Рабцэвіч. Асаблівую ўвагу вучоных і студэнтаў прыцягвалі прадстаўленыя ў іх залатыя і сярэбраныя ўпрыгожанні, злiткі-грыўны са знакамітага Вішчынскага скарбу, знойдзенага экспедыцыяй пад кіраўніцтвам дацэнта Э. М. Загарульскага, экспанаты, перададзеныя Керчэнскім і Феадасійскім археалагічнымі музеямі, і інш.

У 1958 г., пасля атрымання памяшкання і экспазіцыйнага абсталявання, разгарнуў навуковую і вучэбную дзейнасць Анатамічны музей кафедры нармальнай анатоміі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Створаны пад непасрэдным кіраўніцтвам загадчыка кафедры прафесара Д. М. Голуба, музей валодаў значнай колькасцю сухіх і вільготных прэпаратаў па параўнаўчай анатоміі, згрупаваных ў аддзелы асцэалогіі, артрасіндэсмалогіі, міялогіі, эмбрыялогіі У 1967 г. быў адкрыты спецыяльны раздзел, прысвечаны гісторыі кафедры нармальнай анатоміі[80].

У 1965 г. быў створаны першы ведамасны Музей гісторыка-біяграфічнага тыпу у старэйшай вышэйшай навучальнай установе — Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

8 лістапада 1956 г. паводле загаду Міністэрства абароны СССР адбылося адкрыццё яшчэ адной буйной ведамаснай галіновай установы — Музея абароны Брэсцкай крэпасці. Яго адкрыццю папярэднічала вялікая даследчыцкая праца, праведзеная пісьменнікам С. С. Смірновым, які расказаў свету аб подзвігу абароны крэпасці, расшукаў яе абаронцаў ў розных кутках краіны. Некаторыя з іх трапілі ў палон цяжкапараненыя ці кантужаныя, і, спазнаўшы нямецкія лагеры для ваеннапалонных, апынуліся пасля вызвалення ў ГУЛАГу. Некаторыя адчулі на сабе кляймо здраднікаў. Так, Герой Савецкага Саюза П. М. Гаўрылаў быў звольнены з працы, трагічна склаўся лёс А. М. Філя і Б. А. Маслава. Пасля XX з'езда КПСС дзякуючы намаганням С. С. Смірнова былі рэабілітаваны і адноўлены ў правах многія абаронцы цытадэлі. У прадмове да сваёй кнігі «Брэсцкая крэпасць» пісьменнік звяртаўся да герояў абароны з наступнымі словамі: «Дзесяць гадоў назад Брэсцкая крэпасць ляжала ў забытых, закінутых руінах, а вы — яе героі-абаронцы — не толькі былі невядомымі, але як людзі, якія ў сваёй большасці прайшлі праз гітлераўскі палон, сустракалі крыўдны недавер да сябе, а часам адчувалі і простую несправядлівасць. Наша партыя і яе XX з'езд, пакончыўшы з

беззаконнямі і памылкамі перыяду культу асобы Сталіна, адкрылі для вас, як і для ўсёй краіны, новую паласу жыцця... Цяпер у крэпасці ёсць добры музей, дзе поўна і цікава адлюстраваны ваш подзвіг. Цэлы калектыў навуковых супрацоўнікаў-энтузіястаў займаецца вывучэннем барацьбы вашага легендарнага гарнізона, выяўляе новыя яе падрабязнасці, расшуквае яшчэ невядомых герояў... З выхадам у свет гэтай кнігі я перадаю музею крэпасці ўвесь сабраны за дзесяць гадоў матэрыял і развітваюся з тэмай абароны Брэста»[81].

Экспазіцыя музея была разгорнута ў былой казарме, якая захавалася на цэнтральным востраве крэпасці. Новы музей адразу ж зрабіўся адным з найбольш папулярных у рэспубліцы — на працягу 1957 г. яго наведала звыш 150 тыс. чалавек. Найвялікшую ўвагу наведвальнікаў прыцягвалі экспанаты, знойдзеныя пры раскопках: загад № 1 па гарнізоне ад 24 чэрвеня 1941 г., надпісы на цаглінах, пакінутыя абаронцамі, медальёны загінуўшых воінаў з іх развітальнымі запісамі, будзільнік, які спыніўся ў першыя хвіліны артабстрэлу, зброя, аплаўленыя цагліны з казематаў і інш. Экспанаваліся таксама работы мастакоў і скульптараў, якія адлюстроўвалі подзвіг абаронцаў крэпасці. Трэба адзначыць, што першая экспазіцыя Музея абароны Брэсцкай крэпасці рабілася ў спешцы, да святочнай даты, што абумовіла яе невысокі мастацкі ўзровень, непазбежныя недахопы і недапрацоўкі. Некаторыя найбольш эмацыянальна афарбаваныя экспанаты губляліся ў вітрынах сярод капійнага матэрыялу, іншыя ляжалі, проста прытуленыя да сцен. Пэўная частка карцін і скульптур была нізкай мастацкай якасці[82].

Як і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, у перыяд «адлігі» Дом-музей І з'езда РСДРП быў месцам абавязковага наведвання ўрадавых дэлегацый, высокіх гасцей рэспублікі, турыстычных груп, школьнікаў і студэнтаў. У яго залах праводзіліся заняткі па гісторыі КПСС, прыём у піянеры, выдача партыйных і камсамольскіх білетаў. Трэба адзначыць, што акрамя правядзення ідэалагічных мерапрыемстваў, навуковыя супрацоўнікі музея ў гэты час пачалі пошукі новых матэрыялаў пра з'езд і няпросты лёс яго ўдзельнікаў. Частка з гэтых матэрыялаў, што адлюстроўвалі працэс фарміравання сацыял-дэмакратыі ў Расійскай імперыі напрыканцы ХІХ ст., з'явілася ў экспазіцыі. У 1959 г. Дом-музей быў выведзены з падпарадкавання Міністэрства культуры БССР і перададзены Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ, што, з аднаго боку, палепшыла матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне музея, а з другога — паставіла яго дзейнасць пад больш жорсткі ідэалагічны кантроль[83].

Адной з першых у рэспубліцы спроб парушыць шаблон і пабудаваць музейны аповяд аб прыродзе на аснове сучасных прыёмаў з'явілася новая экспазіцыя Музея Белавежскай пушчы, якая адкрылася для агляду ў 1963 г. Тут у шчыльнай садружнасці з навукоўцамі працавалі мастакі А. Русакоў, А. Бушуеў і М. Геншафт. Па іх праекту экспазіцыя была пабудавана на прынцыпова новай аснове. Арыгінальнае светлавое і каляровае афармленне залаў, вітражы на вокнах, лёгкія стэнды, размяшчэнне экспанатаў і буйнамаштабных фатаграфій было вельмі пераканаўчым і вобразным. У выніку кожная зала мела сваё непаўторнае аблічча. Арыгінальнасцю вылучаліся анатацыі да экспанатаў, некаторыя з якіх нагадвалі фрагменты паэтычных твораў. Садружнасць навукоўцаў і мастакоў зрабіла музей натхнёным, цікавым, «ажывіла» экспанаты, дапамагла кожнаму з іх загаварыць вобразнай мовай і ў выніку ўсебакова раскрыць змест тэмы[84].

У 1966 г. пры кінастудыі «Беларусьфільм» быў створаны Музей кінематаграфіі БССР. З 1982 г. яго экспазіцыя была разгорнута ў рэспубліканскім Доме кіно. Стваральнікі музея пад кіраўніцтвам Т. У. Лашынай на аснове невялікага фондавага збору здолелі паказаць асноўныя этапы развіцця беларускага кіно: станаўленне кінапрацэсу ў 1920-1930-я гг.; кіно ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны; у 1940-я — 1960-я гг.; сучаснае кіно. Меўся асобны «пакой-казка», прысвечаны мультыплікацыі. У экспазіцыі можна было ўбачыць пастанову СНК БССР ад 17 снежня 1924 г. аб стварэнні ў складзе Наркамасветы кіраўніцтва па справах кіно (Белдзяржкіно), кінакадры з фільмаў заснавальнікаў беларускага кіно Ю. Тарыча «Лясная быль», У. Гардзіна «Кастусь Каліноўскі», літаратурныя і рэжысёрскія сцэнарыі, мантажныя аркушы фільмаў, здымкі вытворчых момантаў, успаміны ветэранаў беларускага кіно, прызы беларускіх фільмаў на кінафестывалях. Шмат каштоўных матэрыялаў для музея было перададзена з «калыскі» Белдзяржкіно — кінастудыі «Ленфільм». Асаблівасцю дадзенага музея было тое, што адначасова з папулярызатарскай функцыяй ён ад самага пачатку свайго існавання выконваў функцыю інфармацыйна-даведачнага цэнтра. Яго матэрыяламі актыўна карысталіся рэжысёры, сцэнарысты, кіназнаўцы, студэнты[85].

У 1966 г. у Віцебску пры Ўпраўленні трамвая быў створаны першы ў Савецкім Саюзе Музей трамвая. Ініцыятыва яго стварэння зыходзіла ад Л. А. Забелы, які пачаў збіраць матэрыялы для будучага музея ў канцы 1950-х гг. На яго рашэнне аб выбары тэмы калекцыі паўплываў той факт, што віцебскі электрычны трамвай, пушчаны ў 1898 г., быў адным з першых у Расійскай імперыі. Экспазіцыя музея адкрывалася дагаворам, падпісаным у студзені 1896 г. паміж акцы-

янерным таварыствам «Віцебскі трамвай» і гарадской управай аб пачатку будаўнічых работ. З вялікай цікавасцю наведвальнікі знаёміліся з нотамі «Трамвай-марша», напісанага спецыяльна ў гонар адкрыцця новага віду транспарту, «Інструкцыяй для вагонаважатых», выдадзенай у 19.10 г., макетамі першых вагонаў. Асобныя стэнды ў экспазіцыі музея былі прысвечаны гісторыі віцебскага трамвая ў савецкі час[86].

У канцы 1950-х — 1960-х гг. у БССР узніклі дзясяткі ведамасных музеяў на прадпрыемствах, транспарце, у калгасах, якія пераважна адносіліся да гісторыка-біяграфічнага тыпу. Яны месціліся ў клубах, бібліятэках, праўленнях калгасаў, некаторыя мелі ўласныя памяшканні. Першыя калгасныя музеі адкрылі свае дзверы для наведвальнікаў у в. Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна (1959), в. Любіцічы Івацэвіцкага раёна (1959), в. Яроміна Гомельскага раёна (1959), в. Сакаўшчына Валожынскага раёна (1961), в. Стары Сверржань Стаўбцоўскага раёна (1961), в. Чапялі Салігорскага раёна (1961). Моцную падтрымку іх стварэнню аказвала Міністэрства сельскай гаспадаркі, кіраўніцтва якога разглядала музейнае будаўніцтва як «важную дзяржаўную справу»[87]. Калгасныя музеі атрымлівалі з цэнтра пераважна арганізацыйна-метадычную падтрымку. Так, у 1960 г. адбыўся семінар работнікаў калгасных музеяў.

Крыху пазней паўсталі першыя музеі на транспарце і прамысловых прадпрыемствах рэспублікі — Віцебскім аддзяленні Беларускай чыгункі (1966), Гомельскім чыгуначным вузле (1967), Мінскім лакаматыўным дэпо (1967), «Гомсельмашы» (1967), Віцебскім станкабудаўнічым заводзе (1967), Беларускім аўтамабільным заводзе (1968). Іх стварэнне было звязана з юбілейнай датай — 50-годдзем кастрычніцкай рэвалюцыі.

Новай з'явай у музейным жыцці БССР у другой палове 1950-х — 1960-х гг. быў пачатак масавага стварэння грамадскіх школьных музеяў. На Беларусі сярэднія адукацыйныя ўстановы мелі даўнюю традыцыю стварэння ўласных музеяў. Вядома, што калекцыі мінералаў і старажытнасцей, наглядных дапаможнікаў і мадэляў выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе ў губернскіх гімназіях ужо напачатку XIX ст. Гэта традыцыя не была забыта і ў савецкай школе. Школьныя музеі, паўстаўшыя ў 1920-я гг., выконвалі ролю своеасаблівых лабараторый, якія павінны былі падтрымліваць нагляднасцю навучальна-выхаваўчы працэс. Гэтым тлумачылася іх сувязь са зместам выкладаемых дысцыплін, фарміраванне музейнага збору з калійнага і дублетнага матэрыялу, вялікая колькасць графікаў, схем, дыяграм, фотаздымкаў. Усё гэта было абумоўлена задачамі працоўнай

школы таго часу і адыграла сваю станоўчую ролю і ў пазнанні краю, і ў політэхнічнай падрыхтоўцы вучняў. Аднак самастойнай сеткі школьных музеяў у даваенныя гады не склалася. Тлумачылася гэта тым, што ў той час савецкая школа выпрацоўвала новыя формы навучання і выхавання, уводзіліся і забараняліся новыя методыкі і г. д. Натуральна, што ў гэтых складаных умовах станаўлення савецкай школы школьныя музеі не мелі тэндэнцыі ўстойлівага развіцця. А Вялікая Айчынная вайна і перыяд пасляваеннай адбудовы эканомікі наогул адсунулі гэтыя праблемы на задні план.

Актывізацыя краязнаўчай работы і масавае стварэнне грамадскіх школьных музеяў у БССР пачалося ў другой палове 1950-х гадоў. Найбольш актыўны ўдзел у гэтым руху прынялі школьнікі — удзельнікі шматлікіх экспедыцый, паходаў, патрыятычных аперацый («Ніхто не забыты, нішто не забыта», «Мая Айчына», «Летапіс Вялікай Айчыннай», «Па камсамолу раўняем крок» і інш.). Створаныя ў пасляваенны перыяд школьныя музеі дзейнічалі самастойна, без навукова-метадычнага кіраўніцтва з боку дзяржаўных музеяў. Падобная самастойнасць абумовіла стыхійнасць, хуткае ўзнікненне і такое ж хуткае знікненне школьных музеяў, немагчымасць вызначыць іх дакладную колькасць, а таксама склад калекцый. Профіль школьнага музея і змест яго дзейнасці ў большасці выпадкаў вызначаліся спецыялізацыяй, уласнымі схільнасцямі і зацікаўленасцю яго стваральніка. Але кіраўніцтва народнай адукацыяй ўсіх узроўняў аддавала перавагу ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

Адзіным рэгулятарам дзейнасці такіх музеяў у разглядаемы перыяд з'яўляліся цэнтральныя і абласныя дзіцячыя экскурсійна-турыстычныя станцыі, а таксама дамы піянераў. Супрацоўнікі краязнаўчых аддзелаў гэтых арганізацый амаль не мелі музеязнаўчай падрыхтоўкі і ў большасці сваёй слаба уяўлялі стан і перспектывы развіцця школьных музеяў. Іх дзейнасць абмяжоўвалася правядзеннем аглядаў, злётаў, спаборніцтваў. Тым не менш, першы крок на шляху навуковага абгрунтавання фарміравання музейных калекцый у школах быў зроблены менавіта на Рэспубліканскай дзіцячай экскурсійна-турыстычнай станцыі, калі яе метадысты ў 1960 г. распрацавалі «Палажэнне аб школьным краязнаўчым музеі», у якім былі выкладзены прынцыпы стварэння музеяў, збірання матэрыялаў, структура кіраўніцтва, прынцыпы класіфікацыі калекцый[88]. Падчас прыняцця «Палажэння...» у рэспубліцы ўжо дзейнічаў 51 школьны музей. Пераважная большасць з іх была створана па загаду Міністэрства адукацыі ў верасні 1959 г.[89] Крыху пазней пачалася

пашпартызацыя школьных музеяў, якая, на жаль, у разглядаемы перыяд скончана не была.

Адыгрываючы важную ролю ў пашырэнні агульнаадукацыйнага кругагляду моладзі, а ў шэрагу выпадкаў з'яўляючыся сапраўднымі культурнымі цэнтрамі, школьныя музеі мелі шмат хібаў. Найбольш сур'ёзным з іх было парушэнне правіл уліку і захавання помнікаў, што прыводзіла да іх фізічнага знікнення і, як вынік, беручы пад увагу вялікую колькасць школьных музеяў, — да дэфармацыі цэлага культурна-гістарычнага слоя.

Адзін з першых школьных музеяў у БССР быў створаны ў Юравіцкай СШ Калінкавіцкага раёна і з'яўляўся вынікам краязнаўчай работы настаўнікаў і вучняў, якая праводзілася з сярэдзіны 1950-х гг. Неўзабаве экспазіцыя музея склалася з наступных раздзелаў: археалогія; этнаграфія; нумізматыка; прырода; гісторыя мясцовага калгаса. Найбольш каштоўны быў першы раздзел, што тлумачылася знаходжаннем побач з в. Юравічы групы археалагічных помнікаў, якія ў 1960-1965 гг. даследаваў дырэктар школы, будучы вядомы даследчык гісторыі першабытнага ладу на Беларусі У. Ф. Ісаенка. Пад яго ж кіраўніцтвам быў напісаны летапіс вёскі ў двух тамах. Музей Юравіцкай СШ з'яўляўся метадычным цэнтрам, дзе рэгулярна праводзіліся краязнаўчыя семінары з удзелам прадстаўнікоў розных культурна-асветніцкіх і адукацыйных устаноў Гомельскай вобласці[90].

Напачатку 1960-х гг. актыўную дзейнасць разгарнулі таксама музеі СШ № 54 і 60 г. Мінска, Дрысенскай СШ № 2 Віцебскай вобласці, Мар'інагорскай СШ №2 Мінскай вобласці, Валеўскай СШ Гродзенскай вобласці, Пружанскай СШ № 2 Брэсцкай вобласці і інш.

Добра вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі выў Музей народнай славы ў в. Іканы Барысаўскага раёна, створаны ў 1964 г. па ініцыятыве дырэктара мясцовай сярэдней школы В. В. Ігнатовіча. Ужо першая экспазіцыя музея вылучалася каштоўнымі матэрыяламі і высокай мастацкай якасцю іх прадстаўлення. У зале баявой славы экспанаваліся зброя і асабістыя рэчы партызан Барысаўска-Бягомльскай зоны, у тым ліку чэхаў і славакаў, карта спаленых вёсак і фотаздымкі, што адлюстроўвалі злачынствы акупантаў. Асобны стэнд распавядаў пра авіяполк «Нармандыя-Нёман», які ў 1944 г. удзельнічаў у вызваленні Барысаўшчыны. У мемарыяльнай зале на стэлах былі сабраны імёны жыхароў Барысаўскага раёна, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сам будынак музея знаходзіўся ў Парку герояў, дзе побач з кожным дрэвам былі замацаваны таблічкі з імёнамі воінаў і партызан, што загінулі на Барысаўшчыне.

Праз пяць гадоў пасля стварэння І ганскаму музею было прысвоена званне «народнага», а з 1977 г. ён набыў статус дзяржаўнага, стаўшы філіялам Барысаўскага краязнаўчага музея. Гэты статус вызначаўся не толькі энтузіязмам В. В. Ігнатовіча і створанага ім музейнага актава, але і аб'ектыўнымі паказчыкамі. У фондах Іканскага музея захоўвалася каля 7 тыс. адзінак. Музей быў уключаны ва Усесаюзную турыстычпа-краязнаўчую экспедыцыю «Мая Радзіма — СССР», што забяспечвала вялікі прыток наведвальнікаў з розных саюзных рэспублік. У другой палове 1980-х гг. у сувязі з эканамічным крызісам і зменай ідэалагічных прыярытэтаў паток турыстаў значна скараціўся. У гэты ж час пры захаванні вызначанай тэматыкі экпазіцыіі музея ў ёй з'явіліся этнаграфічная зала і карцінная галерэя[91].

Значны ўклад у справу аховы і папулярызацыі нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны ўнёс школьны музей в. Гудзевічы Мастоўскага раёна. Ён быў заснаваны ў 1965 г. і меў літаратурна-этнаграфічны профіль. Ініцыятарам яго стварэння і нязменным кіраўніком з'яўляўся мясцовы настаўнік А. М. Белакоз[I], які аддаваў музею ўвесь вольны час і нават частку сваёй сціплай настаўніцкай зарплаты. За першыя 25 гадоў існавання ў фондах было сабрана каля 12 тыс. адзінак. Крыніцы папаўнення калекцый былі розныя. У якасці кансультантаў і ахвярадаўцаў выступілі В. Быкаў, Я. Брыль, Д. Бічэль-Загнетава, З. Верас, Н. Гілевіч, У. Караткевіч, А. Мальдзіс, М. Ткачоў і інш. Сярод перададзеных матэрыялаў асаблівую каштоўнасць мелі тыя, у якіх аўтары давалі трактоўку сваіх твораў, апавядалі пра літаратурных герояў, дзеячаў навукі і культуры. Вельмі дапамагалі вучні, якія прыносілі сямейныя рэліквіі і суседзяў угаворвалі ахвяраваць.

Першапачаткова экспазіцыя месцілася ў чатырох невялікіх пакоях, перанасычаных экспанатамі, дзе ў цесным суседстве былі «...каменныя прылады неаліту і здымкі беларускіх касманаўтаў»[92]. Матэрыяльную базу музея значна ўмацавала рашэнне калгаснага кіраўніцтва перавесці яго са школьнага у сваё падпарадкаванне. А ў 1990 г., ужо маючы агульнае прызнанне і статус дзяржаўнага, Гудзевіцкі літаратурна-этнаграфічны музей паказваў свае калекцыі ў дванаццаці экспазіцыйных залах. Да найбольш каштоўных экспанатаў, прадстаўленых у літаратурнай экспазіцыі, адносіліся грамата

[I] Белакоз Аляксандр Мікалаевіч беларускі музейны дзеяч, краязнаўца, педагог, нарадзіўся ў 1928 г. у в. Ляткі Ваўкавыскага павета. Пасля заканчэння Гродзенскага педагагічнага інстытута ў і 958 г. працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Гудзевіцкай СШ, дзе заснаваў музей. Распрацаваў методыку далучэння вучняў да літаратурна-краязнаўчага пошуку, музейнай справы. У 1990 г. быў прызначаны дырэктарам Гудзевіцкага літаратурна-этнаграфічнага музея. Заслужаны работнік культуры БССР.

Станіслава Аўгуста Панятоўскага, пісаная ім з прычыны склікання апошняга сойму Рэчы Паспалітай, матэрыялы пра беларускіх першадрукароў, пра ўдзел мясцовых сялян у паўстанні 1863-1864 гг., газеты «Наша ніва», першыя выданні твораў Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Цёткі, творы вуснай народнай творчасці, лемантар «Зорка» А. Смоліч, «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча. У экспазіцыі, прысвечанай этнаграфіі, дэманстраваліся вырабы з косці, каменю і крэменю часоў неаліту, вырабы мясцовых кавалёў XVIII-XX стст., калекцыя падвойных дываноў, вырабы з льну, саломкі, лазы, дрэва, гліны. Асобную групу складалі творы жывапісу, графікі, скульптуры работы Я. Куліка, А. Кашкурэвіча, У. Кіслага, М. Купавы, А. Марачкіна, П. Сергіевіча і інш. Акрамя традыцыйнай экспазіцыі, экскурсанты аглядалі помнік народнага дойлідства — сялянскую хату XVIII ст. з выстаўленымі ў ёй прадметамі сялянскага побыту. У музеі дэманстраваліся зёлкі і апісанне іх выкарыстання, а таксама спосабы народных прыёмаў лячэння[93].

Значная актывізацыя стварэння грамадскіх музеяў была звязана з іх усесаюзным аглядам, які праходзіў з канца 1964 па 1968 г. і быў прысвечаны 50-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. У гарадах і вёсках паўсталі сотні новых грамадскіх школьных і ведамасных музеяў гісторыка-біяграфічнага тыпу. На 1 студзеня 1969 г. іх агульная колькасць у БССР склала 343 (пераважная большасць з іх знаходзілася ў школах). Акрамя таго, у рэспубліцы было створана звыш сямі тысяч музейных пакояў і куткоў[94].

Ацэньваючы развіццё музейнай справы ў БССР сярэдзіны 1950-х — канца 1960-х гг., неабходна адзначыць новыя станоўчыя тэндэнцыі ў развіцці музейнай сеткі. Павялічылася абсалютная колькасць музеяў, узніклі новыя музеі, створаныя на грамадскіх пачатках, а таксама археалагічна-архітэктурныя запаведнікі, на падмурку якіх пазней паўсталі першыя беларускія музеі-запаведнікі. Назіралася паглыбленне змястоўных аспектаў камплектавання і экспанавання матэрыялаў, звязаных з агульнай дэмакратызацыяй у краіне, рэабілітацыяй многіх удзельнікаў гістарычных падзей. Павелічэнне дзяржаўнага музейнага фонду ў колькасных адносінах абумовіла правядзенне вельмі важных мер па ўпарадкаванню захавання і ўліку калекцый. Узніклі першыя ў пасляваенны час экспазіцыі, прысвечаныя раскрыццю розных аспектаў нацыянальнай культуры. Нарэшце, назіралася агульнае пашырэнне музейнай дзейнасці, што было вынікам узрастання грамадскай актыўнасці і цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны.

Разам з тым, менавіта ў гэты час канчаткова зацвердзіўся паварот у бок падпарадкавання ўсёй дзейнасці музеяў па адлюстраванню і прапагандзе гісторыі савецкага грамадства, уключаючы сучаснасць, за кошт іншых гістарычных перыядаў. Матэрыяльна-тэхнічная база музеяў была па-ранейшаму слабай, фінансаванне — абмежаваным. Усе накірункі музейнай дзейнасці былі прасякнуты ідэалагічным зместам, што адлюстроўвала агульную культурную палітыку, якая нязменна праводзілася партыйным кіраўніцтвам. Кароткі перыяд дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР, пры ўсёй яго супярэчлівасці, не быў выключэннем.

[1] НАРБ. Ф. 1131. Воп. 1. Спр. 58. Арк. 133.
[2] Там жа. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 255.
[3] Там жа. Воп. 2. Спр. 584. Арк. 9.
[4] Там жа. Спр. 485. Арк. 9.
[5] Там жа. Спр. 358. Арк. 52
[6] Сурокі А. Мастацтва музейнай экспазіцыі // Літаратура і мастацтва. 1963. 19 лют.
[7] Шаўчук М. Мастак прыйшоў у музей // Літаратура і мастацтва. 1963. 21 мая.
[8] Справочник партийного работника. Вып. VI. М., 1965. С. 354-356.
[9] Сборник документов по музейному делу. 1964-1984. М., 1987. С. 8-9.
[10] Мальдзіс А. Сляды продкаў // Літаратура і мастацтва. 1970. 16, 23, 30 кастр.
[11] Каханоўскі Г. З думкай пра будучае // Літаратура і мастацтва. 1970. II снеж.
[12] Златоустова В. И. Государственная политика в области музейного дела... С. 263.
[13] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 246. Арк. 350.
[11] Егоров Ю. С. Развитие музейной сети в условиях зрелого социализма (60-70-е гг.) // Музейное дело в СССР. Сб. науч. тр. М., 1985. С. 24.
[15] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 320. Арк. 195, 52, 277.
[16] Там жа. Спр. 85. Арк. 15.
[17] Там жа. Ф. 7. Воп. 4. Спр. 3014. Арк. 111.
[18] Там жа. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 178. Арк. 171.
[19] Там жа. Спр. 215. Арк. 8.
[20] Архіў НМГіКБ. Спр. 30а. Арк. 3.
[21] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 215. Арк. 18.
[22] Архіў НМГіКБ. Спр. 29а. Арк. 7.
[23] Навумаў Р. У падарунак музею // Літаратура і мастацтва. 1963. 25 студз.
[24] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 72. Арк. 17.
[25] Там жа. Арк. 1-39.
[26] Там жа Спр. 354. Арк. 9.
[27] Архіў НМГіКБ. Спр. 21а. Арк. 16.

[28] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 251.
[29] Шаўчук М. Мастак прыйшоў у музей...
[30] НАРБ Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 175.
[31] Алексяюк М. І. Камянецкая вежа //Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973.№ 2. С. 27.
[32] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр 136. Арк. 69
[33] Там жа. Воп. І. Спр. 441. Арк. 76.
[34] Там жа. Спр. 158. Арк. 233.
[35] Курчицкий А. В. Страницы истории ... С. 30.
[36] Загародцы Г. Навошта музею мастак // Літаратура і мастацтва. 1963. 30 жн.
[37] Царук. В. М. Экспазіцыйная дзейнасць Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 4. Гродна, 1997. С. 7.
[38] Сурокі А. Мастацтва музейнай экспазіцыі...
[39] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 246.
[40] Там жа. Спр. 72. Арк. 213.
[41] Кондратьева Л. Ф. Из истории Могилёвского областного краеведческого музея... С. 107.
[42] Морозов М Музей славы русского оружия // Советская Белоруссия. 1958. 1 авг
[43] Каханоўскі Г. А. Збіраць, ахоўваць, вывучаць... // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № І. С. 36.
[44] Новиков Д. Здесь всё интересно // Советская Белоруссия. 1972. 28 янв.
[45] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 217.
[46] Там жа. Спр. 284. Арк. 3.
[47] Там жа. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 72. Арк. 254.
[48] Леоновец А. Полесская «Третьяковка» // Заря. 1978. 29 июня.
[49] Шпыркова І. Юбілей музея // Слонімскі веснік. 1999. 18 верас.
[50] Джумантаева Т. А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. XX ст. 70-я гг. XX ст.)... С. 15.
[51] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 354. Арк. 108.
[52] Сливкин В. В., Хатянович Н. А. Сорокалетие с элементами 60-летия: Лидский краеведческий музей // Оникс. 1999. № 5. С. 6.
[53] Коўзелеў М. Слава зямлі сваёй // Звязда. 1981. 29 сак.
[54] Кукевич А. Память отчей стороны // Советская Белоруссия. 1969. 1 июня.
[55] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 284. Арк. 118.
[56] Там жа. Арк. 81.
[57] Там жа. Воп. 1. Спр. 136. Арк. 257.
[58] Там жа Ф. 7. Воп. 4. Спр. 2993. Арк. 1.
[59] Там жа. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 19.
[60] Там жа. Спр. 284. Арк. 256.
[61] Там жа. Спр. 136. Арк. 59.
[62] Витебский областной музей Героя Советского Союза М. ср. Шмырева: Краткий путеводитель. Мн, 1990.

[63] Замскі М. Дзень учарашні і дзень сённяшні // Літаратура і мастацтва. 1978. 24 студз.
[64] Музей Ф. Э. Дзержинского: (Очерк-путеводитель). Мн., 1977.
[65] Сцяпанаў І. На радзіму «жалезнага рыцара» // Мінская праўда. 30 студз
[66] Сшеня Я. В Аб чым расказваюць экспанаты // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. № 2. С. 53.
[67] Герасімовіч П. Адноўлены на руінах...С. 12.
[68] Архіў НММ РБ. ер. 164. Воп. І. Спр. 370. Арк. 2.
[69] Там жа. Спр. 73. Арк. 14.
[70] НАРБ. Ф. 974. Воп. І. Спр. 119. Арк. 39.
[71] Там жа. Спр. 158. Лрк. 114,
[72] Там жа. Воп. 2. Спр. 329. Арк. І.
[73] Гурйна Н. И., Киркевич А. И. Дом-музей А. Мицкевича в Новогрудке. Мн., 1973.
[74] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 358.
[75] Ііратасевіч М. У Коласавым доме // Літаратура і мастацтва. 1984. 7 снеж.
[76] НАРБ. Ф. 974. Воп. 2. Спр. 358. Арк. 262.
[77] Жыгоцкі М. Р. На беразе сівога Нёмана // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1977. № 2. С. 39.
[78] Іійсанепко А. Д., Шкляров Л. П. История Зоологического музея... С. 15.
[79] Таинственный мир камня... С. 11.
[80] Богданова М. И. Анатомические музеи: Учебно-методическое пособие. Ми., 2000. С. 6.
[81] Смірноў С. С Брэсцкая крэпасць. Мн., 1967 С. 4.
[82] Сурокі А. Каб экспанаты загаварылі... // Літаратура і мастацтва. 1962. 10 ліп.
[83] Симонюков С. М. Дом-музей I съезда РСДРП. Мн., 1998.
[84] Сурскі А. У садружнасці мастакоў і вучоных. Па залах новага музея Белавежскай пушчы //Літаратура і мастацтва. 1963. 14 чэрв.
[85] Шпота В. Страницы летописи республики // Вечерний Минск. 1984 17 дек.
[86] Подлипский А. Музей трамвая // Знамя юности. 1978. 31 авг.
[87] НАРБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 442. Арк. 79.
[88] Там жа. Арк. 25.
[89] Там жа. Спр. 432. Арк. 120.
[90] Нямкевіч В. Летапіс працягваецца // Літаратура і мастацтва. 1967. 15 снеж.
[91] Валастны Я. Музей у парку герояў // Мінская праўда. 2002. 18 мая.
[92] Ждановіч В. Слава Гудзевічаў // Маладосць. 1985. № 12. С.153.
[93] Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей. Мн., 1988.
[94] Літаратура і мастацтва. 1969. 28 студз.

## Глава III

# МУЗЕІ З КАНЦА 1960-х ГАДОЎ ДА 1991 ГОДА

Сацыяльна-культурная сітуацыя, што склалася ў СССР у канцы 1960-х гг., прынцыпова адрознівалася ад той, якая была ў папярэднія гады. Спыняецца ажыццяўленне эканамічнай рэформы 1965 г., згортваюцца навуковыя грамадазнаўчыя дыскусіі, а пошук ісціны атрымлівае абмежаваную, «пазітыўную» зададзенасць. Знакавай падзеяй было ўвядзенне савецкіх войск у Чэхаславакію ў 1968 г., што азначала не толькі крах спадзяванняў на дэмакратызацыю грамадскага жыцця ў краінах савецкага блока, але і перамогу сіл інерцыі ўнутры краіны. Кансерватызм пачаў набываць агрэсіўныя формы. Гэтыя тэндэнцыі не маглі не адбіцца на ідэалагічным баку дзейнасці ўстаноў культуры, у тым ліку музеяў.

Перыяд 1970-х - 1980-х гг. характарызаваўся актыўным ростам музейнай сеткі краіны, якая набыла сучасны выгляд:

1) дзяржаўныя музеі сістэмы Міністэрства культуры;

2) ведамасныя (галіновыя) музеі, якія належалі іншым міністэрствам і ведамствам;

3) грамадскія музеі.

Гэтаму спрыяла сацыяльна-культурная сітуацыя, якая пачала складвацца з канца 1950-х гг. і была абумоўлена ўздымам народнай гаспадаркі, ростам узроўню матэрыяльнай забяспечанасці насельніцтва, увядзеннем 5-дзённага працоўнага тыдня, абавязковай сярэдняй адукацыі, павышэннем культурных запатрабаванняў людзей. Павелічэнню колькасці музеяў спрыяла таксама мэтанакіраваная дзейнасць дзяржаўных структур па выкананню пастановы ЦК КПСС 1964 г. «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных». На гэты час прыпадае пік стварэння філіялаў музеяў, якія працавалі пад адміністрацыйным кіраўніцтвам асноўнага музея і мелі з ім агульны бюджэт. Актыўны рост колькасці філіялаў тлумачыўся тым, што для іх утварэння патрабавалася толькі ўзгадненне з ЦК КПБ (для адкрыцця новага дзяржаўнага музея неабходна было прыняцце пастановы ЦК). Многія філіялы з'явіліся асновай для ўзнікнення самастойных музеяў. Нарэшце, распаўсюджаным шляхам узнікнення новых музеяў у разглядаемы перыяд было наданне шэрагу лепшых грамадскіх музеяў статуса дзяржаўных.

Важнай тэндэнцыяй было павелічэнне колькасці вузкапрофільных музеяў, галоўным чынам у складзе музеяў-запаведнікаў, а таксама літаратурных і этнаграфічных музеяў.

Упарадкаванню арганізацыі работы гістарычных і краязнаўчых музеяў першай групы паспрыялі зацверджаныя Міністэрствам культуры СССР «Палажэнне аб краязнаўчым музеі саюзнай, аўтаномнай рэспублікі, краю, вобласці, нацыянальнай акругі, раёна сістэмы Міністэрства культуры СССР»[1] і «Тыпавога палажэння аб гістарычным музеі»[2], дзе былі вызначаны адзіныя для ўсіх краязнаўчых і гістарычных музеяў краіны прынцыпы арганізацыйнай і штатнай структуры, мэты, змест і формы работы. Галоўнай задачай як гістарычных, так і краязнаўчых музеяў любога рангу з'яўлялася вывучэнне краіны або краю ў савецкі перыяд і распаўсюджванне навуковых ведаў аб гісторыі савецкага грамадства сярод насельніцтва.

Разгортванню музейнага будаўніцтва паспрыяла таксама пастанова ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і УЦСПС «Аб мерах па далейшаму развіццю турызму і экскурсій ў краіне»[3]. У пастанове адзначалася, што турызм і экскурсіі, якія ў 1960-я гг. атрымалі шырокае распаўсюджванне, зрабіліся не толькі формай адпачынку, але «важным сродкам павышэння культурнага ўзроўню і ідэйна-палітычнага выхавання насельніцтва»[4]. Для шырокага развіцця турыстычнай і экскурсійнай работы неабходна была перш за ўсё наяўнасць музеяў, а таксама помнікаў гісторыі і культуры, якія вызначалі напрамак турыстычных маршрутаў. Асаблівую ролю ў гэтым адыгралі музеі-запаведнікі, якія ў адзіным ансамблі гісторыка-культурных помнікаў і музейных экспазіцый прадстаўлялі гісторыю краіны са старажытных часоў да нашых дзён.

Найбольш заўважнай з'явай музейнага жыцця ў СССР у 1970-я гг. стала ўстойлівая тэндэнцыя цэнтралізацыі музеяў. На практыцы гэта праявілася ў стварэнні музеяў-запаведнікаў і музейных аб'яднанняў. Асноўная перавага аб'яднанняў бачылася «у магчымасці больш рацыянальнага і шырокага выкарыстання музейных фондавых збораў у навуковых і адукацыйных мэтах, больш поўнага задавальнення духоўных запатрабаванняў насельніцтва, а таксама павышэння ўзроўню перыферыйных музеяў, вырашэння задачы тэматычнага прафілявання асобных музеяў»[5]. Для вывучэння і абмеркавання вопыту стварэння першага Уладзіміра-Суздальскага аб'яднання і распрацоўкі перспектыўнага плана развіцця музейнай справы ў саюзных рэспубліках Міністэрства культуры СССР накіравала ў снежні 1979 г. у міністэрствы саюзных рэспублік рэкамендацыі і тыпавое палажэнне цэнтральнай музейнай сістэмы, выпрацаваныя на пашыраным пасяджэнні Навукова-метадычнага савета па рабоце музеяў. Такім чынам цэнтралізаваны падыход да музейнага будаўніцтва стаў распаўсюджвацца па ўсёй краіне.

Трэба адзначыць, што працэс цэнтралізацыі органы кіравання музейнай справай пачалі без распрацоўкі яго навуковых асноў, шляхам «спроб і памылак», і ён набыў характар чарговай кампаніі. У асноўным музейныя аб'яднанні складваліся па тэрытарыяльнаму прынцыпу, прычым у якасці базы для іх выкарыстоўвалі музеі-запаведнікі з іх шматлікімі помнікамі. Невялікую групу склалі аб'яднанні літаратурных музеяў. А ўключэнне ў склад аб'яднанняў мастацкіх музеяў выклікала пратэсты з боку Акадэміі мастацтваў СССР. Пасля распаду СССР большасць музейных цэнтралізаваных сістэм спыніла сваё існаванне.

Навукова-метадычны савет па рабоце музеяў акрамя тыпавога палажэння цэнтральнай музейнай сістэмы распрацаваў у гэты час схему каардынацыі навуковай работы музеяў у галіне гісторыі савецкага грамадства ў маштабах краіны. Адпаведна ёй агульную каардынацыю музейнай дзейнасці ажыццяўляе міністэрства культуры, рэспубліканскія музеі каардынуюць работу абласных, абласныя — раённых, апошнія — народных у сваіх адміністрацыйных межах. Міністэрства культуры СССР у 1974 г. зацвердзіла гэту схему, надаўшы ёй статус дырэктыўнага дакумента для міністэрстваў саюзных рэспублік.

На 1 студзеня 1980 г. па саюзных рэспубліках сетка музеяў сістэмы Міністэрства культуры была размеркавана наступным чынам: РСФСР — 965, Украінская ССР — 189, Грузінская ССР 106, Беларуская ССР — 89[I] , Літоўская ССР — 80, Латвійская ССР — 65, Эстонская ССР — 58, Казахская ССР — 57, Малдаўская ССР — 57, Азербайджанская ССР — 55, Армянская ССР — 48, Узбекская ССР — 44, Туркменская ССР — 14, Кіргізская ССР — 11, Таджыкская ССР — 11. Паказчыкі колькасці музеяў у саюзных рэспубліках у абсалютных лічбах даюць адноснае ўяўленне аб узроўні развіцця музейнай справы ў СССР. Больш дакладную карціну стварае аналіз разгалінаванасці музейнай сеткі ў рэспубліках адносна займаемых імі тэрыторый і колькасці іх насельніцтва, што прадстаўлена ў Табліцы 3[6]:

Табліца 3

| **Саюзныя рэспублікі** | **1 музей на тыс. кв. км** | **Саюзныя рэспублікі** | **1 музей на тыс. чал. насельніцтва** |
|---|---|---|---|
| Армянская ССР | 0,6 | Эстонская ССР | 26 |

[I] У гэту лічбу уключаны філіялы дзяржаўных музеяў БССР, якія існавалі ў той час.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Малдаўская ССР | 0,6 | Латвійская ССР | 40 |
| Грузінская ССР | 0,7 | Літоўская ССР | 44 |
| Літоўская ССР | 0,8 | Грузінская ССР | 47 |
| Эстонская ССР | 0,8 | Армянская ССР | 63 |
| Латвійская ССР | 1,0 | Малдаўская ССР | 70 |
| Азербайджанская ССР | 1,6 | Беларуская ССР | 109 |
| Беларуская ССР | 2,3 | Азербайджанская ССР | 114 |
| Украінская ССР | 3,2 | РСФСР | 145 |
| Узбекская ССР | 10,0 | Туркменская ССР | 214 |
| РСФСР | 13,0 | Казахская ССР | 263 |
| Таджыкская ССР | 13,0 | Украінская ССР | 265 |
| Кіргізская ССР | 18,0 | Кіргізская ССР | 336 |
| Туркменская ССР | 35,0 | Таджыкская ССР | 363 |
| Казахская ССР | 48,0 | Узбекская ССР | 377 |

Пастанова 1965 г. «Аб музейным фондзе Саюза ССР» паспрыяла прыцягненню ў 1970-я -1980-я гг: ўвагі кіруючых органаў да праблемы ўліку і захавання музейных калекцый. У 1968 г. Міністэрства культуры СССР выдала інструкцыю па ўліку і захаванню музейных фондаў (акрамя мастацкіх), а ў 1971 г. — інструкцыю па ўліку і захаванню мастацкіх музеяў. Яны вызначылі парадак камплектавання, уліку, захавання, навуковага апісання і выкарыстання помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры і былі абавязковыя для ўсіх музеяў сістэмы міністэрства куль туры.

Прымаючы гэтыя дакументы, Міністэрства культуры СССР імкнулася навесці парадак у фондавай гаспадарцы, падрыхтаваць калекцыі да каталагізацыі і ў перспектыве стварыць зводны навуковы каталог Музейнага фонду СССР. Але гэта праца сутыкнулася з шэрагам перашкод, найбольш сур'ёзнымі з якіх былі адсутнасць прынцыпаў стварэння зводнага каталога, нявывучанасць музейных фондаў, іх дрэнны ўлік. З мэтай пераадолення гэтых перашкод напачатку 1970-х гг. была распачата зверка наяўнасці фондаў з уліковай дакументацыяй. Фактычна гэта была першая спроба за ўсе

гады савецкай улады правесці інвентарызацыю музейнай гаспадаркі краіны. Яна дала магчымасць скласці толькі агульныя лічбавыя паказчыкі. Так, у сярэдзіне 1980-х гг., калі работы па зверцы наяўнасці фондаў былі фактычна спынены, Музейны фонд СССР склаў каля 50 млн адзінак захоўвання. У гэту лічбу не былі ўключаны калекцыі шматлікіх ведамасных і грамадскіх музеяў[7].

Найбольш важным дзяржаўным актам стаў закон СССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры», прыняты ў 1976 г. Аналагічны закон з той жа назвай быў прыняты ў ліпені 1978 г. у БССР[8]. Законам на Міністэрства культуры БССР была ўскладзена арганізацыя работ па ўліку, забеспячэнню захаванасці, рэстаўрацыі, эфектыўнаму выкарыстанню і кантролю за вывазам усіх відаў помнікаў (гісторыі, археалогіі, архітэктуры, мастацтва), за выключэннем дакументальных, за якія адказвала Галоўнае архіўнае ўпраўленне пры СМ БССР. Нягледзячы па тое, што ў большасці артыкулаў закона гутарка ішла пра нерухомыя помнікі гісторыі і культуры, ён актывізаваў дзейнасць дзяржаўных органаў таксама па захаванню рухомай культурнай спадчыны. Так, было ўзноўлена упраўленне музеяў і аховы помнікаў (дагэтуль пэўны час музеямі апекаваўся адзіны інспектар у складзе упраўлення культурна-асветніцкіх установаў). У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР быў арганізаваны аддзел старажытнабеларускага мастацтва. Усталяваны адзіны парадак выяўлення, ўліку і аховы помнікаў у культавых будынках і прыватных калекцыях. Нарэшце, у снежні 1985 г. на аснове рэстаўрацыйных майстэрняў было створана спецыялізаванае навукова-рэстаўрацыйнае вытворчае аб'яднанне «Белрэстаўрацыя».

У жніўні 1982 г. ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай работы музеяў»[9], дзе, як і ў папярэдняй (1964 г.) пастанове вышэйшага партыйнага кіраўніцтва, музей вызначаўся як важны сродак у арсенале ідэалагічнай работы. Дадзеная пастанова змяшчала заклік палепшыць дзейнасць музеяў з тым, каб кожны з іх стаў дзейсным сродкам выхавання. У чарговы раз музеям было дадзена ўказанне, што для гэтага трэба рабіць, як будаваць экспазіцыю і што ў ёй паказваць. Міністэрству культуры, Акадэміі навук і іншым ведамствам было прапанавана сачыць за адлюстраваннем у музеях дасягненняў грамадства развітога сацыялізму, сучаснага этапу навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і асабліва ролі партыйнага кіраўніцтва ў развіцці эканомікі і вырашэнні сацыяльных праблем. Сёння такія рэкамендацыі не патрабуюць ніякіх каментарыяў, але яшчэ амаль дзесяцігоддзе пасля выхаду партыйнай пастановы савецкія музеі былі павінны рэалізоўваць менавіта такія задачы.

Актыўным інструментам па правядзенню такой палітыкі сталі агляды музеяў, якія праводзіліся рэгулярна, пачынаючы з 1965 г., калі быў абвешчаны ўсесаюзны агляд, прысвечаны 50-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Падобныя агляды прымяркоўваліся да буйнейшых юбілейных дат: 60-годдзя і 70-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, 100-годдзя з дня нараджэння Леніна, 50-годдзя і 60-годдзя ўтварэння СССР, 30-годдзя і 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Агляды былі накіраваны на вырашэнне асноўнай задачы, вызначанай у пастанове 1982 г., — стварэнне разгорнутых экспазіцый аддзелаў гісторыі савецкага грамадства і іх шырокае выкарыстанне ў прапагандысцкай рабоце сярод насельніцтва. У той жа час кожны з іх меў свае канкрэтныя мэты і задачы, свае асаблівасці. Напрыклад, агляд, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР, быў адзначаны ўвагай да навукова-асветніцкай дзейнасці; 50-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі — збіральніцкай і навукова-даследчай працы; 40-годдзя Перамогі — патрыятычнага выхавання.

Такім чынам, развіццё музейнай справы ў СССР у 1960-х -1980-х гг. у многім абумоўлівалася планамернай дзейнасцю па падрыхтоўцы і правядзенню разнастайных аглядаў. Гэта значна знізіла іх сэнс і значэнне, ператварыўшы ў звычайныя планавыя мерапрыемствы. Фармалізм, уласцівы правядзенню традыцыйнага сацыялістычнага спаборніцтва ва ўсіх сферах вытворчай і невытворчай дзейнасці, адбіўся і на правядзенні аглядаў, ператварыўшы іх у механізм збору рапартаў і падліку колькасных паказчыкаў. Нягледзячы на намаганні шматлікіх музейных спецыялістаў, большасць экспазіцый па гісторыі савецкага грамадства была неглыбокай па праблематыцы, невыразнай з мастацкага пункту гледжання, абмежаванай па экспанатуры. Але агляды мелі і станоўчыя бакі. Па-першае, падчас іх правядзення партыйныя і савецкія органы вымушаны былі звяртаць больш увагі на работу музеяў, іх праблемы і неяк спрыяць іх вырашэнню. Па-другое, сабраныя падчас аглядаў матэрыялы давалі магчымасць органам кіравання музейнай справай скласці больш поўнае ўяўленне аб стане галіны, яны выкарыстоўваліся таксама для навукова-метадычных распрацовак. Пасля правядзення агляду, прысвечанага 70-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, было вырашана больш іх не праводзіць[10].

Канцэнтрацыя ўвагі на савецкай гісторыі прывяла да занядбання ў большасці краязнаўчых музеях даследчыцкіх работ, прысвечаных тысячагадовай гісторыі, што папярэднічала 1917 году. У аддзелах дарэвалюцыйнай гісторыі працавалі звычайна 1-3 чалавекі, а іх экпазіцыйныя плошчы саступалі «савецкім». Гэтай праблеме быў

прысвечаны агульны збор аддзялення гісторыі Акадэміі навук СССР, які адбыўся ў лістападзе 1978 г. На ім быў прыняты дакумент пад назвай «Аб супрацоўніцтве з музеямі гістарычнага профілю»[11], дзе пералічваліся мерапрыемствы па паляпшэнню ўсіх напрамкаў навуковай дзейнасці музейных устаноў. Дакумент гэты быў карысны і своечасовы, але за выключэннем буйнейшых сталічных музеяў яго парады не выконваліся. Тлумачылася гэта тым, што дырэктыўныя органы і органы кіраўніцтва галіною бачылі ў асноўнай масе музеяў перш за ўсё прапагандысцкія, а не навуковыя ўстановы.

У другой палове 1980-х гг., разам з працэсамі перабудовы і дэмакратызацыі жыцця ў грамадстве, разгарнулася шырокае абмеркаванне далёкага і блізкага мінулага. Людзі розных пакаленняў і жыццёвага вопыту імкнуліся выказацца па пытаннях, якія доўгі час ігнаравала афіцыйная гістарычная навука. Гістарычныя дыскусіі выйшлі за сцены вучоных саветаў і акадэмічных кабінетаў на старонкі перыядычнага друку. На масавага чытача хлынулі новыя ідэі, невядомыя і забытыя факты, вострыя і арыгінальныя суджэнні. Музеі не маглі застацца ўбаку ад гэтага працэсу. Узнікла вострая неабходнасць перабудовы перш за ўсё маральна і фізічна састарэлых гістарычных экспазіцый. Шэраг сталічных музейных устаноў адгукнуўся на настойлівыя патрабаванні часу новымі актуальнымі выставамі. Але, атрымаўшы магчымасць шчыра і адкрыта выказацца па вострых гістарычных праблемах, супрацоўнікі музеяў адчулі цяжар асабістай адказнасці за тое, што замоўчвалі ўчора, і за тое, што павінны сказаць сёння. Стала відавочным адставанне ўзроўню інтэрпрэтацыі падзей мінулага ў экспазіцыях савецкіх музеяў ад агульнага развіцця грамадскай думкі, іх метадалагічная слабасць. Большасць з іх шукалі шляхі перабудовы сваіх экспазіцый ужо ў межах незалежных дзяржаў.

У БССР план вываду музейнай галіны з крызіснага стану быў выпрацаваны ўжо ў апошнія гады існавання Савецкага Саюза. Напрыканцы 1989 г. пасля ўзгадненняў і кансультацый з вядучымі навуковымі ўстановамі, творчымі саюзамі і грамадскімі арганізацыямі Міністэрствам культуры была прынята «Праграма развіцця сеткі дзяржаўных музеяў і філіялаў у БССР да 2000 г.»[12]. Яна прадугледжвала змяненне структуры і тэматыкі музейнай сеткі рэспублікі, стварэнне буйных нацыянальных музеяў, умацаванне матэрыяльнай базы дзеючых, падрыхтоўку і перападрыхтоўку музейнага персаналу. У рамках выканання праграмы ў красавіку 1991 г. была створана Праблемная навуковая рада па пытаннях захавання, рэстаўрацыі і экспанавання музейных калекцый, якая мела статус

навукова-кансультацыйнага органа на грамадскіх пачатках пры Міністэрстве культуры і аб'ядноўвала вядучых спецыялістаў галіны[I].

Музеі, якія ўваходзілі ў сістэму Міністэрства культуры, складалі большую частку ўсіх музеяў БССР. Па маштабах сваёй дзейнасці і адміністрацыйнаму падпарадкаванню органам культуры яны падзяляліся на рэспубліканскія, абласныя і раённыя, па профілях — на краязнаўчыя, ваенна-гістарычныя, гісторыка-рэвалюцыйныя, агульнагістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя, мастацкія і літаратурныя.

Краязнаўчы профіль меў Дзяржаўны музей БССР, які з'яўляўся буйнейшым ў рэспубліцы сховішчам помнікаў гісторыі і прыроды. У першыя гады пасля яго адкрыцця ў 1967 г. (дырэктар — С. З. Сапешка, намеснік — У. А. Гілеп) галоўныя намаганні кіраўніцтва маладога музея прыкладала на папулярызацыю яго калекцый. З 1974 г. і да канца разглядаемага перыяду Дзяржаўны музей БССР узначальваў І. П. Загрышаў. На працягу гэтага адрэзку часу высокі ўзровень работы музея забяспечваўся яго супрацоўнікамі — намеснікам дырэктара М. В. Сінькевічам, захавальнікам фондаў Р. В. Доўнар-Запольскай, загадчыкамі аддзелаў Р. Н. Саманавым, А. М. Заклінскай, І. І. Лукашэвіч, навуковым супрацоўнікам Л. Д. Клокам, рэстаўратарам У. А. Маслыкам і інш. Усе найважнейшыя пытанні жыцця музея вырашаліся калегіяльна, пасля абмеркавання на пасяджэннях навукова-метадычнага савета.

Асноўнай пляцоўкай адукацыйна-асветніцкай работы была стацыянарная экспазіцыя, якая мела наступную структуру: 1) прырода; 2) гісторыя першабытнаабшчыннага ладу; 3) гісторыя сярэдніх вякоў і перыяду капіталізму; 4) рэвалюцыя 1905-1907 гг.; 5) Кастрычніцкая рэвалюцыя і грамадзянская вайна; 6) сацыялістычнае будаўніцтва; 7) Вялікая Айчынная вайна; 8) аднаўленне народнай гаспадаркі; 9) навукова-тэхнічны прагрэс, сельская гаспадарка, навука, культура, дабрабыт у сучасны перыяд. Найбольшую ўвагу наведвальнікаў прыцягвалі першабытныя вырабы з косці, скульптурныя выявы жывёл, фібулы, творы сярэдневяковага рамяства, упрыгожанні з косці, шкла і бурштыну, драўляная скульптура, слуцкія паясы, паліхромная кафля, урэцкае шкло, старадрукі і рукапісы XVI-XVIII стст., багацейшы этнаграфічны матэрыял XVIII-XX стст., асабістыя рэчы беларускіх грамадскіх дзеячаў, вайскоўцаў, пісьменнікаў[13].

Акрамя сталай стацыянарнай экспазіцыі вялікая ўвага надавалася стварэнню часовых стацыянарных і перасоўных выставак.

[I] На Раду ўскладалася значная частка функцый упраўлення музеяў і аховы помнікаў. Пасля ліквідацыі апошняга ў 1988 г. Міністэрства культуры не праводзіла праверкі стану, уліку, захавання музейных калекцый, а таксама не ажыццяўляла агульную каардынацыю музейнай работы і аховы помнікаў.

Уяўленне аб змесце і маштабах выставачнай дзейнасці Дзяржмузея БССР дае наступная вытрымка з яго справаздачы за 1978, юбілейны год: «Больш 300 тыс. савецкіх грамадзян і замежных турыстаў агледзела наступныя выстаўкі — «60 год БССР і КПБ», «З імем Леніна», «Імі ганарыцца рэспубліка», «Помнікі і памятныя месцы рэвалюцыйнай славы Беларусі», «Браты назаўсёды (да 100-годдзя вызвалення Балгарыі)», «Манетныя клады Беларусі», «Мікрамініяцюры заслужанага майстра Украіны М. Сядрыстага», «Мастацкая фатаграфія, прысвечаная 60-годдзю БССР і КПБ (сумесна з Саюзам журналістаў)», «Ідэі Кастрычніка жывуць і перамагаюць», «Беларускае народнае мастацтва», «Старая і новая вёска», «Мінералы СССР», «З фондаў музея», «Халодная і агнястрэльная зброя», «Музычныя інструменты»[14].

Больш 80% ад агульнай колькасці наведвальнікаў музея аглядала яго экспазіцыі з дапамогай экскурсавода, якія прапаноўвалі агульную і 26 тэматычных экскурсій. Акрамя экскурсійнага абслугоўвання, выкарыстоўваліся такія формы масавай работы, як лекцыі, урокі, тэматычныя вечарыны, дні прафесій, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, камсамольскія зборы, піянерскія лінейкі і інш. З мэтай распаўсюджвання інфармацыі пра выставачную і масавую работу музея у розных раёнах Мінска былі расстаўлены рэкламныя шчыты, расклеены афішы, рассылаліся лісты кіраўнікам буйных прадпрыемстваў, арганізацый, калгасаў, выкарыстоўваліся сродкі масавай інфармацыі. Дзейнічалі перасоўныя выстаўкі ў спецыяльных чыгуначных вагонах, якія абслугоўвалі аддаленыя ад сталіцы раёны. Гэтыя намаганні далі плён — на працягу 1978 г. стацыянарную сталую экспазіцыю агледзела 310,5 тыс. чалавек[15].

Уся выставачная і адукацыйна-асветніцкая работа Белдзяржмузея базіравалася на яго фондавым зборы. Павелічэнне збору адбывалася, як і ў перыяд работы Аргрупы, за кошт археалагічных, этнаграфічных, гісторыка-побытавых экспедыцый, якія праводзіліся планава, прычым некаторыя з іх былі разлічаны на некалькі гадоў. Прадуктыўным спосабам павелічэння калекцый былі камандзіроўкі навуковых супрацоўнікаў, геаграфія правядзення якіх сягала далёка за межы БССР. Нетрадыцыйны спосаб камплектавання за кошт помнікаў гісторыі і культуры, знойдзеных у гідрасферы, быў прапанаваны ў 1982 г., калі пры Дзяржмузеі быў арганізаваны клуб падводных гісторыка-археалагічных даследаванняў. Ініцыятарам яго стварэння выступіў навуковы супрацоўнік С. М. Сіманюкоў, які аб'яднаў вакол сваёй ідэі некалькі дзясяткаў энтузіястаў-падводнікаў. На працягу 1980-х гг. члены клуба праводзілі гідраархеалагічныя даследаванні ракі Свіслач у Мінску, ракі Лукомкі, азёр Стаячае і

Сенніца ў Віцебскай вобласці, ракі Ясельда на Брэстчыне, азёр Нарач і Мядзел Мінскай вобласці. Былі праведзены абследаванні акваторыі вострава Свіной на Каспіі, а таксама шэрагу прыбярэжных зон Чорнага мора. У выніку былі выяўлены і перададзены ў музеі рэспублікі і Акадэмію навук сотні знаходак — прадметы побыту і ўпрыгожанні, узоры зброі і фрагменты тэхнічных прыстасаванняў[16].

Інтэнсіўнае павелічэнне збору музея вымагала правядзення работ па складанню навукова-даведачнага апарату. Ён ствараўся да наступных калекцый: археалагічная, этнаграфічная, нумізматычная, зброі, фарфору і шкла, старадрукаў і рукапісаў, плаката. Іх агульная колькасць на 1 студзеня 1977 г. склала 164,5 тыс. адзінак. Разам з прадметамі навукова-дапаможнага фонду гэта лічба ўзрастала да 217,5 тыс. адзінак. Такім чынам, фондавы збор Дзяржмузея ўключаў усе тыпы гістарычных першакрыніц, меў агульнагістарычны характар і адлюстроўваў розныя бакі жыцця беларускага народа. Побач з гістарычнымі помнікамі ў ім захоўваліся творы мастацтва, прадметы побыту, масавай вытворчасці, дакументы, фотаздымкі. У гэты ж час пачалася публікацыя калекцый у выглядзе друкаваных каталогаў. Акрамя фондавага збору, значную каштоўнасць уяўляла спецыялізаваная бібліятэка, якая налічвала каля 15 тыс. тамоў.

Новыя перспектывы ў распрацоўцы пытанняў кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў матэрыяльнай культуры адкрыла стварэнне музейнай рэстаўрацыйнай майстэрні. Акрамя работы з уласнымі калекцыямі, рэстаўратары музея аказвалі значную дапамогу музеям рэспублікі, дзе рэстаўрацыйныя службы адсутнічалі. Новы штуршок гэты напрамак работы атрымаў у 1983 г., калі быў створаны савет па рэстаўрацыі і кансервацыі.

Важнае месца ў дзейнасці музея займаў навукова-метадычны аддзел, створаны ў 1967 г. Яго супрацоўнікі праводзілі сістэматычныя заняткі з музейнымі работнікамі рэспублікі, аналізавалі работу раённых краязнаўчых музеяў, складалі метадычныя дапаможнікі. Творчы почырк Дзяржмузея БССР можна было ўбачыць у экспазіцыях музеяў у Пінску, Любані, Вілейцы, Клецку, Мядзелі, Быхаве, Лунінцы і іншых гарадоў і вёсак рэспублікі. З 1970 г. на базе музея рэгулярна праводзіліся практыкі студэнтаў-гісторыкаў БДУ і МДПІ імя Горкага. Усё гэта сведчыла аб пераўтварэнні Дзяржмузея ў буйнейшы ў рэспубліцы навукова-метадычны цэнтр музейнай і гісторыка-краязнаўчай работы.

На працягу 1975-1977 гг. супрацоўнікамі аддзела гісторыі развіцця сацыялістычнага грамадства пад кіраўніцтвам Н. А. Варатніцкай і групай мастакоў (аўтар мастацкай ідэі Э. Агуновіч) ішла

дэталёвая навукова-мастацкая распрацоўка і мантаж новай экспазіцыі, прысвечанай савецкаму перыяду беларускай гісторыі. З лістапада 1977 г. напярэдадні 60-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі яна была адкрыта для агляду. Нягледзячы на тое, што змест экспазіцыі 1977 г., як і папярэдняй, вызначаўся панаваўшай дзяржаўнай ідэалогіяй і бягучымі задачамі партыйнай прапаганды, яна значна адрознівалася ад папярэдняй у лепшы бок з прафесійнага пункту гледжання. У новых залах былі творча выкарыстаны прыёмы тэматычнага паказу помнікаў. У спалучэнні з матэрыяламі выяўленчага і фотаілюстратыўнага характару, а таксама пісьмовымі першакрыніцамі, яны дэманстравалі працэс пабудовы сацыялізму ў БССР. Новая экспазіцыя была пазбаўлена памылак, тыповых для тагачаснай савецкай музейнай практыкі. Залы не былі перагружаны экспанатамі, матэрыял меў дакладную, зразумелую сістэматызацыю. Кожная зала мела сваю дамінанту, свой «твар», сваю арыгінальную задуму. Разам з тым, абагульняючай тэмай усіх залаў было жыццё народа яго праца, творчасць, дабрабыт.

Новая экспазіцыя, прысвечаная сучаснаму жыццю БССР, хутка атрымала станоўчыя водгукі сярод музейнай грамадскасці краіны. Яе ўзгадвалі на агульнасаюзных канферэнцыях, семінарах, нарадах музейных работнікаў. На ёй праводзіліся заняткі з кіраўнікамі грамадскіх музеяў, студэнтамі, школьнікамі[17].

У сярэдзіне 1980-х гг. праводзілася рээксгіазіцыя аддзела прыроды. З гэтай мэтай у 1986 г. было арганізавана 15 палявых экспедыцый, па выніках якіх сабраны каштоўны матэрыял для новых дыярам і біягруп.

Тым не менш, ужо ў канцы 1980-х гг. гістарычная экспазіцыя музея стала аб'ектам грамадскай крытыкі. Адзін з чытачоў газеты «Чырвоная змена» у гэты час наступным чынам апісваў свае ўражанні: «Аб якой павазе да сваёй мінуўшчыны, мовы можна тут гаварыць? Уся гісторыя нашай Радзімы, якая знаходзіцца на скрыжаванні шляхоў, якую закранулі амаль усе войны Усходняй Еўропы, заключана ў нешматлікіх стэндах. А ў якім становішчы знаходзяцца нават тыя экспанаты, што ёсць!»[18]. Адказам на грамадскую крытыку сталі непалітызаваныя, новыя па змесце выстаўкі — «Францыск Скарына і яго час» (1990), «Клады Беларусі» (1991), «Чарнобыль — зона бяды» (1991), «Праца і святкаванне ў польскім народным мастацтве» (1991). А напачатку 1990-х гг. кіраўніцтва Дзяржмузея БССР (перайменаванага ў 1992 г. у Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі) распачало яго поўную рээкспазіцыю.

У разглядаемы перыяд Дзяржмузей БССР меў адзіны філіял — Музей рамёстваў і народных промыслаў у г. п. Заслаўе. Ён быў адкрыты ў 1978 г. у помніку архітэктуры XVI ст. — кальвінскім зборы (Спаса-Прэабражэнскай царкве). Прыхільнікам ідэі выкарыстання гэтага культавага будынка ў якасці музея народнага мастацтва быў І. П. Загрышаў, асобныя раздзелы экспазіцыі распрацоўвалі спецыялісты ў галіне народнага мастацтва М. Ф. Раманюк, С. А. Мілючэнкаў і інш. Аўтарам генеральнага праекта мастацкага вырашэння экспазіцыі выступіў Э. Агуновіч.

У экспазіцыі філіяла дэманстравалася каля 900 твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва IX-XX стст.: выявы гербаў беларускіх гарадоў XIV-XVI стст., прадметы хатняга ўжытку, узоры народнага адзення XIX-XX стст., ювелірныя вырабы X-XIII стст., вырабы беларускіх злотнікаў (пацір XVI ст., напрастольны крыж 1625 г.), ганчарныя вырабы IX-XX стст., кафля XVI-XVII стст. з Заслаўя, царскія вароты XVIII ст. з Давыд-Гарадоцкай Георгіеўскай царквы, скульптурныя выявы святых з Віцебскай і Гродзенскай абласцей, слуцкія паясы другой паловы XVIII — пач. XX стст., неглюбскія ручнікі, абразы[19].

Цікавая экспазіцыя, а таксама жывапісны прыродны і гістарычны ландшафт, у атачэнні якога знаходзіўся заслаўскі філіял, спрыялі вялікаму прытоку наведвальнікаў, пераважна турыстаў. Пачынаючы з 1981 г. тут праводзіліся тэатралізаваныя народныя святы з удзелам мінскай творчай інтэлігенцыі і студэнтаў. У 1988 г., пасля рашэння Міністэрства культуры аб перадачы кальвінскага збора Заслаўскаму гісторыка-культурнаму запаведніку, кіраўніцтва Дзяржмузея забрала з экспазіцыі свайго былога філіяла найбольш каштоўныя экспанаты. Яшчэ праз два гады Спаса-Прэабражэнская царква была перададзена вернікам[20].

Меншыя па аб'ёму, але каштоўныя сваім лакальным характарам работы па збору, вывучэнню і папулярызацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі праводзілі абласныя краязнаўчыя музеі.

Развіццё Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея на працягу 1970-х -1980-х гг. характарызавалася хуткім павелічэннем аб'ёму фондавых калекцый. Напачатку 1980-х гг. агульная колькасць прадметаў у іх дасягнула ўжо 100 тыс. адзінак. Па крыніцах камплектавання гэты фондавы збор меў дзве асаблівасці. Першая з іх была абумоўлена раскопкамі, што праводзіліся на Берасцейскім гарадзішчы (аб чым будзе сказана падрабязней ніжэй). Другая — работай Брэсцкай мытні, адкуль рэгулярна пастулалі канфіскаваныя творы

мастацтва. Як і ў першыя гады пасля адкрыцця, асноўнымі наведвальнікамі Брэсцкага абласнога музея былі турысты. На пачатку 1980-х гг. штогод музей разам з філіяламі аглядала больш 400 тыс. чалавек[21].

У разглядаемы час экспазіцыя 1965 г. у цэлым захавала сваю структуру і аб'ём. Рэалізацыя новых экспазіцыйных праектаў стрымлівалася абмежаванымі матэрыяльна-тэхнічнымі магчымасцямі. Па словах тагачаснага дырэктара музея Т. А. Слесарук, малыя плошчы асноўнага будынка прымушалі шукаць іншыя спосабы папулярызацыі сваіх значна ўзбагаціўшыся калекцый[22]. Найпрасцейшым выйсцем у гэтай сітуацыі было правядзенне выставак, якіх адбывалася ў музеі і па-за яго сценамі 10-15 у год. Прыкладам наватарскага падыходу да экспазіцыйнай дзейнасці з'яўлялася выстаўка пад адкрытым небам (мастацкія творы, этнаграфічныя вырабы, філатэлія, плакаты і інш.), арганізаваная супрацоўнікамі Брэсцкага музея ў 1981 г., падчас святкавання Міжнароднага дня музеяў. Гэты дэмакратычны спосаб прэзентацыі помнікаў карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод жыхароў горада і турыстаў[23]. У 1986 г. ужо ў сценах музея адбылася выстаўка шэдэўраў мастацтва, канфіскаваных брэсцкімі мытнікамі за спробу незаконнага вывазу за мяжу. Падчас правядзення выстаўкі колькасць падобнага «кантрабанднага тавару» у фондасховішчы музея дасягнула значнай лічбы (адных толькі абразоў было перададзена каля 1,5 тыс. адзінак). Акрамя абразоў, дэманстраваліся карціны, старажытныя кнігі, ювелірныя вырабы з каштоўных металаў, фарфор і інш.[24]

Новы перыяд у жыцці музея пачаўся ў 1991 г., пасля таго, як ён пераехаў у будынак былога гаркома КПБ. Невялікі касцёл, які Брэсцкі абласны музей займаў на працягу трох дзесяцігоддзяў, быў вернуты вернікам.

У 1982 г. на тэрыторыі Валынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці адкрыўся новы ўнікальны па спосабу захавання і экраніравання гістарычных помнікаў філіял Брэсцкага абласнога музея — археалагічны музей «Бярэсце». Гэтаму папярэднічала адкрыццё і шматгадовае археалагічнае вывучэнне гарадзішча Бярэсця невялікім атрадам аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам П. Ф. Лысенкі. Палявыя сезоны 1971-1981 гг. суправаджаліся нечаканымі адкрыццямі, рэдкімі знаходкамі і, самае галоўнае, выяўленнем добра захаваўшыся драўляных збудаванняў і гарадской інфраструктуры. Усё гэта выклікала вялікую цікавасць у спецыялістаў і шырокай грамадскасці. Да месца правядзення раскопак прыходзілі турыстычныя групы, мясцовыя жыхары, і ужо тады зарадзілася

думка пра стварэнне пасля завяршэння даследаванняў незвычайнага археалагічнага музея.

Выкананню гэтага праекта былі аддадзены гады напружанай працы. У 1970-1973 гг. для захавання рэштkaў старажытных пабудоў група супрацоўнікаў Беларускага тэхналагічнага інстытута пад кіраўніцтвам прафесара В. Я. Віхрова распрацавала і ўпершыню ажыццявіла метад кансервацыі драўляных збудаванняў у палявых умовах. У 1974 г. быў распрацаваны праект павільёна з бетону, алюмінію і шкла, які павінен быў накрыць закансерваваныя археалагічныя раскопы. Але яго ўзвядзенне зацягнулася на гады з-за адсутнасці ў Міністэрства культуры БССР сродкаў на будаўніцтва, а таксама складаных адносін, якія склаліся паміж археалагічным атрадам і кіраўніцтвам Брэсцкага абласнога музея. Сітуацыю рэзка змяніў зварот П. Ф. Лысенкі з просьбай дапамагчы выратаваць гінучы ўнікальны помнік да Старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгіна. Апошні даў станоўчы адказ і ўсклаў кантроль за правядзеннем работ па стварэнню музея на старшыню ўрада БССР і міністра культуры СССР. Падобны высокі патранаж дазволіў давесці справу да хуткага завяршэння[25].

У 1982 г. першыя наведвальнікі ўбачылі асноўную экспазіцыю музея, якая ўключала больш як 30 выяўленых у выніку раскопак старажытнага Бярэсця драўляных жылых і гаспадарчых пабудоў, рэшткі маставых, частаколаў, якія дзякуючы кансервуючым якасцям магутнага культурнага пласта добра захаваліся на вышыню 12 вянцоў. Акрамя закансерваваных раскопаў, у залах музея наведвальнікі знаёміліся з палітычным, эканамічным і культурным развіццём Бярэсця ў XI-XIV стст. Гэтую магчымасць давала шматлікая і разнастайная археалагічная калекцыя: прылады працы (сярпы, косы, ліцейная форма, акоўкі, нажы, жорны, лапаты і інш.), прадметы ўзбраення і амуніцыі конніка (наканечнікі коп'яў і стрэл, шпоры, кальчугі, фрагменты даспехаў і інш.), прадметы бытавога прызначэння (замкі, ключы, крэсівы, дзвярныя кольцы і прабоі і інш.), жаночыя ўпрыгожанні (бранзалеты, падвескі, пацеркі, фібулы і інш.), вырабы з дрэва, скуры, косці. Сярод экспанатаў можна было ўбачыць такія рэдкія знаходкі, як самшытавы грэбень з выразанымі кірылічнымі літарамі, касцяны мастыхін, металічнае пісала, касцяная шахматная фігурка і інш[26].

1970-я гг. былі часам актыўных пошукаў навуковых супрацоўнікаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея пад кіраўніцтвам дырэктара А. Н. Швайнштэйна ў галіне методыкі пабудовы экспазіцыі. Да найбольш удалых эксперыментаў трэба аднесці аўта-

матычную аудыёсістэму, з дапамогай якой аповяд экскурсавода суправаджаўся гукавым фонам, што адпавядаў зместу аднаго з 22-х залаў. Аднак зрабіць цікавымі для наведвальнікаў залы савецкага перыяду не дапамагала нават аўтаматыка. Дазорца залаў Віцебскага музея распавядала аб сваёй рабоце карэспандэнту часопіса «Нёман»: «Я раней дзесяць год у даўніне (залах, прысвечаных дарэвалюцыйнай гісторыі краю — А. Г.) сядзела. Народу там заўсёды шмат, хвалюешся, каб дзеткі з месца нічога не кранулі. Стомішся за дзень, бегаючы. Як бліжэй стала да пенсіі, сюды перавялі, кажуць: «У сучаснасці (залах, прысвечаных савецкай гісторыі краю — А. Г.), Настасся Фамінічна, Вам будзе спакайней». Так яно і ёсць. І лягчэй, і спакайней, а сумна. Калі людзі ідуць, дык весялей. А тут рэдкія экскурсіі, і ўсё бегам імкнуцца...»[27].

Зусім іншай была рэакцыя публікі на адкрыты ў 1970 г. пасля рээкспазіцыі раздзел выяўленчага мастацтва. Яго аснову склалі работы рускіх і беларускіх мастакоў XIX — пачатку XX ст., перададзеныя ў дар Дзяржаўным мастацкім музеем БССР, у тым ліку І. Хруцкага, І. Крамской, У. Макоўскага, В. Падстава, А. Архіпава, К. Каровіна, С. Жукоўскага, І. Бароўскага і інш[28].

У 1976 г. пачалася рэстаўрацыя Віцебскай ратушы, у сувязі з чым доступ публікі да стацыянарнай экспазіцыі быў абмежаваны, а неўзабаве ўвогуле спынены. Асноўную ўвагу падчас правядзення рэстаўрацыйных работ, зацягнуўшыхся на доўгія 18 гадоў, супрацоўнікі абласнога музея звярнулі на камплектаванне фондавага збору і стварэнне выставак. Так, комплекснымі экспедыцыямі былі сабраны прылады працы і побыту сялян, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, матэрыялы па гісторыі партызанскага руху, калгаснага будаўніцтва, індустрыялізацыі. Паступалі матэрыялы археалагічных даследаванняў Верхняга і Ніжняга замкаў. Паўсталі асабовыя фонды выдатных селекцыянераў краю І. К. Мароза і І. П. Сікоры. На пачатку 1980 г. агульная колькасць прадметаў калекцый ужо дасягнула 88 тыс. Прыкладна трэцюю частку фондавага збору складала нумізматыка — найбольш каштоўная калекцыя Віцебскага абласнога музея. У тым жа годзе было арганізавана 13 выставак ў музеі і 18 па-за яго межамі. Найбольшай папулярнасцю карысталіся гісторыка-краязнаўчая і мастацтвазнаўчая тэматыка — «Архітэктура Віцебска», «Нашы землякі — пісьменнікі», «Вопратка сялян канца XIX — пачатку XX стагоддзя», «Фарфор і шкло XIX стагоддзя» і інш.

У 1988 г. быў заснаваны новы філіял Віцебскага абласнога музея — Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва», праз год яшчэ адзін — Літаратурны музей ў Віцебску.

Першы крок на шляху аднаўлення сядзібнага дома І. Я. Рэпіна ў Здраўнёва Віцебскай вобласці* быў зроблены ў 1956 г., калі дзякуючы намаганням беларускіх і рускіх дзеячаў культуры Я. Коласа, В. Бялыніцкага-Бірулі, І. Грабара на яго месцы была ўсталявана мемарыяльная дошка. А праз чатыры гады віцебскі абласны камітэт КПБ прыняў рашэнне аб узнаўленні былога лецішча мастака і пераўтварэнні яго ў філіял Віцебскага абласнога музея. Праект рэканструкцыі лецішча быў выкананы супрацоўнікамі спецыялізаванай майстэрні Саюза архітэктараў БССР пад кіраўніцтвам П. Кракалёва. Вялікая пошукавая работа была праведзена супрацоўнікамі Віцебскага абласнога музея на чале з загадчыцай аддзела выяўленчага мастацтва Е. М. Кічынай. У працэсе аднаўлення сядзібнага дома значна дапамаглі і лісты дачкі І. Рэпіна Т. М. Дзяканавай, і матэрыялы, перададзеныя іншымі сваякамі мастака. Асноўныя работы па рэканструкцыі будынка, малых архітэктурных форм і ўпарадкавання сядзібы праводзіліся Віцебскай рэстаўрацыйнай майстэрняй аб'яднання «Белрэстаўрацыя» і былі скончаны ў канцы 1988 г. Тады ж выйшаў загад Міністэрства культуры БССР аб стварэнні музея І. Я. Рэпіна «Здраўнёва»[I][29].

Адначасова са збіраннем рэпінскай спадчыны супрацоўнікі Віцебскага краязнаўчага музея фарміравалі фонд літаратурных матэрыялаў для другога філіяла. У лютым 1990 г. адбылося абмеркаванне архітэктурнага вырашэння і мастацкага ўвасаблення будучай экспазіцыі Літаратурнага музея, прадстаўленых у выглядзе макета. Пасля абмеркавання ў вузкім прафесійным коле макет работы мінскага мастака У. Кандрацьева быў выстаўлены для публічнага агляду і абмеркавання[30].

Як і абласны музей у Віцебску, які займаў памяшканне гарадской ратушы з 1924 г., Гомельскі абласны краязнаўчы музей быў непарыўна звязаны з выдатным помнікам класіцызму XIX ст. — палацам Румянцавых-Паскевічаў. Увесь палацава-паркавы ансамбль, у які акрамя палаца ўваходзілі Петрапаўлаўскі сабор, капліца і парк, складаў разам з музеем адзінае цэлае, што натуральна вызначала як профіль стацыянарнай экспазіцыі, так і тэматыку выставак. Але, нягледзячы на ўключэнне аб'ектаў ансамбля ў экскурсійныя маршруты,

---

[I] Сядзіба «Здраўнёва» у 1892-1901 гг. была месцам летняга адпачынку І. Я. Рэпіна і яго сям'і і натхніла вялікага майстра на стварэнне шырока вядомых палотнаў «Восеньскі букет», «Беларус», «Дуэль» і інш. Пасля 1917 г. «Здраўнёва» стала месцам жыхарства сям'і малодшай дачкі мастака. Нягледзячы па намаганні І. Я. Рэпіна прыцягнуць увагу віцебскіх губернскіх улад да аховы сядзібы, пасля ад'езду ў 1930 г. яе ўладальнікаў за мяжу дом і іншыя пабудовы былі прададзены на дровы.

дзейнасць Гомельскага музея была па-ранейшаму зарыентавана выключна на краязнаўчую тэматыку.

Найвялікшую колькасць адзінак захоўвання ў гэтым музеі змяшчала археалагічная калекцыя (звыш 60 тыс., г. зн. больш паловы агульнай колькасці), што было вынікам вывучэння Гомельшчыны на працягу 1960-х -1980-х гг. супрацоўнікамі музея разам з археолагамі з навуковых устаноў Гомеля, Мінска, Масквы і Ленінграда. Акрамя таго, у 1978 г. сектар археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР перадаў у Гомель археалагічныя калекцыі старэйшага беларускага даследчыка К. М. Палікарповіча ў колькасці звыш 10 тыс. адзінак[31]. У выніку правядзення комплексных гісторыка-побытавых экспедыцый значна павялічыліся этнаграфічныя калекцыі. Па-ранейшаму вялікая ўвага надавалася выяўленню матэрыялаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і сацыялістычнага будаўніцтва. У другой палове 1980-х гг. супрацоўнікі музея звярнулі ўвагу на матэрыялы, якія распавядалі пра вынікі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сярод паступленняў гэтага перыяду вылучаліся прадметы ранняй бронзаліцейнай вытворчасці, арабскія дзірхемы, упрыгржанні, прылады працы, прадметы ўзбраення IX-XI стст., клад грыўнаў XI-XII стст., віслая пячатка XII ст., віленскае «Евангелле» Пятра Мсціслаўца 1575 г., фарфоравыя і фаянсавыя вырабы нямецкай, англійскай і расійскай вытворчасці XIX — пачатку XX стст., комплекс сярэбраных вырабаў рускіх і заходнееўрапейскіх майстроў, гадзіннік XIX ст. фірмы Ф. Жалі і інш[32].

У 1980 г. супрацоўнікі музея правялі вялікую і карпатлівую работу па арганізацыі адкрытага захоўвання фондавых калекцый. Гэта стала магчымым пасля перадачы музею ў якасці філіяла палаца Халецкіх у в. Хальч Веткаўскага раёна. Захоўванне калекцый у дзесяці пакоях палаца было наладжана такім чынам, што іх маглі аглядаць наведвальнікі. Найбольшым поспехам карысталіся пакоі, у якіх былі паказаны інтэр'еры сялянскага жытла канца XIX — пачатку XX ст., а таксама пакоі, прысвечаныя творчасці народных мастакоў Гомельшчыны. Акрамя Хальчанскага палаца, адкрытае захаванне было наладжана ў ніжнім склепе палаца Румянцавых-Паскевічаў[I]. У выніку, калі сярэднестатыстычны беларускі музей паказваў у стацыянарнай экспазіцыі каля 10% ад агульнай колькасці прадметаў ў яго фондасховішчы, то Гомельскі музей - 70%[33].

Арганізацыя адкрытага захоўвання супала з пабудовай новай стацыянарнай экспазіцыі, што абумовіла рэкордны прыток

---

[I] Значная частка плошчаў палаца Румянцавых-Паскевічаў у 1970 -х 1980-х гг. была па-ранейшаму занята Палацам піянераў.

наведвальнікаў. У 1980 г. палац разам з філіямі (акрамя Хальчанскага палаца існаваў філіял — мемарыяльны музей імя П. М. Лепяшынскага) агледзела 340 тыс. чалавек.

На працягу 1970-х -1980-х гг., як і ў папярэдні час, асноўныя намаганні супрацоўнікаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея прыкладаліся да паляпшэння экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі падзей XX ст. Падобная практыка прывяла да фізічнага і маральнага старэння залаў, прысвечаных старажытнай беларускай гісторыі. Гісторык Г. М. Сагановіч, агледзеўшы гэтыя залы ў 1986 г., крытыкаваў іх за надзвычай лаканічны паказ падзей ваеннай гісторыі Беларусі, несуразмернасць расійскага і беларускага матэрыялу, нарэшце, за недакладнасці ў анатацыях[34]. Новая інтэрпрэтацыя падзей сярэдневяковай беларускай гісторыі была прапанавана публіцы ў стацыянарнай экспазіцыі «Гродзеншчына ў складзе Вялікага княства Літоўскага», адкрытай у 1989 г.

Вялікую ролю ў культурным жыцці горада адыгралі экспазіцыі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, адкрытыя па-за яго сценамі. У 1973 г. першыя наведвальнікі агледзелі гістарычную экспазіцыю ў шэдэўры архітэктуры XII ст. — Барысаглебскай царкве. Праз тры гады намаганнямі супрацоўніцы музея вядомай беларускай паэтэсы Д. Бічэль-Загнетавай у доме, дзе прайшлі дзіцячыя гады Максіма Багдановіча, адкрылася экспазіцыя літаратурнага аддзела. Яна перадавала атмасферу, у якой фарміравалася асоба паэта ў раннім дзяцінстве. Адразу ж пасля адкрыцця гэтая экспазіцыя набыла характар нацыянальнага грамадска-культурнага цэнтра. Тут працавалі дзіцячае аб'яднанне «Вянок», выдавецкая суполка імя М. Багдановіча, аб'яднанне каталікаў-беларусаў[35].

Вынікам вывучэння і збірання ўзораў флоры і фауны Гродзенскай вобласці было адкрыццё ў студзені 1970 г. у шасці залах музея новай экспазіцыі аддзела прыроды. Аўтарам яе навуковай канцэпцыі выступіла загадчыца аддзела В. А. Юркевіч, мастацкае вырашэнне было выканана мінскімі мастакамі Д. Брумерам і Я. Шыбнёвым. Новая экспазіцыя аддзела пророды атрымала станоўчыя водгукі ўдзельнікаў праведзенай ў сакавіку 1970 г. у Гродне Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі супрацоўнікаў прыродазнаўчых музеяў. У прыватнасці, была адзначана высокая якасць вырабу чучалаў буйных млекакормячых, птушак і рыб, прадстаўленых ў дыярамах і біягрупах, а таксама натурныя фотаздымкі прынёманскіх краявідаў[36].

Пачынаючы з 1986 г. экспазіцыйная і асветніцкая дзейнасць Гродзенскага музея рэзка скарацілася ў сувязі з пачаткам

правядзення археалагічна-архітэктурных даследаванняў з мэтай падрыхтоўкі праекта рэстаўрацыі помнікаў Замкавай гары (у 1985 г. музей агледзела звыш 230 тыс. чалавек). На працяглы тэрмін залы закрыліся для закладкі зандажоў, потым на правядзенне рамонту і аднаўленне экспазіцый. Новыя перспектывы развіцця перад музеем адкрыла перадача яму часткі Новага замка, які раней займаў абласны камітэт КПБ. Замкавыя памяшканні было вырашана выкарыстоўваць у якасці выставачных залаў. Гэта, на думку супрацоўнікаў музея, адпавядала атмасферы і духу, што панавалі ў замку, калі яго гаспадаром быў апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі — мецэнат, апякун мастацтва і калекцыянер. 25 кастрычніка 1991 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё першай музейнай экспазіцыі Новага замка, якая складалася з чатырох выставак: «Зброя мінулых стагоддзяў», «На зямлі і пад вадой», а таксама выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва[37].

Экспазіцыя Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея, адкрытая ў 1967 г., на працягу 1970-х гг. карысталася папулярнасцю сярод мясцовых жыхароў і турыстаў. Яе аглядала да 100 тыс. чалавек у год. Акрамя экскурсій, у музейных залах праводзіліся іншыя формы адукацыйна-выхаваўчай работы. У лютым 1977 г. будынак Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея быў зачынены на капітальны рамонт (які зацягнуўся да 1989 г.), а яго супрацоўнікі прыступілі да распрацоўкі новай экспазіцыі. Адначасова праводзіліся археалагічныя раскопкі на тэрыторыі вобласці, збіранне гісторыка-побытавага матэрыялу, пашпартызацыя нерухомых помнікаў. Вялікая ўвага надавалася выставачнай рабоце. У 1980 г. колькасць прадметаў асноўнага фонду ў Магілёўскім музеі дасягнула 80 тыс. У ім вылучаліся калекцыі манет і старажытных скарбаў, зброі XIV-XIX стст., крыжоў XI-XVII стст., этнаграфіі XIX — пачатку XX ст., старадрукаў. Па-ранейшаму значная ўвага надавалася адлюстраванню ў фондавым зборы музея падзей савецкай гісторыі.

У 1976 г. была праведзена рэстаўрацыя філіяла Магілёўскага абласнога музея — Ляснянскага мемарыяльнага комплексу. Акрамя рэстаўрацыйных работ на нерухомых помніках абнавілася экспазіцыя Музея гісторыі бітвы пад Лясной, дзе з'явіліся новыя матэрыялы, прысвечаныя падзеям у Слаўгарадскім раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны[38]. У 1981 г. у Магілёве быў створаны яшчэ адзін філіял абласнога музея — музей этнаграфіі. У яго двух экспазіцыйных залах паказваліся прылады працы і побыту, адзенне сялян Магілёўскай губерні XIX — пачатку XX ст., узоры старажытнага і сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У 1986 г. у Магілёве, у будынку

былога калегіума уніятаў, была разгорнута экспазіцыя філіяла абласнога музея, прысвечанага дзекабрыстам. Выбар будынка філіяла быў абумоўлены тым, што ў ім пасля разгрому ў студзені 1826 г. паўстання Чарнігаўскага палка ўтрымліваліся пад вартай члены тайных таварыстваў С. І. і М. І. Мураўёвы-Апосталы, М. П. Бястужаў-Румін, В. К. Тызенгаўзен. Збіраліся матэрыялы аб іншых дзекабрыстах, жыццё якіх было звязана з Магілёвам — М. М. Раеўскім, В. А. Мусіне-Пушкіне, П. П. Цітове. Філіялы Магілёўскага музея аглядала каля 80 тыс. чалавек у год, прычым палова з іх аддавала перавагу музею этнаграфіі[39].

Колькасць прадметаў асноўнага фонду ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечна ў 1990 г. пераўзышла 30 тыс. адзінак. Сярод фондавых калекцый паўнатой і гісторыка-мастацкай каштоўнасцю вылучаліся такія, як «археалогія», «нумізматыка», «скарбы», «народнае ткацтва і адзенне», «кераміка», «дакументы», «кнігі». На працягу 1970-х - 1980-х гг. у ліку іншых іх узбагацілі адзін з буйнейшых скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, які налічваў 5 768 манет XVI-XVII стст. з в. Мароські Маладзечанскага раёна, адзін з найстаражытных дакументаў, пісаных на старабеларускай мове, — «Вопіс на дарэнне зямлі ў карысць Хохлаўскай царквы», зроблены князем Станіславам Кішкай у 1607 г., драўляная скульптура «Распяцце» XVII ст. з в. Ілля Вілейскага раёна, драўляная скульптура „Кцітар» XIX ст. з Нясвіжскага касцёла Божага цела, старадрук «Тлумачэнні да твораў Цыцэрона» (Нясвіжская друкарня Радзівілаў, 1762), самаробны партызанскі медаль «За заслугі».

Павелічэнне фондавых калекцый дазволіла тройчы — у 1970, 1979 і 1984 гг. правесці перабудовы стацыянарнай экспазіцыі, а таксама арганізаваць шматлікія стацыянарныя і перасоўныя выстаўкі.

Мінскі абласны музей у параўнанні з іншымі абласнымі музеямі саступаў ім як па багаццю калекцый, так і па колькасці наведвальнікаў, што тлумачылася яго маладосцю і месцазнаходжаннем у райцэнтры. Акрамя таго, разгортванне ўсіх напрамкаў работы музея стрымлівала яго слабая матэрыяльна-тэхнічная база. На працягу ўсяго разглядаемага перыяду ён знаходзіўся ў маленькім будынку барачнага тыпу[40].

Сярод раённых краязнаўчых музеяў па-ранейшаму вылучаўся сваёй дзейнасцю музей у Пінску. Падчас святкавання 50-годдзя ў 1976 г. яго фондавы збор налічваў ужо 48 тыс. адзінак захоўвання. Паводле слоў тагачаснага дырэктара — старога пінскага інтэлігента, лацініста і археолага Б. В. Міралюбава, музей стаў сапраўдным навуковым і адукацыйным цэнтрам Палесся. За пасляваенны час яго

агледзела 1 350 тыс. чалавек[41]. Пінскі музей у разглядаемы час стаў не толькі навукова-асветніцкім, але і важным метадычным цэнтрам. З дапамогаю яго супрацоўнікаў ствараліся першыя стацыянарныя экспазіцыіі Брэсцкага, Столінскага і Бярозаўскага краязнаўчых музеяў. Шырокую вядомасць атрымаў музей Аляксандра Блока ў в. Лапацін Пінскага раёна, створаны ў 1980 г. навуковым супрацоўнікам Ф. Ф. Жураўскім.

Паводле рашэння ЦК КПБ у 1979 г. Пінскі краязнаўчы музей быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны музей сацыялістычнага пераўтварэння Палесся. Сфера яго дзейнасці пашырылася на большасць раёнаў Брэсцкай, паўднёвыя Мінскай і ўсходнія (да Мазыра) Гомельскай абласцей. Гэта перайменаванне паўплывала не толькі на тэрыторыю, але і на змест дзейнасці музея. Асаблівае месца ў збіральніцкай і экспазіцыйнай рабоце занялі матэрыялы, якія паказвалі тагачаснае сацыяльна-эканамічнае аблічча Палесся, меліяратыўную будоўлю, работу перадавых сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў. Планавалася адкрыццё адкрытай пляцоўкі для паказу прылад працы, якія ўжываліся пры меліярацыіі з часоў асваення Палесся чалавекам[42].

У другой палове 1980-х гг. пачаліся змястоўныя змены ў рабоце Пінскага музея. Быў выпрацаваны новы тэматыка-экспазіцыйны план, у якім адсутнічала апалагетыка пераўтварэнняў, што право-дзіліся на Палессі ў пасляваенны перыяд. Навуковыя супрацоўнікі ўпершыню звярнуліся да вывучэння гарадскога побыту. У сем'ях старых пінчан, у старажылаў колішніх мястэчак удалося прыдбаць разнастайныя рэчы хатняга ўжытку, асобныя дэталі інтэр'ераў, адзенне. А ў лістападзе 1990 г. па ініцыятыве супрацоўнікаў пінскага музея ён быў перайменаваны ў Музей Беларускага Палесся.

У 1978 г. паводле распараджэння ЦК КПБ ў Ветцы ў былым ку-пецкім асабняку XIX ст. быў заснаваны музей народнай творчасці. Як вядома, Ветка, закладзеная старaверамі ў 1685 г., хутка стала буйным рэлігійным і эканамічным цэнтрам рускага расколу і ўяўляла буйное пасяленне з самакіраваннем, шырокімі гандлёвымі сувязямі, якое было акружана шматлікімі слабодамі, манастырамі і скітамі. Апошнія з'яўляліся цэнтрамі пашырэння пісменства, развіцця мастацтва іканапісу. Тут жа сфарміравалася самабытная школа веткаўскай разьбы, у якой спалучыліся мясцовыя беларускія і рускія традыцыі народнага архітэктурнага дэкору.

У падмурак музея была пакладзена прыватная калекцыя мясцовага таленавітага мастака, разбяра па дрэву, чаканшчыка, пераплётчыка, ткача Ф. Р. Шклярава[I], які стаў першым дырэктарам музея. На працягу дзесяцігоддзяў з ранняй вясны да глыбокай восені абыходзіў ён вёскі Гомельшчыны і ніколі не вяртаўся з пустымі рукамі. Хуткаму павелічэнню калекцый Ф. Р. Шклярава спрыялі не толькі яго апантанасць і настойлівасць, але такія якасці, як тактоўнасць і абаяльнасць. З цягам часу да экспедыцый Ф. Р. Шклярава далучыліся яго першыя супрацоўнікі Г. Р. Нячаева і С. І. Лявонцьева. Створаная імі самабытная арыгінальная экспазіцыя, адкрытая для агляду 1 лістапада 1987 г., адразу ж атрымала высокую ацэнку спецыялістаў і шырокай публікі. «Цудоўны свет, калі ў ім ёсць такія апантаныя людзі, захавальнікі і збіральнікі старажытнасцей, як у музеі г. Веткі», — пакінуў у кнізе водгукаў свае ўражанні ад убачанага народны пісьменнік Беларусі Ніл Гілевіч[43].

Да найбольш каштоўных калекцый «веткаўскай жамчужыны» адносіліся старадрукі XVI-XVIII стст., у тым ліку «Евангелле вучыцельнае» І. Фёдарава і П. Мсціслаўца (Заблудаў, 1569), «Апостал» І. Фёдарава (Львоў, 1574), «Евангелле» П. Мсціслаўца (Вільня, 1575), кнігі В. Гарабурды (Вільня, друкарня Мамонічаў), А. і І. Нявежаў (Масква, друкарні Бурцава і Фофанава, першая палова XVII ст.), «Евангелле» А. Радзішэўскага (Масква, 1606), выданні XVIII ст. з Куцеінскай друкарні; рукапісныя кнігі XVI-XX стст,, пераважна рукапісы крукавога нотнага пісьма; абразы і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва работы мясцовых майстроў-старавераў рознага часу, у тым ліку Р. Рагаткіна (іканапіс), Р. Свяшчэннікава (чаканка), М. Смірновай (шыцццё бісерам), П. Кастылёва (разьба па дрэве); традыцыйнае і сучаснае ткацтва — ручнікі, абрусы і хусткі з в. Неглюбка і пас. Рэпішча; традыцыйныя строі Веткаўскага раёна[44].

Правядзенне выставак у гарадах рэспублікі і за яе межамі, выпуск каталогаў, удзел у тэлеперадачах — вось няпоўны пералік дзейнасці супрацоўнікаў музея па папулярызацыі сабраных унікальных помнікаў. Напачатку 1990-х гг. у Веткаўскім музеі пачалася распрацоўка і рэалізацыя комплекснай адукацыйнай праграмы «Аз буки веди — глаголь добро», якая складалася з 15 тэм па знаёмству школьнікаў з гісторыяй, тэхналогіяй, духоўнай сутнасцю народнага ткацтва, семантыкай народнага арнамента. Гэта праграма з'явілася

---

[I] Шкляраў Фёдар Рыгоравіч (1925 1988) нарадзіўся ў Ветцы, паходзіў з сям'і стараавераў, працаваў у мясцовым клубе мастаком-афарміцелем. На працягу 1950-х 1970-х гг. сабраў гісторыка-мастацкую калекцыю, на аснове якой у 1978 г. быў адкрыты Веткаўскі музей народнай творчасці. Першапачаткова займаў пасаду грамад скага дырэктара музея, з набыццём Веткаўскім музеем статуса дзяржаўнага ўзначальваў яго па прафесійнай аснове.

лагічным завяршэннем усёй канцэпцыі музея, накіраванай на ўзнаўленне living рознабаковых сувязей сучаснага чалавека з традыцыйнай культурай.

Важны цэнтр па адраджэнню рэгіянальнай культуры паўстаў на працягу другой паловы 1980-х гг. у Браславе, адным з турыстычных цэнтраў Беларусі. У 1984 г. у горадзе быў заснаваны раённы гісторыка-краязнаўчы музей, у распараджэнне якога было перададзена некалькі дзясяткаў прадметаў з мясцовага школьнага збору. Наступныя чатыры гады былі часам напружанай арганізацыйнай работы, якая праводзілася пад кіраўніцтвам дырэктара музея Г. С. Падалян. Адначасова ішла інтэнсіўная збіральніцкая праца — штогод навуковы супрацоўнік К. С. Шыдлоўскі праводзіў да ста выездаў па камплектаванню фондавага збору музея. У 1988 г. экспазіцыя Браслаўскага музея, размешчаная ў будынку былой прыватнай друкарні, прыняла першых наведвальнікаў. Яе аснову склалі звыш 700 экспанатаў, якія адлюстроўвалі найважнейшыя старонкі гісторыі горада і краю, а таксама знаёмілі з традыцыйнымі для Браслаўшчыны відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У адрозненне ад абсалютнай большасці музеяў БССР дадзенага профілю ў ёй адсутнічалі тагачасныя ідэалагічныя клішэ, напрыклад, не было раздзела дасягненняў сацыялістычнага будаўніцтва. З цягам часу экспазіцыя музея ўзбагацілася цікавымі археалагічнымі матэрыяламі, этнаграфічным комплексам «Куток сялянскай хаты», а таксама манаграфічнымі экспазіцыйнымі комплексамі, прысвечанымі выдатным землякам, — П. Сергіевічу, С. Нарбуту і інш.[45]

Браслаўскі музей вылучаўся сярод іншых краязнаўчых музеяў рэспублікі высокім узроўнем навукова-даследчай работы. Яго супрацоўнікі выступілі арганізатарамі і ўдзельнічалі ў вывучэнні неалітычнай стаянкі Дубкі (1988), гарадзішчаў Масквічы (1988), Браслава (1989-1990), Дрысвят (1991), бескурганнага могільніка Пашавічы (1991). З 1989 г. у музеі пачалі праводзіцца міжнародныя навукова-краязнаўчыя канферэнцыі «Браслаўскія чытанні», у якіх удзельнічалі навукоўцы з Мінска, Гродна, Масквы, Пецярбурга, Польшчы. Выдаваліся навукова-краязнаўчыя зборнікі «Браслаўскія сшыткі». Супрацоўнікі музея падрыхтавалі і выдалі дапаможнік па гісторыі для настаўнікаў раёна, апублікавалі дзесяткі артыкулаў у выданнях навуковага і даведачнага характару[46].

Разнастайнасцю адрозніваліся формы адукацыйна-асветніцкай работы Браслаўскага музея. Не абмяжоўваючыся экскурсійным абслугоўваннем насельніцтва, музей прапаноўваў школам раёна правядзенне музейных урокаў, лекцый, быў створаны клуб юных края-

знаўцаў. Поспехам у браслаўчан карысталіся выставы «Калядныя ўзоры», «Жанчына сярод кветак» і інш. Неад'емнай часткай работы стала дапамога школам у арганізацыі грамадскіх музеяў. Важным напрамкам было адраджэнне і развіццё народнай творчасці. З 1986 г. пры музеі працавала творчае аб'яднанне майстроў і самадзейных мастакоў «Ля возера», якое пазней стала падмуркам для «жывога» музея рамёстваў. Распрацоўваліся канцэпцыі падобных музеяў — карчмы і заезджага двара. Планавалася адкрыццё музея прыроды і этнаграфіі, музея традыцыйнай культуры. Пашырэнне фондавага збору Браслаўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, у якім налічвалася 15 тыс. прадметаў, аб'яднаных у 16 калекцый, а таксама ўключэнне ў сферу яго дзейнасці шэрагу новых аб'ектаў узняло пытанне аб яго статусе. Змены адбыліся у снежні 1995 г., калі Віцебскі аблвыканком прыняў рашэнне аб стварэнні на яго базе Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў.

Прыклады творчых адносін да вывучэння і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны давалі новыя музеі раённага падпарадкавання — Горацкі гісторыка-этнаграфічны, Мсціслаўскі гісторыка-археалагічны, народнай творчасці ў Моталі і некаторыя іншыя. Але большасць раённых краязнаўчых музеяў існавала ў цяжкіх матэрыяльна-тэхнічных умовах, што стрымлівала іх далейшае развіццё. У непрыстасаваных маленькіх будынках, без гардэроба і месц агульнага карыстання, з пячным ацяпленнем туліліся музеі ў Бешанковічах, Вілейцы, Гарадку, Ельску, Капылі, Клецку, Лунінцы, Любані, Пухавічах, Рагачове, Шуміліна і інш. Дырэктар Баранавіцкага краязнаўчага музея ў справаздачы за 1983 г. канстатаваў: «Трэба адзначыць, што ўмовы захавання ніяк не адпавядаюць інструкцыям. Музейныя прадметы захоўваюцца ў неверагодна дрэнных умовах, 40,8 тыс. адзінак захоўвання знаходзяцца ў пакоі плошчай 30 кв. м»[47]. У тым жа годзе дырэктар аднаго са старэйшых краязнаўчых музеяў у Бабруйску наступным чынам вызначыў перашкоды, якія стрымлівалі развіццё яго установы: «1. малая экспазіцыйная плошча; 2. недахоп фондавых памяшканняў; 3. адсутнасць лекцыйнай залы; 4. адсутнасць аўтатранспарту; 5. адсутнасць гардэроба.»[48].

Не толькі цяжкасці матэрыяльна-тэхнічнага характару перашкаджалі развіццю раённых краязнаўчых музеяў. Сур'ёзныя нараканні з боку грамадскасці выклікала іх экспазіцыйная практыка. Вядомая пісьменніца С. Алексіевіч у сваім нарысе «... І ўбачаць нас» (які трэба ахарактарызаваць як адну з першых і даволі ўдалых спроб беларускай публіцыстыкі ў жанры музейнай крытыкі) з расчараваннем пісала: «Як шкада, што можна з зачыненымі вачыма арыентавацца ў многіх

раённых музеях, так яны падобныя адзін да аднаго. Ну, канешне, у цэнтры пакоя на высокай падстаўцы вы ўбачыце дзясятак пераходзячых чырвоных вымпелаў, сцяжкоў, якімі ўзнагароджваюць ударнікаў. Але, калі зацікавіцеся гісторыяй гэтых экспанатаў, дык высветліцца, што яны безыменныя... А так хацелася б даведацца аб чалавечых лёсах, імёнах, якія стаяць за гэтымі вымпеламі і сцяжкамі! У музеях шмат узораў мясцовай прамысловасці: кофтачкі, сукенкі, абутак... Складаецца ўражанне, нібыта стаіце вы перад вітрынай крамы. А ці з такім пачуццём мы павінны сыходзіць з музея?»[49].

Перыяд з 1969 па 1974 г. у буйнейшым музеі ваенна-гістарычнага профілю — Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны быў часам вельмі напружанай працы, калі навуковым калектывам, узначаленым новым кіраўніцтвам (дырэктар — П. С. Лавецкі[I], намеснік па навуковай рабоце — У. А. Гілеп, мастак — А. Кроль), былі перароблены ўсе экспазіцыйныя тэмы на трох паверхах музея. У чэрвені 1969 г. была адкрыта зала Казлова. Праз два гады мастакамі П. Крохалевым, Б. Аракчэевым, У. Лагуном, Л. Асядоўскім створана дыярама «Мінскі кацёл» (першапачаткова з мэтай яе размяшчэння планавалася ўзвесці спецыяльную прыбудову да музея). У 1973 г. супрацоўнікамі аддзела гісторыі партызанскага руху пад кіраўніцтвам Р. А. Чарнаглазавай была выканана экспазіцыя ўсіх залаў, прысвечаных гісторыі партызанскага руху. У 1975 г. — перабудаваны экспазіцыі залаў Перамогі і гарадоў-герояў (загадчык ваенпафрантавога аддзела — Я. К. Габец). Былі выкарыстаны аўдыя- і кінатэхніка, электронныя карты. У выніку гэтага паўстала стацыянарная экспазіцыя, якая праіснавала з невялікімі зменамі да канца разглядаемага перыяду і карысталася вялікай папулярнасцю сярод наведвальнікаў.

Важнай падзеяй у жыцці музея было адкрыццё 3 ліпеня 1977 г. пляцоўкі цяжкага ўзбраення. Вялікае ўражанне на гледачоў, незалежна ад іх узросту і месца жыхарства, пакідала зала, дзе з 1980 г. дэманстравалася серыя жывапісных работ М. Савіцкага «Лічбы на сэрцы».

5 ліпеня 1969 г. адкрыліся два новыя філіялы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — Мемарыяльны комплекс Хатынь і Курган Славы.

---

[I] Лавецкі Пётр Спірыдонавіч (1917-2003) музейны дзеяч. Нарадзіўся ў Жлобіне, пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце. З лістапада 1942 г. радавы, намеснік камандзіра па разведцы, начальнік штаба партызанскага атрада «Буравеснік» Мінскай вобл., член Мінскага падпольнага райкома ЛКСМБ. Са жніўня 1944 г. па пуцёўцы Беларускага штаба партызанскага руху — на працы ў Белдзяржмузеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Займаў пасады загадчыка аддзела, намесніка дырэктара па навуковай рабоце, дырэктара (1968-1982), з 1982 г. на пенсіі. Заслужаны работнік культуры БССР.

Узнавіць гісторыю пагібелі Хатыні дапамагла газета Плешчаніцкага камуністычнага падполля, дзе ў 1943 г. быў надрукаваны артыкул пад назвай «Запомні! Адпомсці!», які стаў дакументальным помнікам хатынскай трагедыі. У студзені 1966 г. ЦК КПБ прыняў пастанову аб стварэнні на месцы былой вёскі Хатынь мемарыяльнага комплексу ў памяць соцень беларускіх вёсак, знішчаных у гады нямецкай акупацыі. Распрацоўка комплексу была даручана скульптару С. Селіханаву, архітэктарам Ю. Градаву, В. Занковічу, Л. Левіну. У аснову мемарыяла была пакладзена планіроўка даваеннай вёскі. Дзякуючы намаганням навуковага супрацоўніка музея А. Г. Ванькевіч высвятляліся месцазнаходжанне і спосабы мемарыялізацыі пад'язных шляхоў, жылых дамоў, калодзежаў, адрыны, у якой спалілі людзей, іх брацкай магілы. У цэнтры комплексу было вырашана ўсталяваць бронзавую скульптуру Нямскоранага чалавека з забітым хлопчыкам на руках. Гэта задума была здзейснена да канца 1968 г. Аднак ужо першыя месяцы работы мемарыялу, вялікая колькасць наведвальнікаў падказалі, што яго канцэпцыю трэба пашырыць. У выніку стварэння другой чаргі мемарыялу з'явіліся могілкі спаленых вёсак, комплекс адроджаных вёсак, сцяна жалобы вязняў нацысцкіх канцлагераў і Вечны агонь. Мемарыяльны камплекс Хатынь праіснаваў у якасці філіяла да сакавіка 1991 г., пасля чаго набыў статус самастойнай установы[50].

Курган Славы быў узведзены па праекту скульптараў А. Бембеля, А. Арцімовіча і архітэктараў А. Стаховіча, Л. Міцкевіча, В. Лапцэвіча на 21-м кіламетры шашы Мінск-Масква ў гонар подзвігу воінаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 г. Цырымонія закладкі Кургана адбылася 30 верасня 1966 г. з удзелам прадстаўнікоў гарадоў-герояў Масквы, Ленінграда, Валгаграда, Севастопаля, Адэсы, Кіева, Брэста і Мінска. Пасля завяршэння будаўнічых работ, якія працягваліся амаль тры гады, Курган Славы ўяўляў складанае інжынерна-архітэктурнае збудаванне, вышыня якога дасягала 35 метраў. На яго вяршыні былі ўмацаваны чатыры штыкі-абеліскі, якія сімвалізуюць франты — удзельнікі вызвалення Беларусі, яго ніжнюю частку ўпрыгожвалі мазаічныя выявы савецкіх ордэнаў. На аглядную пляцоўку на вяршыні Кургана вядуць дзве лесвіцы[51].

У ліпені 1981 г. адкрыўся яшчэ адзін філіял музея, прысвечаны баявой садружнасці беларускіх, рускіх, латышскіх і літоўскіх партызану пас. Расоны Віцебскай вобласці. У яго аснову былі пакладзены калекцыі існаваўшага ў пасёлку раённага музея народнай славы. Структура філіяла выглядала наступным чынам: першая зала была

прысвечана станаўленню савецкай улады на Расоншчыне, апошняя — кіраўніку Расонскага патрыятычнага падполля П. М. Машэраву, астатнія адзінаццаць залаў раскрывалі падзеі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Акцэнт у экспазіцыі быў зроблены на сумеснай барацьбе народаў СССР супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў[52].

Апошні па часе ў разглядаемы перыяд філіял музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрыўся ў маі 1984 г. у Лоеве Гомельскай вобласці пад назвай Музей бітвы за Дняпро[53]. У снежні 1989 г. расонскі і Лоеўскі філіялы былі пераўтвораны ў самастойныя музеі.

Пік цікавасці публікі да музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прыпаў на 1975 г., калі яго агледзела 533,5 тыс. чалавек (у тым жа годзе найбольш наведваемы філіял музея — Хатынь агледзела I 700 тыс. чалавек). Акрамя стацыянарных экспазіцый, 1970-я - 1980-я гг. былі часам актыўнай выставачнай дзейнасці музея. Дзесяткі тысяч людзей аглядалі выстаўкі музея, якія ў гэтыя гады экраніраваліся ў Польшчы, Нікарагуа, Францыі, Японіі, В'етнаме, Нідэрландах, Югаславіі, Чэхаславакіі, ГДР, ФРГ, Аўстраліі.

У 1975 г. агульная колькасць фондавых калекцый склала 127 255 адзінак захоўвання і працягвала павялічвацца. У фондах музея працавалі сотні даследчыкаў, матэрыялы прадстаўляліся выдавецтвам, кінастудыям, абласным і раённым музеям[54].

За 50 гадоў існавання музея было выдадзена больш 80 пуцевадзіцеляў, альбомаў, буклетаў, каталогаў, метадычных рэкамендацый і інш.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця ў краіне, перагляд вузлавых момантаў савецкай гісторыі, у тым ліку перыяду другой сусветнай вайны, абумовілі з'яўленне ў сакавіку 1988 г. пастановы ЦК КПБ аб абнаўленні экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У адпаведнасці з ёй супрацоўнікі распачалі выпрацоўку новых агульных падыходаў да ацэнкі падзей і фактаў вайны, у тым ліку прычын адступлення ў яе першыя дні, новых крытэрыяў пры разглядзе персаналій, імкнуліся надаць экспазіцыі навуковасць і праўдзівасць, пазбегнуць аднастайнасці ў экспанаванні ўзнагарод і асабістых рэчаў удзельнікаў вайны[55].

Музей абароны Брэсцкай крэпасці таксама адносіўся да найбольш папулярных у рэспубліцы. У 1967-1971 гг. пры ўдзеле аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам вядомага скульптара А. П. Кібальнікава на тэрыторыі крэпасці быў створаны мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой. Скульптурна-архітэктурны ансамбль уключаў ацалелыя збудаванні, закансерваваныя руіны, крапасныя валы і творы сучаснага манументальнага мастацтва

«Смага», «Мужнасць», некропаль, дзе былі пахаваны астанкі 850 чалавек, мемарыяльную пляцоўку гарадоў-герояў. Вастрыню ўспрымання комплексу ўзмацнялі дэкаратыўнае падсвечванне і гукавое афармленне.

Напачатку 1980-х гг. колькасць агледзеўшых мемарыяльны комплекс людзей пераўзышла 800 тыс. ў год, большасць з якіх складалі турысты. Пасля далучэння ў 1969 г. комплексу да музеяў сістэмы Міністэрства культуры ў якасці асноўнага накірунку яго дзейнасці была вызначана работа з масавай аўдыторыяй, пераважна з моладдзю. У крэпасці праходзілі шматлікія тэматычныя вечарыны, урачыстыя зборы, мітынгі, святы, сустрэчы з ветэранамі, урокі, дні пагранічніка, уручэнні камсамольскіх білетаў. Акрамя таго, штогод супрацоўнікі музея стваралі да 10 перасоўных выставак на ваенна-патрыятычную тэматыку[56].

Сярод падзей, паспрыяўшых развіццю іншых музеяў ваенна-гістарычнага профілю, трэба ўзгадаць заканчэнне ў 1980 г. рэстаўрацыі будынка Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава, адкрыццё ў 1982 г. новай экспазіцыі ў Ваўкавыскім ваенна-гістарычным музеі імя П. І. Баграціёна[57]. Важнай вехай ў гісторыі Музея савецка-польскай баявой садружнасці ў в. Леніна было святкаванне 40-годдзя стварэння Войска Польскага ў 1983 г.

У 1972-1977 гг. на месцы былога маёнтка Дзяржынава ў Стаўбцоўскім раёне, дзе нарадзіўся Ф. Э. Дзяржынскі, быў створаны мемарыяльны комплекс, які стаў філіялам Івянецкага гісторыка-рэвалюцыйнага музея[58].

Пастановай бюро ЦК КПБ ад 23 кастрычніка 1973 г. з мэтай атэістычнага выхавання насельніцтва БССР быў заснаваны новы музей гістарычнага профілю — Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі. Першыя крокі па яго стварэнню былі зроблены ў Полацку, калі для новай установы выдзелілі памяшканне ў Сафійскім саборы. Сярод першых паступленняў у музей былі калекцыя ўсходняга дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва другой паловы XIX — пачатку XX ст., вялікая калекцыя абразоў, перададзеная з Брэсцкай мытні, кнігі, гравюры рэлігійнага зместу, стараверскае ліццё.

У 1977 г. было прынята рашэнне аб пераводзе Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі ў Гродна для правядзення атэістычнай прапаганды ў найбольш «веруючым» рэгіёне Беларусі. Музею былі прадстаўлены напаўразбураныя памяшканні базыліянскага кляштара Нараджэння Маці Божай. Адначасова з правядзеннем рэстаўрацыйных работ у кляштары (архітэктар — Г. П. Жаровіна) яго новыя гаспадары разгарнулі актыўную збіральніцкую работу. Атмасферу

энтузіазму, творчага пошуку, захаплення гісторыяй краю падтрымліваў у музеі вядомы беларускі пісьменнік А. Н. Карпюк, запрошаны ў гэты час на пасаду дырэктара.

У 1977-1991 гг. навуковыя супрацоўнікі штогод праводзілі экспедыцыі, адшукваючы на гарышчах сялянскіх хат, пад скляпеннямі зруйнаваных храмаў струхнелыя дошкі, кнігі, начынне. Пастунова ў фонды трапілі ўнікальныя прадметы — помнік дэкаратыўна-прыкладпога мастацтва XII-XIII стст. «Вадаліў», жывапіс XVII-XVIII стст., у тым ліку «Святая сям'я» Гілярыя Хаецкага, «Святая Тэкля» невядомага мастака, слуцкія паясы, старадрукі XVII-XVIII стст. Гэтыя шэдэўры дапамагалі атрыбуціраваць вядомыя беларускія мастацтвазнаўцы Н. Ф. Высоцкая, В. В. Церашчатава, іншыя спецыялісты. З дапамогаю навуковага супрацоўніка Белдзяржмузея БССР Л. Д. Клока была набыта частка бібліятэкі Адама Станкевіча. Высокай якасцю характарызавалася этнаграфічная калекцыя, якая дазволіла правесці шэраг яскравых выстаў, у тым ліку «Семантыка ў беларускай этнаграфіі», «Беларускі ручнік — повязь часоў» і Інга. Значнымі падзеямі ў культурным жыцці Гродна былі выставы «Адрэстаўраваныя помнікі», «Гісторыя кананізацыі святых», «Помнікі меднага ліцця Беларусі». З 1978 па 1991 г. у музеі адкрылася 50 выстаў.

У студзені 1985 г. у базыліянскім кляштары адбылося адкрыццё першай часткі стацыянарнай экспазіцыі, праца над якой працягвалася да канца 1991 г. (мастакі — А. Ступень і С. Кічко). Яе структура выглядала наступным чынам: «Паходжанне рэлігіі і яе раннія формы», «Хрысціянізацыя старажытнай Русі. Веравучэнне і культ праваслаўнай царквы», «Папства. Веравучэнне і культ каталіцкай царквы», «Гісторыя царквы ў Вялікім княстве Літоўскім», «Гісторыя царквы на беларускіх землях у Рэчы Паспалітай», «Гісторыя царквы на беларускіх землях у складзе Расійскай імперыі». Стваральнікі экспазіцыі Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі імкнуліся пазбаўляцца ў сваёй працы ад суб'ектывізму, спрошчаных і негатыўных ацэнак дзейнасці царквы і яе ідэалогіі[59].

У 1991 г. дзейнасць музея спынілася, калі гродзенскія абласныя ўлады прынялі рашэнне аб вяртанні будынка вернікам, не паклапаціўшыся аб тым, каб знайсці для музея які-небудзь іншы.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР адыгрываў вялікую ролю ў культурным жыцці краіны і належаў да найбольш значных музеяў гэтага профілю ў СССР. Яго калекцыі[I], саступаўшыя ў колькасці і якасці толькі зборам вядучых мастацкіх музеяў Масквы і Ленінграда,

---

[I] На 1 студзеня 1989 г. у зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР налічвалася 22 315 адзінак захоўвання.

па свайму складу ўяўлялі значную гісторыка-культурную каштоўнасць і ўключалі шэраг унікальных твораў. Яны выклікалі цікавасць з боку спецыялістаў і шырокай грамадскасці, публікаваліся ў айчыннай і замежнай літаратуры.

Працягвалася планамерная і сістэматычная экспедыцыйная работа па выяўленню, вывучэнню і ахове гісторыка-культурнай спадчыны, у выніку якой значна ўзбагацілася калекцыя старажытнабеларускага мастацтва. З 1946 па 1988 г. музеем было арганізавана 80 навуковых экспедыцый, абследавана 1354 населеныя пункты, дзе выяўлена і прынята на ўлік больш 2 тыс. помнікаў жывапісу, скульптуры, прыкладнога мастацтва, манускрыптаў і старадрукаў. Гэта работа дазволіла зрабіць агульныя высновы пра характар, своеасаблівасці і асноўныя тэндэнцыі развіцця мастацтва Беларусі XII-XVIII стст. Адначасова са збіраннем і вывучэннем экспедыцыйных матэрыялаў былі разгорнуты работы па іх рэстаўрацыі. Для гэтага музеем былі прыцягнуты вядучыя расійскія, а таксама маладыя беларускія мастакі-рэстаўратары А. С. Шпунт, П. Р. Журбей і інш. Імі было выратавана шмат ікон і скульптуры XV-XVIII стст., старажытныя партрэты з Нясвіжа, Гродна, Полацка, Мінска. У 1989 г. у складзе музея пачалі працаваць рэстаўрацыйныя майстэрні з вялікім штатам спецыялістаў розных напрамкаў[60].

Буйнейшай у зборы мастацкага музея па-ранейшаму з'яўлялася калекцыя беларускага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XX ст. Яна фарміравалася дзякуючы планамернаму набыццю твораў беларускіх мастакоў М. Савіцкага, А. Анікейчык, Г. Вашчанкі, В. Грамыкі, Г. Паплаўскага, Л. Шчамялёва, В. Цвіркі, П. Масленікава і інш. на выставах і непасрэдна ў майстэрнях. Да канца 1970-х гг. склалася калекцыя заходнееўрапейскага мастацтва, якая ўключала больш тысячы адзінак. Яна змяшчала творы прадстаўнікоў розных школ, эпох, напрамкаў і храналагічна ахоплівала перыяд XVI-XX стст. Узбагачэнню гэтай калекцыі паспрыяла мінская выстаўка твораў заходнееўрапейскага мастацтва 1965 г., дзе быў закуплены шэраг каштоўных твораў, а таксама карціны, атрыманыя ў дар ад Дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна. Перадача з маскоўскага Музея народаў Усходу калекцыі мастацтва Кітая і Індыі паклала пачатак калекцыі арыенталістыкі. Яе камплектаванне праводзілася ў наступныя гады па шырокай праграме — ад сярэдневяковых бронзавых вырабаў, лакавых мініяцюр і эмаляў да сучаснага жывапісу на шоўку, вышывак і народных друкаваных карцінак[61].

Штогод у музеі праводзілася 30-35 стацыянарных і перасоўных выставак, якія мелі розную гісторыка-культурную каштоўнасць. Да найбольш яскравых поспехаў трэба аднесці выстаўку «Партрэты з Нясвіжа і Гродна XVI-XIX стст.», якая адбылася ў 1982 г. дзякуючы намаганням вядомага беларускага мастацтвазнаўцы Т. А. Карповіч і рэстаўратара Рускага музея ў Ленінградзе А. Б. Брындарава. У яе аснову былі пакладзены рэшткі нясвіжскай партрэтнай галерэі і партрэты сям'і Весялоўскіх, знойдзеныя у 1966 г. у падвале кляштара брыгітак у Гродна. Сапраўднымі падзеямі ў культурным жыцці БССР былі замежныя выстаўкі, якія праводзіліся ў гэты час, — «Мастацтва Галандыі і Фландрыі XVII ст. з Дзяржаўнага Эрмітажа» (1966), «Заходнееўрапейскі жывапіс у зборах ЗША. Са збору А. Хамера» (1973), «Шэдэўры польскага жывапісу XIX — пачатку XX ст. з музеяў Польшчы» (1974), «Скарбы Дрэздэнскай галерэі» (1975), «Кераміка Пікаса» (1981), «Сучаснае мастацтва Канады з калекцыі Файерстоўна. Таронта» (1988). У сваю чаргу, музей даў магчымасць пазнаёміцца з творчасцю беларускіх мастакоў жыхарам больш 50 краін свету, у тым ліку Польшчы, Венгрыі, Аўстрыі, Грэцыі, Італіі і іншых краін.

У сярэднім экспазіцыю мастацкага музея аглядала больш за 200 тыс. чалавек у год. У якасці найбольш важнай і перспектыўнай часткі яго аўдыторыі была вызначана моладзь. Асноўным напрамкам работы з ёю было эстэтычнае выхаванне — лекторый выхаднога дня, музычныя вечарыны, гурток юных аматараў мастацтва, універсітэты культуры па папулярызацыі мастацкіх ведаў. У плане іх работы былі не толькі заняткі ў музеі, але і сустрэчы з мастакамі, наведванне выставак, экскурсіі ў іншыя гарады і да гісторыка-культурных помнікаў. Лібералізацыя ўмоў гаспадарання напрыканцы разглядаемага перыяду дазволіла кіраўніцтву музея выкарыстоўваць эксперыментальныя формы работы, у прыватнасці, выстаўкі-аўкцыёны[62].

Вялікая работа праводзілася супрацоўнікамі музея па аказанню метадычнай, арганізацыйнай і тэхнічнай дапамогі па стварэнню мастацкіх экспазіцый у іншых музеях рэспублікі. Падобныя экспазіцыі паўсталі ў зембінскім музеі, на радзіме Н. Лежэ-Хадасевіч, у Магілёўскай карціннай галерэі і некаторых іншых.

У 1970-х — пачатку 1980-х гг. у музеі значна актывізаваліся работы па публікацыі фондавых калекцый шляхам выдання навуковых каталогаў[I]. У выніку вялікай пошукавай работы, работы па

[I] Вось няпоўны пералік каталогаў, падрыхтаваных і выдадзеных супрацоўнікамі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: «В. К. Бялыніцкі-Біруля», 1973; «Русская н советская скульптура», 1977; «Белорусская советская скульптура», 1978; «Беларускі савецкі жывапіс», 1978; «Беларускія народныя тканіны», 1979; «Другое нараджэнне партрэтаў з

рэстаўрацыі і вывучэнню помнікаў выйшлі з друку тры альбомы — «Жывапіс Беларусі XII-XVIII стст.», «Пластыка Беларусі XII-XVIII стст.», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII-XVIII стст.» (аўтар-укладальнік Н. Ф. Высоцкая).

Адной з асаблівасцей работы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР было стварэнне сеткі філіялаў і аддзелаў у розных рэгіёнах рэспублікі. Гэта работа праходзіла пад кіраўніцтвам мастака-графіка і мастацтвазнаўцы Ю. А. Карачуна, які ўзначальваў музей на працягу дваццаці гадоў, пачынаючы з 1977 г. Высокаадукаваны, творчы чалавек, Ю. А. Карачун імкнуўся да таго, каб мастацкі музей стаў сапраўдным цэнтрам зберажэння і развіцця нацыянальнай культуры, а яго дзейнасць ахоплівала ўсю Беларусь. У гэтай справе ён знайшоў аднадумцаў у асобе загадчыцы аддзела старажытнабеларускага мастацтва Н. Ф. Высоцкай, загадчыка аддзела навукова-асветніцкай работы Г. І. Караля, намесніка дырэктара па навуковай рабоце І. М. Паньшынай, загадчыцы аддзела дарэвалюцыйнага рускага і савецкага мастацтва А. К. Рэсінай, галоўнага захавальніка А. І. Сакалова і інш.

З 1978 г. філіялам музея стала карцінная галерэя ў в. Гурыны Мазырскага раёна, адкрытая ў 1976 г. як музей на грамадскіх пачатках. У яе сямі залах было прадстаўлена каля 200 твораў сучаснага беларускага мастацтва. З 1979 г. з асаблівасцямі народнага мастацтва Беларусі знаёміў яшчэ адзін філіял — музей беларускай пароднай творчасці ў Раўбічах. Больш 100 твораў В. Бялыніцкага-Бірулі, якія адлюстроўвалі творчы шлях славутага мастака, дэманстраваліся ў магілёўскім філіяле Дзяржаўнага мастацкага музея, адкрытым у 1982 г. Акрамя карцін, у мастацкім музеі В. Бялыніцкага-Бірулі ў спецыяльных мемарыяльных залах можна было пазнаёміцца з жыццёвым шляхам мастака. У 1983 г. філіяламі мастацкага музея стаў Гальшанскі замак, з 1984 г. сядзібны дом Ваньковічаў у Мінску, а з 1987 г. Мірскі замак. Вяліся таксама работы на Лошыцкай сядзібе ў Мінску.

У 1988 г. у Магілёве ў будынку былога Пазямельна-сялянскага банку адкрылася карцінная галерэя (пазней — Магілёўскі абласны мастацкі музей). У першыя гады існавання ў яе залах праводзіліся пераважна часовыя выстаўкі з фондаў розных музеяў, персанальныя выстаўкі мастакоў. У наступным годзе ў Брэсце адкрыўся яшчэ адзін музей мастацкага профілю, аснову фондаў якога склалі мастацкія

---

Нясвіжа і Гродна», 1981; «Руская дарэвалюцыйная і савецкая гравюра і літаграфія ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР», 1984.

каштоўнасці, канфіскаваныя брэсцкімі мытнікамі. У дзень адкрыцця Музея выратаваных каштоўнасцей колькасць жадаючых агледзець яго экспазіцыю пераўзышла тэхнічныя магчымасці. Тыя, хто здолелі патрапіць на адкрыццё, ўбачылі абразы XVI-XIX стст., заходнееўрапейскі і рускі жывапіс XVII-XIX стст, клады, калекцыю рускіх самавараў, мэблю, фарфор, зброю[63].

Адной з важных праяў дэмакратызацыі культурнага жыцця БССР другой паловы 1980-х гг. было развіццё міжнароднага супрацоўніцтва музеяў. У кастрычніку 1990 г. пасля рэканструкцыі адбылося ўрачастае адкрыццё ў Навагрудку мемарыяльнага музея-сядзібы А. Міцкевіча. Рэканструкцыя праводзілася польскай будаўнічай фірмай «Будзімэкс» на беларускія сродкі ў рамках пагаднення аб супрацоўніцтве, падпісаным паміж Домам-музеем А. Міцкевіча ў Навагрудку і Літаратурным музеем А. Міцкевіча ў Варшаве. Крыху больш за год спатрэбілася спецыялістам «Будзімэкса», каб правесці рэстаўрацыю сядзібы паэта. У першапачатковым выглядзе быў узноўлены дом і флігель, звязаныя лёхам, свіран, калодзеж, альтанка. Пакоі дома (дзіцячы, маці, кабінет бацькі, сталовая) набылі мемарыяльны характар. Літаратурная экспазіцыя, якая раней займала дом, пераехала ў флігель. Галоўным праекціроўшчыкам рэканструкцыі сядзібы паэта быў беластоцкі архітэктар М. Балаш, афармленнем экспазіцыі займаўся мінскі мастак В. Філімонаў. Рэстаўрацыі папярэднічала вялікая даследчыцкая работа, праведзеная беларускімі і польскімі музеёлагамі, архітэктарамі, краязнаўцамі. У далейшыя планы дырэктара музея-сядзібы Л. У. Усенка ўваходзіла стварэнне літаратурна-мемарыяльнага ансамбля да 200-х угодкаў нараджэння А. Міцкевіча на базе яго сядзібы[64].

Экспазіцыя літаратурнага музея Я. Купалы, спраектаваная ў 1960 г., праіснавала амаль без змен да пачатку 1970-х гг. Між тым, гэта дзесяцігоддзе было часам важных знаходак навуковых супрацоўнікаў музея, якія дазвалялі па-новаму распавесці пра жыццё, літаратурную і грамадскую дзейнасць паэта, шырэй паказаць яго паэтычнае асяроддзе. У 1973 г. была створана творчая група па распрацоўцы новага тэматыка-экспазіцыйнага плана, якую ўзначаліла загадчыца экспазіцыйнага аддзела Ж. К. Дапкюнас. Мастацкі бок праекта выконвала група мінскіх мастакоў на чале з Э. Агуновічам. Новая экспазіцыя была арганізавана па тэматыка-храналагічнаму прынцыпу, асноўная ўвага ў ёй надавалася савецкаму перыяду жыцця Я. Купалы. У дванаццаці залах была прадстаўлена вялікая колькасць твораў мастацтва, якія адлюстроўвалі старонкі жыцця паэта. Быў узноўлены мемарыяльны інтэр'ер — кабінет Янкі Купалы.

Урачыстае адкрыццё новай экспазіцыі адбылося 15 мая 1976 г. Яна праіснавала да канца разглядаемага перыяду і атрымала вялікую колькасць станоўчых водгукаў дзякуючы сур'ёзнай навуковай распрацоўцы і ўдалым дызайнерскім знаходкам[65].

У 1972 г. на радзіме Я. Купалы на аснове філіяла музея быў заснаваны мемарыяльны запаведнік «Вязынка», абмежаваны пэўнай тэрыторыяй з адметным культурным краявідам — гарадзішчам II-IV стст. н. э., хаткай дваровых, помнікам паэту работы З. Азгура, дубовым гаем, пасаджаным беларускімі пісьменнікамі, малымі архітэктурнымі формамі[66]. Праз шэсць гадоў падобны мемарыяльны запаведнік паўстаў на аснове другога філіяла купалаўскага музея ў Л яўках[67]. А ў 1989 г. было прынята рашэнне аб стварэнні новага філіяла на месцы былога фальварка Акопы на Лагойшчыне.

Мемарыяльныя запаведнікі, якія паказвалі пэўныя перыяды жыцця песняра, сталі месцам правядзення купалаўскіх святаў паэзіі, злётаў моладзі, іншых тэматычных мерапрыемстваў. Пік гэтай дзейнасці прыпаў на 1982 г., калі святкавалася 100-годдзе з дня нараджэння Я. Купалы. У той юбілейны год мінскую экспазіцыю разам з філіяламі наведала каля 200 тыс. чалавек.

У 1982 г. да 100-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі ў Мінску, прысвечаным яго памяці, адкрылася новая экспазіцыя. Аўтарамі яе мастацкага вырашэння былі мастакі Э. Агуновіч і Ф. Ладуцька. На першым паверсе ў чатырох залах размясцілася біяграфічная экспазіцыя, якая распавядала аб дзяцінстве, працы настаўнікам, службе ў войску, росквіце таленту Я. Коласа. На другім паверсе знаходзілася мемарыяльная частка экспазіцыі, якая ўключала гасцёўню, сталовую, фрагмент рабочага кабінета. Эмацыянальнай дамінантай мемарыяльнай часткі экспазіцыі з'яўляўся ліст, недапісаны паэтам і датаваны днём яго смерці. Судзячы па шматлікіх водгуках наведвальнікаў, аўтары экспазіцыі здолелі перадаць цеплыню і атмасферу добразычлівасці, што панавала ў каласавым доме[68].

У 1987 г. з мэтай аптымізацыі дзейнасці літаратурных музеяў было створана Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў БССР. Згодна са статутам, гэта было «галоўнае сховішча гісторыка-літаратурных каштоўнасцей рэспубліканскага значэння», у аснову дзейнасці якога пакладзена адзіная сістэма кіравання, каардынацыя усіх накірункаў работы на месцах. Першапачаткова ў склад аб'яднання ўвайшлі нанова створаны Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурны музей Я. Купалы з філіяламі — мемарыяльнымі запаведнікамі «Вязынка» і «Ляўкі», Літаратурны музей

Я. Коласа з філіялам — коласаўскім мемарыяльным запаведнікам у Стаўбцоўскім раёне, Літаратурны музей П. Броўкі з філіялам — хатай-музеем у в. Пуцілкавічы Ушацкага раёна і Літаратурны музей М. Багдановіча. У 1988 г. кіраўніцтва аб'яднання распачало работы па мемарыялізацыі апошняга месца жыцця пачынальніка беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча ў в. Кушляны Смаргонскага раёна, якое дагэтуль захоўваў вялікі знаўца жыцця і творчасці паэта М. С. Ляпеха[I]. Практыка работы аб'яднання прадэманстравала неэфектыўнасць палітыкі цэнтралізацыі і праз непрацяглы час яно спыніла свае існаванне[69].

Разглядаемы перыяд быў часам стварэння ў БССР музеяў-запаведнікаў — новага тыпу музейных установ, якія сфарміраваліся на аснове нерухомых помнікаў с захаваннем або ўзнаўленнем гісторыка-культурнага асяроддзя. Першы ў рэспубліцы музей-запаведнік паўстаў у найстарадаўнім горадзе на беларускіх землях — Полацку. Выбар месца яго стварэння быў абумоўлены гісторыка-культурнай значнасцю захаваўшыхся ў горадзе помнікаў, а таксама звязаных з імі падзей. Адкрыццю запаведніка папярэднічала вывучэнне археалагічнага матэрыялу, назапашанага ў выніку даследаванняў старажытнага Полацка, якія ў розныя гады праводзілі вядомыя вучоныя А. М. Ляўданскі, А. Р. Мітрафанаў, Л. В. Аляксееў, М. К. Каргер, Г. В. Штыхаў, В. А. і Вас. А. Булкіны.

Архітэктурна-археалагічны запаведнік у Полацку быў заснаваны ў верасні 1967 г. на тэрыторыі плошчай у 31,3 га і першапачаткова ўключаў у сябе тэрыторыю Ніжняга і Верхняга замка, а таксама Сафійскі сабор. Заснаванне запаведніка стварыла ўмовы не толькі для даследавання, але і для рэстаўрацыі і музейнага выкарыстання архітэктурных помнікаў. Гэтыя работы атрымалі далейшы імпульс пасля таго, як у сакавіку 1971 г. запаведніку (перайменаванаму ў гісторыка-археалагічны) былі перададзены памяшканні ў Сафійскім саборы для захавання калекцый і работы невялікага навуковага калектыву пад кіраўніцтвам І. А. Мацюшкіна. Наступнай важнай датай ў гісторыі Полацкага гісторыка-археалагічнага запаведніка з'яўляецца чэрвень 1985 г., калі яму былі перададзены ўсе помнікі археалогіі, гісторыі і культуры, а таксама музеі горада.

[I] Ляпеха Міхал Сымонавіч (1903-1992) парадзіўся ў в. Базары Ашмянскага раёна, атрымаў пачатковую адукацыю ў польскаай школе. З 1945 г. працаваў майстрам па выкапцы вапны ў Смаргонскім раёне. Высветліў месцазнаходжанне сядзібнага дома Ф. Багушэвіча ў в. Кушляны, арганізаваў яго выкарыстанне ў якасці бібліятэкі, з 1951 г. яе вартаўнік. На аматарскіх пачатках на працягу амаль сарака гадоў праводзіў рамонтна-рэстаўрацыйныя і ахоўныя работы, збіраў матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменніка, стварыў мемарыяльную экспазіцыю, арганізаваў экскурсійны агляд сядзібнага комплекса.

Пасля ўзбуйнення структура запаведніка набыла наступны выгляд. Да нерухомых помнікаў адносіліся: паселішча 1-га тысячагоддзя да н. э. у гістарычным раёне Запалоцце, селішча і гарадзішча VII—VIII стст., Спаса-Прэабражэнская царква з фрэскамі, фундаменты храма-пахавальні XII ст., комплекс Бельчыцкага Барыса-Глебскага манастыра, Верхні замак з Сафійскім саборам XI-XVIII стст., Ніжні замак з валам Івана Грознага XVI ст., Домік Пятра I XVII ст., Богаяўленскі сабор і жылы будынак XVIII ст., Чырвоны мост XIX ст., Крыжаўзвіжанская царква XIX-XX стст, Лютэранская кірха XX ст., рэшткі езуіцкага калегіума.

Фонд рухомых помнікаў запаведніка быў размеркаваны паміж наступнымі музеямі. У старэйшым з іх — краязнаўчым — пасля правядзення ў 1968 г. рээкспазіцыі меліся тры раздзелы. Першы з іх быў прысвечаны гісторыі Полаччыны дасавецкага перыяду, другі — гісторыі савецкага грамадства, трэці — прыродзе краю. Найбольш важныя ў навуковых адносінах матэрыялы змяшчаліся ў першым раздзеле, у тым ліку вырабы з крэменю, косці, скуры, кераміка, нумізматычная калекцыя, старажытная зброя, адзенне. Этнаграфічны матэрыял быў прадстаўлены комплексам «Куток сялянскай хаты канца XIX — пачатку XX ст.», вырабамі ткацтва, ганчарства, узорамі пляцення і дрэваапрацоўкі.

Часткай запаведніка з'яўляўся таксама заснаваны ў 1971 г. Музей баявой славы, у пяці залах якога паказвалася гісторыя Полаччыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У 1981 г. у Богаяўленскім саборы было адкрыта яшчэ адно структурнае падраздзяленне Полацкага запаведніка — Карцінная галерэя. Гэтай падзеі папярэднічалі рэстаўрацыя будынка і прыстасаванне памяшканняў пад выставачныя залы, што працягвалася 8 гадоў. Падчас адкрыцця ў фондах Карціннай галерэі змяшчалася каля 2 тыс. твораў жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у тым ліку В. Бялыніцкага-Бірулі, Г. Вашчанкі, А. Кашкурэвіча, А. Марачкіна, Г. Паплаўскага, М. Савіцкага, У. Стальмашонка, Н. Шчаснай.

Наступны па часе музей, які адыгрываў у запаведніку дамінантную ролю, адкрыўся ў 1987 г. у Сафійскім саборы і быў прысвечаны яго гісторыі і архітэктуры. Экспазіцыя Музея гісторыі і архітэктуры Сафійскага сабора размяшчалася ў двух залах і ахоплівала храналагічны перыяд з сярэдзіны XI ст. да нашых дзён. Сярод іншага ў ёй дэманстраваліся пліткі падлогі XI ст., фрагменты фрэскавага роспісу, рэчы з пахаванняў XIII-XVI стст., віслая пячатка кіеўскага князя Усевалада (Андрэя) XI ст., вапнавы камень з імёнамі

сведкаў будаўніцтва сабора ў XI ст., найбольш цікавыя плінфы са знакамі і надпісамі. Арганічнай часткай экспазіцыі з'яўляліся фрагменты сцен сабора, якія паказвалі ход рэстаўрацыйных работ у 1969-1983 гг. Акрамя музея ў Сафійскім саборы з 1985 г. дзейнічае арганная канцэртная зала.

Самы маленькі музей у складзе запаведніка — Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанка адкрыўся таксама ў 1987 г. у кватэры, дзе прайшлі апошнія гады знакамітай палачанкі.

У 1990 г. у будынку былой брацкай школы пачаў дзейнічаць Музей беларускага кнігадрукавання, у чатырнаццаці залах якога экспанаты былі згрупаваны па наступных раздзелах: развіццё пісьменства, форм і матэрыялаў кнігі; рукапісная кніга на беларускіх землях; жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны; Скарыніяна; кнігадрукаванне другой паловы XVI-XVIII ст., XIX — пачатку XX ст.; гісторыя кніжнай ілюстрацыі; тыны і віды друкаванай прадукцыі; развіццё паліграфіі. Сярод помнікаў пісьменнасці, што дэманстраваліся ў экспазіцыі, вылучаліся прасліцы, фрагменты керамікі, плінфы, тынкоўкі з надпісамі XI-XIII ст., кірылічныя і лацінскія выданні XVI — пачатку XX ст., выданні заходнееўрапейскіх друкарняў XVI-XIX стст., фрагмент Торы XVIII ст., выданні беларускіх друкарняў пачатку XX ст., сучасныя выданні — лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Акрамя таго, былі прадстаўлены інтэр'еры майстэрні перапісчыка XVI ст. і друкарні XVII ст., прылады працы мастакоўграфікаў, друкарскае і паліграфічнае абсталяванне, а таксама слайды і відэафільмы, звязаныя з працэсам кнігадрукавання.

Напачатку 1990-х гг. агульная колькасць калекцый у фондах Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка наблізілася да 40 тыс. Сярод іх найвялікшае навукова-культурнае значэнне мелі скарб арабскіх куфіцкіх дырхемаў, знойдзены ў в. Казьянкі, свінцовая віслая пячатка XI ст., віты залаты пярсцёнак XI ст., залатыя скроневыя кольцы паўднёвага тыпу XII ст., каменны абразок «Канстанцін і Алена» XII ст. і інш.

У ліпені 1990 г. у адпаведнасці з рашэннем Савета Міністраў БССР Полацкі гісторыка-культурны запаведнік атрымаў статус установы рэспубліканскага значэння з вызначанымі мэтамі і задачамі, рэжымам утрымання помнікаў і зонамі яго аховы[70].

Прыклад новых адносін да музейнай дзейнасці, пераасэнсавання яе тэарэтычных асноў даў напрыканцы 1980-х -1990-х гг. гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе». Як і ў Полацку, гэты запаведнік быў створаны на аснове існаваўшага з 1967 г. заслаўскага

архітэктурна-археалагічнага запаведніка, у склад якога ўваходзілі гарадзішча «Замэчак» X ст., курганныя могільнікі X-XI стст., гарадзішча «Вал» XVI ст., кальвінскі збор XVI ст. (Спаса-Прэабражэнская царква). Рашэнне Савета Міністраў БССР, прынятае ў 1986 г., дазволіла ўключыць у склад запаведніка некаторыя іншыя помнікі — касцёл Св. Марыі XVIII ст., рэшткі палацавага комплексу XIX ст., вуліцы сярэдневяковага горада, а таксама навакольныя маляўнічыя краявіды[71]. Рэалізацыя дадзенага рашэння адбывалася на фоне крызісу таталітарнай ідэалогіі, дэмакратызацыі грамадскага жыцця, працэсу адраджэння беларускай культуры. Усё гэта, памножанае на ап'яняльную атмасферу галоснасці, вызначыла склад і характар дзейнасці сфарміраванага ў 1988 г. творчага калектыву запаведніка на чале з А. М. Калбаска і рэалізацыі шэрагу ідэй новай музеялогіі[I].

У 1989 г. супрацоўнікамі была распрацавана і прынята канцэпцыя запаведніка, у падмурак якой пакладзены прынцыпы непарыўнай узаемасувязі самасвядомасці народа і яго культуры, экалагічны падыход да месца і ролі чалавека ў прыродзе і грамадстве. Горад у канцэпцыі разглядаўся як культурная экасістэма, у якой культурныя і прыродныя кампаненты звязаны паміж сабой прынцыпамі самазахавання і самаабнаўлення. Быў праведзены аналіз стану помнікаў ў Заслаўі, акрэслены напрамкі дзейнасці, арганізацыйная структура запаведніка, этапы яго развіцця. Адначасова быў распачаты збор прадметаў музейнага значэння як у ваколіцах Заслаўя, так і далёка за яго межамі. Сабраныя помнікі рэгістраваліся з дапамогай першай у Беларусі праграмы «Камп'ютэрызацыя фондаў», распрацаванай сумесна з Мінскім радыётэхнічным інстытутам у 1991 г.

З мэтай аб'яднання прыхільнікаў ідэй новай музеялогіі кіраўніцтва заслаўскага запаведніка арганізавала на пачатку 1990 г. правядзенне канферэнцыі, у якой удзельнічалі прадстаўнікі музеяў-запаведнікаў з Архангельска, Кемерава, Ноўгарада, Львова, Румшышкес, Таліна. Удзельнікі канферэнцыі, падсумаваўшы вопыт зробленага на месцах, прынялі дэкларацыю, у якой абвясцілі аб сваім далучэнні да міжнароднага руху «За новую музеялогію».

Чарговым крокам на шляху развіцця запаведніка стала пастанова Савета Міністраў БССР ад 19 верасня 1990 г. «Аб гісторыка-культурным запаведніку «Заслаўе»[72], якою зацвярджаўся статус

---

[I] Новая музеялогія — новы напрамак у развіцці музейнай тэорыі і практыкі, а таксама міжнародны рух, звязаны з пошукамі шляхоў абнаўлення і дэмакратызацыі музеяў, пераасэнсавання іх ролі ў сучасным грамадстве. Ідэі новай музеялогіі абапіраюцца на выніку эксперыментаў новых музейных устаноў — экамузеяў, якія ўзніклі ў Францыі на пачатку 1970-х гг. Тэарэтычнае абгрунтаванне экамузея было ўпершыню зроблена Ж. А. Рыўерам, які выкарыстаў скандынаўскую мадэль музея пад адкрытым небам з адным адрозненнем будынкі павінны былі заставацца ў іх арыгінальным кантэксце, без перасоўвання ў спецыяльна адведзенае месца.

запаведніка, фіксаваліся межы яго ахоўнай зоны і межы зон рэгулявання забудовы ахоўваемага прыроднага ланшафту. Неўзабаве пасля вызначэння заканадаўчых і тэарэтычных асноў сваёй дзейнасці супрацоўнікі запаведніка распачалі практычныя захады па захаванню помнікаў у кантэксце іх культурнага і прыроднага асяроддзя. Першым быў створаны этнаграфічны комплекс «Млын», які складаўся з дзеючага млына, хаты завознікаў і свірайа. Па суседству ад комплексу «Млын» быў адкрыты жывы музей «Кузня», а таксама ганчарная майстэрня. У выставачным комплексе запаведніка напачатку 1990-х гг. жыхары Заслаўя і турысты пазнаёміліся з першымі традыцыйнымі музейнымі экспазіцыямі: музычных інструментаў «Музыка вячорак», маляваных дыванкоў «Алена Кіш. Паміж двух сусветаў», і «Мара аб Заслаўі», якія давалі прыклад нетрадыцыйнай, мастацка-вобразнай інтэрпрэтацыі тысячагадовай гісторыі горада. Трэба адзначыць, што гэтыя музейныя праекты ажыццявіліся дзякуючы не толькі энтузіязму супрацоўнікаў, але і дазволу дзяржавы (з 1990 па 1993 г.) дзейнічаць па мадэлі «новых умоў гаспадарання», г. зн. самастойна размяркоўваць бюджэтныя сродкі.

Адукацыйна-асветніцкая дзейнасць экамузея накіравана перш за ўсё на насельніцтва мясцовасці, у якой ён існуе. Менавіта ў выніку супрацоўніцтва і дыялогу паміж экамузеем і насельніцтвам узнікае узаемапаразуменне і павага. У Заслаўі працэс пошукаў кантактаў запаведніка з мясцовым насельніцтвам адбываўся хваравіта і няпроста. Гэты працэс абцяжарвалі размытасць абшчыннай псіхалогіі, моцны ўціск суседняга мегаполіса, няпэўнасць нацыянальна-гістарычнай самаідэнтыфікацыі ў мясцовага насельніцтва. Першапачаткова мясцовыя жыхары ставіліся да намаганняў па стварэнню запаведніка як гледачы своеасаблівага этнаграфічнага шоу. Разуменню імі сэнсу дзейнасці запаведніка паспрыялі такія акцыі, як экалагічны мітынг, арганізаваны ў 1989 г., рэгулярнае правядзенне фальклорных святаў, вяртанне гістарычных назваў вуліцам Заслаўя, музейна-педагагічныя заняткі з вучнёўскай моладдзю горада, удзел у гарадскім радыёэфіры[73].

У XX ст. у розных краінах свету распаўсюдзілася нетрадыцыйная форма захавання, вывучэння і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў выглядзе музеяў пад адкрытым небам, або «скансэнаў»[I]. Узнікненне музеяў гэтага тыпу было рэакцыяй грамадства на нівеліроўку жыцця і пагрозу страты рэшткаў

---

[I] Скансэн (літаральна: востраў акопаў, тэрыторыя, на якой захаваліся рэшткі фартыфікацыйных збудаванняў) — назва першага музея пад адкрытым небам, адкрытага А. Хазеліусам у 1891 г. у Стакгольме на востраве Дьюргардэн.

традыцыйных, народных культур у выніку індустрыялізацыі. Падобныя працэсы, першапачаткова заўважаныя ў краінах заходняй і паўночнай Еўропы на мяжы XIX і XX стст., назіраліся ў рэспубліках СССР, у тым ліку і ў БССР у 1930-я - 1940-я гг. і былі выкліканы дзяржаўнай палітыкай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя змяніла вонкавы выгляд, памеры, планіроўку традыцыйнага сялянскага жыцця, а таксама побытавы сусвет беларуса. Узнікла рэальная пагроза страты рэштак архітэктурнай і этнаграфічнай спадчыны, якая ацалела ў віхуры сусветных войнаў і сацыяльна-эканамічных трансфармацый.

Першым на Беларусі ідэю стварэння музея драўлянага дойлідства выказаў у 1908 г. вядомы мастак Ф. Рушчыц[74]. Але грамадская патрэба ў падобным музеі наспела ў канцы 1950-х — пачатку 1960-х гг., калі ў беларускім друку з'яўляюцца прапановы і канцэпцыі стварэння ўласнага скансэна. Адны бачылі яго музеем народнага побыту, другія — этнаграфічным, трэція прапаноўвалі адразу ж арганізоўваць нацыянальны парк. Сыходзіліся аўтары прапаноў у галоўным - неабходнасці тэрмінова дзейнічаць[75]. Афіцыйнае рашэнне аб стварэнні падобнага музея ў БССР было прынята Саветам Міністраў рэспублікі ў снежні 1976 г. У яго пастанове тып будучай установы быў вызначаны як музей народнага дойлідства і побыту, што ўключала ў сферу камплектавання яго калекцый амаль усе помнікі матэрыяльнай культуры беларускага народа, пачынаючы з жылых і гаспадарчых пабудоў і канчаючы дзіцячаю цацкаю.

Для музея была адведзена тэрыторыя ў 12-ці км на паўднёвы захад ад Мінска, каля вярхоўя Воўкавічскага вадасховішча на р. Пціч, паблізу аўтадарогі Брэст-Мінск. Была сфарміравана рабочая група па стварэнню музея, якую ўзначаліў архітэктар С. А. Сергачоў. Згодна з генпланам тэрыторыя музея павінна была займаць 250 га дзеля паказу ўсёй Беларусі з яе помнікамі драўлянага дойлідства і падзялялася на экспазіцыйную, запаведную і ахоўную зоны. Экспазіцыйная зона складалася з сектараў, прысвечаных матэрыяльнай і мастацкай культуры асноўных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Паазер'е, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе), сектараў «Мястэчка», лясных промыслаў і унікальных помнікаў (прыстань з экспазіцыяй суднаходства, паромам, нізкаводнымі спайнымі мастамі, вадзяным млынам). Акрамя таго, у экспазіцыйнай зоне прадугледжваўся паказ рэгіянальных асаблівасцей земляробства, садаводства і агародніцтва, лясной гаспадаркі. Запаведная зона аб'яднала курганныя могільнікі, гарадзішча на Менцы, фальварак і в. Строчыца. Ахоўныя зоны былі прызначаны

зберагаць экалогію і краявід, а таксама помнікі археалогіі і архітэктуры ў навакольных паселішчах.

Першы праект, распрацаваны ў 1979 г. БелНДІП горадабудаўніцтва, прадугледжваў, што Беларускі дзяржаўны музей народнага дойлідства і побыту, дзякуючы блізкасці значных гістарычных помнікаў (Заслаўе, Прылукі), будзе ўключаны ў перспектыўны турыстычны маршрут «Старажытнае кальцо горада Мінска». Вызначаная ў ім канцэпцыя і многія параметры музея аказаліся дакладнымі і не страцілі актуальнасці да сённяшняга дня. Разам з тым, у праекце ўвасобіліся валюнтарысцкія, бездухоўныя адносіны да краявіду і жывога асяроддзя. Будаўніцтва рабілася самамэтаю, імкненнем стварыць грандыёзнае відовішча з помнікаў, акаляючых пагоркі Пцічы. Толькі гэтым можна патлумачыць той факт, што тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне праекта прадугледжвала знос вёскі Строчыца і стварэнне на яе месцы рэкрэацыйнага комплексу з грамадскімі цэнтрамі, рэстаранамі, відовішчнай пляцоўкай. Прапанаваны знос вёскі і змена краявіду сталі камнем сутыкнення, які замарудзіў распрацоўку праекта на гады[76].

Сітуацыя змянілася ў другой палове 1980-х гг., калі пераасэнсаванне феномену скансэна ў музеялогіі супала са зменамі сацыяльна-палітычнага клімату ў СССР. Пашыралася разуменне адзінства экалогіі асяроддзя і экалогіі культуры, павышэння ролі духоўных фактараў у адносінах да сістэмы чалавек — асяроддзе. Стала відавочна, што ў сучасных умовах ёсць усе магчымасці захавання помнікаў ва ўласным асяроддзі.

Лёс музея народнага дойлідства і побыту зрабіўся прадметам грамадскага абмеркавання. Нарэшце ў 1988 г. Беларускім рэстаўрацыйна-праектным інстытутам быў распрацаваны генеральны план музея, які грунтаваўся на канцэпцыі стварэння нацыянальнага архітэктурна-этнаграфічнага парка-запаведніка. У ім вызначаліся асаблівасці тэрыторыі і наяўнасць на ёй гістарычных помнікаў (гарадзішча на Менцы, курганы-валатоўкі IX-XI стст., старажытная в. Строчыцы з традыцыйнай структурай). Разнастайнасць рэльефу давала магчымасць выкарыстоўваць натуральныя фрагменты прыродна-геаграфічнага асяроддзя, адпаведныя ўсім этнаграфічным рэгіёнам Беларусі[77].

Адначасова з праектнымі баталіямі супрацоўнікі рабочай групы праводзілі экспедыцыйнае абследаванне Беларусі. На працягу дзесяцігоддзя было выяўлена некалькі соцень помнікаў народнага дойлідства, з якіх каля 30 перавезлі на тэрыторыю музея. Акрамя таго, было сабрана каля 12 тыс. рухомых помнікаў, першы з якіх,

дзіцячая калыска XIX ст., меў сімвалічны сэнс. Усе рухомыя помнікі былі згрупаваны ў 24 тэматычныя калекцыі — абразоў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, жывапісу, старадрукаў, ткацтва і вышыўкі, строяў, пляцення, керамікі і інш.[78]

У 1987 г. адбылося адкрыццё для наведвальнікаў сектара «Цэнтральная Беларусь» Беларускага дзяржаўнага музея народнага дойлідства і побыту. У ім дэманстраваўся фрагмент вёскі XIX — пачатку XX ст. з вулічнай планіроўкай. Кампазіцыйны цэнтр утваралі будынкі царквы XVIII ст. і грамадскага свірна першай паловы XIX ст. На прыкладзе сялянскіх двароў пачатку XX ст. былі паказаны эвалюцыя двара пагоннага тыпу. У інтэр'ерах гэтых будынкаў праз ансамблевыя і сістэматычныя экспазіцыі прасочваліся асаблівасці побыту насельніцтва Цэнтральнай Беларусі. У кузні экспанаваліся прылады працы і кавальскія вырабы. Экспазіцыю сектара дапаўняў вятрак-казлоўка, некалькі сялянскіх сядзіб і ветраны млын. Астатнія сектары экспазіцыйнай зоны музея з-за недахопу сродкаў знаходзіліся ў стане праектавання.

Уяўленне аб выглядзе музейнай сеткі (без уліку філіялаў) сістэмы Міністэрства культуры БССР на 1 студзеня 1985 г. дае Табліца 4[79]:

Сярод ведамасных музеяў БССР высокім навуковым узроўнем дзейнасці па-ранейшаму вылучаліся музеі Акадэміі навук.

Табліца 4

| **Вобласць** | **Колькасць музеяў** | **Колькасць прадметаў асноўнага фонду** | **Колькасць наведвальнікаў (тыс. чал.)** | **Колькасць праведзеных выставак** | **Колькасць музейных супрацоўнікаў** |
|---|---|---|---|---|---|
| Брэсцкая | 6 | 179 219 | 792,2 | 59 | 108 |
| Віцебская | 13 | 182 348 | 338,9 | 153 | 135 |
| Гомельская | 9 | 175 402 | 282,2 | 105 | 106 |
| Гродзенская | 11 | 206 199 | 420,1 | 75 | 96 |
| Магілёўская | 10 | 145 159 | 206,0 | 42 | 123 |
| Мінская | 14 | 106 707 | 202,1 | 140 | 103 |
| г. Мінск | 8 | 391 666 | 1 113,6 | 188 | 495 |
| Усяго | 74 | 1 470 253 | 3 355,1 | 256 | 1 361 |

Вельмі важны ў навуковых і культурных адносінах акадэмічны галіновы музей быў заснаваны рашэннем Прызідыума Акадэміі навук 7 ліпеня 1977 г. і з'явіўся вынікам сумесных намаганняў супра-

цоўнікаў двух акадэмічных устаноў — Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Інстытута фізікі. Вытокі музея звязаны са стварэннем напрыканцы 1960-х гг. па ініцыятыве навуковага супрацоўніка Інстытута фізікі Ю. В. Хадыкі клуба аматараў старажытнабеларускага мастацтва. Першапачаткова ў склад клуба ўваходзілі зацікаўленыя мастацтвам вучоныя-фізікі. Адзіным прафесіянальным мастацтвазнаўцам сярод іх была супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР Э. І. Вецер. Хутка ў клубе з'явіліся новыя члены, людзі розных прафесій, ахопленыя жаданнем вывучаць старажытнае беларускае мастацтва. На свае семінары члены клуба запрашалі буйнейшых у рэспубліцы спецыялістаў — гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, архітэктараў, рэстаўратараў. На працягу дзесяці гадоў, што праіснаваў клуб, яго членамі было праведзена дзясяткі экспедыцый у розныя рэгіёны Беларусі. Падчас гэтых экспедыцый абследаваліся закрытыя цэрквы і манастыры, дзе сярод смецця і пылу было выяўлена і дастаўлена ў Акадэмію навук каля 400 старажытных абразоў, скульптур, помнікаў дэкаратыўнага мастацтва, кніг[80].

Разам з клубам аматараў старажытнабеларускага мастацтва экспедыцыйную дзейнасць па выяўленню і фіксацыі помнікаў гісторыі і культуры Беларусі разгарнуў сектар «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», створаны ў складзе Акадэміі навук[I]. Першая экспедыцыя сектара, арганізаваная яго кіраўніком В. В. Церашчатавай[II] у 1970 г. у Брэсцкую вобласць, паклала аснову калекцыі рухомых помнікаў (каля 20 высокамастацкіх абразоў, некалькі скульптур XVII-XVIII стст., фрагменты мастацкіх тканін. Не менш плённымі былі наступныя комплексныя экспедыцыі сектара, якіх праводзілася да трох штогадова[81] .

Падчас кампаніі супраць нацыяналістычных ухілаў сярод беларускай інтэлігенцыі, якая пачалася пасля красавіцкага (1974 г.) пленума ЦК КПБ, калекцыю старажытнабеларускага мастацтва, сабраную членамі клуба, было загадана перадаць Дзяржаўнаму

---

[I] «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» структурнае падраздзяленне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, створанае пасля пастановы Прэзідыума АН СССР і Міністэрства культуры СССР 1967 г. аб падрыхтоўцы «Збору помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР». Вынікам работы сектара стала выданне ў 1984 1988 гг. сумесна з аддзелам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР і выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя» 7-томнага аднайменнага выдання, якое змяшчала больш за 14 тыс. артыкулаў пра нерухомую гісторыка-культурную спадчыну Беларусі.

[II] Церашчатава Вольга Васільеўна (1926-1992), нарадзілася ў г. п. Лоеў Гомельскай вобл., у 1944 г. добраахвотна уступіла ў Савецкую Армію, некалькі гадоў служыла ў Германіі. Пасля дэмабілізацыі скончыла Маскоўскі паліграфічны інстытут, аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, дзе аба раніла кандыдацкую дысертацыю. У 1969 г. узначаліла сектар «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», з 1974 г. узначальвала групу музейнага фонду, з 1979 г. — Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Аўтар шматлікіх навуковых прац па гісторыі беларускага мастацтва.

мастацкаму музею БССР. Шматлікія пратэсты Ю. В. Хадыкі і Э. І. Вецер не былі пачуты прадстаўнікамі ўлад. Хутка і сам клуб спыніў сваё існаванне. Далейшая экспедыцыйная дзейнасць па фіксацыі, вывучэнню і збору гісторыка-культурнай спадчыны працягвалася ўжо толькі ў рамках «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» пад кіраўніцтвам В. В. Церашчатавай. У гэтай рабоце ўдзельнічалі таксама члены былога клуба старажытнабеларускага мастацтва.

Неўзабаве новыя экспедыцыйныя знаходкі, а таксама частка калекцыі, вернутая з Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, дазволілі сектару «Збору...» узняць перад кіраўніцтвам Акадэміі навук пытанне аб стварэнні музея на падмурку сабраных помнікаў. Гэтаму паспрыялі блізкія ўрачыстасці, прысвечаныя юбілею Акадэміі. Для будучага музея было выдзелена памяшканне ў новым корпусе гуманітарных навук, выраблена экспазіцыйнае абсталяванне. Дзякуючы арганізатарскім здольнасцям і энергіі В. В. Церашчатавай з музейных сховішчаў Масквы і Вільні ўдалося атрымаць абразы з даваенных мінскіх збораў і рэдкія ўзоры народнага мастацтва. Аддзел рэдкай кнігі і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Акадэміі перадаў на часовае захаванне беларускія старадрукі, Інстытут гісторыі — дакументальныя матэрыялы. Адначасова з ліквідацыяй лакун у калекцыях рэстаўратары праводзілі падрыхтоўку прадметаў для экспаніравання ў залах[82].

Адкрыццё Музея старажытнабеларускай культуры адбылося 15 мая 1979 г. (аўтар мастацкага афармлення — У. Капшай). У яго экспазіцыі было прадстаўлена каля 2,5 тыс. прадметаў, размеркаваных па археалагічным, этнаграфічным і мастацкім раздзелах. Археалагічныя матэрыялы асвятлялі этапы засваення чалавекам тэрыторыі Беларусі ад эпохі палеаліту да позняга феадалізму. Сярод іх выдзяляліся: скульптурная выява галавы чалавека 3-2 тыс. да н. э., фрагменты арнаментаванага керамічнага посуду канца 3-га тыс. да н. э., сякера канца 5-3-га тыс. да н. э., узоры скуранога абутку XII ст. з Полацка. У раздзеле этнаграфіі экраніраваліся матэрыялы, якія характарызавалі матэрыяльную культуру беларусаў XIX — пачатку XX ст., у тым ліку калекцыя народнага касцюма, прылады працы, хатняе начынне, вырабы народнага мастацтва, кафля XV-XX стст., цацкі, работы сучасных разбяроў на дрэве. У раздзеле мастацтва прыцягвалі ўвагу наведвальнікаў абразы «Маці Боская Замілаванне» XIV-XV стст., «Пакланенне вешчуноў» 1514 г., «Вогненнае ўшэсце Ільы» 1744 г., «Тройца старазапаветная» I паловы XVII ст., драўляная скульптура «Евангеліст Іаан» пачатку XVI ст., надмагілле П. Сапегі і членаў яго сям'і пачатку XVII ст., узоры дэкаратыў-

на-прыкладнога мастацтва, мастацкія тканіны, у тым ліку слуцкія паясы XVIII-XIX стст., фрагменты іканастасаў, алтароў, абклады абразоў і інш. Вялікую мастацкую і гістарычную каштоўнасць меў «моладаўскі звон», адліты ў 1583 г. па загаду дзяржаўнага і ваеннага дзеяча С. Войны для царквы ў сваім маёнтку Моладава (цяпер Іванаўскі раён). Акрамя таго, у экспазіцыі дэманстраваліся кнігі першых беларускіх друкарняў, у тым ліку Брэсцкая біблія 1563 г. і Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 і 1619гг.[83]

З першых дзён існавання Музей старажытнабеларускай культуры стаў важным навуковым цэнтрам па вывучэнню матэрыяльнай культуры Беларусі. У ім рэгулярна праводзіліся навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя розным аспектам гісторыка-культурнай праблематыкі. Вынікі даследаванняў супрацоўнікаў музея друкаваліся ў спецыяльным выданні «Новыя адкрыцці»[I]. Праводзіўся культуралагічны семінар «Сумоў'е», удзельнікамі якога былі супрацоўнікі розных акадэмічных інстытутаў, выкладчыкі БДУ, мастакі. Фондавыя калекцыі вывучаліся выкладчыкамі ВНУ, мастакамі, студэнтамі і інш.

Як і большасць ведамасных музеяў, Музей старажытнабеларускай культуры даваў абмежаваныя магчымасці агляду сваіх экспазіцый для шырокай аўдыторыі. Адсутнічалі штатныя пасады экскурсаводаў, наглядчыкаў. Іх абавязкі выконвалі навуковыя супрацоўнікі музея. Ён быў адкрыты толькі два разы на тыдзень у буднія дні, што выклікала незадаволенасць грамадскасці. Так, адзін са «звычайных» турыстаў, якому не пашанцавала трапіць у музей, з крыўдаю адзначаў: «... выклікае горкія пачуцці той факт, што музей адкрыты практычна толькі для груп «Інтурыста» і некаторых абраных»[84]. А дзесяцікласнікі адной з цэнтральных мінскіх школ шчыра прызналіся ў кнізе водгукаў: «Вельмі шкада, што не ведалі аб гэтым музеі раней»[85].

Працягвалася камплектаванне фондавага збору Геалагічнага музея Інстытута геалогіі ўзорамі горных парод, мінералаў, карысных выкапняў, метэарытаў. У 1983 г. на базе назапашаных калекцый, колькасць якіх дасягнула 6 тыс. адзінак, была адкрыта новая экспазіцыя музея. Арганізаваная па тэматычнаму прынцыпу, яна выкарыстоўвалася як у навукова-даследчых мэтах, так і для папулярызацыі геалагічных навук сярод навучэнцаў[86].

У 1985 г. па ініцыятыве акадэміка Г. І. Гарэцкага ў складзе Інстытута геалогіі ўзнік яшчэ адзін галіновы музей, вельмі

---

[I] Да 1991 г. з друку выйшлі тры выпускі: Помнікі старажытнабеларускай культуры. Новыя адкрыцці. Мн, 1984; Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. MIL, 1985; Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя даследаванні. Мн., 1989. Рыхтаваўся да выдання чацвёрты.

незвычайны па зместу сваіх калекцый і форме іх экраніравання. Музей валуноў пад адкрытым небам размясціўся на плошчы каля 6 га паміж Акадэмгарадком і мікраараёнам Уручча. Тут знайшлі сваё месца і былі ўзяты пад ахову больш за 2 тыс. ледавіковых камянёў, размешчаных ў некалькіх тэматычных экспазіцыях, распрацоўцы якіх папярэднічалі шматгадовыя даследаванні беларускіх вучоных. Цэнтральная частка экспазіцыі Музея валуноў была выканана ў выглядзе карты Беларусі. На ёй у выглядзе ўзгоркаў былі адлюстраваны асноўныя элементы рэльефу Беларусі - узвышшы і грады. Пешаходныя сцежкі імітавалі рэкі, два невялікія штучныя басейны возера Нарач і Мінскае мора. Створаная карта дазваляла наведвальнікам не толькі скласці агульнае ўражанне пра рэльеф краіны, але і ўпэўніцца ў бязмежнасці фантазіі прыроды. Акрамя карты рэльефу Беларусі ў экспазіцыі была прадстаўлена выстаўка «Камень у жыцці чалавека», дзе дэманстраваліся камяні з паганскімі знакамі, каменныя крыжы, жорны і інш.[87]

Уласны гісторыка-біяграфічны музей Акадэміі навук быў заснаваны ў 1980 г. па ініцыятыве акадэміка М. А. Барысевіча. Падчас падрыхтоўчага перыяду было сабрана каля 10 тыс. адінак асноўнага фонду. Лепшыя з іх стваральнікі музея выкарысталі ў адкрытай у 1989 г. экспазіцыі, у тым ліку пастанову СНК і ЦВК БССР аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук, матэрыялы пра першых акадэмікаў, страты навуковых кадраў у выніку палітычных рэпрэсій, дакументы аб удзеле супрацоўнікаў Акадэміі ў Вялікай Айчыннай вайне, аднаўленні Акадэміі ў пасляваенны час, манаграфічныя працы вучоных, дыпломы аб адкрыццях і вынаходніцтвах, макеты тэхналагічных установак[88].

Сярод музеяў вышэйшых навучальных устаноў БССР, як галіновых, так і гісторыка-біяграфічных, колькасцю назапашаных калекцый, а таксама маштабамі навукова-педагагічнай работы вылучаліся музеі БДУ.

На працягу 1970 -1980-х гг. працягвалася камплектаванне калекцый Заалагічнага музея Белдзяржуніверсітэта. Рэдкія ўзоры фауны дастаўляліся ў Мінск з экспедыцый на Алтай, Ямал, Далёкі Ўсход, у Сярэднюю Азію. У 1981 г., пасля пераезду біялагічнага факультэта ў новы будынак, у ім адкрылася пашыраная экспазіцыя, якая адрознівалася ад папярэдняй лепшым мастацкім узроўнем, новымі біягрупамі і ланшафтпымі дыярамамі. Пазней да традыцыйнай экспазіцыі быў далучаны зоаэкзатэрарыум — своеасаблівы мікразаапарк, які карыстаўся вялікай папулярнасцю не толькі сярод дзяцей, але і дарослых наведвальнікаў. Акрамя стацыянарнай

экспазіцыі ў БДУ, лепшыя калекцыі Заалагічнага музея мелі магчымасць аглядаць шматлікія наведвальнікі Савецкай выстаўкі ў Лондане (1979), Сусветнай выстаўкі паляўнічых трафеяў у Плоўдзіве (1981), ВДНГ БССР у Мінску[89].

Пасля пераводу ў 1969 г. геалагічнага аддзялення з БД У ў Гомельскі універсітэт, ў апошні, разам з вучэбным абсталяваннем, была перададзена частка мінералагічных калекцый. Гэта прывяло да згортвання ўсіх відаў работ у Музеі мінералогіі і петраграфіі БДУ. Новы перыяд развіцця гэтага падраздзялення геаграфічнага факультэта, перайменаванага ў 1974 г. у Музей землязнаўства Белдзяржуніверсітэта, быў звязаны са стварэннем ва універсітэце кафедры агульнага землязнаўства. Са складу кафедры былі прызначаны навуковы кіраўнік (праф. В. М. Шырокаў), старшыня Савета (праф. В. Ф. Якушка), загадчык музея (К. М. Раманенка), якія прапанавалі яго новую канцэпцыю. Яна адлюстроўвала новыя веды пра космас, ўзаемасувязь усіх фізічных працэсаў, якія адбываюцца на Зямлі. Высокую мастацкую якасць новай экспазіцыі музея, адкрытай у 1992 г., забяспечыла супрацоўніцтва кіраўніцтва факультэта з мастакамі-прафесіяналамі[90].

Значнае месца ў культурным жыцці рэспублікі займаў музей гісторыі Белдзяржуніверсітэта, які паўстаў у 1977 г. на гістарычным факультэце. Найвялікшая ўвага стваральнікамі яго экспазіцыі — А. Л. Абэцэдарскай, А. А. Стуканавым, А. А. Яноўскім - надавалася гісторыі універсітэта, а таксама лёсу яго выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў. Значная колькасць матэрыялаў, прадстаўленых у экспазіцыі, была перададзена членамі студэнцкай пошукавай групы «Абавязак». Акрамя мінулага універсітэта, каштоўныя ў навуковых адносінах калекцыі археалогіі, этнаграфіі і нумізматыкі знаёмілі наведвальнікаў музея са старажытнай гісторыяй Беларусі. Гэтыя аддзелы карысталіся папулярнасцю не толькі сярод экскурсантаў. У іх праводзіліся семінарскія заняткі са студэнтамі-гісторыкамі, а таксама школьнікамі горада. Грамадскі рэзананс атрымалі выстаўкі, якія праводзіліся ў музеі гісторыі БДУ ў 1980-я гг., — «Помнікі дойлідства Беларусі XII-XVIII стагоддзяў», «500-годдзе з дня нараджэння Ф. Скарыны», а таксама графічных работ М. Басалыгі, М. Купавы, Г. Паплаўскага, Г. Ціхановіча і іншых беларускіх мастакоў[91].

У 1968-1970 гг. у сувязі з падрыхтоўкай да IX Міжнароднага кангрэсу анатамаў праводзіліся вялікія работы па рэканструкцыі анатамічнага музея кафедры нармальнай анатоміі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Была праведзена рэстаўрацыя старых прэпаратаў, выраблена шмат новых. У наступныя гады ў структуры

музея было выдзелена некалькі новых аддзелаў, у выніку чаго яго экспазіцыя, разгорнутая ў трох спецыяльных пакоях, ахоплівала ўсе раздзелы анатоміі[92].

Вынікам сумеснай працы выкладчыкаў (прафесара Б. В. Бокуця, дацэнтаў Г. С. Еўдакіменкі і З. М. Сарокі) і студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта стаў археалагічны музей, адкрыты ў 1980 г. Фонды музея скаліся пераважна за кошт археалагічных раскопак, якія праводзіліся ў розныя гады выпускнікамі універсітэта ў складзе атрадаў Інстытута гісторыі АН БССР.

Частка матэрыялаў была перададзена на часовае захоўванне з фондаў абласнога краязнаўчага музея. У экспазіцыі былі прадстаўлены прылады працы эпох палеаліту, мезаліту, неаліту, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў, віды посуду, пачынаючы з неалітычнага, упрыгожанні і побытавыя рэчы эпохі феадалізму. Пазней музей узбагаціўся этнаграфічнымі матэрыяламі і быў перайменаваны ў археалагічна-этнаграфічны[93].

У 1991 г. у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце па ініцыятыве кафедры польскай літаратуры і культуры адкрыўся музей, прысвечаны вядомай польскай пісьменніцы, літаратурнаму крытыку і грамадскаму дзеячу Зоф'і Налкоўскай[94].

Меншыя па аб'ёму фондавых калекцый і экспазіцыйных плошчах гісторыка-біяграфічныя музеі былі створаны ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце (1977), Беларускім політэхнічным інстытуце (1978), Беларускім інстытуце механізацыі сельскай гаспадаркі (1979), Мінскім радыётэхнічным інстытуце (1984), Беларускім інстытуце фізічнай культуры (1984), Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце (1986), Мінскім педагагічным інстытуце (1989) і інш.

Вялікую работу па арганізацыі ўласных музеяў у 1970-я -1980-я гг. разгарнулі іншыя ведамствы, установы і прадпрыемствы БССР.

У 1974 г. быў заснаваны Музей гісторыі войск Беларускай ваеннай акругі. На працягу чатырохгадовага перыяду падрыхтоўкі да адкрыцця музея было сабрана каля 12 тыс. прадметаў — зброя, баявыя ўзнагароды, дакументы і асабістыя рэчы палкаводцаў і салдат, франтавыя газеты, улёткі, фотаздымкі, мемуары военачальнікаў. Экспазіцыя Музея гісторыі войск Беларускай ваеннай акругі была адкрыта для агляду ў красавіку 1978 г. (аўтар мастацкага афармлення У. Капшай). Яе структура складалася з наступных тэм: падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі; удзел беларускага народа ў стварэнні Чырвонай Арміі; утварэнне Мінскай ваеннай акругі ў 1918 г.; савецка-польская вайна 1920 г.; Беларуская

ваенная акруга ў 1922-1941 гг.; удзел войск акругі ў Вялікай Айчыннай вайне; акруга ў пасляваенны перыяд[95].

У 1987 г. адкрыўся Музей леса пры Смаргонскім лясгасе. У ім былі прадстаўлены амаль усе пароды мясцовых дрэў, а таксама чучалы звяроў і птушак. Усе матэрыялы экспазіцыі былі арганізаваны ў жывапісныя біягрупы. У планы стваральнікаў Музея леса ўваходзіла адкрыццё пры ім дэндрарыя[96].

Музеі гісторыка-біяграфічнага тыпу ў разглядаемы перыяд адкрылі: Мінскі трактарны завод (1970), Беларуская чыгунка (1971), Гомельскі абласны драматычны тэатр (1973), Аршанскі завод «Чырвоны Кастрычнік» (1973), Мінскі дзяржаўны цырк (1977), БелГРЭС (1980), Мінскі завод імя С. М. Кірава (1981), ДТСААФ (1982), Мінскі Палац піянераў (1988), МВД БССР (1989). Пачалі ствараць уласныя музеі ЦК ЛКСМБ (1979), Міністэрства сувязі БССР (1983) і інш. Работы па мемарыялізацыі ўласнай гісторыі распачалі дзясяткі разнастайных невялікіх арганізацый, у тым ліку быхаўская раённая газета «Маяк Прыдняпроўя» (1971), мінскае тралейбуснае дэпо № 1 (1978), Бераставіцкая раённая паліклініка (1987), ЖЭУ-1 г. Пінска (1980)

Вялікая колькасць музеяў была створана ў калгасах рэспублікі. Экспазіцыі большасці з іх мелі гісторыка-біяграфічны характар, дэманстравалі пераважна капійныя матэрыялы і распавядалі аб «баявых і працоўных традыцыях» вёскі, а таксама лёсах яе жыхароў. Аднак у шэрагу выпадкаў на вёсцы паўсталі арыгінальныя, пазбаўленыя штампаў сапраўдныя асяродкі культуры, значэнне якіх выходзіла за межы стварыўшых іх калгасаў. Да іх ліку адносіліся музей сялянскага побыту ў в. Астрамечава Брэсцкага раёна, музей імя акадэміка П. Ф. Ракіцкага ў в. Кустаўніца Мазырскага раёна, музей меліярацыі ў в. Камуна Любанскага раёна, музей хлеба ў в. Вялікая Кракотка Слонімскага раёна, мастацка-археалагічны музей у в. Гарадзец Шаркоўшчынскага раёна, этнаграфічны музей у в. Блонь. Лепшым з іх было прысвоена званне «народнага».

Павелічэнне ў 1970-х -1980-х гг. колькасці музеяў, якія не падпарадкоўваліся Міністэрству культуры, аб'ектыўна патрабавала вызначэння іх статуса, стварэння юрыдычнай базы, навукова-метадычнага, кадравага забеспячэння і, нарэшце, каардынацыі дзейнасці. Ведамасныя музеі галіновага тыпу, за невялікім выключэннем, заставаліся па-за полем зроку Міністэрства культуры, што тлумачылася навуковай або тэхнічнай накіраванасцю іх дзейнасці.

У адносінах да грамадскіх школьных і ведамасных музеяў гісторыка-біяграфічнага тыпу Міністэрствам былі зроблены захады арганізацыйна-метадычнага характару. «Тыпавым палажэннем», зацвер-

джаным Міністэрствам культуры СССР у красавіку 1978 г., абедзьве групы атрымалі агульны статус «музеяў, якія працуюць на грамадскіх начатках». У палажэнні, у прыватнасці, было запісана: «Грамадскі музей з'яўляецца культурна-асветніцкай установай, якая мэтанакіравана збірае, захоўвае, экспануе прадметы матэрыяльнай і духоўнай культуры і вядзе на іх аснове шырокую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных»[97]. Як сведчыць дадзеная фармулёўка, грамадскаму музею былі ўласцівыя тыя ж сацыяльныя функцыі, што і дзяржаўнаму — функцыя дакументіравання грамадскіх і прыродных працэсаў і з'яў, а таксама функцыя адукацыйна-выхаваўчага ўздзеяння на людзей. Галоўным адрозненнем грамадскіх музеяў ад дзяржаўных, на думку аўтараў палажэння, быў спосаб іх стварэння.

Органы культуры і іншыя ведамствы спрыялі ўмацаванню матэрыяльнай базы грамадскіх музеяў, аказвалі навукова-метадычную дапамогу з мэтай забеспячэння захаванасці і выкарыстання іх фондавых калекцый. Найважнейшым з гэтых захадаў была арганізацыя ўліку помнікаў гісторыі і культуры са збораў грамадскіх музеяў у адпаведных дзяржаўных музеях сістэмы Міністэрства культуры. Асноўныя патрабаванні да ўліку, захавання і выкарыстання розных тыпаў помнікаў у грамадскіх музеях, а таксама парадак пастаноўкі іх на дзяржаўны ўлік былі выкладзены ў спецыяльным дакуменце — метадычным лісце, выдадзеным Міністэрствам культуры СССР[98]. Падчас практычнай уліковай работы высветлілася, што паставіць на дзяржаўны ўлік усе помнікі, якія захоўваліся ў грамадскіх музеях, у блізкі час было немагчыма. Яскравым прыкладам таму з'яўлялася немагчымасць наладзіць на працягу 1970-х 1980-х гг. адпаведныя ўмовы захавання работ мастачкі Н. Хадасевіч-Лежэ на яе радзіме ў в. Зембін Барысаўскага раёна. Былі распрацаваны крытэрыі адбору помнікаў, якія падлягалі дзяржаўнаму ўліку. У 1981 г. у грамадскіх музеях СССР налічвалася 5 918 770 адзінак захоўвання, з якіх толькі 432 800 адзінак знаходзілася на дзяржаўным уліку[99].

Палажэнне 1978 г. аб музеях, якія працуюць на грамадскіх пачатках, падзяляла іх на тры асноўныя групы. Да першай групы адносіліся музеі, якія ствараліся па загаду і падпарадкоўваліся мясцовым органам кіравання — аддзелам культуры раённых і гарадскіх выканкомаў або сельскім і пасялковым саветам народных дэпутатаў. Большасць музеяў гэтай групы мелі гістарычны, краязнаўчы профіль альбо былі мемарыяльныя. У БССР падобныя ўстановы пад назвай «музеі народнай славы» былі арганізаваны напрыканцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. у Мядзелі, Рагачове,

Клічаве, Бягомлі, Лельчыцах, г. п. Акцябрскім. Яны з'яўляліся грамадскімі толькі па назве і хутка набылі юрыдычны статус дзяржаўных.

Да другой групы былі аднесены музеі прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, навуковых, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і інш. Ініцыятарам стварэння музеяў гэтай групы звычайна выступала адміністрацыя прадпрыемства, калгаса, прафсаюзная, камсамольская арганізацыя, вучоны або педагагічны савет. Прадметам вывучэння і паказу ў іх была гісторыя дадзенай установы, прадпрыемства або арганізацыі. (Размова пра іх ішла вышэй, у кантэксце аналізу дзейнасці ведамасных музеяў гісторыка-біяграфічнага тыпу.)

У трэцюю, найбольш вялікую групу грамадскіх музеяў, былі ўключаны школьныя музеі, якія працавалі пад кіраўніцтвам органаў народнай адукацыі. Школьныя музеі ствараліся ў школах, ПТВ, палацах і дамах піянераў і ў іншых пазашкольных установах. Іх дзейнасць каардынавалася дзіцячымі экскурсійна-турыстычнымі станцыямі і рэгулявалася спецыяльным палажэннем[100]. Асаблівасцю грамадскіх школьных музеяў была іх навучальна-выхаваўчая накіраванасць. Профіль школьнага музея мог быць любы, але незалежна ад гэтага ўсім ім быў уласцівы мемарыяльны характар.

У 1981 г. у СССР існавала каля 12 тыс. грамадскіх музеяў. З іх 4 тыс. падпарадкоўвалася мясцовым органам кіравання, у склад другой групы уваходзіла 3 200 музеяў, яшчэ 4 800 музеяў мела статус школьных. Па саюзных рэспубліках і профілях гэта адлюстравана ў Табліцы 5.

У БССР у гэты час грамадскія музеі размяркоўваліся па профільных групах наступным чынам: гістарычныя — 400, літаратурныя — 22, мастацкія — 8, прыродазнаўчыя — 6, Іншыя — 120; 12 з іх набылі статус дзяржаўных[101].

На працягу 1980-х гг. колькасць музеяў, якія працавалі на грамадскіх пачатках, у БССР павялічылася больш чым удвая і дасягнула 1380[102].

Часта збіраючы каштоўны матэрыял, кіраўнік і актыў школьнага музея былі бездапаможнымі ў пытаннях практычнай музейнай работы і ўсё рабілася інтуітыўна, усляпую. Кіраўнікі школьных музеяў, як правіла, не былі нават знаёмы з «Тыпавым палажэннем аб музеі, які працуе на грамадскіх пачатках». Сітуацыя палепшылася пасля стварэння ў 1981 г. Універсітэта тэорыі і практыкі музейнай работы пры Дзяржаўным музеі БССР, куды ў якасці слухачоў запрашаліся кіраўнікі грамадскіх музеяў. З 1986 г. падобныя формы вучобы

прапаноўвалі Гродзенскі гісторыка-археалагічны і Віцебскі абласны музеі.

Табліца 5

| **Саюзныя рэспублікі** | **Колькасць музеяў** | **Профіль** | **Колькасць музеяў** |
|---|---|---|---|
| Украінская ССР | 5150 | Гістарычныя | 6900 |
| РСФСР | 3062 | Краязнаўчыя | 2000 |
| Казахская ССР | 1006 | Ленінскія | 1900 |
| Узбекская ССР | 763 | Мемарыяльныя | 472 |
| Беларуская ССР | 552 | Літаратурныя | 235 |
| Літоўская ССР | 256 | Прыродазнаўчыя | 130 |
| Азербайджанская ССР | 248 | Мастацкія | 115 |
| Грузінская ССР | 215 | Сельскагаспадарчыя | 80 |
| Малдаўская ССР | 169 | Тэатральныя | 40 |
| Туркменская ССР | 146 | Тэхніка-эканамічныя | 30 |
| Кіргізская ССР | 139 | Музычныя | 8 |
| Армянская ССР | 79 | Іншых профіляў | 90 |
| Таджыкская ССР | 77 | | |
| Эстонская ССР | 63 | | |
| Латвійская ССР | 58 | | |

Грамадскія школьныя музеі сталі сур'ёзным фактарам у сістэме помнікаахоўных і культурна-асветніцкіх устаноў краіны. Але з самага пачатку гэта ініцыятыва знізу была зафармалізавана, штучна стымулявалася партыйнымі ідэолагамі зверху, губляючы на працягу развіцця характар жывой справы. Так, у адпаведнасці з загадам Міністэрства асветы БССР, выдадзеным у 1980 г., кожны педагагічны

калектыў павінен быў абсталяваць у школе Ленінскі пакой або мець музей рэвалюцыйнай, баявой ці працоўнай славы. У шэрагу выпадкаў фармальны падыход дазволіў узвесці ў ранг музея чырвоныя куткі і пакоі славы, не меўшыя аўтэнтычных матэрыялаў, ці ствараць народныя музеі за кошт фондаў дзяржаўных музеяў і сіламі іх супрацоўнікаў. Адсутнасць прафесійнага і фінансавага забеспячэння пры арганізацыі музеяў часта прыводзіла да сітуацыі, калі ўзнікала ўстанова з неакрэсленым профілем і тэматыкай. Нярэдка, запоўніўшы стэнды і паліцы экспанатамі, музей абачліва зачынялі на замок, каб адчыніць толькі ў выключных выпадках — на вялікае свята ці для інспектарскай камісіі.

Тым не менш, у шэрагу школ узніклі музеі, якія захоўвалі цікавыя калекцыі і карысталіся попытам з боку грамадства. Да іх ліку трэба аднесці музей народнай творчасці ў в. Дарасіна Любанскага раёна, музей мастацтва і этнаграфіі ў в. Лужкі Шаркоўшчынскага раёна, музей фальклору ў Капыльскай музычнай школе. У Сенніцкай СІП Мінскага раёна прыцягваў увагу наведвальнікаў музей Я. Купалы, у в. Лапаціна Пінскага раёна — А. Блока, у в. Журавічы Рагачоўскага раёна — А. Макаёнка. З'яўляліся новыя музеі і нетрадыцыйнага профілю: музей хлеба ў в. Сабалі Брагінскага раёна, касманаўтыкі — уе. Тамашоўка Брэсцкага раёна, гісторыі пішучай машынкі — у навучальна-вытворчым камбінаце Партызанскага раёна г. Мінска, музей С. Манюшкі ў п. Азёрным Чэрвеньскага раёна і многія іншыя.

* * *

Такім чынам, у 1970-я -1980-я гг. назіралася далейшае рэзкае павелічэнне колькасці музеяў рознай падпарадкаванасці, з'ўленне новых тыпаў музейных установ накшталт музеяў-запаведнікаў і скансэнаў. Становучай тэндэнцыяй было адкрыццё філіялаў галаўных музеяў у помніках дойлідства, што выратавала іх ад канчатковага разбурэння. Вялікі аб'ём работ аб'яднання «Белрэстаўрацыя» праводзіўся на архітэктурных помніках, якія выкарыстоўваліся пад музейныя патрэбы. Павялічыўся аб'ём музейных калекцый, палепшыліся ўмовы іх уліку і захоўвання. Адбывалася паступовая прафесіяналізацыя музейнай дзейнасці, прыцягненне ў яе сапраўдных навукоўцаў і прымяненне навуковых падыходаў. Але галоўным паказчыкам работы кожнага музея па-ранейшаму быў яго ўдзел у камуністычным выхаванні грамадзян. Такая сітуацыя была падрыхтавана ўсёй папярэдняй планамернай дзейнасцю ідэалагічных органаў і органаў кіравання музейнай справай. Яна стрымлівала творчыя пошукі тых,

хто працаваў у музеях, не дазваляла далучыцца шырокай грамадскасці да культурнай спадчыны на розных узроўнях.

На мяжы 1980-1990-х гг. становішча беларускіх музеяў пагоршылася ў сувязі з памяншэннем фінансавання іх дзейнасці з боку дзяржавы, рэзкім зніжэннем колькасці наведвальнікаў, адтокам маладых і найбольш актыўных спецыялістаў. Між тым, само жыццё патрабавала ад музеяў знайсці сваё месца ў адраджэнні нацыянальных культур, вырашэнні сацыяльных і экалагічных праблем. Гэта актывізавала музейную грамадскасць, пачалося абмеркаванне найбольш вострых праблем, у тым ліку па паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў у новых гаспадарчых умовах.

Вельмі небяспечнай тэндэнцыяй напрыканцы разглядаемага перыяду стала рэзкае павелічэнне крадзяжоў гісторыка-культурнай спадчыны. У сярэднім у гэты час на працягу аднаго году крымінальны вышук БССР фіксаваў 50-60 злачынстваў, звязаных з крадзяжом прадметаў антыкварыяту. Асабліва дзёрзкія злачынствы ў музеях зламыснікі здзяйснялі ў 1991 г. З Музея старажытнабеларускай культуры АН БССР былі выкрадзены ўначы два найкаштоўнейшыя абразы[103]. У Барысаўскі краязнаўчы музей рабаўнікі ў масках з'явіліся за сярэдневяковай нумізматыкай не хаваючыся, удзень[104].

У той жа час выйшла на паверхню праблема вяртання з музеяў культавых рэчаў, забраных у закрытых цэрквах і касцёлах. Гэта праблема падзяліла грамадскую думку на два лагеры. Вяртаць ці не вяртаць? Калі кампраміс, то да якой ступені? Адны казалі аб парушэнні дзяржавай правоў чалавека, якая пазбавіла яго свабоды веравызнання, аб прафесійным падыходзе да захоўвання культавых рэчаў святарамі Мінскага кафедральнага сабора, ксяндзамі Нясвіжскага і Пінскага касцёлаў. Другія справядліва нагадвалі апанентам, што толькі дзякуючы музейным спецыялістам гэтыя рэчы былі захаваны для беларускай культуры ў гады ваяўнічага бязбожніцтва, пра адсутнасць ў большасці цэркваў і касцёлаў належных умоў захавання, штатных мастацтвазнаўцаў, рэстаўратараў і г. д. Грамадская дыскусія аб прыналежнасці культавага мастацтва ўзняла больш глыбокае пытанне аб узаемаадносінах царквы і музея. У прыватнасці, пра сацыяльна-культурныя функцыі прадметаў мастацтва, калі яны не абмяжоўваюцца рэлігійным канонам. Калі ў ліберальна-дэмакратычных еўрапейскіх краінах супрацоўніцтва царквы і музея арганічна выпрацавалася на працягу дзесяцігоддзяў, то ў перабудовачныя гады ў былым СССР падобнае затанне насіла канфрантацыйны характар.

Гэтыя і іншыя вострыя пытанні музейнага жыцця Беларусі вырашаліся ўжо ў наступны перыяд гісторыі краіны.

[1] Положение о краеведческом музее союзной, автономной республики, края, области, национального округа, района системы Министерства культуры СССР. М., 1964.
[2] Типовое положение об историческом музее. М., 1968.
[3] Сборник документов по музейному делу. 1964-1984. М., 1985. С. 9-12.
[4] Там жа.
[5] Тенденции и перспективы развития музейных объединений. Музейное дело и охрана памятников. Обзорная информация. Вып. I. М., 1987. С. 1.
[6] Разгон А. М. Музейная сеть единого многонационального социалистического государства // Музейное дело в СССР. Сб. науч. тр. М., 1985. С. 17.
[7] Даньшина Е. В. Создание сводного научного каталога — основного носителя информации о музейных фондах // Актуальные проблемы советского музееведения. Сб. науч. тр. М, 1987. С. 49.
[8] Збор законаў, указаў, пастаноў і распараджэнняў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Савета Міністраў Беларускай ССР. Мн, 1978. № 20. Арт. 388. С.389.
[9] Правда. 1982. 20 авг.
[10] Златоустова В. И. Государственная политика... С. 285.
[11] Сборник документов по музейному делу... С. 54 -57.
[12] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 1954. Арк. 10.
[13] Дзяржаўны музей Беларускай ССР: (Па залах музея). Мн., 1970.
[11] Архіў НМГіКБ. Спр. 284. Арк. 97.
[15] Там жа. Спр. 145. Арк, 7.
[16] Симонюков С. Сенсаций не ищем... // Сельская газета. 1988. 8 мая.
[17] Тюрина Т. Летопись наших дней // Советский музей. 1984. № 2. С. 14.
[18] Капыловіч М. Гісторыя пад «пыльным шклом» // Чырвоная змена. 1989. 17 жн.
[19] Загришев И. П., Милюченков С. А. Заславский историко-культурный заповедник. Мн, 1982. С. 1-24.
[20] Гаранская Т. Загублены музей? // Чырвоная змена. 1989. 7 чэрв.
[21] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 1640. Арк. 103.
[22] Слесарук Т. А музею ж цяжка... // Літаратура і мастацтва. 1979. 8 чэрв.
[23] Борисовец А. Музей выходит... на улицу // Заря. 1981. 23 мая.
[24] Новиков Г. Как спасли шедевры // Советская культура. 1986. 25 дек.
[25] Лысенко П. Ф. Открытие Берестья. Мн, 1989. С. 11 68.
[26] Лысенко П. Ф. Берестье. Мн, 1985.
[27] Алексиевич С. ...И увидят нас // Нёман. 1975. № 10. С. 128.
[28] Кічына Е. У гасцях у цудоўнага // Віцебскі рабочы. 1970. 13 лют.
[29] Сухорукое А., Шишанов В. К истории создания музея-усадьбы И. Е. Репипа «Здравнёво»... 116.
[30] Пасюціна А. Праект літаратурнага музея // Віцебскі рабочы. 1990. 3 лют.
[31] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 1640. Арк. 205.

[32] Агай М. Памятная кніга чалавецтва // Гомельская праўда. 1991. 18 мая.
[33] На сустрэчу з гісторыяй // Літаратура і мастацтва. 1981. 26 чэрв.
[34] Экспазіцыя будзе абноўлена // Літаратура і мастацтва. 1986. 17 студз.
[35] Бічэль-Загнетава Д. І. Пошукі Максіма Багдановіча // Матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства». 8-9 кастр. 1990. Гродна, 1990. С. 14.
[36] Из воспоминаний заведующей отделом природы Юркевич Ванды Антоновны // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 4. Гродна, 1997. С. 182.
[37] Царук В. М. Экспазіцыйная дзейнасць... С. 10.
[38] Кудлаеў К. Удзячныя нашчадкі // Літаратура і мастацтва. 1976. 10 верас.
[39] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. І. Спр. 1912. Арк. 67.
[40] Лянкевіч Т. Мінскі абласны краязнаўчы музей // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. №6. С. 34.
[41] Андреев М. Юбилей музея // Заря. 1976. 21 июля.
[42] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. І. Спр. 1746. Арк. 31.
[43] Клыга А. Прыгажосць ёсць парадак // Гомельская праўда. 1987. 13 лют.
[44] Чарнова Л. Скарбы Фёдара Шклярава // Голас Радзімы. 1999. 19 жн.
[45] Падалян Г. Старонкі гісторыі музейнага аб'яднання... С. 3.
[46] Пашкевіч Т. Захоўваючы повязь часоў // Браслаўская звязда. 1998. 17 кастр.
[47] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. І Спр. 1746. Арк. 101.
[48] Там жа. Арк. 137.
[49] Алексиевич С. ...И увидят нас... С. 130.
[50] Ванькевич А. Г Чтобы никогда не повторилась Хатынь // Музейное дело в СССР. М„ 1977. С. 112.
[51] Вайнтруб Е. Г. Курганы боевой славы. Мн., 1981.
[52] Пятроў С. У гонар баявой дружбы // Віцебскі рабочы. 1980. 25 студз.
[53] Архіў БДМГВАВ. Спр. 955. Арк. 15.
[54] Там жа. Арк. 16
[55] Там жа. Арк. 71.
[56] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 1640. Арк. 156.
[57] Флякс Я. Экспозиция рассказывает // Гродненская правда. 1982. 15 сент.
[58] Усадьба Дзержиново: Беседа у фотоэкспозиции. Мн, 1983.
[59] Ляшчонак II. Заўтра заусёды позна // Спадчына. 1999 № 4. С. 81.
[60] Высоцкая Н. Ф. Собирание, реставрация и изучение произведений древпебелорусского искусства в Государственном художественном музее БССР // Сообщения Государственного художественного музея... С. 155.
[61] Пракопцаў У. Беларуская скарбніца культуры // Беларускі гістарычны часопіс. 2002. № 4.
[62] Архіў НММ РБ. Ф. 164. Воп. І. Спр. 576. Арк. I.
[63] Сутько Ю. Сокровища, возвращённые народу // Сельская газета. 1989. 12 февр.
[64] Стома Г. Тут начинался мир его души // Гродненская правда. 1990. 5 окт.
[65] Літаратурны музей Янкі Купалы. Мн., 1981.
[66] Хадкевіч Л. Вязынка. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік. Мн., 1982.

[67] Ляўкі. Купалаўскі мемарыяльны запаведнік. Ми., 1981.
[68] Камароўская З. «Песняй вітаю я вас...» // Роднае слова. 1999. № 11. С. 183.
[69] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. I. Спр. 1930. Арк. 55.
[70] Архіў НПГКМЗ. Ф. I.
[71] Сбор законов БССР, указов Президиума Верховного Совета БССР, постановлений и распоряжений СМ БССР. Мн, 1990. № 2. С. 273.
[72] Там жа. №28. С. 571.
[73] Калбаска А. Музейны дыярыуш. Мн., 2000. С. 55 63.
[74] Турков. В. С., Терёхин С. Ф. К вопросу о создании в Белоруссии музея под открытым небом // Вопросы этнографии и фольклора. Мн, 1979. С. 25.
[75] Аладаў В., Ахрэмчык I , Броўка П., Глебка Я, Крапіва К., Платонаў Б., Шырма Р. Створым этнаграфічны музей! // Літаратура і мастацтва. 1966. 23 жн.
[76] Лакотка А. I. Беларускі дзяржаўны музей-запаведнік «Менка»... С. 28.
[77] Літаратура і мастацтва. 1988. 16 снеж.
[78] Васілеўскі М. Незвычайныя экспанаты // Звязда. 1978. 21 сак.
[79] Архіў МК РБ. Ф. 974. Вол, I Спр. 1592.
[80] Манаева Д. Падзвіжнікі. Гісторыя стварэння аднаго музея...
[81] Музей старажытнабеларускай культуры. Мн, 1998. С. 5.
[82] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. і. Спр. 1244. Арк. 14.
[83] Музей старажытнабеларускай культуры: Каталог экспазіцыі. Мн, 1983.
[84] Папоў С. Паказваць скарбніцу ўсім // Літаратура і мастацтва. 1987. 11 верас.
[85] Старых М. Скарбы Белай Русі // Чырвоная змена. 1982. 5 снеж.
[86] Национальная Академия наук Беларуси. Институт геологических наук. Мн, 2002. С. 26.
[87] Академия паук Белорусской СССР. Институт геохимии и геофизики. Экспериментальная база валунов. Мн, 1990.
[88] Гоголева М. Музей в Академии // Вечерний Минск. 1989. 4 мая.
[89] Писаненко А. Д., Шкляров Л. П. История Зоологического музея... С. 20
[90] Таинственный мир камня... С. 13.
[91] Давідовіч I. У музеі гісторыі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1986. № 4. С. 11.
[92] Богданова М. И Анатомический музей... С. 5.
[93] Багамольнікаў Ул. З мінулых стагоддзяў // Гомельская праўда. 1980. 29 ліст.
[94] Голас Радзімы. 1991. 7 ліст.
[95] Ерашэнка П. Новы музей Мінска// Чырвоная змена. 1978. 23 лют
[96] Сельская газета. 1987. 14 ліп.
[97] Типовое положение о музее, работающем на общественных началах. М, 1978. С. 1.
[98] О порядке ведения (оформления) документации при постановке на государственный учет памятников истории и культуры, объектов природы, хранящихся в общественных музеях, в том числе школьных (Методическое письмо). М, 1980.

[99] Туманов В. Е. Общественные музеи // Музейное дело в СССР. Сб. науч. тр. М, 1985. С. 151.
[100] Положение о школьном музее // Школьные музеи. Из опыта работы. Под ред. В. Н. Столетова и М. П. Кашина. М, 1977. С. 133 135.
[101] Ваницкий А. Н Работа музеев Белоруссии по патриотическому и интернациональному воспитанию молодёжи // Музейное дело в СССР. Сб. науч. тр. М, 1980. С. 59.
[102] Архіў МК РБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 1954. Арк. 2.
[103] Звязда. 1991. 6 снеж.
[104] Народная газета. 1991. 25 июня.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Вывучэнне гісторыі музейнай справы Беларусі з 1941 па 1991 г. дазваляе зрабіць выснову аб тым, што на працягу гэтага пяцідзесяцігоддзя была створана музейная сетка краіны ў яе сучасным выглядзе. Быў нанава сфарміраваны дзяржаўны музейны фонд, амаль цалкам знішчаны ў гады вайны. Гісторыя музейных установ у разгледжанае пяцідзесяцігоддзе не ўяўляла сабой раўнамерны паступальны рух і кожны з выдзеленых перыядаў меў свае асаблівасці.

У першае пасляваеннае дзесяцігодзе ва ўмовах узнаўлення народнай гаспадаркі дзяржаўная палітыка ў галіне музейнай справы характарызавалася імкненнем адрадзіць музеі, узнавіць асноўныя напрамкі іх дзейнасці. Дзякуючы самаахвярнай працы энтузіястаў музеі Беларусі ўзняліся за гэты час з попелу як птушка фенікс. Адначасова захавалася і ўзрастала імкненне пераўтварыць іх ў выключна прапагандысцкія ўстановы, якія выконваюць пэўныя ідэалагічныя задачы. У гэты перыяд узмацняецца рэгламентацыя ўсёй дзейнасці музеяў, працягвае фарміравацца камандна-адміністрацыйны стыль кіраўніцтва імі.

У перыяд «адлігі», пачатак якому быў накладзены XX з'ездам КПСС, назіраліся працэсы дэмакратызацыі грамадства, рост грамадскай актыўнасці, узмацненне цікаўнасці да гісторыка-культурнай спадчыны. У культурнай палітыцы ў гэты час адзначаюцца тэндэнцыі, якія абумовілі з'яўленне археалагічна-архітэктурпых запаведнікаў, першых грамадскіх музеяў, а таксама правядзенне вельмі важных мер па ўпарадкаванню захавання і ўліку калекцый. У той жа час галоўным напрамкам робіцца арыентацыя музеяў па збіранне матэрыялаў па гісторыі савецкага грамадства і іх выкарыстанне ў экспазіцыйнай і навукова-асветніцкай дзейнасці.

У апошнія дваццаць гадоў існавання БССР уся музейная справа рэспублікі развівалася найбольш шпаркімі тэмпамі. У гэтыя гады назіраецца пільная ўвага партыйных і дзяржаўных органаў да работы музеяў. Значна пашырылася музейная сетка, з'явіліся новыя ўтварэнні — цэнтралізаваныя музейныя сістэмы. Рэгулярна праводзіліся рэспубліканскія семінары музейных работнікаў па розных аспектах дзейнасці музейных установ. Важнай падзеяй у музейным жыцці БССР быў усесаюзны семінар музейных работнікаў у Мінску (1979). Ажывілася збіральніцкая работа, у працэсе якой музеі супрацоўнічалі з Інстытутам гісторыі АН БССР, дзяржаўнымі рэспубліканскімі і абласнымі архівамі, бібліятэкамі, іншымі навуковымі

ўстановамі рэспублікі. Збіральніцкая работа набыла больш планавы характар, тэматыка збораў і сродкі камплектавання фондаў новымі паступленнямі рэгуляваліся гадавымі і перспектыўнымі планамі. Усё гэта спрыяла колькаснаму павелічэнню дзяржаўнага музейнага фонду БССР, стварэнню новых экспазіцый, разгортванню асветніцкай работы. Аднак з'явы «застою» усё больш адмоўна ўплывалі на ўсе накірункі музейнай дзейнасці.

У другой палове 1980-х гг. у сувязі з новымі працэсамі ў развіцці савецкага грамадства перад музеямі паўстала задача пераадолення таго, што пазбаўляла іх уласнага твару, творчых магчымасцей, каб заняць належнае месца ў адраджэнні культуры. Пачаўся пошук новых форм і метадаў кіраўніцтва музеямі, гаспадарчых механізмаў, выпрацоўка новай культурнай палітыкі. Ажывілася музейная грамадскасць, з'явілася магчымасць свабоднага абмеркавання шматлікіх прафесійных пытанняў. На першы план выйшла праблема стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў, умоў, неабходных для іх пасяховай работы.

Найбольш шматлікая (каля 80%) профільная група дзяржаўных музеяў БССР распавядала пра прыроду і мінулае краю, г. зн. мела краязнаўчы профіль. Адны з іх узнікалі як вынік дзейнасці Міністэрства культуры БССР па фарміраванню музейнай сеткі рэспублікі. Другія набылі дзяржаўны статус у выніку аматарскай працы мясцовага насельніцтва ў галіне вывучэння краю. Такім чынам, склалася сістэма навукова-асветных установ па збору, вывучэнню, захаванню і папулярызацыі ўсяго комплексу нацыянальнай рухомай гісторыка-культурнай спадчыны.

Краязнаўчыя музеі сутыкалася з вялікімі цяжкасцямі падчас выканання гэтых задач. Яны знаходзіліся ў больш ці менш прыстасаваных памяшканнях, адчуваўся востры недахоп кваліфікаваных спецыялістаў (толькі за перыяд з 1985 па 1990 г. змянілася каля паловы дырэктараў краязнаўчых музеяў); мастацкая невыразнасць, ілюстратыўнасць экспазіцый не дазвалялі разгарнуць шырокую папулярызацыю сабраных калекцый (яшчэ ў сярэдзіне 1960-х гг. практыкаваліся такія формы асветніцкай работы, як чытанні газет уголас). Нарэшце, развіццё краязнаўчых музеяў замаруджвалася заняпадам краязнаўчага руху пасля яго фактычнага знішчэння у 1930-я гг. Адрадзіцца ва умовах пасляваеннай БССР у якасці жывой асновы музейнай справы ён так і не здолеў. Гэтаму працэсу перашкаджалі таксама аб'ектыўныя прычыны, такія, як інтэнсіўны працэс урбанізацыі.

Аб'ектыўная патрэба пашырэння ў колькасных і якасных адносінах сеткі дзяржаўных музеяў БССР ў разглядаемы час праявілася ў шэрагу дзяржаўных і грамадскіх музейных праектаў і ініцыятыў: будаўніцтва ў Мінску Палаца музеяў (начальнік упраўлення музеяў Камітэта па справах культурна-асветніцкіх установаў У. Л. Вянюкоў, 1951), кансервацыі і музейнага выкарыстання фундамента і рэшткаў сцен царквы канца XI — пачатку XII ст. на Менскім замчышчы (ст. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР В. Р. Тарасенка, 1959), стварэння Музея гісторыі тэатра Беларусі (старшыня Беларускага тэатральнага аб'яднання Л. Александроўская, 1971), кансервацыі і музейнага выкарыстання неалітычных шахт у в. Краснае Сяло Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці (загадчык сектара археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР Л. Д. Побаль, 1972), адкрыцця філіяла Цэнтральнага музея У. І. Леніна ў Мінску (Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, канец 1970-х гг.), кансервацыі і музейнага выкарыстання шляхам уключэння ў комплекс Палаца рэспублікі фрагментаў Дамініканскага касцёла — помніка архітэктуры Мінска XVII ст. (міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, 1986), стварэння Музея гісторыі Мінска (А. Пермякоў, 1987), музея мінскага партыйнага падполля (супрацоўнік Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Д. М. Петрачэнка, 1987), археалагічнага музея «Менскае замчышча» (Л. Д. Побаль, 1988), музея гісторыі Кампартыі Беларусі (Бюро ЦК КПБ, 1988), мемарыяльных музеяў Ф. Скарыны, С. Буднага, К. Лышчынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, І. Буйніцкага, Цёткі, Ц. Гартнага, Б. Тарашкевіча (праграма «Спадчына» Беларускага фонду культуры, 1989), Музея нацыянальнага мастацтваў Мінску (удзельнікі круглага стала па музеях у рэдакцыі часопіса «Беларусь», 1989), Музея беларускай фатаграфіі (кіраўнік фотастудыі «Ракурс» І. Пятровіч, 1989). Не ўсе гэтыя праекты мелі рэалістычны характар і сацыяльную значнасць, аднак рэалізацыя большасці з іх безумоўна б паспрыяла культурнаму развіццю рэспублікі.

Разглядаемы перыяд характарызаваўся стварэннем шэрагу ведамасных музеяў, якія не ўваходзілі ў сферу кампетэнцыі Міністэрства культуры. Статыстыка музеяў дадзенай групы, як і раней, нікім у рэспубліцы не вялася, адсутнічаў які-небудзь каардынацыйны орган. Між тым, нават фрагментарныя звесткі сведчаць аб ролі, якую адыгрывалі ведамасныя музеі ў дакументаванні асобных галін навукі, тэхнікі, вытворчасці, а таксама гісторыі стварыўшых іх устаноў. Большасць з іх была даступна з пэўнымі абмежаваннямі.

Важнай з'явай у культурным жыцці БССР 1960-1980-х гг. было масавае стварэнне грамадскіх музеяў. Яны выступалі ў ролі сваеасаблівых клубаў, якія аб'ядноўвалі людзей, пераважна школьнікаў, па іх зацікаўленасці і давалі магчымасць праявіць і рэалізаваць свае здольнасці. Галоўным фактарам, які аб'ядноўваў вакол грамадскіх музеяў, была цікавасць да гісторыі сваёй малой радзімы, клопат аб захаванні і папулярызацыі распавядаючых аб ёй помнікаў гісторыі і прыроды. Аднак ад самага пачатку дырэктыўная дзейнасць партыйных органаў прыводзіла да фармалізацыі грамадскіх пачынанняў, да з'яўлення грамадскіх музеяў, якія не мелі калекцый аўтэнтычных прадметаў. Стварэнне лепшых грамадскіх музеяў грунтавалася на падзвіжніцтве канкрэтных асоб, іх энтузіязме і глыбокім веданні гісторыі сваёй малой радзімы.

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

## Музеі сістэмы Міністэрства культуры БССР на 19 верасня 1991г.

| № п\п | Назва музея | Год засна-вання | Профіль | Колькасць прадметаў асноўнага фонду | Адрас | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| I | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| I | Віцебскі абласны краязнаўчы музей | 1918 | Края-знаўчы | 182 549 | вул. Леніна, 36 210026, г. Віцебск | У 1918 г. была адкрыта першая экспазіцыя. У 1927 г. аб'яднаны з Віцебскім царкоўна- археалагічным музеем, музеем Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, з 1924 г. з'яўляўся аддзяленнем Беларускага дзяржаўнага музея. З 1928 г.— Віцебскі культурна-гістарычны музей, з 1944 г. — абласны краязнаўчы |
| 7 | Магілёўскі абласны краязнаўчы музей | 1919 | Края-знаўчы | 119 178 | Савецкая плошча, I 212030, г. Магілёў | З 31.01.1919 г. адкрыты ( як губернскі) Магілёўскі гістарычны музей, з 1924 г. з'яўляўся аддзяленнем Беларускага дзяржаўнага музея. З 1928 г. — самастойны краязнаўчы музей. У 1941 г. быў знішчаны. З 1944 г. — абласны краязнаўчы музей |
| 3 | Гомельскі абласны краязнаўчы музей | 1919 | Края-знаўчы | 155 812 | пл. імя Леніна, 4 246050, г. Гомель | Пасля заснавання меў назву Абласнога мастацкага музея імя А. В. Луначарскага, з 1926 г. — аддзяленне Беларускага дзяржаўнага музея, з 1928 г. — самастойны краязнаўчы музей. З 1944 г. — абласны краязнаўчы музей |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей | 1922 | Края-знаўчы | 158 981 | Бул. Замкавая, 20 230023, г. Гродна | Падчас нямецкай акупацыі разрабаваны. Адноўлены 02.08.1945 г. паводле пастановы СНК БССР |
| 5 | Слуцкі краязнаўчы музей | 1923 | Края-знаўчы | 21 822 | вул. Леніна, 171 223610, г. Слуцк, Мінская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 27.09.1952 г. |
| 6 | Дом-музей I з'езда РСДРП | 1923 | Гісторы-ка-рэва-люцый-ны | | пр. Скарыны, 31а 220005, г. Мінск | У 1941 г. быў знішчаны. У 1948 г. адноўлены. З 17.02.1992 г. паводле загада Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь перададзены Міністэрству культуры РБ як філіял Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі |
| 7 | Бабруйскі краязнаўчы музей | 1924 | Края-знаўчы | 12 462 | вул. Сацыялістыч-ная, 56 213826, г. Бабруйск, Магілёўская вобл. | Работы па ўзнаўленню пачаліся ў чэрвені 1945 г. |
| 8 | Барысаўскі дзяржаўны аб'яднаны музей | 1924 | Края-знаўчы | 36 333 | вул. Рэвалюцыі, 67 222120, г. Барысаў, Мінская вобл. | Работы па ўзнаўленню пачаліся 21.12.1946 г. На яго базе створана аб'яднанне паводле рашэння выканкома Мінскага абласнога Савета ад 29.02.1988 г. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Музей Беларускага Палесся | 1926 | Края-знаўчы | 57 517 | пл. Леніна, 22 225710, г. Пінск, Брэсцкая вобл. | З 1939 г. — Пінскі гісторыка-рэвалюцыйны музей, з 1940 г. — Пінскі гісторыка-краязнаў- чы музей, з 1954 г. — Пінскі краязнаўчы музей. Паводле рашэння Міністэрства культуры БССР ад 04. 01. 1979 г. на базе Пінскага краязнаўчага музея створаны Беларускі дзяржаўны музей сацыялістычнага пераўтварэння Палесся. 01.11.1990 г. перайменаваны ў Музей Беларускага Палесся |
| Ю | Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік | 1926 | Края-знаўчы | 49 741 | вул. Леніна, 22 211400, г. Полацк, Віцебская вобл. | 1926 г. — час заснавання першай структурнай часткі запаведніка (краязнаўчага музея). Работы па яго аднаўленні пачаліся ў 1948 г. 19.09.1967 г. заснаваны гісторыка-археалагічны запаведнік. 16.07.1990 г. паводле пастановы Савета Міністраў БССР перайменаваны ў гісторыка-культурны запаведнік. З 22. 05. 1997 г., паводле пастановы Савета Міністраў РБ, аб'яўлены гісторыка-культурным музеем-запаведнікам |
| II | Клімавіцкі краязнаўчы музей | 1926 | Края-знаўчы | 4 265 | вул. Савецкая, 69 213600, г. Клі-мавічы, Магі-лёўская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 11.07.1978 г. |
| 12 | Тураўскі краязнаўчы музей | 1927 | Края-знаўчы | 9 629 | вул. Кірава, 21 247980, г. п. Тураў, Жыткавіцкі раён, Гомель-ская вобл | Адноўлены 15.05.1950 г. паводле рашэння выканкома Палескага абласнога Савета дэпутатаў працоўных ад 02.12.1949 г. як дзяржаўны музей |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 13 | Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей | 1927 | Края-знаўчы | 23 409 | вул. Гара камунараў, 8 247760, г. Мазыр, Гомельская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 18.06.1948 г. |
| 14 | Баранавіцкі краязнаўчы музей | 1929 | Края-знаўчы | 38 074 | вул. Савецкая, 72 225320, г. Баранавічы, Брэсцкая вобл. | У 1940 г. быўператвораны ў Баранавіцкі абласны музей выяўленчага мастацтва (разрабаваны падчас Вялікай Айчыннай вайны). Паводле пастановы Савета Міністраў БССР ад 24.05.1946 г. Слонімскі раённы гісторыка- краязнаўчы музей, які ўцалеў у час вайны, ператвораны ў Баранавіцкі абласны гісторыка- краязнаўчы музей. 30.05.1952 г. паводле рашэння выканкома Баранавіцкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных музей пераведзены з г. Слоніма ў г. Баранавічы. 09.04.1954 г. перайменаваны ў Баранавіцкі краязнаўчы музей |
| 15 | Слонімскі раённы краязнаўчы музей | 1929 | Края-знаўчы | 20 362 | пл. Леніна, I 231800, г. Слонім, Гродзенская вобл | Адноўлены 31.10.1952 г. як Слонімскі раённы краязнаўчы музей |
| 16 | Бешанковіцкі гісторыка-краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 9 035 | вул. Валадарнага, 6, 211350, г. п. Бешанковічы, Віцебская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 19.04.1978 г. З 1987 г. — гісторыка-краязнаўчы музей |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 4 812 | вул. Леніна, 58 213320, г. Быхаў, Магілёўская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 04.06.1979 г. |
| 18 | Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 24 833 | вул. Вароўскага, 3 211540, г. Гарадок, Віцебская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 28.02.1974 г. |
| 19 | Капыльскі краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 13 182 | пл. Леніна, 4 223910, г. Капыль, Мінская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 01.06.1973 г. |
| 20 | Лепельскі раённы краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 14 966 | вул. Калініна, 66 211180, г. Лепель, Віцебская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся ў 1953 г. |
| 21 | Мсціслаўскі гісторыка-археалагічны музей | 1920-я гг. | Гіста-рычны | 9 982 | вул. Калініна, 49 213470, г. Мсціслаў, Магілёўская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 01.07.1988 г. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 22 | Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 6 534 | вул. Піянерская, 4 211070, г. Талачын, Віцебская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 29.08.1985 г. |
| 23 | Чэрыкаўскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей | 1920-я гг. | Края-знаўчы | 6 380 | вул. Ленінская, 180 213530, г. Чэрыкаў, Магілёўская вобл. | Работы па аднаўленню пачаліся 10.06.1983 г. |
| 24 | Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна | 1937 | Ваенна-гістарычны | 34 377 | вул. Баграціёна, 10 231900, г. Ваўкавыск, Гродзенская вобл. | Паводле пастановы СНК БССР ад 01.01.1940 г. набыў статус дзяржаўнага. Перайменаваны 27.02.1953 г. |
| 25 | Дом-музей Адама Міцкевіча | 1938 | Літара-турны | 5 162 | вул. Леніна, I 231400, г. Навагрудак, Гродзенская вобл. | Адноўлены ў 1955 г. |
| 26 | Дзяржаўны мастацкі музей БССР | 1939 | Мастацкі | 22 561 | вул. Леніна, 20 220030, г. Мінск | Паводле пастановы Савета Міністраў БССР ад 10.07.1957 г. ператвораны ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР. Паводле пастановы Савета Міністраў РБ ад 30. 11. 1993 г. перайменаваны ў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 27 | Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны | 30.09. 1943 | Ваенна-гістарычны | 103 911 | пр. Скарыны, 25а 220030, г. Мінск | |
| 28 | Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы | 19.05. 1944 | Літаратурны | 28 200 | вул. Я. Купалы, 4 220030, г. Мінск | |
| 29 | Брэсцкі абласны краязнаўчы музей | 11.06. 1945 | Краязнаўчы | 145 027 | вул. К. Маркса, 60 224646, г. Брэст | |
| зо | Літаратурны музей у Ляўках | 04.08. 1945 | Літаратурны | | 211038, в.Ляўкі, п/а Копысь, Аршанскі раён, Віцебская вобл. | Філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы |
| 31 | Літаратурны музей у Вязынцы | 04.08. 1945 | Літаратурны | | 222310, в. Вязынка, Маладзечанскі раён, Мінская вобл. | Філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы |
| 32 | Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава | 18.06. 1946 | Ваенна-гістарычны | 21 443 | вул. Суворава, 16 225860, г. Кобрын, Брэсцкая вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 33 | Столінскі краязнаўчы музей | 1950 | Краязнаўчы | 11 677 | парк «Манькавічы» 225510, г. Столін, Брэсцкая вобл. | |
| 34 | Рэчыцкі краязнаўчы музей | 03. 05. 1952 | Краязнаўчы | 20 997 | вул. Савецкая, 31 247500, г. Рэчыца, Гомельская вобл. | |
| 35 | Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча | 16.07. 1952 | Краязнаўчы | 7 755 | вул. Савецкая, 9 231100, г. Ашмяны, Гродзенская вобл. | У 1953 г. прысвоена імя Ф. К. Багушэвіча. Адкрыты 16.10.1955 г. |
| 36 | Дзяржаўны літа- ратурна-мемары- яльны музей Якуба Коласа | 16.08. 1956 | Літаратурны | 27 460 | пр.Ф. Скарыны, 66а 220012, г. Мінск | |
| 37 | Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» | 08.11. 1956 | Ваенна-гістарычны | 39 213 | Шпітальны востраў 224018, г. Брэст | Заснаваны 08.11.1956 г. паводле загада Міністэрства абароны СССР на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Прыняты пад кіраўніцтва Міністэрства культуры БССР 07. 05. 1969 г. На тэрыторыі крэпасці створаны мемарыяльны комплекс паводле пастановы Савета Міністраў БССР ад 22.07.1971 г. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 38 | Музей Ф. Э. Дзяржынскага | 01.03. 1957 | Гісторыка-рэвалюцыйны | 9 502 | вул. Музейная, 2 222370, г. п. Івянец, Валожынскі раён, Мінская вобл. | |
| 39 | Дзяржаўны музей БССР | 15.12. 1956 | Гістарычны | 262 212 | вул. К. Маркса, 12 220050, г. Мінск | Заснаваны як Арганізацыйная група па стварэнню Дзяржаўнага музея БССР. 02.11.1967 г. адбылося адкрыццё Дзяржаўнага музея БССР. Перайменаваны ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі згодна з пастановай Савета Міністраў РБ ад 22.02.1992 г. |
| 40 | Лідскі раённы краязнаўчы музей | 24.04. 1959 | Краязнаўчы | 32 126 | вул. Перамогі, 37а 231300, г. Ліда, Гродзенская вобл. | Першы фондавы збор створаны ў 1941 г. Адноўлены ў 1959 г., рээкспазіцыі — у 1964, 1976, 1987 гг. 27.01.2000 г. Лідскім гарадскім выканаўчым камітэтам было прынята рашэнне аб аб'яднанні мастацкай галерэі «Лідэя» з Лідскім краязнаўчым музеем у Лідскі гісторыка-мастацкі музей |
| 41 | Мінскі абласны краязнаўчы музей | 31. 07. 1959 | Краязнаўчы | 42 265 | вул. Талстога, 4 222310, г. Маладзечна, Мінская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 42 | Крычаўскі раённы краязнаўчы музей | 30.12. 1959 | Края-знаўчы | 17 448 | вул. Ленінская, 46а 213500, г. Крычаў, Магілёўская вобл. | |
| 43 | Бярозаўскі гісторыка-рэвалюцыйны музей | 21.06. 1961 | Гісторы-ка-рэва-люцый-ны | 17315 | вул. Леніна, 67 225210, г. Бяроза, Брэсцкая вобл. | |
| 44 | Рагачоўскі музей народнай славы | 03.10. 1962 | Гіста-рычны | 18 829 | вул. Леніна, 58 247250, г. Рагачоў, Гомельская вобл. | Паводле распараджэння Савета Міністраў БССР ад 30.01.1967 г. набыў статус дзяржаўнага музея народнай славы |
| 45 | Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей | 1964 | Края-знаўчы | 5 434 | вул. Санаторная, 5 222830, в. Блонь, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. | |
| 46 | Іканскі музей народнай славы | 04.07. 1964 | Ваенна-гіста-рычны | 7 822 | 222135, в. Іканы, Бары-саўскі раён, Мінская вобл. | У 1971 г. Іканскаму грамадскаму музею было прысвоена званне «народны», з 1977 г. набыў статус дзяржаўнага, стаўшы філіялам Барысаўскага краязнаўчага музея |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 47 | Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей | 1965 | Края-знаўчы | 13 395 | 231626, в. Гудзевічы Мастоўскі раён, Гродзенская вобл. | З 02.02.1968 г. — філіял Мастоўскага музея. Паводле загада Міністэрства культуры БССР ад 19.04.1990 г. стаў асобным дзяржаўным музеем |
| 48 | Музей Обальскага камсамольскага падполля | 29.10. 1965 | Ваенна-гіста-рычны | 1 040 | вул. Школьная, I 211266, г. п. Обаль, Шумілінскі раён, Віцебская вобл. | З'яўляўся філіялам Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 29.10.1965 г. па 31.12.1989 г. |
| 49 | Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» | 22.01. 1966 | | | 213110, «Хатынь», Лагойскі раён, Мінская вобл. | З'яўляўся філіялам Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 05.07.1969 г. па 31.03.1991 г. |
| 50 | Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова | 24.03. 1966 | Ваенна-гіста-рычны | 6 395 | вул. Чэхава, 4 210026, г. Віцебск | |
| 51 | Дзятлаўскі дзяржаўны гісторыка-краязнаўчы музей | 29.08. 1966 | Края-знаўчы | 12417 | вул. Першамайская, 12 231460, г. Дзятлава, Гродзенская вобл. | Заснаваны як музей народнай славы. Сучасная назва з 24.03.1998 г. паводле рашэння Дзятлаўскага райвыканкома |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 52 | Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна | 30.01. 1967 | Края-знаўчы | I 133 | вул. Савецкая. 2 347300, г. п. Акцябрскі, Гомельская вобл. | Паводле рашэння Акцябрскага райвыканкома ад 14.11.1995 г. перайменаваны ў Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна |
| 53 | Мядзельскі музей народнай славы | 10.03. 1967 | Гіста-рычны | 16 553 | вул. П. М. Ша-ранговіча, I 222380, г. П. Мядзель, Мінская вобл. | |
| 54 | Клічаўскі краязнаўчы музей | 05.06. 1967 | Края-знаўчы | 4 183 | вул. Я. Зайца, 21 213900, г. Клічаў, Магілёўская вобл. | Заснаваны як музей народнай славы. Сучасная назва з 30.01.1992 г. паводле рашэння Клічаўскага райвыканкома |
| 55 | Музей савецка-польскай баявой садружнасці | 29.08. 1967 | Ваенна-гіста-рычны | 6 250 | 213410, п. Леніна, Горацкі раён, Магілёўская вобл. | |
| 56 | Літаратурна-мемарыяльны комплекс у в. Мікалаеўшчы-на (Смольня) | 1967 | Літара-турны | | 222660, п/а Мі-калаеўшчына, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобл. | Філіял Дзяржаўнага літаратурна- мемарыяльнага музея Я. Коласа |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 57 | Музей партызана-героя Мікалая Гойшыка | 1967 | Ваенна-гіста-рычны | | вул. Дзяржын-скага. 18 225250, г. Івацэвічы, Брэсцкая вобл. | Заснаваны як грамадскі музей. 16.03.1993 г. паводле рашэння Івацэвіцкага райвыканкома на яго базе быў створаны мемарыяльны музей — філіял Івацэвіцкага краязнаўчага музея |
| 58 | Бягомльскі музей народнай славы | 17.04. 1968 | Края-знаўчы | 13 405 | вул. Савецкая, 17 211730, г. п. Бягомль, Докшыцкі раён, Віцебская вобл. | У 1985 г. пераведзены ў памяшканне былой Бягомльскай СПІ з поўнай перабудовай экспазіцыі |
| 59 | Любанскі дзяржаўны музей народнай славы | 22.10. 1968 | Гіста-рычны | 10 621 | вул. Калініна, 2 223810, г. Любань, Мінская вобл. | |
| 60 | Ушацкі музей народнай славы | 07.01. 1969 | Ваенна-гіста-рычны | 13 309 | вул. Ленінская, 37 211480, г. п. Ушачы Віцебская вобл. | Пастановай Савета Міністраў РБ прысвоена імя У. Е. Лабанка |
| 61 | Курган Славы Савецкай Арміі-вызваліцельніцы Беларусі | 05.07. 1969 | | | 21-ы кіламетр шашы Мінск-Масква, Сма-лявіцкі раён, Мінская вобл. | Філіял Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 62 | Карэліцкі краязнаўчы музей «Зямля і людзі» | 1970 | Края-знаўчы | 6017 | вул. Савецкая, 19 231430, г. п. Карэлічы, Гродзенская вобл. | |
| 63 | Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі | 29.05. 1970 | Мастацкі | 472 | вул. Савецкая, 14 213160, г.п. Бялынічы, Магілёўская вобл. | |
| 64 | Музейны комплекс «Хаваншчына» | 1971 | Ваенна-гіста-рычны | | 225255, в. Корачын, урочышча Хаваншчына, Івацэвіцкі раён, Брэсцкая вобл. | Філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея |
| 65 | Археалагічны музей «Бярэсце» | 18.08. 1972 | Гіста-рычны | | Шпітальны востраў Брэсцкай крэпасці 224018, г. Брэст | Філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея |
| 66 | Музей «Дзяржынава» | 1972 | Гісто-рыка-рэвалю-цыйны | | 222660, хутар Дзяржынава, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобл. | Філіял Музея Ф. Э. Дзяржынскага |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 67 | Мемарыяльны комплекс «Дальва» | 1973 | | | 223110, Акалоўскі сельсавет, Лагойскі раён, Мінская вобл. | Філіял Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» |
| 68 | Касцюковіцкі краязнаўчы музей | 18.06. 1973 | Края-знаўчы | 10 779 | вул. Ленінская, 21, 213640, г. Касцюковічы, Магілёўская вобл. | |
| 69 | Музей гісторыі і культуры г. Наваполацка | 01.10. 1973 | Гіста-рычны | 7 837 | вул. Маладзёжная, 45а, 211440, г. Наваполацк, Віцебская вобл. | |
| 70 | Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі | 04.12. 1973 | Гіста-рычны | 53 089 | вул. Замкавая, 16 230025, г. Гродна | Паводле загада Міністэрства культуры БССР ад 06.06.1977 г. перайменаваны ў Рэспубліканскі музей атэізму і рэлігіі і пераведзены ў Гродна. Адкрыты 15.01.1985 г. Паводле загада Міністэрства культуры БССР ад 13.09.1989 г. перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі |
| 71 | Пастаўскі раённы краязнаўчы музей | сту-дзень 1974 | Края-знаўчы | 6 855 | пл. Леніна 11/2 211840, г. Паставы, Віцебская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 72 | Свіслацкі гісторыка-краязнаўчы музей | 1976 | Краязнаўчы | 6 208 | вул. Леніна, 8 231960, г. п. Свіслач, Гродзенская вобл. | |
| 73 | Мазырская раённая карцінная галерэя | 18.02. 1976 | Мастацкі | | 247781, в. Гурыны, Крынічанскі сельсавет, Мазырскі раён, Гомельская вобл. | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР |
| 74 | Салігорскі краязнаўчы музей | 15.06. 1976 | Краязнаўчы | 9 097 | вул. Леніна, 5а 223710, г. Салігорск, Мінская вобл. | |
| 75 | Ельскі краязнаўчы музей | 01.08. 1976 | Краязнаўчы | 2 566 | вул. Дзяржынскага, 1 247820, г. Ельск, Гомельская вобл. | |
| 76 | Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту | 09.12. 1976 | Этнаграфічны | 17 509 | 223021, п/а Азярцо, Мінскі раён | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Музей беларускага народнага мастацтва | 14.04, 1977 | Мастацкі | | Спорткомплекс «Раўбічы» 223054, Астрашыцка-гарадоцкі сельсавет, Мінскі раён | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Паводле загада Міністэрства культуры БССР ад 26.11.1982 г. створаны аддзел народнай творчасці ў пасёлку Раўбічы |
| 78 | Музей баявой садружнасці беларускіх, рускіх, латышскіх і літоўскіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны | 18.08. 1978 | Ваенна-гістарычны | 5 169 | вул. Савецкая, 10а 211460, г. п. Расоны, Віцебская вобл. | З'яўляўся філіялам Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 04.07.1981 г. па 31.12.1989 г. |
| 79 | Лунінецкі краязнаўчы музей | 01.09. 1978 | Краязнаўчы | 6 795 | вул. Савецкая, 16 225650, г. Лунінец, Брэсцкая вобл. | |
| 80 | Музей Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі | 04.09. 1978 | Мастацкі | | вул. Ленінская, 37 212030, г. Магілёў | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 81 | Веткаўскі музей народнай творчасці | 30.11. 1978 | Краязнаўчы | 3 679 | Красная плошча, 5 247120, г. Ветка, Гомельская вобл. | |
| 82 | Музей гісторыі горада Светлагорска | 30.12. 1978 | Гістарычны | 3 846 | вул. Зялёная, I 247400, г. Светлагорск, Гомельская вобл. | |
| 83 | Мотальскі музей народнай творчасці | 1979 | Этнаграфічны | 17 186 | пл. Леніна 225822, в. Моталь, Іванаўскі раён, Брэсцкая вобл. | |
| 84 | Клецкі дзяржаўны гісторыка-этнаграфічны музей | 01.07. 1979 | Краязнаўчы | 5 366 | вул. Гагарына, 6 222640, г. Клецк, Мінская вобл. | |
| 85 | Жодзінскі дом-музей А. Ф. Купрыянавай | 1980 | Мемарыяльны | | вул. Маскоўская, 15 222160, г. Жодзіна, Мінская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 86 | Палац Халецкіх | 1980 | Края-знаўчы | | 247240, в. Хальч, Вет-каўскі раён, Гомельская вобл. | Філіял Гомельскага абласнога краязнаўчага музея |
| 87 | Літаратурны музей Петруся Броўкі | 10.07. 1980 | Літара-турны | 21 754 | вул. К. Маркса, 30 220030, г. Мінск | |
| 88 | Хата-музей Петруся Броўкі | 10.07. 1980 | Літара-турны | | 211485, в. Пуцілкавічы, п/а Малыя Дольцы Ушацкі раён, Віцебская вобл. | Філіял літаратурнага музея П. Броўкі |
| 89 | Хойніцкі гісторыка-краязнаўчы музей | 1981 | Края-знаўчы | I 991 | вул. Савецкая, 43 247600, г. Хойнікі, Гомельская вобл. | |
| 90 | Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей | 06.02. 1981 | Края-знаўчы | 6 825 | вул. Школьная, 4а, 223400, г. п. Узда, Мінская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 91 | Мемарыяльны музей імя П. М. Лепяшынская | 05.05. 1981 | Мема-рыяльны | | 247172, в. Ліцвінавічы, Кармянскі раён, Гомельская вобл. | Філіял Гомельскага абласнога краязнаўчага музея |
| 92 | Літаратурны музей Максіма Багдановіча | 27.07. 1981 | Літара-турны | 8 584 | вул. М. Багда-новіча^ 220029, г. Мінск | |
| 93 | «Акінчыцкая лясная камора» | 1982 | Літара-турны | | вул. Сянкевіча, 6 222660, г. Стоўбцы, Мінская вобл. | Філіял Дзяржаўнага літаратурна- мемарыяльнага музея Я. Коласа |
| 94 | Мемарыяльны музей І. Мележа | 1982 | Мема-рыяльны | | 247600, в. Глінішча, Хойніцкі раён, Гомельская вобл. | Філіял Хойніцкага гісторыка-краязнаўчага музея |
| 95 | Вілейскі гісторыка-краязнаўчы музей | 1982 | Края-знаўчы | 18 223 | пл. Свабоды, 8 222410, г. Вілейка, Мінская вобл. | |
| 96 | Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў | 27.04. 1982 | Края-знаўчы | 16 658 | вул. Энгельса, 39 211970, г. Браслаў, Віцебская | 26.05.1995 г. паводле рашэння Браслаўскага райвыканкома ўтвораны: Музей рамёстваў, Музей прыроды і этнаграфіі, Музей земляробства і млын. На іх базе створана Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | вобл. | |
| 97 | Архітэктурны комплекс XVI-XVIII стст. у в. Гальшаны | 28.02. 1983 | Мастацкі | | 231120, в. Гальшаны, Ашмянскі раён, Гродзенская вобл. | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР |
| 98 | Музей бітвы за Дняпро | 17.10. 1983 | Ваенна-гіста-рычны | 1 053 | вул. Савецкая, 3 247100, г. Лоеў, Гомельская вобл. | З'яўляўся філіялам Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з 11. 05.1984 г. па 31.12.1989 г. |
| 99 | Дзяржынскі гісторыка-краязнаўчы музей | 15.11. 1983 | Края-знаўчы | 4 570 | вул. Ленін-градская, 6 222720, г. Дзяржынск, Мінская вобл. | |
| 100 | Дом-музей Вань- ковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст. | 05.01. 1984 | Мастацкі | | вул. Інтэрнацы-янальная, 33а 220600, г. Мінск | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 101 | Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей | Май 1984 | Края-знаўчы | 6 697 | вул. Кутузава, 23 231000, г. Смаргонь, Гродзенская вобл. | |
| 102 | Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей | 28.05. 1984 | Края-знаўчы | 8 506 | вул. Кароткіна, 12, 211260, г. п. Шуміліна, Віцебская вобл. | |
| 103 | Музей баявой і працоўнай славы Бабруйскага раёна в. Сычкава | 06.08. 1984 | Гіста-рычны | 5 219 | вул. Селязнёва 213847, в. Сычкава, Бабруйскі раён, Магілёў-ская вобл. | |
| 104 | Горацкі раённы гісторыка-этнаграфічны музей | 14.12. 1984 | Края-знаўчы | 4 811 | зав. Якубоўскага, 2 213410, г. Горкі, Магілёўская вобл. | |
| 105 | Мастоўскі музей «Лес і чалавек» | 12.01. 1985 | Края-знаўчы | 2 041 | вул. Савецкая, 34 231600, г. Масты, Гродзенская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 106 | Мемарыяльны комплекс «Усакіна» | 09. 05. 1985 | Гіста-рычны | | 213790, в. Усакіна, Клічаўскі раён, Магілёўская вобл. | Філіял Клічаўскага краязнаўчага музея |
| 107 | Музей дзекабрыстаў | 1986 | Края-знаўчы | | вул. Перша-майская, 8 212000, г. Магілёў | Філіял Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея |
| 108 | «Беларуская хатка» | 02,10, 1986 | Літара-турны | | вул. Рабкораў-ская. 19 220001. г. Мінск | Філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча |
| 109 | Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» | 31.12. 1986 | Края-знаўчы | 10212 | вул. Рынкавая, I 223036, г. Заслаўе, Мінская вобл. | |
| 110 | Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей | 29. 07. 1987 | Края-знаўчы | 8 601 | вул. Гродзенская, 2 231400. г. Навагрудак, Гродзенская вобл. | |
| 111 | Чашніцкі гістарычны музей | 15. 08. 1987 | Ваенна-гіста-рычны | 4 709 | пл. Свабоды, I 211150, г. Чашнікі, Віцебская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 112 | Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры | 06. 11. 1987 | Літара-турны | 30 778 | вул. М. Багда-новіча, 15 220029, г. Мінск | |
| 113 | Палацава-пар-кавы комплекс XVI-XX стст. у гарадскім пасёлку Мір | 24.12. 1987 | Гіста-рычны | | Замак 231444, г. п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобл. | Філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР |
| 114 | Брагінскі гістарычны музей | 23. 06. 1988 | Гіста-рычны | 694 | вул. Савецкая, 79 247630, г. п. Брагін, Гомельская вобл. | |
| 115 | Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва» | 11.08. 1988 | Мастацкі | | п/а Руба, Віцебскі раён | Філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея |
| 116 | Дом-музей дзеда Талаша | 07.10. 1989 | Мема-рыяльны | 188 | 247940, в. Навасёлкі, п/а Бела- навічы, Петрыкаўскі раён, Го-мельская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 117 | Нясвіжскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей | 30.10. 1989 | Края-знаўчы | 4 452 | вул. Ленінская, 96 222620, г. Нясвіж, Мінская вобл. | |
| 118 | Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей | 31.10. 1989 | Края-знаўчы | 16 557 | пл. Леніна, 4 247150, г. Ча-чэрск, Гомель-ская вобл. | |
| 119 | Жлобінскі гісторыка-краязнаўчы музей | 21.12. 1989 | Края-знаўчы | 6 236 | вул. Першамай-ская, 85 247210, г. Жлобін, Гомельская вобл. | |
| 120 | Мемарыяльная сядзіба «Альбуць» | 1990 | Мема-рыяльны | | 222660, п/а Мі-калаеўшчына, Стаўбцоўскі раён, Мінская вобл | Філіял Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Я. Коласа |
| 121 | Літаратурны музей | 26.10. 1988 | Літара-турны | | вул. Фрунзе, 13 210026, г. Віцебск | Філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 122 | Мемарыяльны музей садавода-селекцыянера І. П. Сікоры | 29.11. 1988 | Мемары-яльны | 2 746 | 211900, в. Алашкі Ма-лыя, Шаркаўш-чынскі раён, Віцебская вобл. | |
| 123 | Музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» | 04.02. 1989 | Мастацк і | | вул. Леніна, 39 224646, г. Брэст | Філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея |
| 124 | Літаратурны музей «Акопы» | 05.09. 1989 | Літара-турны | | 223123, в. Харужанцы, Лагойскі раён, Мінская вобл. | Філіял Дзяржаўнага музея Я. Купалы |
| 124 | Музей гісторыі пасёлка Ільіч | 26.09. 1989 | Гіста-рычны | | вул. Школьная, 7 247250, пасёлак Ільіч, Рагачоўскі раён, Гомельская вобл. | Філіял Рагачоўскага музея народнай славы |
| 126 | Маслакоўскі філіял Горацкага гісторыка-этна-графічнага музея | 1990 | Края-знаўчы | | 213401, в. Маслакі, Горацкі раён, Магілёўская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 127 | Лельчыцкі краязнаўчы музей | 01.01. 1990 | Края-знаўчы | 675 | вул. Чырвона-армейская, 1 247840, г. п. Лельчыцы, Гомельская вобл. | |
| 128 | Круглянскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей | 21.02. 1990 | Края-знаўчы | 5 627 | вул. Савецкая, 40 213180, г. п. Круглае, Магілёўская вобл. | |
| 129 | Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры | 28.02. 1990 | Края-знаўчы | 10 056 | вул. Старавіленская, 14 220029, г. Мінск | |
| 130 | Музей гісторыі горада Брэста | 28.02. 1990 | Гіста-рычны | | вул. Леванеўскага, 3 224005, г. Брэст | Філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея |
| 131 | Чавускі раённы гісторыка-краязнаўчы музей | 02.04. 1990 | Края-знаўчы | 2 910 | вул. Савецкая, I 213200, г. Чавусы, Магілёўская вобл. | |
| 132 | Шклоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей | 27.06. 1990 | Края-знаўчы | 1 016 | вул. Савецкая, 69 213010, г. Шклоў, Магілёўская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 133 | Дом-музей Францішка Багушэвіча | 06.07. 1990 | Літара-турны | | 231032, в. Кушляны, Смаргонскі раён, Гродзенская вобл. | Філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры |
| 134 | Музей гісторыі Магілёва | 16.07. 1990 | Гіста-рычны | 5 437 | вул. Ленінская, 1а 212030, г. Магілёў | |
| 135 | Выставачная зала — музычная гасцёўня | 29.07. 1990 | Мастацкі | 615 | пр. Фрунзе, 11 210026, г. Віцебск | |
| 136 | Карцінная галерэя г. ц. Акцябрскі | 03.08. 1990 | Мастацкі | | вул. Фрунзе, 9 247300, г. п. Акцябрскі, Гомельская вобл. | Філіял Цэнтра гісторыі і культуры Акцябрскага раёна |
| 137 | Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава | 19.11. 1990 | Мастацкі | 2 147 | вул. Міронава, 33 212030, г. Магілёў | 22.12.1996 г. музею прысвоена імя народнага мастака РБ В. Масленікава |
| 138 | Міёрскі гісторыка-этнаграфічны музей | 27.12. 1990 | Гіста-рычны | 2 645 | вул. Школьная, 12 211930, г. Міёры, Віцебская вобл. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 139 | Фальварак Ракуцёўшчына | 1991 | Літара-турны | | 222320, в. Ра-куцёўшчына, Маладзечанскі раён, Мінская вобл. | Філіял Літаратурнага музея М. Багдановіча |
| 140 | Калінкавіцкі краязнаўчы музей | 23.03. 1991 | Края-знаўчы | 1847 | вул. Інтэрна-цыянальная, 11 а 247710, г. Калін-кавічы, Гомельская вобл. | |
| 141 | Музей прыроды і экалогіі Рэспублікі Беларусь | 08.07. 1991 | Прыро-дазнаўч ы | 25 277 | вул. К. Маркса, 12 220050, г.Мінск | |

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013